С(Бел)
А 19

Літаратурна-мастацкі альманах

AVE

КНХ

Адраджэнне
Вера
Еднасць

Выпуск 6

У дзвюх частках

Частка першая

І толькі вашы рукі, плечы
Такі цяжар падняць маглі:
Ён вышай сілы чалавечай
І вышай сіл другой зямлі.

Якуб Колас

848191

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта

Мінск БДТУ 2011

Аўтар ідэі выдання,
прысвечанага 65-годдзю Вялікай Перамогі,
В. А. КУЗЬМІЧ

Складальнік,
кіраўнік праекта, адказная за выпуск
Н. Я. САВІЦКАЯ

Рэдакцыйная рада
Старшыня: В. А. Кузьміч, загадчык кафедры
беларускай мовы

Члены рады: Т. У. Жукоўская, выкладчык
Т. А. Казлякова, ст. выкладчык
Р. В. Міксюк , ст. выкладчык
В. У. Русак, ст. выкладчык,
кандыдат філалалагічных навук

Шосты нумар «AVE» – гэта спецыяльны выпуск, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У ім змешчаны творчыя і навуковыя працы апошніх 2–3 гадоў, напісаныя да ўніверсітэцкіх, гарадскіх і рэспубліканскіх конкурсаў. Члены студэнцкага аб'яднання «Пошук» і літаратурнага клуба «Ветліца» падрыхтавалі на рэспубліканскія конкурсы «Халакост. Гісторыя і сучаснасць» (2008 г.), «Вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа» (2009 г.), «Аўтограф» (2010 г.) звыш 80 прац. Каля 60 з іх узнагароджаны дыпломамі і адзначаны падзякамі.

У «AVE-6» змешчаны творы 63 аўтараў, з іх у раздзелах: паэзія – 14, малыя жанры – 12, навукова-творчыя працы – 7, «Халакост. Гісторыя і сучаснасць» – 7, «Аўтограф» – 26.

Шосты нумар выдаецца ў дзвюх частках. У першую частку ўвайшлі наступныя раздзелы: паэзія, малыя жанры, навукова-творчыя працы, «Халакост. Гісторыя і сучаснасць». Другую частку складаюць лепшыя творы, якія былі прадстаўлены на рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф».

© УА «Беларускі дзяржаўны
тэхналагічны ўніверсітэт», 2011

ЗМЕСТ

АД СКЛАДАЛЬНІКА **6**

ПАЭЗІЯ **8**

Вольга АДАМОВІЧ 8
Беларусам. Памяць
Настасся ГЕРАСІНА 9
Вайна
Вікторыя ДАМАСІК 10
Возвращение (триптих)
Аляксандр КАПСАРАЎ 13
Когану Павлу, автору «Бригантины». Попутчик
Ганна КУЛІКОВА 14
Думкі пра вайну.
Настасся ЛІСОЎСКАЯ 15
У зямлянцы (трыпціх)
Галіна ЛУКША 17
Мы завяршаем подзвіг-сказ... Курган Славы. Трохвугольнік.
Песня жыцця. Векавечныя помнікі
Кацярына РЫБАКОВА 20
Память о войне
Аляксей САЛАМОНАЎ 22
Та победа нужна была миру. Была ў нас адна перамога.
Вайна з душы маёй глядзіць. Войны трэба ў мінулым пакінуць
Алена СТАДОЛЬНІК 24
Перамога. Вайна
Наталля СЯДЗЕЛЬНІК 25
Маці салдата
Аляксандр ХОЛАДАЎ 26
Военным корреспондентам. Раздали всё: оружие, патроны...
Он был последним... Говорят, что «пережил войну...»
Кацярына ЦІХАНКОВА 28
«Ветераны. Отвоевали Волю...»
Алена ЧАРНЯНОК 28
«Шумяць, бягуць і ззяюць рэкі...»

МАЛЫЯ ЖАНРЫ **29**

Вольга БАГРАВЕЦ 29
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)

Вольга БАРЭЛЬ 30
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)
Наталля ВАЛАСАЧ 30
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)
Лізавета ГУНЯЖЭНКА 31
Вялікая Айчынная вайна праз лёс майго дзядулі (*эсэ-ўспамін*)
Зміцер ДАШКУН 35
Дзяды і прадзеды пакінулі нам мову,
сям'ю, зямлю (*сачыненне-разважанне*)
Зміцер КРУК 35
Гераізм маіх продкаў (*сачыненне-разважанне*)
Паліна КУЗЬМІЦКАЯ 36
По ту сторону войны (*апавяданне*)
Іван КУРЫЛЕНКА 40
Вайна праз лёс майго прадзеда (*нарыс*)
Аляксандр ПЫТЛЯК 47
Беларуская сям'я на працягу XX стагоддзя (*эсэ*)
Таццяна СІНЯКІНА 48
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)
Касандра ШАХАБ 49
Пажары — гэта цяжкія раны маёй зямлі (*эсэ*)
Юлія ШЭМЕЛЬ 51
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)
Вікторыя ЯНУШ 53
Вайна праз лёс маёй сям'і (*эсэ*)

НАВУКОВА-ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ 55

Алена ЕЎСЯВІЦКАЯ 55
Вайна вачыма маладых
Вольга КАВАЛЁВА 66
Дзяцінства, апаленае вайной
Таццяна КІШКО 85
Азарычы — боль мой на ўсё жыццё
Марыя МАЛАШУК 109
Партизанская бригада Н. М. Никитина: история и судьбы её участников
Ірына ПЕРКАВЕЦ 123
Вайна праз жыццё
Вікторыя ЦЫГАНОК 139
Паўстала песня народная
Юлія ШЭМЕЛЬ 160
Дарогі болю

«ХАЛАКОСТ. ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» 175

УСТУП ДА РАЗДЗЕЛУ 175

Вольга АДАМОВІЧ 175
Я хачу, каб у душах жывых яны з мёртвых паўсталі...
Таццяна БАХАНКО 190
Незабыўнае
Зміцер ІСАЕЎ 197
Катастрофа яўрэяў Беларусі
Глафіра КАРАЛЁВА 219
Частка беларускай гісторыі
Людміла СТАЎСКАЯ 223
І засталіся толькі ўспаміны
Дар'я ШУШКЕВІЧ 226
Жыццё і змаганне ільянскіх яўрэяў

АД СКЛАДАЛЬНІКА

У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце 12 гадоў працуе літаратурны клуб «Ветліца», членамі якога з'яўляюцца звыш ста студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў; прыходзяць у клуб іх дзеці і ўнукі.

Дзейнасць клуба рознабаковая. Гэта пасяджэнні, вечарыны, конкурсы, выставы і інш. Па выніках дзейнасці клуба выдаецца літаратурна-мастацкі альманах «AVE» (Адраджэнне. Вера. Еднасць). Выйшла 5 зборнікаў. Друкуюцца члены клуба ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, выступаюць на радыё, удзельнічаюць у акцыях міласэрнасці і інш. Дадзенае выданне прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Мы адзначаем 65-годдзе Вялікай Перамогі. Гэта падзея з'яўляецца яркай старонкай не толькі айчыннай, але і сусветнай гісторыі, важным этапам на шляху выратавання чалавецтва ад «карычневай чумы» XX стагоддзя — нацызму.

Праз 65 год пасля тых гераічных лёсавызначальных падзей, калі непасрэдных удзельнікаў і сведкаў становіцца меней, можна пачуць і такое пытанне: які сэнс зноў і зноў вяртацца ў тыя далёкія гады, якія сталі для новых пакаленняў глыбокай гісторыяй? Адказ можа быць толькі адзін. Мэта вяртання да ваенных падзей — не выклікаць пачуццё нянавісці і помсты ў адносінах да былых ворагаў Айчыны, а зусім іншая. Рэаліі нашых дзён, карэнныя інтарэсы народаў свету патрабуюць пазбаўлення ад стэрэатыпаў варожасці. У той жа час мы не павінны дапусціць, каб разам з нянавісцю адыходзіла памяць пра тую бездань народнага гора і найвялікшую мужнасць нашых продкаў у той бязлітаснай вайне. Тое, за што чалавецтва заплаціла такую непамерную цану, ніколі не павінна паўтарыцца! Наша краіна выпакутавала і заваявала права на сваю бяспеку, упэўненасць у заўтрашнім дні.

Насельніцтву Беларусі ў 1941–1944 гадах давялося вынесці ўвесь цяжар нацысцкага акупацыйнага рэжыму, у выніку якога загінула звыш чвэрці насельніцтва краіны. Гэтыя гады былі перыядам барацьбы беларускага народа за сваё гістарычнае і фізічнае існаванне. Выжыць у такіх умовах можна было толькі праз жорсткую масавую барацьбу. Менавіта такую барацьбу Беларусь прадэманстравала захопнікам і ўсяму свету, назаўсёды замацаваўшы за сабой званне «рэспублікі-партызанкі». Каля 800 тысяч патрыётаў у гады акупацыі знаходзіліся ў складзе злучэнняў, брыгад і атрадаў народных мсціўцаў, партызанскіх рэзерваў і яшчэ дзясяткі тысяч чалавек – у падпольных антыфашысцкіх арганізацыях, якія масава падтрымлівала мірнае насельніцтва рэспублікі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся сотні тысяч беларусаў. Прадстаўнікі беларускага народа ўпісалі таксама свае імёны ў гісторыю еўрапейскага руху Супраціўлення.

У пачатку цяперашняга, XXI стагоддзя, мы атрымалі шырокі доступ да крыніц інфармацыі, адкрылася шмат невядомага раней. На гэтай глебе разгарнулася нямала дыскусій. Аднак нельга адмовіць таго, што менавіта Савецкі

Саюз выратаваў чалавецтва ад нацызму. І зараз, як і раней, мы схіляем галаву перад подзвігам тых, хто перамог фашызм.

У Беларусі больш за 6,5 тысячы помнікаў і брацкіх магіл, якія сведчаць пра подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамагаюць захоўваць духоўную памяць.

Нягледзячы на тое, што зараз надрукавана 10,5 тысячы публікацый, з'яўляюцца новыя старонкі, якія да нядаўняга часу былі невядомыя. Мы мала ведаем пра праведнікаў, а наш народ — гэта народ-праведнік, які захаваў шмат жыццяў чырвонаармейцаў, што трапілі ў палон, яўрэяў і інш.

Мы абавязаны захоўваць памяць пра Вялікую Айчынную вайну, гераізм і мужнасць, пра незлічоныя ахвяры беларускага і іншых народаў СССР.

Веды пра Вялікую Айчынную вайну маюць вялікае значэнне для патрыятычнага выхавання маладых людзей. Менавіта ім належыць будаваць і берагчы нашу Беларусь у будучым. Устанаўленне сувязі часоў і пакаленняў — важнейшая частка ідэалагічнай працы, без якой не можа існаваць і паспяхова развівацца дзяржава. Гістарычная памяць пра подзвігі гераічных продкаў, пра веліч беларускага народа ў час найцяжэйшых выпрабаванняў 1941–1945 гадоў будзе для нашай моладзі крыніцай гордасці, духоўнай апорай і падмогай.

Яшчэ жывуць сведкі вайны, якія сустракаюцца з моладдзю і дзеляцца ўспамінамі. Часам ім цяжка ўзгадваць трагічныя падзеі , яны не могуць стрымаць слёз. Моладзь вельмі чуйна адносіцца да такіх момантаў, суперажывае. Некаторыя студэнты ведаюць гісторыю сваёй сям'і і могуць расказаць пра дзядуль і прадзедаў таварышам. Чытанне кніг, удзел у конкурсах вершаў, прагляд спектакляў і кінафільмаў, удзел у вечарынах і акцыях памяці выклікаюць жаданне напісаць уласныя творы, звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Такія творы асабліва кранаюць студэнтаў, паколькі прэзентуюцца маладымі людзьмі падчас правядзення куратарскіх гадзін, сустрэч у групах і інш. Многія творы надрукаваны ў альманахах «AVE». Тэма Вялікай Айчыннай вайны скразная і адлюстравана ва ўсіх пяці выданнях. Разам у пяці зборніках надрукаваны творы каля 60 аўтараў розных жанраў. Шосты выпуск альманаха цалкам прысвечаны падзеям мінулай вайны.

У нас слаўная гісторыя, якая памнажае нашы сілы, імкненне ахоўваць і ствараць тое вечнае і святое, што абаранялі цаной свайго жыцця, ратавалі і перадалі нам героі Вялікай Айчыннай вайны. І гэту гісторыю распавядаюць нашы студэнты, даносячы яе да сэрцаў і розумаў новага пакалення маладых людзей.

ПАЭЗІЯ

Вольга АДАМОВІЧ

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Нарадзілася ў 1989 годзе ў вёсцы Параф'янава Докшыцкага раёна на Віцебшчыне. Скончыла ў 2007 годзе Параф'янаўскую сярэднюю школу з залатым медалём і паступіла ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт.

Першыя вершы пачала пісаць у 9 класе. Творы друкаваліся ў раённай газеце «Родныя вытокі», у часопісах «Дыялог», «Рэпетытор». За ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф» атрымала дыплом Міністэрства адукацыі II ступені ў намінацыі «Паэзія» (2010 г.)

Беларусам

Зазірні ў люстэрка,
Што час адбівае праз шкло.
Шмат уздымаў, падзенняў
У гісторыі нашай было.
Гэта мы, беларусы,
Непрызнанне цярпелі, прыгон.
Гэта мы, беларусы,
У вайне аддавалі жыццё.
Гэта мы, беларусы,
Талерантнасць сваю збераглі,
Каб жыла Беларусь,
Каб яна не гарэла ў агні.

У руках зараз нашых
Незалежнасць Радзімы святой.
І стаім мы на варце
За рост яе і яе супакой.
Трэба мужнасць, адвагу
Мець у сэрцы, любоў і давер.
Да Радзімы павагу
Мы гэта засведчым цяпер.
Не цурацца ніколі,
Сваёй мовы, сваіх каранёў,
Каб ісці да свабоды,
Каб сэрца палала агнём —
Вось задача якая
Перад моладдзю, намі, стаіць,
Каб Зямля дарагая
Магла ў шчасці і радасці жыць!

Памяць

Загінуўшым ад жорсткасці і нянавісці прысвячаю…

Па прыступках іду,
Што жыццём нашым сёння завуцца.
Прадчуваю бяду,
Быццам зараз яны абарвуцца…

Востры боль, неспакой,
Штосьці душыць, рве сэрца на часткі.
Памяць сілай сваёй
Не дае ад зямлі адарвацца...
Памяць мёртвых, жывых,
Тых, што спяць неспакойна і сёння.
Памяць тых і другіх,
Што паклалі галовы вайною.
Хтосьці хоча забыць
І пустыя прыступкі пакінуць.
Ці хіба можна змыць
След крывавы тых успамінаў?!
Перайначу жыццё,
Перакрэслю пустыя прыступкі,
Каб не ўпаў у забыццё
Мой народ, не забыў тыя мукі.
Мукі страшныя тых,
Што ў вайну тут галовы паклалі.
Я хачу, каб у душах жывых
Яны з мёртвых паўсталі.

Настасся ГЕРАСІНА

Студэнта інжынерна-эканамічнага факультэта (ІЭФ)

Нарадзілася 23 снежня 1991 года у горадзе Смалявічы Мінскай вобласці. У Смалявічах скончыла 10 класаў, потым пераехала ў Мінск і ў 11 классе навучалася ў 12 школе г. Мінска. У 2009 годзе паступіла ў БДТУ. Любіць вандраваць, слухаць добрую музыку, чытаць кнігі, пісаць вершы.

Вайна

Паміж узгоркаў дарога ўецца...
Курган Славы вайной адгукнецца...
Тыя мінулыя дні адышлі ў небыццё,
Як дзяды за Радзіму аддавалі жыццё.
Многія не вярнуліся дамоў,
А матулі ўсё чакалі сыноў,
Нема крычала матчына сэрца
Ад нясцерпнае раны вайны,

Але сын ўжо не адчыніць дзверцы –
У памяць аб ім б'юць званы.
Яны назаўсёды хацелі пакончыць з вайной
Як з самай вялікай бядой.
Хай жа будзе заўжды
Мір, спакой на зямлі,
Каб дзеці не зведалі
Жахаў вайны.

Вікторыя ДАМАСІК

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Нарадзілася 10 чэрвеня 1991 года ў горадзе Пінску. Базавую адукацыю атрымала ў СШ № 15 г. Пінска. Паралельна вучылася ў музычнай школе. У 2007 годзе закончыла Брэсцкі абласны ліцэй імя П. М. Машэрава. У 2009 годзе паступіла ў БДТУ.

Любіць усё, што адносіцца да мастацтва: тэатр, кіно, жывапіс, музыку, літаратуру...

Возвращение (триптих)

Ошибки былые пусть будут уроком,
Жестокость чужая – причиной слезы…
В истории, в прошлом не столь уж далёком
Мы видели ужас фашистской войны,
Когда умирали солдаты и дети,
Когда в тридцать восемь была седина,
Когда нападенье, как сон, на рассвете,
Когда вместо жалости – лишь пустота.
Сраженья, блокады, сгоревшие сёла,
Охрана штабов и воздушных границ,
Войска, отступления, дети и голод –
Страшнее в истории нету страниц!

***

Отчаянный взгляд – знак прощанья с родными.
На сжатых губах, словно символ, слеза.
«Ах, только бы пули, да только бы мимо!..»
Не людям решать: здесь хозяйка — война!

Платок кружевной положила в кармашек
И проводила дитя на войну.
Был грустными красками август раскрашен…
«Мамуль, ты не плачь! Обещаю – приду!»
Калитку закрыв, она знала: вернётся,
Пройдёт он ещё по родимой тропе.
Ей только молитвой хранить остаётся,
Свечу за него зажигать в темноте…
Не месяцы — годы ждала она сына,
И сердце сжималось при виде солдат.
Она его верой своей сохранила,
Она не забыла его смелый взгляд…
И вот: в саду слышится скрежет калитки,
И взгляд чей-то в окна, как будто прицел.
Дрожащие руки в цвет мраморной плитки…
Не сын – а немецкий пришёл офицер.
И так в каждый дом. Полицаи и фрицы
Входили, сгоняя во двор всех подряд.
И слёзы, и крики, и скорбные лица
В толпе тех идущих в пылающий ад.
Сгоняли в сарай, а потом по приказу
Они разожгли этот жуткий костёр.
«И чтоб ни одна не сбежала зараза!»
И всё! Не деревня – а чёрный простор…

***

Солдат, возвратясь из-за линии фронта,
Идёт к тому дому, где мамка живёт,
В пробитой пилотке, шинели протёртой
Быстрее, быстрее и только вперёд.
«Живой я, живой! Мамка, как обещал,
Я к родимому дому сквозь ливни бегу!
Да что ж ты на письма мне не отвечала?!
Да ладно… Я скоро тебя обниму!
Я чувствовал сердцем, что ты была рядом,
Я знал, что ты ждёшь, что скучаешь по мне.
Как будто хранимый с небес чьим-то взглядом
Я выжил в безжалостной этой войне.
Платок кружевной, словно крестик,
Хранил. Он всегда не разлучен со мной.
Как будто не годы прошли, а столетья —
А он всё по-прежнему пахнет тобой!

Ведь май на дворе! Сад уже расцветает?
Там, помнишь, когда-то была карусель!
С мальчишками мы, как воробышек стая,
Забраться пытались на папину ель…
Родная, я близко! Я там, за межой
Валялся в пыли и кровавой земле.
И вот иду к чистой, святой и родной!
К спокойным рассветам, хрустальной росе…
Минуты остались… Я знаю: увижу
Просторную церковь и хутор родной!
Я с каждой минутой всё ближе и ближе…
… Неужто забыл я дорогу домой?!
Не мог.… Здесь была длиннокосая ива…
А рядом две лавки и синий забор…
Ах, что же ты, сволочь — война, натворила?!
Да чем же им, гадам, мешал этот двор?!
Вот эти руины пропитаны детством,
Вот эта трава ещё помнит меня.
Ах, мамка, я думал: приду – будем вместе…
Мамуля, а где хоть могилка твоя?!
Я лишь потому выбирался из ада
И между боями я грезил о том,
Что после войны буду с мамкою рядом,
С победой приду в свой родительский дом.
Не может быть в жизни больнее лишенья;
Минута сраженья не так уж страшна:
С простреленным телом возможно спасенье,
Но с умершим сердцем – уже никогда… »

***

Приникнув к земле той сгоревшей деревни,
Где сердце осталось на время войны,
Смывая слезами с рук пепел деревьев,
Он чувствовал тяжесть кровавой земли…
Таких же, как он, были тысячи воинов:
Медаль на груди, ну а в сердце тоска.
И каждому было и горько, и больно
Узнать, как Победы цена велика!



Аляксандр КАПСАРАЎ

Нарадзіўся ў горадзе Орску ў 1944 годзе. У Беларусі жыў на радзіме бацькоў у Гомелі і ў Магілёве, дзе закончыў школу і Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Асвоіў прафесіі слесара, фармоўшчыка, токара, вадзіцеля, радыётэхніка і радыётэлеграфіста і інш. Тры гады служыў у Савецкай арміі. Па размеркаванні накіраваны ў Мінск на Вопытны завод. Супрацоўнічае з МТЗ. Кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік кафедры «Дэталі машын і ПТУ». Мае больш за 15 укаранёных вынаходстваў. Літаратурнай творчасцю займаецца поруч з матэматыкай і фізікай.

Когану Павлу, автору «Бригантины»

И твёрдый стих и гибкое перо
Векам передавали наудачу
Те юноши, чей гений не оплачен,
Кому удач, увы, не суждено.

Но полнокровно, гласными пропитан
Для людных мест среди больших полян
Откованный для пира и для битвы
Могучий слог, любовью осиян.

Нет слову ни преград и ни обочин.
Век дневниковый кончился давно.
Оно ложится горлом многоточий
В газету, телевизор и кино.

В некрологи, но только не в прощенья.
Взорвётся с комсомольского листка
Граната слов… Вставали из траншеи
Поэты для последнего броска.

Граната слов. Нет ордена в петлице,
И этим строчкам не пристала лесть.
Прислушайся: грохочет колесница,
В которой гнев, забвение и честь!

А паруса? А ветер, что на север?
А капитан, кто «не дождавшись нас…?»
Иных уж нет…, но перегружен Сервер:
«Спасите души», как спасали Вас!..

Попутчик

Попутчик стар. Костюм из твида.
Солдатом был. Стал инвалидом,
И обнажённой белизной
Смотрел рукав полупустой.

До дачи – роща да поляна...
Хмелён весенний воздух пряный!

Он утомился. Путь не близкий.
Нашёл пенёк под снегом низкий,
Смахнул снежок, примял валежник,
Присел на лапничек несвежий,

Рюкзак развязан, «Беловежской»
Налит стаканчик той, Здоровой,
Огромной, правою, последней…,
Её не тронул край передний,
На той, на той… передовой.

– «Ну что ж, отметим… по одной?»
– «А то!? Ещё пока есть силы».
– «Скажи сосед, как это… было?»
– «Да,… воевал, но не герой».
Мой первый бой – последний бой.

Забот немало, нет покоя.
Мой брат недавно, упокоен,
И дом осел…, ещё весной он.
Сам – одинокий – холостой.
Таков он наш… последний бой.

Но лучше отвлекись, послушай!
Как, перестроившись, клинком,
Летят, летят лебяжьи души
И клювы светятся дымком.

И всё – туда же, всё – туда же,
На тёплый отсвет янтаря,
Где распушась крылом лебяжьим
Им откликается заря.

А следом этим кликам редким,
Сопровождая мах крыла
Кудахчут дачные наседки
И душу рвут колокола».

Замолк. Легки его пожитки.
Скрипучи петли у калитки.
Дымок. Капуста на обед.
... Да лебедей... свистящий след.



Ганна КУЛІКОВА

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Нарадзілася ў Магілёве. Скончыла сярэднюю школу №31. Там пачала пісаць вершы пад кіраўніцтвам настаўніцы Мікалуцкай Жанны Мікалаеўны. У 2009 годзе паступіла ў БДТУ. З'яўляецца членам літаратурнага клуба «Ветліца», удзельнічае ў гульні «Што? Дзе? Калі?», конкурсе «Студэнцкі дэбют», фестывалі «Студэнцкая вясна – 2010».

Думкі пра вайну...

Я ведаю,
Што было з тымі,
Хто жыў у сорак першым...
Я памятаць буду іх дзеі,
Напішу пра іх свае вершы,
Урокам жа будзе Гісторыя,
Якая дае нам надзею
На непаўторнасць той жудасці...
Мы можам імкнуцца да мудрасці
Ці да светлага шчасця,
Якое скрозь цемру праб'ецца
І застанецца з намі ...
Але памятаць мы павінны,
Якою цаной заплацілі за гэта
Нашыя дзеды, што былі падлеткі
У сорак першае лета.
Іх дзеі ў памяці нашай
Нясуць святло незгасальнай якасці
Ды словы падзякі, уздзячнасці...

Усё гэта — заўсёдная
Праўда народная,
Шчырая, вечная..
Яна не згасае ў вечнасці —
Адраджаецца песнямі, вершамі…
Дарэчы, не ведаю
Колькі слоў сказаць мы павінны
Тым, хто ахвярна змагаўся,
Тым, хто ў зямельцы застаўся,
І заваяваў Перамогу Вялікую свету …
Але толькі адно прыходзіць шчаслівае..
Гэтыя словы: «ШЧЫРА ДЗЯКУЮ, МІЛЫЯ!»

Настасся Лісоўская

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Нарадзілася 10 мая 1991 года ў Полацку. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны. Неаднойчы спрабавала сябе і ў музыцы, і ў выяўленчым мастацтве, але, магчыма, лёсам было наканавана атрымаць сапраўдную асалоду ад сяброўства з беларускай літаратурай. У 2009 годзе паступіла ў БДТУ.

У зямлянцы (трыпціх)

Два сябры ў зямлянцы

– Трэба ісці.
– Пачакаем.
– Нельга. Ужо грыміць.
– Ведаю… але…
– Мы разам, а значыць,
Перамога на нашым баку.

Тут, на вайне, ён – безыменны,
Ідзе па полі зноў салдат,
Нібы праз калідор крывавы,
Улева, управа крок – разрад…

Іскрынку ловіць шэрых воч
Таварыш, хутка абдымае,
Крычыць, не верыць, што навекі
Дзяцінства сябра пакідае.

Цяпер не зможа адрачыся
Яго ўжо злосная душа
Ад «дыялога» са зверам-немцам;
Не спіць, чакае зацішша.

Маці і дзіця ў зямлянцы

– Мама, даражэнькая!
– Не плач, цішэй.
– Мне страшна,
Там штосьці грыміць.
– Я цябе ніколі не пакіну.

Зямля ўжо не пад нагамі,
Кудысь апошняя хвіліна
Кругамі праз яго ідзе.
Ён робіць крок назад – і міна.

І да малога бяжыць маці,,
У вішнёвым кампоце крыві
Сядзіць, дрыжыць ад прыгавору
І ўзнімае з думкай бровы.

Зачараваны нейкі злоснік
Узяў «жалезныя нажніцы»,
Малому адной рукой толькі
Адрэзаў для жыцця крыніцы.

Дзяўчына і хлопец у зямлянцы

– Чуеш?
– Зноў грыміць.
– Зноў… у мяне
Дрэннае адчуванне.
– Дарэмна, каханая,
Бо я з табой.

Як павуціннем белым-белым
Накрыла іх рэальнасць гэта.
Яна – вясковая дзяўчына…
Імгненне – выстрал. Вайны мэта.

Убачыць ён надзеі позірк
У дзявочым твары ўсё ж паспеў.
Магутнасць знікла, замест веры
З'явіўся воўчы дзікі спеў.

Што засталося ў хлопца?
Зусім без сэнсу лёс зламаны,
Вайной і ворагам нікчэмным
Яму, шчасліўцу, дараваны.

Галіна ЛУКША

Госць клуба

Нарадзілася ў 1934 годзе, у вёсцы Зарэчча Лапіцкага сельсавета Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны была вязнем. У 1952 годзе скончыла Лапіцкую сярэднюю школу, у 1957 – Беларускі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці інжынер хімік-тэхнолаг сілікатнай прамысловасці. Працавала 1957–1959 гадах у Чэлябінску ва Уральскам філіяле акадэміі навук СССР. З 1959 па 1993 год працавала ў Маладзечанскім будаўнічым трэсце на заводах ЖБК і ва ўпраўленні на пасадах галоўнага тэхнолага, начальніка вытворчага аддзела, начальніка лабараторыі.

Вершы не друкавала, піша з 1998 года. Пенсіянерка. Удава, мае дзяцей, унукаў, праўнукаў.

* * *

Мы завяршаем подзвіг-сказ,
Мы — дзеці, вязні той вайны.
Былінай адыходзіць час,
І мы з тае пары — адны.
Салдат, што з Брэста пачынаў,
Што першы ў крэпасці ляжыць,
Што безыменна прападаў,
Што шчэ ў кліне не ляціць —
Нам помнік — родная зямля,
Кут вечны, сэрцу дарагі,
Беларусоў адна сям'я,
У космасе — бягі-кругі…
І прыціскае да грудзей —
Усім хапае месца тут —
І прашчураў, і усіх людзей,
Хто зберагае родны кут.
Мая гарэтная зямля,
Заўчасных тут напластавана,
А колькі лётае каля
Ад пажарышчаў планаваных.
І немаўлятачкаў святых,
Ні перад кім не вінаватых.
Біць супляменнікаў сваіх?
Зямлёй у космасе пачатых...
Зацюканая дабрыня.
Час над бяссмерцем працаваць.
Прагрэс і людскасць — вышыня,
Жыццё, каб жыць, не выжываць.

4.02.2005 г.

Курган Славы

На кургане цвіце сасна,
У руках яе заўсёды свечкі,
Распальвае іх вясна,
Як плату за чужыя спрэчкі.
Нібыта з глыбіні лясоў
Ад партызанаў неадпетых
Лунае дух барацьбітоў,
Што зберагліРадзіму Свету.
На Курган Славы ўзыдзі,
Застанься нараўне спакою,
Зямля на вышыні душы
Сувымяральна з вышынёю.
Таму ёй вечна памятаць
Травінкай кожнай, багнай кожнай:
Раз аднойчы гінуць можна,
Скажы — устануць памяраць.

848191
БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта

На каравуле з ёй стаім
Сумлення ля бярозаў, соснаў,
Айчыну беражом пры тым
І ўсю зямную людскасць вёснаў.

Мігаюць зоркі ў цішыню,
Як вочы слаўнага Сусвету.
Сніць Курган Славы дабрыню
Нятленнай памяцю планеты.

11.02.2005 г.

Трохвугольнік

Трохвугольнік! Шчасця колькі!
Вестка добрая-надзея,
Як прамень ад блізкай зоркі
Абяцае, душу грэе.
Бядою вёска гаманіла,
Збягаліся пачуць, што піша,
Радасць у далоні біла —
З'явілася і наша крыша.
У нас той слаўны трохвугольнік,
Чаканы безнадзейна доўга
З канцлагера — ў тунэлі промнік —
Засмяяўся ля парога.

Не ўсе, што разам гаравалі,
Ажылі па сваіх хатах.
Наўрад ці іх шукаць спяшалі
Вызваліцелі-салдаты.
Няхай сабе, абы жывыя.
Жыў чалавек і жыць застаўся.
Не бяды, хай боже крые,
Ён дабіваў, ты вызваляўся.
І вось! Праз шэсцьдзесят гадоў
Трохвугольнік друкаваны,
Як вестка светлая з франтоў,
Татуля, мне прэзентаваны.

Напамін, што памяць ёсць!
Айчына родная не кіне,
Подзвіг і святое штось
Часы яднае, не загіне.

15.05.05 г.

Песня жыцця

Дачакаліся — прыйшлі,
Вярнуліся... Нашто аддалі?
Ды гэта после, мо калі,
Цяпер у радасці спявалі,
Рамонкамі ўслед кідалі.
Малады хлапец — салдат
Струной-гітарай завалодаў,
У гурт сабраў сірот-дзяўчат —
І вечарына з тых нагодаў.
Радасць, шчасце цераз край,
Душа, забыўшыся, спявае,
Маладосць, жыццёвы рай —
Сама сябе апераджае.
Колькі радасці ў адну —
Вызвалены абаронцы,
Пераступілі праз вайну,
Рэха абганяе сонца.

І лунае з веку ў век
Шчасце жыць на белым свеце,
Тады спявае Чалавек,
Як Мір на сонечнай планеце.
Песня сабірае хор
Пахнюткі, бы душы цвіценне?
І неадступна мкне да зор,
Да іх таемнага значэння.
Хваля ў чалавечы рост
Адзіным подыхам з'яднала
Будучыню і ўчарашні хвост,
Што «Кацюша» адкрамсала.
Але і хуценькі адкат —
Водгук валацугі-смерці,
Які з пажарышчамі лад?
Шчэ не хаваны кожны трэці.

Ужо і слёзы не цякуць,
За смерці час жыццё ў адказе.
Чаму заўчасна людзі мруць,
Чым апраўдаць ў кожным разе?

7.05.07 г.

Векавечныя помнікі

Усё памлела навакол
Пад летнім сонейкам пякучым,
І гнецца лісцейка на дол
У сумным роздуме дрымучым.
Ды неяк разам пацямнела,
Паўнеба хмара заняла,
Віхура збоку наляцела,
Закружыла, замяла.
Усе травінкі, лісце дрэваў
Загаманілі, загулі,
Пугаючыся ветра рэваў
І тулячыся да зямлі.
Вось першыя дажджынкі-дзеці
Вялікія і па адной
Насцігнулі Зямельку-Маці
І ўлягліся на пакой.
А мы, блазнота ўся малая,
Бягом па хатах хто куды.
Матуля дзверы адчыняе,
Крычыць: «Хутчэй сюды, сюды».
Як куранят нас сабірае,
Крыху прамоклых ды ўсіх,
У печы юшку зачыняе,
Пярун каб часам не насціг.
А вецер круціць і рагоча,
Гром грыміць над галавой,
Ён быццам перунамі хоча
Расчыніць, што над табой.
У вокны б'ецца і шчыруе,
Палошча неба ўсё падрад,
Пэўна радасць падаруе,
Бо чысціць агарод і сад.
А нам, сабраўшыся ў хаце,
Душой прыемна адчуваць
Спакой цяпла ля роднай маці...
Хоць нічагуткі не відаць.
Ды памаленьку ўсё сціхае,
Гром бурчыць ужо здалёк,
А неба зрэдку палыхае,
Дождж супыняецца. Прамок
Лісточак, лес, садок, лужок,
Зямля і неба, каласок
І травінка-муражынка,
Нават рэчкі беражок.
Сонца раптам азарыла
Усю зямную прыгажосць
І каронай адарыла
Небасхіла маладосць.
Заіграліся краскі неба
На ўтоках прамянёў,
Шчэбет птушак, гоман хлеба
Каля вымытых садоў.
Нахлашч вокны, дзверы ў хаце!
Водар кветак дажджавы,
Звон птушыны, смех дзяціны!
Поўна неба сінявы!
Бягом па навадзях мурожных!
Пляскочаш басанож мурог!
І неба ў лужынах дарожных,
А пырскі радугай з-пад ног!
І спеў душы сярод трывог.
Спакон вякоў усё так было.
Было, ды зеллем парасло...
А гэта бытнасць векавая
Нам помнікам і прабывае.

Люты 1998 г.

Кацярына РЫБАКОВА

Студэнтка факультэта лясной гаспадаркі (ЛГФ)

Нарадзілася 24 жніўня 1989 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. Закончыла восем класаў Горацкай гімназіі № 1 і курс па класе фартэпіяна. Займалася ў Горацкай школе рамёстваў кірамікай, жывапісам, малюнкам. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Магілёўскім дзяржаўным абласным тэхнічным ліцэі № 3 па эканамічна-прававым профілі. Закончыла Магілёўскую школу мастацтваў. У 2006 годзе паступіла ў БДТУ на спецыяльнасць «Інжынер лясной гаспадаркі».

Память о войне

Мир меняется… Меняемся и мы.
Но знаем,
Что сквозь время пронести должны
Ту память,
Что в сердцах людей
Живёт и наполняет смыслом
Мгновенья тех суровых дней.
Ведь время это – это ЖИЗНЬ всех тех,
Чьи имена вовеки искупают
Тот ВСЕМИРНЫЙ грех.
Нельзя забыть о нём никак:
Он – ЖИЗНЬ…
Свершился он не просто так.
Ведь погибали же за что-то?
Не правда ли? Ведь это не пустяк?
Ведь война для многих –
И начало жизни, и её конец.
О другом не знали,
Но мечтали…
Поступали так, как поступал отец.
Просто жили, воевали…
Война – великая утрата.
Война – большая боль,
Не ждавшая взросленья брата,
Не говорившая, когда последний бой.
Не будем забывать об этом.
И подойдя к руине из камней,
Услышим, как поют они дуэтом
О событиях минувших дней.

Пусть отголосок этой песни еле слышный,
Прочувствовав его,
Мы пронести должны
Ту память,
Что в сердцах людей
Живёт и наполняет смыслом
Мгновенья тех суровых дней.

Путь к мечте...

Совсем юнцом он был,
Когда пришлось взять в руки автомат,
Совсем юна она была,
Когда оделась в беленький халат.

Их две судьбы слились в единый путь,
Как множество других,
Лишь пройденный совсем чуть-чуть,
Не знавших боли от потери близких и родных.

Их путь дать выбор им не мог.
Их грёзы и мечты
Упали с неба в свежий ров
И были спрятаны в бинты.

А он ни разу не впускал в душу намёк,
Как не могла и знать она,
Что палец ляжет на курок,
Что вдруг найдутся силы вытащить бойца…

Не раз он прикрывал своих ребят,
Не раз она сшивала нити жизней…
Боролись за одну из всех наград –
За мир, в котором их мечты опять возникнут.

А как же звать Его, ЕЁ?
Они имеют множество имён.
А путь, который все они прошли,
Зовётся коротко – войной…

Отдав так много сил и пережив утрату,
Они вернули всем возможность вновь мечтать,
Отвоевали главную награду,
Позволившую людям выбирать.

Цена победы очень велика,
И заплатили за неё сполна,
Поэтому теперь наш долг, чтоб Он или Она
Не знали больше, что за путь такой война…

Аляксей САЛАМОНАЎ

Доктар тэхнічных навук, прафесар, навуковы кіраўнік асацыяцыі геадэзістаў і картографаў Беларусі, вядомы беларускі публіцыст. Закончыў інжынерна-землеўпарадкавальны факультэт БСГА ў 1951 годзе. У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце працаваў з 1974, года быў загадчыкам кафедры лесаўпарадкавання, дырэктарам універсітэта беларускай мовы, гісторыі і культуры пры БДТУ. Пенсіянер.Ветэран вайны і працы.

Та победа нужна была миру!

Там кругом были смерть и потери,
В нас — усталость, валившая с ног,
А войны ж мы совсем не хотели —
Идиот лишь желать её мог.
Но Победа нужна была Миру,—
Честь должна была мразь укротить.
И нельзя забывать в это веру —
Без неё не смогли победить!
И так больно бывает мне видеть
Колкий взгляд на тех старых солдат.
Нет! Нельзя даже в мыслях обидеть
Мир спасавших не ради наград!
В том аду они сердцем познали
Жизни ценности, их красоту
И другим, как смогли, передали,
Чтоб любили Ум, Труд, Доброту.
Это люди когда-то исполнят,
Войны вместе совсем изведут,
Добротой свои души наполнят
И по умным дорогам пойдут.
Вот тогда мировые проблемы
И без войн можно будет решать
Ведь за их исполнение все мы
Перед Богом должны отвечать!!!

09.05.2006 г.

Была ў нас адна Перамога

Была ў нас адна Перамога,
Адно вызваленне было,
І гора тады ля парога
Па-рознаму ўсюды жыло.
Вар'яцтва ў той час бушавала
Другою сусветнай вайной —
Зямля ўся балюча стагнала,
Залітая потам, крывёй.
Дыбілася мора вадою
І неба рычала агнём,
А смерць ўсё знішчала сабою ,
Ў страшэнным абліччы сваім.
З лепшаю часткай людскою
Беларусь у тым кашмары была.
Яна мужнасцю, усёю сабою
Перамозе той многа дала.
Была і Амерыка з намі
(Без яе б Перамозе не быць),
А канадцы ўліліся ў бойку самі,
Каб прагрэсу людскому служыць.
У тым смерчы сцяною адною
Мы супраць фашызму былі
З мэтай вялікай святою
Перамогу над ім здабылі.
А таму непрыстойна спрачацца —
Перамогу па частках дзяліць,
Бо з фашызмам ахвярна змагацца
Ішлі лепшыя людзі, каб быць.

09.05.2007 г.

Вайна з душы маёй глядзіць

Пакуль жыву, пакуль дышу
Боль той вайны ў душы нашу.
Яна з асколкамі туды
Агнём убіта назаўжды.
Але не проста там сядзіць,
А сочыць пільна і глядзіць,
Каб мы па Розуме жылі,
Не ваяўнічымі былі.
Каб беларускасці святой
Маглі аддаць мы гонар свой,
Каб самастойнасць ва ўсім
Надаць Радзіме назусім...

09.05.2008 г.

Войны ў мінулым трэба пакінуць

Я вайны кожны міг адчуваю,
Яе раны ў пакутах нашу.
Вось чаму ўсіх людзей заклікаю
Жыць без войнаў — душою прашу.
Азірніцеся ў дымку мінулых,
Безупынных крывавых вякоў.
Там знайдзіце сваіх вельмі чулых
І зыходных для вас сваякоў.
Яны больш не жылі, ваявалі
Там з пакутамі ў бойках ліхіх,
Усю сутнасць тых боек пазналі
У змаганнях са зброяй другіх.
Продкі змогуць маўклівай сцяною
З тых вякоў перад намі паўстаць,
Каб з суровай праўдай сваю
Нам наступную думку сказаць:
«Не сячыце сякерай Планету,
Яе нельга ніяк руйнаваць,
Бо ад Бога яна. Усяму свету,
Трэба разам яе зберагаць!
Для таго ў намаганнях стварыце
Звышмагутны сяброўскі закон.
У ім прыстойна вы ўсім пакажыце,
Як павінен яднаць людзей ён.
Ды так, каб родныя ўсе мовы
Нам з павагай ва ўсім зберагаць,
Бо ад Бога ў іх ёсць павучанняў асновы,
Як жыццю сэнс прыстойны даваць.
І шляхі для ўсіх адшукайце,
Як няцеснай Планету зрабіць,
Па-кітайску вы згоду стварайце,
Каб утульна ў агульнасці жыць».

21.06.2008 г.

Алена СТАДОЛЬНІК

Студэнтка інжынерна-эканамічнага факультэта (ІЭФ)

Стадольнік Алена Юр'еўна. Нарадзілася ў вёсцы Параф'янава Докшыцкага раёна Віцебская вобласці. Маці — настаўніца пачатковых класаў Заборцаўскай базавай школы, тата працуе ў «Докшыцырайгазе». Алена актыўны і вясёлы чалавек. Па жыцці яна ідзе з усмешкай. У апошнія гады зацікавілася лёсам Беларусі ў гады вайны.

Перамога

65 гадоў ужо мінула,
Сэрца, здаецца, не плача ўначы,
Але колькі людзей вайна падманула.
Успомні ты і падлічы.
Многа маленькіх дзетак забіта,
Якія не здзейснілі мар.
Нехта з іх жадаў цацку-камету,
Нехта — паветраны шар…
Хачу ў партызаны, хачу!
Крычаў хлапчук салдату,
Бо немцы забілі мамку маю,
Татку майго і брата.
Хачу я помсціць за родных сваіх,
За лёс Беларусі і долю.
Хачу,каб быў толькі мір на Зямлі.
Вайны не было ніколі.
Пайшоў на вайну …
І не баяўся смерці,
Хацелася яму адпомсціць за народ.
Ён сын Зямлі,сын Беларусі.
Радзімы нашай патрыёт.
Ваяваў ён зімой і летам,
І ў спякоту, і ў мароз.
Праз цяжкі час, нялёгкі лёс,
Да нас ён перамогу нёс!!!

Вайна...

Вайна….
Чаму такая жудасная ты???
А колькі жыццяў ты забрала ?!
Мне б палічыць!
Дык часу вельмі мала…
Колькі люду палягло!!!
У палях, крывёй залітых,
Колькі хлопцаў маладых,
Засталіся інваліды!
Мой прадзед на вайне быў,
Міхаілам звaўся.
Куляй быў паранены,
Але жыць застаўся!!!
Расказваў прадзед…гэтай
Вайны жахі, як немцы
Здзекаваліся з людзей
Палілі хаты, дахі…
Казаў, што жанчынку адну.
У хляўчуку закрылі
Хлеўчук саляркай аблілі,
А потым…падпалілі!!!
Ды многіх, многіх так людзей
Фашысты катавалі.
Бацькоў палілі і дзяцей,
Іх жыцці адбіралі…
Як цяжка думаць…
Сэрца дугае ад болю…
Мая Радзіма Беларусь,
Навекі я з табою…

Наталля СЯДЗЕЛЬНІК

Факультэт выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Выпускніца 2009 года. Усе пяць год была актыўным удзельнікам літаратурнага клуба «Ветліца».

Маці салдата

Чорны цень на сцяне нерухомы,
Колькі часу ён тут — не злічыць,
Гэты вобраз да болю знаёмы:
Гэта маці салдата сядзіць.

Пачалася вайна нечакана,
Немец мусіў усё знішчаць.
Маці з сынам вяла размову,
Ён сказаў: «Я пайду ваяваць!

Хопіць гэтым бязлітасным ворагам,
Спальваць вёскі, людзей забіваць,
Каб паветра не пахла порахам,
Я жыццё сваё згодзен аддаць!»

«Мой сыночак, табе з маленства
Я пяшчоту дарыла, любоў,
А цяпер ты мяне пакідаеш,
Невядома на колькі гадкоў».

Абняў яе хлопец: «Матуля,
Пайду, ты мне выбачай.
Вайна скончыцца, я і адразу
Вярнуся дадому — чакай!»

Столькі дзён і начэй бяссонных,
Пасівелі зусім валасы,
Шмат маршчынаў на твары з'явілася,
Зніклі рысы былой красы.

Вось і восень прыйшла залатая,
З жахліваю весткай на крылах...
Сядзіць маці, нібы нежывая,
Халадок прабягае па жылах.

Страшэнны боль сціскае грудзі,
Самотак дыхаць не дае,
Сыночка побач больш не будзе,
Забілі немцы на вайне.

Аляксандр ХОЛАДАЎ

Студэнт факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

Нарадзіўся ў 1989 годзе. Вучыўся ў СШ № 42 і № 19 горада Мінска. Неад'емныя складнікі жыцця: кінематограф, ваенна-гістарычная рэканструкцыя, музыка, фатаграфія. За ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф» атрымаў дыплом Міністэрства адукацыі I ступені ў намінацыі «Паэзія» (2010 г.)

Военным корреспондентам

Войну мы видим их глазами…
Её поблекший, тусклый свет,
С его последними часами
И с начинавшими рассвет.
Здесь в кадре – смерть,
Здесь в кадре – ярость,
Здесь – отдых, неглубокий сон,
И преждевременная старость
Тех, кто от смерти был спасён.
Немало было их на фронте,
Не меньше гибло, чем иных...
И легкомысленно не троньте
Честь летописцев фронтовых,
Кто шёл в атаку с объективом,
А уходил, оставив след
Несохранённым негативом,
Как память уходящих лет,
Не думал о людских наградах,
Там было просто не до них…
Он меж разрывами снарядов
Писал историю живых.
Живых… Что значит это слово,
Одну ли жизнь в привычном дне?
Нет, не одну: воскреснут снова
Дотла сгоревшие в огне.
Воскреснут в строчке, песне, слове
И в фотографиях войны
Под Минском, в Киеве и Пскове
Отцов достойные сыны.
Но не забудем и о людях,
Что память нашу сберегли.
И те, кто есть, для тех, кто будет,
Источник Правды обрели.

***

Раздали всё: оружие, патроны,
Гранаты на ремнях висят уже,
И снова в бой уходят батальоны,
Чтоб смерть разбить на дальнем рубеже.
Она везде – за обгоревшим танком,
За выбитыми окнами домов,
За опрокинутым от горя полустанком,
За пеленой, где не хватает слов.

Не нужно слов – осталась только ярость…
Она в обоймах, на концах штыков.
И лишь одна задача нам осталась:
Спасти весь мир от проклятых оков…

И мы уйдём туманом предрассветным,
Вернёмся, лишь улягутся разрывы.
А тех, кто здесь, мы просим о заветном:
«Не предавайте нас, пока мы живы!»

***

Он был последним на планете,
Кто был убит на той войне.
Когда весна на этом свете,
Погибнуть тяжело вдвойне.
Над домом, где упал он мёртвым,
Давно уж реял белый флаг,
Рейхстаг разбит обстрелом плотным,
Остался предпоследний шаг…
И выстрела никто не слышал:
Повсюду радостный салют.
Был человек – и вот, не дышит,
И письма больше не дойдут.

Всего лишь час назад, в атаке,
Он мог, схвативши пулю в грудь,
В безжалостной последней драке
Упасть и навсегда уснуть.
Но всё иначе: мир спасенный
Не до конца ещё остыл
И вместо ордена солдата
Последней пулей наградил.
Пусть этот случай помнит каждый,
В нём вся безжалостность войны:
Она, начатая однажды,
Не признаёт своей вины.

***

Тот день нас громом оглушил,
Но не орудий и разрывов…
Лишь тишины осевшей пыль
Будила тех, кто были живы.

И из-под каски посмотрев
На солнце, вставшее навеки,
Сошли, надежду отогрев,
Людской беды лихие реки.

Четыре года погибая
В полях, окопах под огнём,
В страданьях веру воскрешая...
Мы снова вспомнили о Нём.

Он был с солдатами под Ельней,
Он укреплял, являя крест…

Весенним днём в берлинском парке
Нам слышится: «Христос Воскрес!»

***

Говорят, что «пережил войну» …
Знаю лишь, что пережил себя.
Не оставшись ни в каком плену,
Продолжаешь, жизни не любя
Как любить, кого и почему,
Если в сердце – сломанный штык-нож?
Говорят, что «пережил войну»,
Что теперь ещё переживёшь?
Что там было, сможешь ли сказать,
Тем, кто не был там и позабыл,
Или даже не хотел и знать,
Постыдясь за свой угасший пыл?
Я хочу, чтоб ты вернулся вновь
К новой жизни, прерванной вчера,
К бою за надежду и любовь,
Что б ни говорили доктора.

КАЦЯРЫНА ЦІХАНКОВА

Студэнтка лесагаспадарчага факультэта (ЛГФ)

Нарадзілася ў 1992 годзе ў горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці. З дзяцінства вызначалася цікаўнасцю. Любіць творы Горкага, Вішнеўскага, Цвятаевай. У паэзіі найбольш цікавіцца творамі сімвалістаў і футурыстаў, любіць музыку, фатаграфію, падарожжы.

***

Ветераны. Отвоевали Волю.
Отдавали секунды горю:
Ведь времени нет для боли.
А как розовеют зори,
Когда под ними – море
Из алой-алой крови!
А память героев бессмертна:
Они ведь все в сердце живы.

Войной глупый путь начертан:
Нажива ведёт в могилы.
Хотела бы я стать чёртом –
И всех виноватых – на вилы!

Алена Чарнянок

Студэнтка факультэта тэхналогіі арганічных рэчываў (ТАР)

Нарадзілася 1 мая 1990 года ў Мінску. Вучылася ў хіміка-біялагічным класе 52 сярэдняй школы. У 2008 годзе паступіла ў БДТУ.

Першая спроба пяра адбылася ў дзевяць гадоў. З дзяцінства любіць Беларусь, яе навакольле, пявучую і пяшчотную мову. Менавіта таму і піша свае творы. Для разнастайнасці кладзе вершы на музыку і спявае іх пад гітару. Напрыклад, песню «Беларусь» чулі не толькі у Мінску, але і за яго межамі. А верш «Мая маленькая Радзіма… » быў прачытаны на беларускім радыё. Яна ганарыцца Радзімай, лічыць сябе патрыёткай і імкнецца захаваць непаўторнасць Беларусі.

***

Шумяць,бягуць і ззяюць рэкі,
Вады крышталь яны нясуць.
Чаму люблю вандроўніц гэтых?
Бо тыя рэкі – Беларусь.
Лугоў духмяны пах чаруе,
Пшанічны водар вее тут.
Чаму паветра так люблю я?
Бо гэты вецер – родны кут.
Павольна ў небе плывуць хмары,
Здалёк чуваць і грому гук.
Чые яны хаваюць мары?
Усе думкі Бацькаўшчыны тут.
Вось будні дзень – пара заняткаў,
Чуваць дзяцей шчаслівы смех.
У чым цана такіх зярняткаў?
Дзяржавы гэта нашай хлеб.
Наступіць вечар, усё сціхае,
Гарыць у вокнах цёплае святло.
Што яно далей абяцае?
Радзімы нашай мірнае жыццё. *(2007 г.)*

Вольга БАГРАВЕЦ

Студэнтка факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

Вайна! Якое страшэннае слова! Колькі гора яна прынесла беларускаму народу! У часы вайны людзі не ведалі, што такое шчасце, радасць, яны бачылі толькі выбухі, дым, смерць. І гэты жудасны час перажыла мая бабуля. Калі пачалася вайна, ёй споўнілася дванаццаць год. Сям'я была вялікая, аж восем дзяцей. Маці выхоўвала дзяцей адна, бацькі не было.

Вайна пачалася, але да іхняй вёскі немцы яшчэ не дайшлі. Яны жылі спакойна, добра, але ім станавілася вельмі страшна, бо ведалі, што па іх зямлі ідзе вайна, што могуць у любы момант згубіць сваіх родных і загінуць самі.

І вось настала тая страшэнная хвіліна, калі гэта адбылося. Усе дзеці і маці былі ў хаце, калі нечакана пачуўся крык.

– «Немцы! Людзі, уцякайце!» Маці выбегла на двор, а там удалечыні было відаць, што сапраўды нямецкія танкі рухаюцца ў бок вёскі Зембін. Маці, узяўшы ў кішэню акрайчык хлеба, апрануўшы дзяцей, выбегла з хаты і разам з дзецьмі пабегла ў лес. А немцы ў той час якраз падыходзілі да вёскі. І вось так адбывалася кожны раз, калі ворагі падыходзілі да Зембіна.

А яшчэ бабуля расказвала, як у час вайны яны галадалі. Калі прыходзіла восень, яны збіралі бульбу і потым складвалі яе ў зямлянкі. І аднойчы, калі бабуліну хату спалілі і сям'я жыла ў зямлянцы, прыйшлі немцы і знайшлі тое месца, дзе жыла маці з дзецьмі і дзе ляжала бульба. Гэтыя дзве зямлянкі былі побач. Немцы падышлі да той зямлянкі, дзе ляжаў ураджай і пачалі крычаць:

– Русіш, вылазь! – кінуўшы гранату ў тую зямлянку, дзе ляжала бульба. Уся бульбачка, якую з такой стараннасцю збіралі, у адзін момант знікла.

Хоць і прайшло шмат часу, але ў душы кожнага чалавека, які бачыў тыя жудасныя хвіліны вайны, яны застануцца назаўсёды. І бабуля, расказваючы нам, сваім унукам, пра перажытае ў гады мінулай вайны, заўсёды хвалюецца, на яе вачах выступаюць слёзы, ёй перахоплівае дыханне… І мы адчуваем, якое гэта было гора, і мы спачуваем бабулі.

Вольга БАРЭЛЬ

Студэнтка факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі (ХТіТ)

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

З дня заканчэння вайны прайшло амаль 65 гадоў. Але і да гэтага часу пякучым болем адклікаецца найцяжэйшая з войнаў у сэрцы кожнага чалавека. Мы не павінны забываць пра жахі вайны, пра смерць мільёнаў людзей. Памятаць пра вайну, гераізм і мужнасць тых, хто змагаўся з ворагамі, ратаваў нашу Радзіму ад фашыстаў, — гэта значыць змагацца за мір. Гэта абавязак усіх, хто жыве на зямлі.

Вялікая Айчынная вайна закранула многіх людзей, прынесла амаль у кожны дом гора.

Не абмінула яна і нашу сям'ю. Мой прадзед, Русак Мікалай, быў удзельнікам вайны. Ён з першых дзён быў на фронце, прайшоў тысячы вёрст франтавых дарог. У самыя цяжкія дні ён марыў аб тым, што сустрэнецца з роднымі. На жаль, яго мары не здзейсніліся, ён загінуў. Загінуў як герой, абараняючы сваю вёску Дабраволя. Гэта вёсачка і зараз знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці Свіслацкага раёна, каля Белавежскай пушчы. Вуліца, на якой ён жыў, і да гэтага часу носіць назву «вуліца Мікалая Русака». Яна названа ў гонар чалавека, які аддаў сваё жыццё за родную зямлю, за родных людзей. Мая бабуля, яго дачка, зараз жыве на гэтай вуліцы, і на яе доме вісіць чырвоная зорачка, як знак, што ў гэтым доме жыў чалавек, які загінуў у час вайны.

Я спадзяюся, што такой жудаснай вайны больш ніколі не будзе, і нікому з нас не прыйдзецца губляць родных людзей.

Наталля ВАЛАСАЧ

Студэнтка факультэта тэхналогіі арганічных рэчываў (ТАР)

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

Была вайна з фашыстамі. Крывавая і страшная. Рушыліся ад бомбаў гарады. Гарэлі вёскі. Загінулі мільёны людзей. Вораг паліў і расстрэльваў дзяцей. За гады акупацыі людзі перажылі такое, аб чым яны будуць успамінаць стагоддзямі. Шмат чаго страшнага і несправядлівага людзі пабачылі за гэты час. Але дзякуючы нашым дзядам і прадзедам, смелым, вынаходлівым, бясстрашным, цвёрдым воляю, дужым

сваёй верай у перамогу над ворагам, яны змаглі зламіць вар'ятаў-разбойнікаў, якія марылі аб сваім панаванні над народамі, аб устанаўленні сваёй улады над светам.

Ці можна забыць гэту вайну? Ці маем мы права не ведаць такую балючую быль?

Мой прадзед, як і ўсе, калі пачалася вайна, пайшоў ваяваць. Ён не змог застацца дома. Хоць там ён пакінуў жонку і чацвёра дзяцей: траіх хлопчыкаў і адну дзячынку. Радзіме былі патрэбныя смелыя, дужыя, вынаходлівыя людзі. Ён пайшоў ваяваць за тых, хто застаўся дома, за тых, каго ў будучыні будуць чакаць ціхія і спакойныя ночы, сонечныя дні і бацькоўская ласка. Мой прадзед так і не змог даведацца, ці збыліся яго мары. Ён загінуў…

Цяжка жылося маёй бабулі пасля вайны, але яна змагла знайсці ў сабе сілы, каб перажыць гэты боль. Дапамагалі ёй у гэтым суседзі. Але пакуты яе не закончыліся.

Аднойчы ў восеньскі сонечны дзянёк хлопчыкі адправіліся ў арэхі. Яны нават і не ведалі, што іх чакае наперадзе. Дзеці бегалі і гулялі ў партызан. І вось адзін з хлопчыкаў знайшоў боегалоўку. Кожны з дзяцей хацеў паглядзець на гэтую жалезную цацку. Але гульня аказалася трагічнай. Раздаўся выбух. Дзеці ўбачылі скрываўленага сябра. Гэта быў сын маёй бабулі.

Цяжка ўявіць, што перажыла мая бабуля, калі даведалася, што яе старэйшы сын стаў інвалідам і назаўсёды развітаўся з вачыма. Гэта было яшчэ адным выпрабаваннем на яе нялёгкім шляху.

Вайна закончылася, але нават пасля яе людзі не сталі жыць спакойна. Дзясяткі дарослых і дзяцей падрываліся на мінах. Дзеці, не ведаючы, які страшны боль могуць прынесці гэтыя «цацкі»: міны, гранаты, патроны – гуляюць у іх да нашых дзён, хоць ужо прайшло 65 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Мне здаецца, што кожны з нас павінен усім сваім жыццём адстойваць добрае, справядлівае, за што змагаліся нашы продкі, на чым вякамі трымалася жыццё, каб вайна зноў не прыйшла ў нашы сем'і, каб не загінула гэта блакітная кветка Сусвету – Зямля.

Лізавета ГУНЯЖЭНКА

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Вялікая Айчынная вайна ў жыцці майго дзядулі

Эсэ-ўспамін

Я хачу прысвяціць гэтыя радкі майму дзядулю, Гуняжэнку Эрасту Фёдаравічу, ён заслугоўвае гэтага. Мой дзядуля ветэран Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

Дзядуля пражыў цяжкае жыццё. Самым складаным выпрабаваннем для яго, як і для ўсіх савецкіх людзей, была Вялікая Айчынная вайна, якая прынесла жах, страты і боль. Дзядуля з годнасцю прайшоў праз жудасныя ваенныя гады. Ён адважна ваяваў, удзельнічаў у вызваленні Беларусі, у баях у Кітаі. Дзядуля скончыў вайсковую службу ў званні старшага сяржанта. За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне быў узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», за ўдзел у баявых дзеяннях супраць японскіх імперыялістаў узнагароджаны медалём «За перамогу над Японіяй», за адвагу і мужнасць, якія былі праяўлены ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў узнагароджаны ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені, узнагароджаны медалём імя Жукава.

Але і пасля вайны, калі дзядуля скончыў вайсковую службу, ён змагаўся за аднаўленне сваёй краіны, за будучыню сваёй сям'і. Шмат гадоў ён шчыра і сумленна працаваў, быў ударнікам працы, пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. Яго працоўная дзейнасць была адзначана знакам «Ударнік адзінаццатай пяцігодкі», знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва», за доўгую сумленную працу быў узнагароджаны медалём «Ветэран працы».

Я ведаю дзядулю як добрага, сумленнага, шчырага чалавека, які заўсёды дапаможа, як чалавека вясёлага, які любіць пажартаваць. Калі дзядуля стаў пенсіянерам, ён працягваў працаваць, каб дапамагчы сваёй сям'і. Ён выхаваў чатырох дзяцей, восем унукаў, убачыў двух праўнукаў. Зараз яму 82 гады, ён працягвае дапамагаць сваім дзецям і ўнукам, і адзінае, чаго ён баіцца, — не мець магчымасці дапамагчы. Уся наша сям'я вельмі любіць дзядулю, і мы вельмі рады, што ён у нас ёсць.

Калі я пачынала пісаць гэтую працу, ведала, што дзядулю будзе цяжка распавядаць мне пра вайну, пра сваё мінулае. Яму ўжо вельмі шмат гадоў, але ўспаміны пра вайну і да гэтага часу засталіся такімі ж балючымі і вострымі, якімі былі шмат гадоў таму. Таму я проста папрасіла дзядулю трошкі распавесці пра вайну. Калі ён пачуў маю просьбу, некалькі хвілін моўчкі глядзеў на мяне, потым пачаў распавядаць. У канцы свайго аповеду ён заплакаў.

Вось што дзядула рассказаў мне:

«Во время войны я работал на кожгалантерейной фабрике в столовой кухонным рабочим. Туда меня муж маминой сестры устроил — дядя Петя. В этой столовой немцы обедали бесплатно, а я еду воровал. Я то кашу унесу, то мясо, то сахар. Я вставал в 4 утра, чтобы на работу прийти. Мне нужно было идти пешком со Свердлова. Вот утром я туда приходил, дрова рубил (их я тоже воровал — надо было чем-то печь топить дома, я их через забор перекидывал и тащил потом домой), воду носил в большие котлы, топил печи, чтобы к тому времени, как приходили повара, вода уже кипела. Иногда, когда рубили мясо, я из костей мозг доставал и уносил потихоньку: у меня был трёхлитровый глиняный кувшин, так я в него жир складывал, сверху кашей прикрывал и таким образом проносил мимо поста, — нужно было что-то есть, кормить сестру и мать с братом.

Мама у меня работала в политехническом институте уборщицей, но какая зарплата у уборщицы… Потом как заболела (у неё были проблемы с ногами)

стала в студенческом общежитии работать вахтёршей… Она всех студентов в лицо знала. Я водил её туда каждое утро.

Так мы и жили. Потом, когда освободили Минск, меня призвали в армию. Мне было тогда 19 лет. Родные собрали меня как могли: дали еду, что дома была, бельё какое-никакое и одежду…

Призвали меня, а потом отправили в Лиду… Лида тогда горела — немец отступал и мы его громили… Я попал в резервный батальон. Так мы и шли, наступая на немцев. Потом наш батальон отправили в Латвию, чтобы мы присоединились к гарнизону на границе Советского Союза и Германии.

Помню, когда мы шли по Беловежской пуще пешком, я продал боты и шел босиком, так сильно наколол ноги, что они загноились и я не мог идти… Мой батальон проходил мимо, а я не мог и шагу ступить. Сидел на обочине и плакал… Тогда мне повезло — меня подобрали медицинские подводы, которые ехали на фронт за ранеными, и подвезли меня… Мы переправились через реку — там мост взорвали и пришлось переправляться по камням и кое-как накиданным доскам, на подводе я проехал всего три километра. А там, на другом берегу Нёмана, стоял мой гарнизон. А потом пришёл немец и мы попали в окружение на 22 дня. Враг днём стрелял, а ночью была тишь…

В окружении было очень сложно. Нас кормили два раза в день: утром, когда было ещё темно и немцы не стреляли, и ночью, когда уже было темно. Давали по 700 граммов хлеба и кусок сахара. А мы, народ молодой, всё время есть хотели, хорошо, если этот хлеб на весь день растянешь, а так, большинство, съедали сразу и сидели голодными… Поэтому я ночами картошку воровал. Та часть берега Нёмана, где мы были в окружении, не простреливалась немцами, и на ней были частные огороды. Так я подползал тишком, вырывал куст картошки (тогда осень была) и руками выкапывал картошку. Накопаю полный мешок и ползу обратно… Пусть простят меня люди, но нужно было выживать. Я был пулемётчиком, а в расчёте на пулемёт «Максим» было пять человек, так нам той картошки на 2–3 раза хватало. Сварим мы её в ведре, в котором воду для охлаждения пулемёта таскали, наберём полные котелки и едим, а картошка плотная — живот только раздуется, а ты всё равно голодный. Но хорошо, что хоть она была…

Потом через 22 дня наши начали наступление. Сначала палили по немцу из артиллерии — полдня земля дрожала, потом самолёты полетели их бомбить, а на утро нам дали по сто грамм и отправили в наступление… Товарища моего сразу убило. Я видел, как осколком ему снесло полголовы, а мы продолжали бежать дальше — не могли мы его нести за собой. Меня тоже ранило, но позже и в ногу: мы сидели в мелколесье — такие заросли молоденьких ёлочек и кустарник. В десяти метрах от нас разорвалась бомба и задела меня, повезло, что осколок не попал в кость. Сначала я даже не почувствовал, просто слышал, что что-то шипит — посмотрел — меня ранило. Перевязал меня старшина и отправил в тыл в медицинскую часть, сначала я лежал в каком-то маленьком городке, потом попал в госпиталь в Даугасе. Вылечился и вернулся в полк.

Дошли мы до Восточной Пруссии, а потом посадили нас в эшелоны и направили на Дальний Восток. На один день мы остановились в Минске… Я только успел сбегать к тётке. Когда утром на вокзал пришла мать, я уже уехал. День Победы мы встретили в Новосибирске. Это был обычный рабочий день, люди шли на работу, а потом выступал Мясников, он сказал, что мы победили, и отныне этот день — праздник, и все на сегодня свободны. Мы все высыпали на перрон, а наши артисты стали играть на трофейных немецких аккордеонах, начались танцы. Потом мы поехали дальше. К месту назначения где-то в Китае мы прибыли через месяц. И сразу пошли воевать с японцами.

Как-то мы взяли в плен две с половиной тысячи человек. Что нас поразило — это их дисциплина! Мы повели пленных разоружаться: сначала шли офицеры, за ними простые солдаты, и все молча, строем. Их было две с половиной тысячи, все при оружии, а нас, разоружавших их, было тридцать человек! А они даже не пытались бежать! Вместо этого они шли правильным строем и бросали оружие перед нашим командиром. Потом их поселили в бараки за колючей проволокой. И там они показали свою дисциплину: каждое утро по команде начальника выходили на плац, пересчитывались и делали зарядку. Образованный они народ, уже тогда они все поголовно носили марлевые повязки от инфекции, а мы даже не подозревали о таких средствах защиты от заразы. Кормили их хорошо — каждое утро им привозили свежий хлеб, а нам доставался чёрствый, старый. Хлеба японцам привозили много, и мы брали хлеб у них. Японцам хлеб наш очень полюбился. Деньги мы у них конфисковали — им не положено было, и с этими деньгами мы ходили на рынок — предприимчивый народ, через два дня после боёв уже развернулась торговля. Я, дурак, когда обыскивали пленных японцев, не взял денег, и в то время, как товарищи в отпуск уезжали на машине, нагруженной вещами, я ходил в обносках.

Одежда у японцев была хорошая, тёплая и аккуратная, пайки их были тоже ничего, в целлофане и даже с витаминами. Я к тому времени пообносился и поэтому ходил в японской форме, только погоны были наши, советские. Китель был для меня тесноват и рукава коротковаты, но другого ничего не было.

Потом японцев увезли в специальный лагерь для военнопленных, и стеречь нам больше стало нечего, и нас отправили уже на нашу землю. Мы шли в декабре месяце через перевал за двести километров. Холод жуткий. Я следил, чтобы у людей не было обморожения — как только белели нос или щёки, то сразу натирал их спиртом, но всё равно многие обморозились. Но мы дошли. В новом месте назначения был гарнизон, и мы, сначала проведя месяц в карантине, стали там служить. Я должен был служить до 1950 года, но служил до 1952. Успел я и с американцами в северной Корее повоевать.

Когда мне дали отпуск, я поехал в Минск, хотел мать забрать с собой — мне на месте службы комнату давали, но она отказались, сказала что ей всё равно, где умирать. После отпуска вернулся в часть и сразу демобилизовался. В Минске устроился на завод слесарем. Мама прожила ещё 2 года. А потом я познакомился с Броней, моей женой, — она жила на квартире у хозяйки в

доме у кинотеатра «Октябрь». Походили мы, повстречались с месяц и поженились. Стали жить у неё, детей вырастили четверых и внуков с правнуками. Мы уже 55 лет вместе… »

Зміцер ДАШКУН

Студэнт факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

Дзяды і прадзеды пакінулі нам мову, сям'ю, зямлю

Эсэ

І сапраўды, я лічу, што дзяды і прадзеды пакінулі нам вельмі каштоўны скарб, за які мы абавязаны быць удзячнымі ім. Ці многія народы свету могуць пахваліцца такой прыгажосцю мовы і зямлі, яе чысцінёю ў прамым і пераносным сэнсе? Я лічу, што не ўсе. Таксама, нашы дзяды захавалі ў нас і нашай сям'і выхаванне дабрыні, спагадлівасці і любові. Гэта яны змагаліся з ворагам у цяжкія для нашай радзімы часы. Яны не нападалі, яны абаранялі нас, змагаліся за тое, каб захаваць у нас тую сітуацыю і тыя якасці, якія ўласцівы беларусам. І менавіта таму адным з маіх любімых святаў я лічу 9 Мая – Дзень Перамогі. У гэты дзень я тэлефаную свайму дзеду – Філангуну Якаву Іванавічу – і выказваю яму сваю удзячнасць і павагу за тое, што ён ваяваў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Але не меншая роля ў захаванні спадчыны належыць маёй бабулі – Лічко Раісе Уладзіміраўне – старэйшаму чалавеку ў нашай сямейнай дынастыі, да якой я разам з бацькамі з вялікай радасцю прыязджаю ў вёску.

І цяпер перад намі, іх дзецьмі і ўнукамі, стаіць вельмі нялёгкая задача: трэба перадаць гэтыя скарбы вечныя нашым нашчадкам, каб яны з цягам часу не забыліся пра нашых дзядоў і прадзедаў. Гэтым, на мой погляд, мы выкажам павагу не толькі нашым продкам, але і самім сабе.

Зміцер КРУК

Студэнт факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

Гераізм маіх продкаў

Эсэ

Для мяне мае продкі – гэта мае бабулі і дзядулі. Яны сапраўды з'яўляюцца гераічнымі асобамі. І таму я вырашыў расказаць пра іх. Але мне не пашанцавала

хоць бы адзіны раз убачыць сваіх дзядуляў. Яны загінулі, калі мае бацькі былі яшчэ ў малым узросце.

Перш-наперш я хачу расказаць пра свайго дзядулю, бацьку маёй маці, — Мікалая Фёдаравіча Нікрашэвіча. Мой дзядуля вырас у вёсцы Дуброва, што ў Карэліцкім раёне. Падчас Вялікай Айчынай вайны ён удзельнічаў у баях. Быў паранены. Галоўны подзвіг майго дзеда — гэта тое, што ён удзельнічаў у вызваленні сваёй роднай вёскі ад нямецкіх захопнікаў.

Немцы ўжо сагналі ўсіх жыхароў вёскі Дуброва ў адзін спецыяльна пабудаваны для гэтага будынак і пачалі падпальваць хаты жыхароў. Некалькі хат згарэла, тое самае чакала і жыхароў вёскі. Але ў той момант, як фашысты аблівалі будынак з людзьмі бензінам, у вёску ўварваліся партызаны. Адным з іх быў мой дзед. Наогул у майго дзеда было шмат медалёў, адным з іх быў медаль за гераізм працы. Мабыць, за сваю самаадданасць ён і пайшоў з жыцця так рана. Яго жонка, мая бабуля, Зінаіда Нікрашэвіч, Герой Працы і Маці-гераіня, бо яна паставіла на ногі пяцярых дзяцей. Ды, прычым, амаль адна, бо бацька пайшоў з жыцця, калі малодшыя яшчэ хадзілі ў школу.

Другая мая бабуля – гэта маці майго бацькі, таксама Маці- гераіня і Герой Працы. А яшчэ яна ахвяра фашысцкага рэжыму, бо яе ў малым ўзросце забралі ў Германію ў працоўны лагер, дзе яна правяла некалькі гадоў. Яна амаль адна вырасціла чацвярых дзяцей. Яе брат — мой трэці дзед — прапаў без звестак у гады вайны, і ніхто не ведае, дзе ён.

Яшчэ для мяне гераічнымі людзьмі з'яўляюцца мае бацькі, таму што яны жылі ў цяжкіх ўмовах, але здолелі нарадзіць і вырасціць мяне з братам.

Паліна Кузьміцкая

Выпускніца лінгвістычнай гімназіі № 8 горада Мінска
Член літаратурнага клуба «Ветліца» з 2008 года. Дачка загадчыка кафедры аўтаматызацыі вытворчых працэсаў і электратэхнікі Кузьміцкага І. Ф.

По ту сторону войны...

Апавяданне

Война... Страшная, жестокая сила, стирающая с лица земли памятники архитектуры, произведения искусства, превращающая возделанные с заботой поля в места яростных сражений, окрашивающая чистые реки кровью, оставляющая в руинах красивейшие из городов, беспощадно калечащая миллионы жизней... Но даже она не способна разрушить самое главное –духовные ценности человека: силу воли, искренность, преданность, честность, умение верить и любить...

Так думала я, когда моя бабушка рассказывала мне одну из самых трогательных историй о любви, войне...и жизни.

Шёл третий год Великой Отечественной войны. Клавдия, которой в 1943 только исполнилось семнадцать лет, с трудом упросила строгую маму отпустить её на танцплощадку со старшими сёстрами. Несмотря на то, что на девушке было старое застиранное платьице и стоптанные туфли, нашу «Наташу Ростову на первом балу» сразу же пригласил на танец молодой и статный военный лётчик Виктор. Не сводя с неё полушутливо-серьёзных голубых глаз, он старался легко говорить о воздушных сражениях, солдатской жизни и о том, что совсем скоро – победа. Клавдия, вернувшись домой, не спала всю ночь, думая о красивом и мужественном Викторе, в которого она влюбилась в тот же вечер, и о том, как изменится вся их жизнь, когда, наконец, закончится проклятая война...

На следующий день Виктор встречал её после школы, которая открылась совсем недавно, после освобождения городка. С тех пор так и повелось... Пока Витя провожал её до дома, они болтали обо всём на свете: он удивлял её своими взрослыми взглядами на жизнь, весёлыми и интересными рассказами о друзьях-сослуживцах, боевых вылетах, родном и далёком Минске, она его – своей честностью и наивностью...

Однажды произошёл забавный случай. Они, как всегда, шли по направлению к дому Клавы, и тут Витя предложил: «Давай пойдём через сквер, там дорога намного короче». Сказать, что девушка испугалась до полусмерти, это не сказать ничего: все варианты, начиная от всяких там признаний и заканчивая (не дай Бог!) поцелуем, пронеслись в её головке за секунду, и она неожиданно для самой себя резко ответила: «Нет, ни за что! Через сквер не пойду!» Виктор опешил: «Да почему?!» И тут Клава произнесла коронную фразу: «Там очень злые собаки, они кусаются!» Витя спрятал улыбку и сказал: «Тогда, конечно, мимо собак мы не пойдём!» Прошло пару недель, и Клавдия, забыв о том разговоре, сама предложила: «А давай пойдём через сквер, так ведь быстрее!» Витя хитро улыбнулся и абсолютно серьёзно ответил: «Ну, уж нет! Ты разве не знаешь, что там злые собаки? Они кусаются!»

Они продолжали встречаться как друзья, добрые товарищи, которым весело и интересно вместе. Лишь однажды Виктор серьёзно спросил: «Клава, скажи, ты хотела бы со мной дружить?» Клава округлила глаза и переспросила: «Разве мы не дружим?» «Нет, – смутился Витя, – в смысле быть вместе...» Клава нахмурилась: разговор принимал опасный оборот. Отвернувшись, она ответила: «Нет.» «Я не нравлюсь тебе?» – выпустил её руку Витя. «Нет», – также однозначно ответила Клава. Витя потряс головой и переспросил: «Так нравлюсь или нет?» «Нравишься...», – вздохнула Клава. «Так в чём же дело?!» – засмеялся Виктор. Клавдия подняла голубые глаза и выдала пулемётной очередью: «Знаешь что, Витя, я знаю, что ты знаешь, что я знаю, что все знают, что когда парень с девушкой встречаются, они целуются! В губы! А я не умею и не буду, и мне не надо... Вот...» Витя облегчённо вздохнул и, взяв Клаву за руку, пообещал: «Не волнуйся, этого не будет, я тебе обещаю». Клава шмыгнула носом и радостно кивнула. На самом-то деле она стеснялась всего на свете: своего возраста, его возраста и мамы... О да... Мамы...

Однажды вечером они сидели на лавочке и, по своему обыкновению, просто молчали, глядя друг на друга... Внезапно, вздымая за собой столб пыли, на дороге показалась старшая сестра Клавдии, Нина. «Клавка-а-а-а-а!» – с выпученными глазами завопила она. Клава зайчиком подскочила и, не сказав Вите ни слова, резво побежала вслед за сестрой в направлении дома. На бегу, сестра докладывала: «Конец нам пришёл, Клав, мать нас всех по всей деревне ищет! Кого находит, того палкой бьет нещадно! Я её крик с другого конца деревни услышала и бегом к тебе! А ты вот чего – с кавалером... Вот бы позору-то было!» Клава перекрестилась и, прибежав домой, залезла под одеяло. На гневный крик матери она подняла голову от подушки и нарочито сонно сказала: «Мама, сплю я, причём давно и крепко!» Мать поохала-поахала и переключилась на старшенькую Марусю, которая решила выступить с речью «взрослая я уже!» Слушая звуки тумаков, отвешиваемых Марусе, Нина с Клавкой тихо переговаривались:

– Дура она!

– Да нет, Нинка, жалко её...

– И всё ж дура, теперь мать за ней шибко следить будет!

– Неправильно это, – уже засыпая, прошептала Клава.

–Тоже дура! – решила Нинка, и дом, наконец, заснул.

На следующеё утро, Клава с удивлением увидела на крыльце своего дома Витю.

«Ты что тут делаешь? С ума сошёл?!» – зашептала она, оттаскивая его в сторону и озираясь на дверь. «Куда ты вчера девалась?! Я ждал тебя всю ночь на той лавке, думал, ты вернёшься, объяснишь хоть что-нибудь», –горячо ответил Витя. «Всю ночь? Бедненький!» – умилилась Клавдия, стараясь сменить опасную тему.

«Где ты была?» – снова повторил Витя. Клава обречённо опустила глаза и прошептала: «Корову я доила...» Витя внимательно посмотрел ей в глаза и попросил: «Не делай так больше, пожалуйста. Я волновался». «Ага», – не зная, куда спрятать глаза, произнесла Клавдия.

Они были вместе. Сами не осознавая этого, они любили друг друга. Она любила его той первой беззаветной любовью, которая ничего не требует взамен, а он защищал её ото всех и вся...

Прошло несколько недель, и недобрая весть, переходя из дома в дом, облетела весь городок : «Военных лётчиков отправляют на передовую!»

Она провожала его. Они стояли молча, взявшись за руки, Клава не могла поднять глаза, а Виктор не мог сказать ни слова.

–Ты любишь меня? – наконец дрогнувшим голосом произнес он.

– Да! – глядя ему в глаза, честно ответила Клавдия и, покраснев, неожиданно рассмеялась. – У меня сердце разрывается, а ты смеёшься... – с горечью сказал он.

Клава выдернула руку и, не видя перед собой ничего, кроме мутной пелены, добежала до дома. Там, упав на кровать, она, наконец, дала вою слезам.

Клава рыдала навзрыд и повторяла «Витя... Витя...» Незаметно к ней подошла мама и, погладив по голове, сказала: «Не плачь, он вернётся...»

Его отправили на Курскую дугу – это были сорок девять дней ада на земле. В этих жестоких боях, не дающих никому пощады и снисхождения, участвовало более четырёх миллионов человек – молодых ребят, идущих на верную смерть, иногда осознанно, а чаще всего – нет: около семидесяти тысяч орудий и миномётов, тринадцати тысяч танков и самоходных орудий, двенадцати тысяч боевых самолётов... Отчаянные бойцы Красной армии, которые были готовы на всё ради великой победы, озверевшие от предчувствия фиаско фашисты и кровь... целые реки крови...

Она ничего не знала об этом, ведь Виктор писал ей о том, как красивы здесь закаты и какое чистое по утрам небо, такое же, как её глаза. Она прятала эти письма под подушку и тайком перечитывала их каждую ночь при свете свечи... А когда в их дом попал снаряд, единственное, что она спасла, были эти строки с фронта.

Но вдруг писем не стало... Шли месяцы, а от Вити не приходило ни весточки... Она писала на фронт, пыталась найти его родных в Беларуси и товарищей по службе – всё было безрезультатно. Клавдия не хотела верить в то, что произошло самое страшное, но годы ожидания сами собой подсказывали: им не пройти вместе по отстроенным улицам маленького, уютного городка, не танцевать под звуки песен победы, не жить вместе под мирным небом... «Их» вообще больше никогда не будет.

Становилось легче лишь тогда, когда Клава думала: «Он жив... Просто встретил другую девушку, забыл обо мне, у него жена, дети, счастливая жизнь...»

– Бабуля, и ты серьёзно могла в это поверить?! Ну, как же так?! – спросила я, когда первый раз услышала этот рассказ.

Бабушка сняла очки и, опустив глаза, тихо ответила:

– Так было легче... Это помогало жить. И ты знаешь, я всегда его любила, сколько ни прошло лет, много хорошего было и много плохого, а я его любила... Так же как и в тот день, когда я провожала его на фронт... И никто, никогда, не занял в моём сердце места Вити... Вся моя жизнь прошла в ожидании его... Потому, после окончания университета, и попросила, чтобы меня направили работать в Минск... Может глупо, но я всё ещё надеялась найти Виктора в этом городе, так часто, живо и нежно описываемом им. Так и вышло, что он, белорус, навсегда остался на русской земле, а для меня, русской, Беларусь стала родной... Значит так решено... Это судьба...

Кто знает, как сложилась бы жизнь моей бабушки и миллионов других девушек, возлюбленные которых ушли и не вернулись, если бы не было войны... Эта хитроумная адская машина, заставляя людей ещё остреё любить и ценить друг друга, хранить верность и преданность чувствам, вместе с тем жестоко разлучала их, навсегда ломая судьбы и оставляя шрамы в сердцах. И бойцы, смело идущие в бой, летчики, летящие навстречу гибели, санитарки, спасающие

раненых под обстрелом, мечтали лишь о том, что когда-нибудь смогут увидеть чистое небо, смех, искрящийся в глазах детей, нас с вами, безмятежно шагающих по зелёным улочкам любимого города... Их платой за это стали любовь, дружба, счастье – всё, что было у них в жизни, а часто она сама... Так, может, стоит сказать им больше, чем «спасибо», а если не находится нужных слов – просто пожать руку и улыбнуться...

Іван КУРЫЛЕНКА

Студэнт факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Пераможца II тура V Рэспубліканскага конкурсу творчых работ «Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа», прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (2009 г.)

Вайна праз лёс майго прадзеда

Нарыс

Прынясіце кветкі салдатам

Уводзіны

Асноўнай задачай дадзенай працы з'яўляецца паказ падзей Вялікай Айчыннай вайны праз лёс і ваенную службу майго прадзеда, падпалкоўніка Кузіна Івана Мікалаевіча.

Зыходзячы з таго, што праца прысвечана пэўнай асобе, мэтазгодна будзе прывесці ў пачатку кароткі біяграфічны нарыс, які запісаны са слоў дачкі – Кузінай Вольгі Іванаўны.

Асноўная частка будзе змяшчаць апавяданне пра вайсковую службу, ваенныя аперацыі, у якіх Іван Мікалаевіч прымаў удзел.

Важным момантам з'яўляецца паказ гістарычных падзей на аснове дакументальных матэрыялаў таго часу, таму апавяданне пра пэўны гістарычны факт будзе суправаджацца адпаведным дакументам ці вытрымкамі з яго.

Апошняя частка прысвечана фотаздымкам з сямейнага архіва, па якіх можна дэталёва прасачыць шлях ветэрана ў даваенны, ваенны і пасляваенны час. Таксама там змешчаны і іншыя матэрыялы, якія дапамогуць больш выразна апісаць постаць Івана Мікалаевіча.

З пададзенага матэрыялу будзе бачна, што лёс аднаго чалавека быў тыповым для таго пакалення, на долю якога выпалі цяжкія ваенныя выпрабаванні. Гэта былі змагары за свабоднае і мірнае жыццё на роднай зямлі.

Магчыма, ідэалогія савецкага часу не па душы сённяшняму маладому пакаленню.

Магчыма, і наша жыццё паслужыць дакорам для нашых нашчадкаў.

Але ж для мяне асабіста лёс майго прадзеда – бясспрэчны прыклад гераізму, адданасці Радзіме. Дзякуючы такім мужным людзям, як ён, мы сёння жывём і радуемся мірнаму небу, часам не задумваючыся, якой цаной адваявана наша свабода.

Мой родны дзядуля, я нізка схіляю перад табой галаву. Я буду помніць твой лёс, ганарыцца табой.

Кузін Іван Мікалаевіч (біяграфічны нарыс са слоў дачкі – Кузінай Вольгі Іванаўны)

Кузін Іван Мікалаевіч (15.10.1907 – 29.11.1973). Нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Машкіна Бранскай губерні. Сям'я жыла небагата, а потым, калі пачаўся голад, перабраліся ў Харкаўскую вобласць (Украіна). Каб зарабіць на хлеб, дапамагчы сям'і, Іван Мікалаевіч працаваў батраком, вучыўся ў сельскай школе, пасля ўдзельнічаў у стварэнні камсамольскіх ячэек, потым скончыў рабфак, а ў 1930 паступіў у Інстытут зерневых культур, што ў Харкаве (гэты горад пэўны час з'яўляўся сталіцай Украіны). Актыўна ўдзельнічаў у камсамольскім руху, стаў членам кампартыі, і праз некаторы час уваходзіў у склад бюро ЦК Камсамола Украіны. З другога курса інстытута (1932) па прызыву КПСС пайшоў у армію. Скончыў Ленінградскую ваенную школу сувязі і ў да 1954 года служыў у розных ваенных злучэннях сувязі. Самым першым стала танкавая брыгада, што размяшчалася ў Калузе. У складзе II Беларускага фронта ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі і Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны за заслугі трыма ордэнамі і медалямі (двума ордэнамі «Красная Звезда» і ордэнам «Красное Знамя»). Скончыў службу ў званні падпалкоўніка. Пасля выхаду ў адстаўку (1954 год – падчас масавых звальненняў пры Хрушчове) на грамадскіх пачатках працаваў палітінфарматарам на фабрыцы «Камінтэрн» у Гомелі.

Пачатак вайсковай службы

Армейскі шлях пачаўся ў Калузе, дзе размяшчалася танкавая брыгада – велізарнае і магутнае злучэнне войскаў. Паводле ўспамінаў бабулі, якая ў той час была яшчэ зусім маленькай, ёй былі вельмі цікавыя ўсе гэтыя танкі, танкеткі (лёгкія бронемашыны), з захапленнем яна назірала за працай вайскоўцаў. Бабуля распавяла, што нават марыла ў той час стаць шафёрам ці лётчыкам.

Аднак армія зрэдку стаіць на месцы, і таму праз колькі часу Іван Мікалаевіч ужо забяспечваў сувязь высокай частаты ў артылерыйскіх злучэннях на ўсходзе РСФСР. Гэты тып сувязі на той час лічыўся немагчымым для перахопу, таму з дапамогай менавіта гэтага тыпу перадаваліся самыя сакрэтныя паведамленні. Пасля прыйшоў загад аб перадыслакацыі ў Забайкальскую ваенную акругу – у Чыту на ваенныя раз'езды. Уся брыгада стаяла ў непасрэднай блізкасці да Халхін-Гола. Там, у танкавых войсках, нёс службу і Л. І. Брэжнеў. Увесь час чакалі пачатку вайны, над усім маўкліва луналі напружанасць і трывога, і калі ва ўзброеных часцях было толькі змрочнае чаканне, то ў сувязістаў няспынна, дзень і ноч ішла праца: падтрымліваліся зносіны з замежнымі разведчыкамі, адсылаліся і прымаліся звесткі з усіх бакоў неабсяжных гарызонтаў Радзімы. У апаратнай заўсёды стаяў цокат радыётэхнікі, ішоў шматгалосны паток

данясенняў, звестак, распараджэнняў. Гэты пакой ніколі не пуставаў, бо там абавязкова павінен быць хоць хтосьці, каб атрымаць ці то важную інфармацыю, ці то загад ісці ў бой, і данесці іх да іншых. Праца была цяжкая, нервовая. Бабуля ўзгадвае, што бацька ішоў позна ўначы і ўначы вяртаўся дадому. Было невядома, чаго чакаць. Японія ўсё не пачынала баявых дзеянняў, і заставалася толькі трывожнае чаканне ў бясконцым чаргаванні дзён.

Раптам – загад: «У бой!». Па начной трывозе паднялі сувязістаў. Войскі рухаліся на усход. Аднак усё скончылася так жа хутка, як і пачалося. Бой цягнуўся дні два-тры і раптоўна сцішыўся. Войскі вярнуліся на пазіцыі.

Пацягнуліся тыя ж дні чаканняў, як і раней. Японія так і не адкрывала фронт, што дазваляла Чырвонай Арміі сканцэнтраваць асноўныя сілы супраць войскаў фашысцкай Германіі.

На Захад!

У 1943 годзе стала відавочным, што трымаць войскі тут больш немагчыма, калі яны так патрэбны на Захадзе, на напрамку асноўнай лініі фронту. Пачыналася наступленне Чырвонай Арміі, патрэбны былі ўсе сілы, каб не даць аніводнай магчымасці ворагу замацавацца на сваіх пазіцыях.

Пачыналася вызваленне нашай Радзімы – Беларусі. Сувязь была патрэбна як ніколі раней. Трэба было скаардынаваць дзеянні на фронце даўжынёй у дзве тысячы кіламетраў. Нібы кроў па венах, несліся па лініях радыёперадач распараджэнні, словы падтрымкі, узмацняючы баявы дух чырвонаармейцаў, напаўняючы іх сілай, мужнасцю, здольнасцю трымаць зброю і рушыць на ворага. Па радыё перадавалі такія чаканыя і патрэбныя звесткі аб дасягненнях змагароў Айчыны.

Да беларускага народа: Зварот Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, СНК БССР і ЦК КП(б)Б, Масква, 23 верасня 1943 года.

«Дорогие товарищи!

В результате сокрушающих ударов, нанесённых немецко-фашистским полчищам нашей доблестной Рабоче-Крестьянской Красной Армией летом этого года, сейчас идёт успешное наступление Красной Армии на всех фронтах. Происходит массовое изгнание с советской земли гитлеровских захватчиков. Красной Армией за короткий срок от немецких захватчиков очищены: Северный Кавказ, Донецкий угольный бассейн, ряд областей Украины, большинство районов Орловской, Смоленской и Калининской областей.

Успешное наступление героической Красной Армии продолжается.

Наши войска находятся на подступах к Киеву, Днепропетровску и Запорожью. Красная Армия подошла вплотную к границам Белоруссии, а на Гомельском, Могилёвском и Витебском направлениях уже перешла границы Белоруссии и начала освобождение Белоруссии от немецких захватчиков. Идут бои за освобождение белорусских городов Витебска и Гомеля.

Белоруссия становится важнейшим театром военных действий. На территории Белоруссии часто решалась судьба многих народов Европы. Здесь в 1812 году

от ударов русской армии и партизанских отрядов Наполеон на берегах Березины и Нёмана потерял остатки своей армии, пытавшейся завоевать Россию, и сам одиночкой бежал из Сморгони во Францию. Здесь потерпели поражение немецкие оккупанты, пытавшиеся в 1918 году захватить наши земли. Так и сейчас гитлеровские захватчики должны найти себе могилу на белорусской земле.

Всеми силами и всеми средствами истребляйте немецких разбойников и людоедов, чтобы во веки веков не поднялись они, чтобы вечно жил могучий и свободолюбивый наш белорусский народ в великой и дружной семье народов Советского Союза.

Все на помощь и на поддержку освободительнице – героической Красной Армии!

Смерть немецким захватчикам!

Да здравствует наша освободительница – славная Красная Армия!

Да здравствует свободная Советская Белоруссия!»

Пачыналася вызваленне Беларусі. Іван Мікалаевіч уваходзіў у склад II Беларускага фронта пад кіраўніцтвам генерал-палкоўніка Георгія Фёдаравіча Захарава. Фронт быў утвораны 24.04.1944 на Магілёўскім напрамку ў выніку падзелу Заходняга фронта на II і III Беларускія франты. Падчас Беларускай аперацыі, што адбылася ў 1944, фронт правёў Магілёўскую аперацыю 1944, Мінскую аперацыю (ва ўзаемадзеянні з I і III Беларускімі франтамі і беларускімі партызанамі), Беластоцкую аперацыю і Асавецкую аперацыю.

Баявое данясенне II Беларускага фронта № 189/063/оп Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму аб пераходзе ў наступленне (25.06.1944 г. 17 г 00 хв):

«Войска II Белорусского фронта ударной группой – 49-я армия и в последующем правое крыло 50-й армии, перейдя в наступление 23.06.1944 на могилёвском направлении, при поддержке массированных ударов артиллерии и авиации, прорвали сильно укреплённую и развитую в глубину оборону противника по западному берегу реки Проня, на фронте Халюпы, Старый Перевоз.

За три дня боёв отразили многочисленные атаки пехоты противника, поддержанной танками, самоходными орудиями и авиацией. Форсировали водные преграды – реки Проня, Бася, преодолели противопехотные и противотанковые заграждения и завалы в лесных массивах и продвинулись на могилёвском и чаусском направлениях вперёд до 30 км, расширив фронт прорыва до 80 км по фронту.

Войсками фронта очищено от противника до 850 кв. километров, до 200 населённых пунктов.

В боях уничтожено более 5000 фашистов, захвачено в плен 300 солдат и офицеров; трофеи: танков – 9, орудий и миномётов разных калибров – 60, пулемётов и автоматов – 375, винтовок – 2700 и другое военное имущество

Захаров, Мехлис, Боголюбов»

Мінская аперацыя стала магчымай пасля таго, як у выніку ажыццяўлення Віцебска-Аршанскай, Магілёўскай і Бабруйскай аперацый 1944 года, нямецкія 4-я і частка 9-й армій групы «Цэнтр» апынуліся ў паўкальцы, глыбока ахопленыя савецкімі войскамі. Да зыходу 28 чэрвеня войскі I Прыбалтыйскага фронта

вялі баі на подступах да Полацка і на рубяжы Заазер'е – Лепель, войскі III Беларускага фронта падышлі да ракі Бярэзіна (у раёне Барысава), ахопліваючы праціўніка з Поўначы, войскі II Беларускага фронта наступалі з Усходу з міжрэчча Дняпра і Друці, не даючы магчымасці нямецкім войскам адарвацца і арганізавана адступіць да Бярэзіны. Войскі I Беларускага фронта, зламаўшы абарону нямецка-фашысцкіх злучэнняў на Бярэзіне (у раёне Бабруйска), выйшлі на рубеж на Усход ад Свіслачы і Асіповіч, знаходзіліся за 100 кіламетраў ад Мінска, у той час як галоўныя сілы праціўніка, што адыходзілі да Мінска, за 130-150 кіламетраў ад яго. У гэтых умовах была асноўная баявая задача: імклівымі ўдарамі войск левага крыла III Беларускага фронта і часткі сіл правага крыла I Беларускага фронта па некалькіх напрамках на Мінск ва ўзаемадзеянні з II Беларускім фронтам завяршыць акружэнне групоўкі войск праціўніка і вызваліць Мінск. Адначасова войскі I Прыбалтыйскага фронта і правага крыла III Беларускага фронта павінны былі працягваць імклівае наступленне на Захад, знішчыць падыходзячыя рэзервы праціўніка і стварыць умовы для развіцця наступлення на шаўляйскім, каўнаскім і варшаўскім напрамках. Войскі III Беларускага фронта 30 чэрвеня галоўнымі сіламі фарсіравалі Бярэзіну, разбілі барысаўскую групоўку гітлераўцаў, 1 ліпеня вызвалілі Барысаў, Бягомль. Адначасова ў напрамку Мінска наступалі войскі II Беларускага фронта, якія 29 чэрвеня вызвалілі Бялынічы, 2 ліпеня – Чэрвень, 3 ліпеня – Беразіно. Рухомыя злучэнні I Беларускага фронта у ноч на 3 ліпеня абышлі Мінск з поўдня, выйшлі да паўднёва-ўсходняй ускраіны горада, дзе злучыліся з войскамі III Беларускага фронта. Вырашальны ўдар па варожым гарнізоне ў Мінску, які складаўся з 3 пяхотных і 1 танкавай дывізій, 3 палкоў СС і розных спецыяльных падраздзяленняў, быў нанесены на досвітку 3 ліпеня. З усходу і паўночнага ўсходу ў горад уварваліся 2-і гвардзейскі танкавы корпус, з поўначы ўвайшлі часці 5-й гвардзейскай танкавай арміі і перадавыя падраздзяленні 11-й гвардзейскай і 31-й армій III Беларускага фронта, у сярэдзіне дня з паўднёвага ўсходу – 1-шы гвардзейскі танкавы корпус і часці 3-й арміі I Беларускага фронта. У другой палове дня Мінск быў поўнасцю вызвалены.

І вось, нарэшце, 27 ліпеня 1944 года – перадача па тэлеграфу вузла сувязі НКА СССР – «Рабочым, калгаснікам, інтэлігенцыі Савецкай Беларусі» (тэлеграма камандуючага III Беларускім фронтам І. Д. Чарняхоўскага):

«Вместе со всем великим советским народом от имени бойцов, сержантов, офицеров и генералов III Белорусского фронта поздравляем с полным освобождением многострадальной Белоруссии от немецко-фашистской тирании. При всенародной поддержке Красная Армия очистила всю белорусскую землю от немецких оккупантов. Чувством глубокого и радостного волнения охвачены сердца воинов III Белорусского фронта. Нам выпала великая честь сражаться за вызволение братского белорусского народа из фашистской неволи. Воодушевлённые этой благородной целью, как одна боевая семья, плечом к плечу дрались насмерть с врагом русские и белорусы, украинцы и поляки, грузины и армяне, казахи и узбеки, соревнуясь друг с другом в

мужестве и отваге. На весь мир прогремела слава о белорусских партизанах, грозных народных мстителях, помогавших Красной Армии ковать победу над гитлеровскими убийцами и душегубами.

Спасибо, родные, за помощь нашим войскам. Спасибо от всех бойцов, сержантов, офицеров, генералов III Белорусского фронта за тёплый, сердечный приём, за отцовскую и материнскую заботу, которой вы окружили нас в дни тяжёлых боёв на белорусской земле.

Знаем, что вы и сейчас, не покладая рук, не щадя своих сил, работаете для Красной Армии, для обеспечения полного разгрома ненавистного врага.

Слава свободолюбивому белорусскому народу! Слава народам Советского Союза, сплотившимся в одну нерушимую и братскую семью!

Черняховский»

У ходзе далейшага наступлення ў верасні-кастрычніку 1944 войскі II Беларускага фронта выйшлі да граніц Польшчы і Усходняй Прусіі, захапілі плацдармы на рацэ Нараў. У студзені-красавіку 1945 фронт удзельнічаў ва Усходне-Прускай аперацыі, у лютым-сакавіку – ва Усходне-Памяранскай аперацыі, з 18 красавіка – у Берлінскай аперацыі, у ходзе якой да 6 мая яго войскі выйшлі на рубеж Штральзунд – Вісмар – Усход Шверына – усходні бераг ракі Эльба да Вітэнберга, дзе сустрэліся з войскамі англійскай 2-й арміі.

Асноўныя вынікі аперацыі «Баграціён» (паводле ўспамінаў К. К. Ракасоўскага, 1944 г.):

«Подводя итог, можно сказать, что группа фронтов под руководством Ставки блестяще осуществила Белорусскую операцию. В результате была разгромлена группа армий «Центр» и нанесено крупное поражение группе армий «Северная Украина», освобождена Белоруссия, большая часть Литвы, значительная часть польских земель к востоку от Вислы. Советские войска форсировали реки Нёман, Нарев и подошли к границам Восточной Пруссии. Немецкие войска потерпели крупное поражение».

На мірнай зямлі

8 мая 1945 г. у Карлсхорсце быў падпісаны Германіяй акт аб капітуляцыі. Завяршальнай аперацыяй Вялікай Айчыннай вайны стала Пражская наступальная аперацыя (6 – 11.05.1945). Фіналам Другой сусветнай вайны лічыцца прызнанне паражэння апошнім нямецкім саюзнікам – Японіяй (02.09.1945). Перамога стала магчымай толькі дзякуючы самаахвярнай дзейнасці савецкіх грамадзян на франтах і ў тыле ворага.

Пасля заканчэння вайны Іван Мікалаевіч працягнуў службу ў Польшчы, у горадзе Лансберг (зараз Вялікапольскі Гожуў), з 1945 па 1947 год. Потым адправіўся ў Легніцу, дзе тады знаходзіўся штаб Паўночнай арміі. Там з 1947 па 1948 год нёс службу ў артылерыйскім злучэнні.

Пасля Польшчы прыйшоў загад аб адпраўцы ў Беларусь, дзе ў 1954 годзе, у Гомелі, Іван Мікалаевіч у званні падпалкоўніка падаў у адстаўку. У гэты ж час адбылося маштабнае скарачэнне арміі (на 300 тысяч чалавек).

Увесь час – і ў вайну, і пасля яе – І. М. Кузіну як партработніку трэба было забяспечваць зносіны паміж кіраўніцтвам і падначаленымі, падтрымліваць сувязь салдат з іх роднымі і сваім прыкладам дэманстраваць, што такое сапраўдная любоў і павага да Радзімы. Незлічоныя выпрабаванні падчас вайны не здольныя былі парушыць гэтай веры. Гэткай жа моцнай была і любоў да сваёй сям'і. Менавіта любоў і не пусціла яго працягнуць службу на Далёкім Усходзе, дзе прапанавалася званне палкоўніка. Іван Мікалаевіч даведаўся, што школа, якую трэба было наведваць дочкам, знаходзілася надта далёка, і таму адмовіўся. Ён з сям'ёй застаўся на мірнай беларускай зямлі. Гэта паказвае, наколькі важная сям'я для чалавека, які прайшоў вайну і бачыў, як яна можа зламаць лёс у адно імгненне, пазбавіць таго адзінага, што складала сэнс жыцця. Вось чаму ветэраны з такой цеплынёй і пяшчотай адносяцца да сваіх блізкіх.

Заключэнне

Другая сусветная вайна тым ці іншым чынам датычылася кожнага чалавека. Яна запатрабавала такія ахвяры і прынесла такія страты, што ўявіць іх сёння тым, хто не бачыў вайны, немагчыма. Вялікая Перамога стала магчымай толькі дзякуючы таму, што нашу зямлю абаранялі людзі, у сэрцах якіх зіхацела надзвычайная адданасць сваёй Радзіме і вера ў перамогу. Гэтая вера і адданасць, гэты сапраўдны патрыятызм быў патрэбны не толькі ваенным, але і ўсім людзям на нашай зямлі. Заклік «Усё для фронту, усё для перамогі!» абвясціў адзіную мэту для мільёнаў чалавек, што працавалі на заводах, лячылі параненых, дапамагалі салдатам Чырвонай Арміі і партызанскім атрадам ратаваць сваю Бацькаўшчыну. І яны здолелі пайсці на гэты подзвіг і здзейсніць яго. Памяць пра яго жывая ў сэрцах ветэранаў, як жывы і гонар за Перамогу ў іх нашчадкаў, якія сёння могуць з удзячнасцю дыхаць вольным паветрам.

Наша сям'я бясконца ўдзячна майму прадзеду за яго святую веру ў перамогу над ворагам, яго адданасць беларускай зямлі. Для нас ён прыклад ва ўсім. Такіх людзей загартавала Вялікая Айчынная вайна. Прайшоўшы праз яе, яны набылі сілы, прагу да жыцця і ўзмацнілі лепшыя чалавечыя якасці. Тая духоўная спадчына, якую пакінуў пасля сябе Іван Мікалаевіч, падобная да каранёў магутнага дрэва. Гэтыя карані моцныя і трывалыя. Іх нікому не парушыць.

У заключэнне я хачу прывесці ўспаміны пра дзядулю маёй мамы:

«Мой папа, прадедушка Вани, был всегда внимательным, доброжелательным к людям, общительным, пользовался уважением. До Великой Отечественной войны отношения между командирами и подчиненными были более тесными, открытыми. У нас дома часто бывали старшины из папиной роты. Мама, Ванина прабабушка, помогала благоустраивать быт в казарме, когда танковая бригада, где служил папа, переехала из Калуги на разъезд в Забайкальский военный округ. Это было накануне боёв под Халхин-Голом и озером Хасан, где в боях участвовал Брежнев Л. И. Он служил тогда в танковых войсках. Бригада, где служил папа, была по тревоге поднята, но в боях не участвовала, так как военные действия продолжались два дня. На фронт папа ушёл в 1943, из частей

связи, которые вели постоянную связь с нашими резидентами (разведчиками) на Востоке — Япония, Китай, что я узнала уже от мамы.

Воевал папа в составе частей связи II Белорусского фронта, освобождал Белоруссию и Польшу от фашистских захватчиков. Имеет правительственные награды. После окончания Великой Отечественной войны служил в армии на территории Польши около 3 лет. Затем служил в Белоруссии (города Пинск, Минск, Гомель). Вышел в отставку в 1954 году, когда по указу Хрущева Н. С, секретаря ЦК КПСС, была сокращена армия на 300 тыс. человек. Папа всегда принимал участие в родительских комитетах при школе, проводил лекции и беседы со школьниками, рассказывал о войне, о службе в армии, о людях, которые защищали своё Отечество самоотверженно. Он прививал молодёжи чувство долга, патриотизма, преданности и любви к своей Родине. Будучи в отставке на пенсии, находился на партучёте при гомельской фабрике «Коминтерн», где вёл занятия как политинформатор на общественных началах. Скончался отец от сердечно-сосудистого заболевания в 1973 году. Был похоронен с воинскими почестями (салютом) как подполковник в отставке и участник Великой Отечественной войны. Добрая память в семье сохранена и по наши дни».

Дочь Кузина Ольга Ивановна (врач)

Аляксандр ПЫТЛЯК

Студэнт факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі (ХТіТ)

Беларуская сям'я на працягу XX стагоддзя

Эсэ

XX стагоддзе – стагоддзе крывавых войнаў, шматлікіх людскіх страт, зламаных чалавечых лёсаў, але і стагоддзе перадавой мірнай працы, стагоддзе гераічных пасляваенных аднаўленняў. Лёс краіны ў XX стагоддзі – лёс грамадства. Лёс грамадства – лёс сям'і.

Пачатак XX стагоддзя азнаменаваўся пачаткам у 1914 годзе Першай сусветнай вайны, а яшчэ раней была Руска-Японская вайна, у якой удзельнічаў мой продак, а менаваіта нехта з боку матчыных сваякоў, хутчэй за ўсё брат маёй прабабулі, па прозвішчы Заблоцкі, але падрабязна пра яго я нічога не ведаю, бо жыў ён даўно. Ведаю толькі, што быў ён марак і служыў на нейкім судне ў Ціхім акіяне. У часы Першай сусветнай вайны шмат людзей з Заходняй Беларусі адступала ў Расію. Нейкі час жылі на Кубані і бацькі маёй прабабулі па бацькоўскай лініі. Пасля рэвалюцыі яны вярнуліся на Радзіму. А Радзіма ў той час ляжала ў развалінах, і сям'ю карміць патрэбна, таму бацька ўжо другой маёй прабабулі, па матчынай лініі, і некаторыя іншыя мужчыны з нашай мясцовасці ў 20-я гады

ездзілі на заробкі ў ЗША – гэта і дапамагло выжыць. Прывёз прапрадзед з-за мора швейную машынку і трошкі грошай, якіх ледзьве хапіла, каб купіць шнур зямлі.

У 1939 годзе пачынаецца новая вайна. Германія нападае на Польшчу, куды ў той час уваходзіла заходняя частка беларускіх земляў. Шмат юнакоў з Заходняй Беларусі абавязаны былі ісці ў польскае войска. Быў прызваны і мой прадзядуля па матчынай лініі Кучынскі Маркіян Ільіч. Два гады ён праслужыў ва ўланскім палку, а потым не стала Рэчы Паспалітай, і ў адну ноч ён і яшчэ некалькі хлопцаў пераплылі раку Буг і апынуліся на тэрыторыі Беларусі. А праз два гады – новая вайна і новыя выпрабаванні, бадай, самыя цяжкія – германскія працоўныя лагеры. Пабывалі ў іх і прадзядуля з прабабуляй па матчынай лініі. Там, у 1943 годзе, у нямецкім горадзе Лерта нарадзіўся цудам і цудам выжыў мой дзядуля – Кучынскі Васіль.

Скончылася вайна. Вярнуліся з лагераў мае прабабуля і прадзядуля з сям'ёй, прыйшоў з фронта другі прадзед са шматлікімі падзякамі і медалём, і пачалося мірнае жыццё ў штодзённых клопатах і гаспадарчых справах. За шматгадовую добрасумленную працу прабабуля і прадзядуля былі ўзнагароджаны медалямі «Ветэран працы».

Нараджаліся дзеці – мае бабулі і дзядулі, хутка выраслі. Затым у іх таксама нарадзіліся дзеці – мае бацькі, дзядзькі і цёткі. А пасля ўжо ў іх, у маіх бацькоў, нарадзіліся я і мая сястра, у дзядзькоў і цётак – мае стрыечныя браты і сёстры. Праз змену ў часе пакаленняў працягваецца беларускі род – адна вялікая сям'я, якая складаецца і з тых, што жылі, і з тых, што жывуць і будуць жыць.

У наш час вялікая ўвага з боку дзяржавы і грамадства надаецца сям'і, але я лічу, што толькі ад саміх членаў гэтай сям'і залежыць, якой будзе гэта сям'я. А сапраўдная беларуская сям'я, на мой погляд, гэта тая сям'я, якая з гонарам глядзіць ў мінулае і з надзеяй у будучыню. Такой сапраўднай беларускай сям'ёй я і лічу сваю Сям'ю.

Таццяна СІНЯКІНА

Студэнтка факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі (ХТіТ)

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

Я хачу расказаць аб тым, як вайна паўплывала на лёс маёй сям'і. Бабуля і дзядуля майго бацькі ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзед мой да вайны жыў на тэрыторыі сучаснай Расіі, а бабуля жыла ўсё сваё жыццё на Беларусі. Дзед працаваў урачом у маленькай бальніцы, а бабуля вучылася. Але, калі настала вай-

на, і бабуля, і дзядуля пайшлі на фронт. Дзед пачаў працаваць урачом, а бабуля рашыла памагаць людзям, і яе ўзялі працаваць медсястрой. У час ваенных дзеянняў, калі мой прадзед быў на вайне, яго вельмі цяжа раніла ў нагу. І яго прыйшлося лячыць. Яму дапамагалі яго калегі, але ён усё роўна кульгаў на гэту нагу ўсё сваё жыццё. Потым, пасля ранення, яго перавялі на працу ў Беларусь, дзе ў той час працавала бабуля. Вось так яны і пазнаёміліся і адразу знайшлі агульную мову.

Калі закончылася вайна, дзядуля пераехаў на Беларусь, і яны ажаніліся. Купілі каля Оршы кавалак зямлі і пабудавалі там свой уласны дом. У ім яны і пражылі ўсё сваё жыццё. У іх трое дзяцей: бацькава матуля і двое яе братоў. Калі яны закончылі вясковую школу, то прыехалі вучыцца ў Мінск. Спачатку мая бабуля, яна старэйшая за ўсіх, а потым і яе браты. Але ўсё роўна яны наведвалі сваіх бацькоў. Калі я была маленькая, то таксама кожнае лета прыязджала да іх. Мне вельмі падабалася бываць у іх. На жаль, ніхто з іх не дажыў да цяперашняга часу. Спачатку памёр прадзед, а потым і прабабуля, яна пражыла больш за 90 гадоў.

Яшчэ я хацела сказаць, што ў маёй бабулі было шмат сясцёр і братоў. Некаторыя з іх загінулі ў час вайны. На іх вёску напалі фашысты. У доме былі толькі малыя дзеткі, але фашысты іх не пашкадавалі і амаль усіх расстралялі. Нават маленькую дзяўчынку, якой было ўсяго 4 месяцы.

Тыя, хто застаўся жыць, і зараз жывуць у той жа вёсцы, у вёсцы Высокае. Раз у год я з бацькамі наведваюся да іх. Гэта вельмі добрыя людзі. Там засталіся і магілы маіх родзічаў.

Вось так паўплывала вайна на лёс маёй сям'і.

Касандра ШАХАБ

Вучаніца пятага класа беларускамоўнай гімназіі №23 горада Мінска. Піша вершы і казкі, малюе, вывучае кітайскую мову. Унучка Кузьміч В. А., загадчыка кафедры беларускай мовы БДТУ.

Пажары — гэта цяжкія раны маёй зямлі

Эсэ

Аднойчы, калі мне было дзесьці пяць ці шэсць гадоў, бабуля села каля мяне і пачала расказваць страшэнную сямейную гісторыю пра тое, якія выпрабаванні выпалі на лёс маіх продкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая гісторыя глыбока кранула маё сэрца.

Тая жудасная вайна забрала ў маёй бабулі дзвюх яе родных сястрычак. Адна з іх, двухгадовая Валечка, была спалена зажыва разам з пяццюстамі жыхарамі

вёскі Бабовішча на Віцебшчыне. У полымі гэтага пажару палалі нявінныя жыцці. У полымі такіх пажараў гарэла Хатынь і яшчэ 627 беларускіх вёсак. Калі я пачула гэта, мне стала жудасна. Балючыя слёзы паліліся з маіх вачэй, сэрца сціснулася, а ў душы маланкава прамільгнулі жахлівыя ўрыўкі вайны, якой я (дзякуй Богу!) ніколі не бачыла. Доўгі час мы шукалі спаленую вёску-могілкі. Некалькі гадоў назад знайшлі толькі поле з маленькім помнічкам ахвярам страшнай трагедыі …

На тым полі звініць цяжкая цішыня, ад жаху ўспамінаў пра мінулае хочацца крычаць… Як можна?! Як можна спаліць жывых людзей?!... Часам мне здавалася, што агонь палае вакол мяне і я пасярод вогненнага кола. Я быццам чула галасы ахвяраў-душаў. І трывожна-шчымлівыя радкі напоўнілі маю душу.

На тым месцы, дзе шуміць трава,
Сплятаецца ў косы памяць.
Праз яе ціха ступаю я,
І сэрца ўспаміны раняць.
Дзесьці там, удалечыні,
Перад вамі я апускаюся,
І малітва ў маёй душы
Ціха-ціха нараджаецца…
Божа, злітуйся нада мною,
Над маёй роднай зямлёю,
Над тымі, хто душы аддаў
І смак жыцця не паспытаў…
Заўсёды ў маёй памяці
Ваш страшны боль застанецца,
Зямлі беларускай кветачкі,
Зусім маленькія дзетачкі,
Ахвяры страшэннай вайны...

Я да таго часу не разумела цану жыцця! Мая сям'я паказала мне, што пажар – гэта наступства, а галоўная бяда жыве ў чалавечых думках і ўчынках.

Цяпер я многа ведаю пра наша цяжкае мінулае, пра многія пажары войнаў і экалагічных катастроф. Але Беларусь наша, як птушка Фенікс, была адроджана з попелу пажарышчаў. Яна перамагла духоўнае і фізічнае вынішчэнне. Наша зямля – як кветка, якая нараджаецца і ніколі не адцвітае, як зорка Надзеі, якая ніколі не згасае.

Калі-небудзь я зраблю штосьці такое для Беларусі, што дапаможа людзям стаць больш добрымі, чулымі, адказнымі. І перш за ўсё для людзей, з якімі я побач. Я адчуваю адказнасць за сваю зямлю. Я павінна яе берагаць. Ад чаго? Ад пажараў бездухоўнасці і жорсткасці, якія нараджаюць пажары вайны. Ад пажараў зайздрасці і злосці, якія паляць душу чалавека. Ад пажараў чалавечай безадказнасці, якая стаіць за ўсімі экалагічнымі бедамі і катастрофамі.

У ідэале будучыню нашай зямлі і Беларусі я і сёння бачу так, як пяць гадоў таму назад.

Тады бацькі паслалі на міжнародны конкурс мой малюнак, які дэманстраваўся ў Жэневе каля будынка ЮНЕСКА сярод малюнкаў дзяцей з розных краін свету.



У цэнтры малюнка вялікае сонца як сімвал жыцця, да якога імкнуцца сонечныя людзі. І ўсім ім, людзям розных нацыянальнасцей, цёпла і радасна ў праменях агульнага сонца. Ніякія беды і нягоды не страшныя ім, бо яны жывуць у ладзе ды згодзе, а на такой планеце пажараў не бывае!

Я спадзяюся, што людзі, якія гэта прачытаюць, не будуць саманадзейнымі, жорсткімі і будуць любіць усіх і ўсё вакол нас. Маленькая запалка раўнадушша не павінна стаць вялікім полымем бесчалавечнасці!

Юлія ШЭМЕЛЬ

Студэнтка факультэта тэхналогіі
і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

Член літаратурнага клуба «Ветліца». Дыпламант рэспубліканскіх конкурсаў «Халакост. Гісторыя і сучаснасць» (2008), «Вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа» (2009), «Аўтограф» (2010). За ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф» атрымала Дыплом I ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Публіцыстыка».

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

Гора заўсёды прыходзіць тады, калі яго не чакаеш. Так і вайна...

Яна ўварвалася ў жыццё кожнай беларускай сям'і, гвалтоўна губячы душы, калечачы чалавечыя лёсы. І мабыць, у гэтыя гады сям'я стала сапраўднай

крэпасцю, моцнай апорай падчас ліхалецця ў, дзе можна было знайсці спакой і ўпэўненасць.

Вялікая Айчынная вайна стала не толькі трагедыяй у гісторыі нашага народа, але і трагедыяй кожнай сям'і паасобку. Не абмінула яна і маіх бабулю і дзядулю.

... Быў май 1944 года. Роўна год заставаўся да канца вайны. Здавалася, што нішто не магло азмрочыць надзею на перамогу, на шчаслівае выратаванне.

Май буяў, толькі гэтая квецень
Недарэчы і не да душы,
Бо за дротам – старыя і дзеці
Як ім выжыць? Як жыць ім, скажы?

Аднойчы непадалёку ад вёскі, дзе жывуць мае бабуля і дзядуля, узарваўся паліцай, які ехаў на парцы коней. Фашысты абвінавацілі ва ўсім парачан. За гэтую страту немцы выбралі васьмёра мужчын, роўна столькі, колькі было конскіх ног. Загадалі капаць яму. А потым, паставіўшы васьмярых на яе краі, – расстралялі. Сярод іх быў і мой прадзядуля – Матэцкі Франц Іосіфавіч:

І вялі іх, нявінных ахвяраў,
Праз дзве вёскі, на поле, туды,
Дзе, як гром, як маланка, ударыў
Стрэл. Разнеслася рэха бяды.

Напужаныя вайной, людзі выносілі з хат найбольш каштоўнае і закопвалі ў зямлі, каб ніхто не знайшоў.

У хуткім часе вёска была поўнасцю спалена. Так як печы не гарэлі, у іх закладвалі міны, якія потым узрывалі. Па шчаслівай выпадковасці адна з мін не ўзарвалася. І на ўсю вёску засталася адна печ, праўда, без хаты.

Усіх парачан сагналі ў канцэнтрацыйны лагер. Колькі жудасных момантаў перажылі тады людзі, асабліва маці! Як няпроста ім было глядзець у галодныя вачаняткі сваіх дзяцей, ці, што яшчэ жудасней, прыціскаць да грудзей нежывое цела. Але яны трымаліся, бо іншага выбару ў іх проста не было:

Не забуду той лагерны голад
І грудное дзіцё на руках.
Памірае. У душы – той жа холад,
Няма ў мамкі яго малака.

Але і тых нямногіх, што вытрымалі пакуты, магло ўвогуле не застацца.

... Акупацыя блізілася да канца. Немцы вымушаны былі адступаць, але пакідаць пасля сябе яны нічога не хацелі. І ў адну з раніц усіх зняволеных вывелі на вуліцу і паставілі на краі ямы. Маю бабулю (Матэцкую Галіну Францаўну – ёй было 7 год) хаваў пад крысо паліто родны дзядзька, каб хоць неяк засланіць дзіцё ад небяспекі.

Колькі страху і душэўных хваляванняў перажылі «маленькія чалавечкі», калі глядзелі ў вочы смерці! Хочацца жыць, радавацца – а ў цябе бяздумна забіраюць гэтае права.

І тут да начальніка лагера падышоў перакладчык, жыхар гэтай вёскі, нешта яму сказаў, і расстрэл адмянілі.

Шчаслівае выратаванне!.. Здавалася б, гэта можа быць толькі ў казцы. Але, магчыма, нейкая еднасць, павага да землякоў дапамагла ў гэты момант.

Вярнуўшыся ў вёску, пагарэльцы знайшлі там адзінокую печ. Тых клункаў, якія яны закопвалі напярэдадні, не было, бо жыхары суседняй вёскі думалі,што ўжо ніхто сюды не вернецца.

Прыйшлося пачынаць усё спачатку. 13-гадовыя хлопчыкі самі будавалі хаты, бо з дарослых мужчын амаль нікога не засталося. Агульнае гора, трагедыя згуртавалі ўсіх ў адзіную і цэлую сям'ю, якая не ведала спакою, пакуль будаўніцтва не было завершана.

Дзеці, не па гадах дарослыя, ведаючы цану хлебу, жыццю, адчувалі сябе нароўні са старэйшымі. Можа, таму і да выпрабаванняў ставіліся з выключнай пярплівасцю і самастойнасцю. Але яны вытрымалі, выжылі, і нават складанасці часу не маглі аспрэчыць гэтага факту.

Сям'я стала сэнсам працягу жыцця, той духоўнай тэрыторыяй, дзе кожны адчуваў сябе моцным і нязломным.

Нягледзячы на бесчалавечыя абставіны, ваеннае пакаленне здолела захаваць і перадаць нашчадкам добразычлівасць, узаемадапамогу, паважлівыя адносіны да старэйшых, працавітасць і спагадлівасць.

Хочацца перагарнуць ваенныя гады, як старонкі ў кнізе, забыцца на іх. Але яны пакінулі глыбокі след у памяці. І чым больш жудасны ён, тым ярчэйшы агеньчык памяці, які гарыць і днём і ноччу, гарыць і ў летнюю спякоту і ў лютую сцюжу, гарыць, як боль у матчыным сэрцы, не ведаючы, што такое забыццё.

Вікторыя ЯНУШ

Студэнтка факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі (ХТіТ)

Вайна праз лёс маёй сям'і

Эсэ

Вялікая Айчынная вайна прынесла вялікае гора на тэрыторыю Беларусі, дзе загінула вельмі шмат дарослых людзей і малых дзетак.

У той час маёй бабулі было ўсяго 4 гады. Калі пачалася вайна, мой прадзед адразу пайшоў у ваенкамат, і ў той жа дзень яго забралі на фронт. Бабуля мая засталася з маці, братам і сястрычкамі. Праз 5 дзён немцы захапілі вёску. Раніцай шостага дня яны павялі ўсіх жанчын на расстрэл. Так бабуля мая засталася без маці. Разам з сястрычкамі і братам яны збеглі ў лес, дзе іх знайшла і забрала да сябе адна жанчына, якая стала для іх новай маці.

Мая бабуля і зараз памятае ўсё тое, што было тады, як быццам гэта было толькі ўчора:

«Вельмі часта былі чуваць моцныя выбухі. Яны працягваліся дзень і ноч, ім не было ні пачатку, ні канца. Немцы расстрэльвалі ўсіх, хто трапляўся ім на вочы, нягледзячы на тое, стары гэта ці малы. Вельмі моцна хацелася есці, але нічога ўжо не было, бо немцы ўсё забралі. Гэта быў вельмі цяжкі час…»

Прадзед вярнуўся дамоў з залатым медалём, ажаніўся з той жанчынай, якая стала маці яго дзецям.

Бацька майго прадзеда таксама ўдзельнічаў у абароне радзімы, але з вайны ён не вярнуўся.

Вайна – гэта вельмі цяжкі час для кожнага чалавека. Мы павінны ўсімі намаганнямі дабівацца міру на зямлі.

НАВУКОВА-ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ

Алена ЕЎСЯВІЦКАЯ

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

За ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф» атрымала Дыплом II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Публіцыстыка».

Кіраўнік: Кузьміч В. А., загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік адукацыі БССР, выдатнік адукацыі

Вялікая Айчынная вайна вачыма маладых

Гэта трэба не мёртвым – гэта трэба жывым

Уступ

Дзве даты назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю чалавечай цывілізацыі — 22 чэрвеня 1941 г. і 9 Мая 1945 г. Іх раз'ядноўвае 1418 дзён і начэй, апаленых разлютаваным полымем бязлітаснай, разбуральнай і кровапралітнай вайны. А аб'ядноўвае гераічная барацьба народаў былога Савецкага Саюза з фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі.

Незвычайная ў гісторыі па маштабах і жорсткасці Вялікая Айчынная вайна завяршылася Вялікай Перамогай 65 гадоў назад. Але і сёння яе боль адгукаецца ў сэрцах не толькі ветэранаў, але і ў моладзі.

Юбілей Перамогі зноў ускалыхнуў хвалю грамадскага інтарэсу да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мільёны людзей ва ўсім свеце перагортваюць яе старонкі, насычаныя крывёю, імкнуцца ўлічыць урокі мінулага, каб даць адказы на выклік сучаснасці. Усё далей у глыб гісторыі адыходзяць падзеі вайны, але значэнне нашай Перамогі не гасне ў вачах грамадства, наадварот, набывае больш сэнс, становіцца больш рэльефным на фоне сучасных палітычных рэалій.

Юбілей Перамогі беларускі народ разам з народамі іншых краін свету адзначае як самае вялікае, агульнае свята. І гэта зразумела. Вайна аказалася галоўнай справай старэйшага пакалення, яна склала цэлую эпоху ў гісторыі беларускага народа, як і ўсіх народаў былога СССР, увабраўшы ў сябе лёс мільёнаў людзей, гора, пакуты, ахвяры. Але было і іншае: вайна распраміла людзей, вынесла на паверхню лепшыя іх якасці, усё добрае, узнёслае, што хавалася ў душах: самаадданы патрыятызм, з'яднанасць і дружбу братніх народаў. Такога чыстага праяўлення любові да сваёй Айчыны, такога ахвярнага напалу і гатоўнасці аддаць жыццё за яе больш не было ніколі.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў апошні час інтэнсіўна распрацоўваецца ў СМІ, выдаюцца шматлікія кнігі, брашуры, артыкулы аб вялікай Перамозе. Нярэдка інфармацыя (асабліва ў СМІ) падаецца даволі супярэчлівая, што выклікае

сур'ёзную палеміку. Сёння, як гэта ні прыкра, не толькі за мяжой, але і ў нашай літаратуры няма адназначнай ацэнкі Вялікай Айчыннай вайны і дасягнутай у ёй перамогі. Разам з прызнаннем сусветнагістарычнага значэння перамогі над фашызмам усё больш гучыць меркаванняў, якія наогул адмаўляюць ёй у станоўчай ацэнцы. Чуюцца нават галасы аб дарэмнасці супраціўлення фашысцкаму нашэсцю, аб памылковасці пазіцыі заходніх краін, што сталі на бок Савецкага Саюза. На думку прыхільнікаў такіх сцвярджэнняў, супраціўленне фашызму і перамога над ім мелі рэгрэсіўнае значэнне, паколькі затрымалі крушэнне камуністычнага рэжыму. Адсюль вынікае, што і ўласаўцы, і паліцэйскія, і дэзерціры, і іншыя здраднікі былі дальнабачнымі, прагрэсіўнымі людзьмі, бо яшчэ тады пачалі барацьбу супраць сталінскага рэжыму, а тыя, хто змагаўся на фронце, у партызанах, падполлі, большасць нашага народа, аказаліся несвядомай, непаўнацэннай масай.

Нягледзячы на гістарычную абсурднасць і амаральнасць такіх меркаванняў, ад іх нельга адмахвацца, таму што гістарычны нігілізм, скажэнне сапраўдных фактаў, тэндэнцыйны каментарый у друку, на тэлебачанні, у школьных і студэнцкіх падручніках прымушаюць недасткова інфармаваных людзей верыць усёй гэтай бязглуздзіцы.

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў нашу гісторыю як небывалая па жорсткасці, трагізму і гераізму барацьба народаў супраць гітлераўскага фашызму. Шлях да Перамогі быў доўгім і цяжкім. Цікавасць да падзей тых гадоў, да асэнсавання наступстваў і ўрокаў вайны не слабее. Яна тлумачыцца і той роляю, якую адыграла вайна ў жыцці нашага народа, часткова недасканалымі адказамі на многія пытанні, якія ўжо вырашаны нашым часам.

Вялікая Перамога над дзяржавамі агрэсіўнага блока была атрымана ў імя міру і жыцця на Зямлі. Яна аказала велізарнае ўздзеянне на ўвесь ход сусветнага развіцця ўжо таму, што аб'ектыўна з'явілася гістарычным прысудам фашызму і мілітарызму пераканаўчым пацвярджэннем важнасці аб'яднання самых розных палітычных, сацыяльных, ідэалагічных сіл супраць ваеннай пагрозы, усякага роду рэваншызму, фашызму і неафашызму.

Аб'ектыўныя гістарычныя матэрыялы і факты сведчаць: рашаючы ўклад у вызваленне народаў Еўропы і Азіі ад фашысцкага рабства, у выратаванні сусветнай цывілізацыі ўнеслі народы Савецкага Саюза і Савецкія Узброеныя Сілы.

Але ў апошнія гады прыкметна пацішэла патрыятычная дзейнасць у нашых школах, маладзёжных арганізацыях. Усё гучней сталі чуваць галасы скептыкаў: «Пра вайну шмат навыдумляна», «Гэта тэма ўжо надакучыла», «Не варта было змагацца за тое, што мы маем сёння», «Мы змагаліся не за тое, што трэба...»

Крыўдна і балюча слухаць такія думкі ад юнакоў, якія не бачылі вайны, не зведалі ўсіх пакут. Аднак моладзь — гэта люстэрка грамадства, і калі мы размаўляем пра недахопы ў патрыятычным выхаванні, то карані іх неабходна шукаць у неэфектыўнай працы педагогаў, вучоных, палітыкаў.

Маладое пакаленне беларусаў выхоўваецца ва ўмовах палітычнай нестабільнасці ў свеце, моладзь з'яўляецца найменш устойлівай часткай насельніцтва. Таму яна жыва ўспрымае ўсе палітычныя і сацыяльныя хваляванні

ў грамадстве, у тым ліку і негатыўныя. Мы павінны абараніцца ад адмоўнага ўплыву неанацызму, навязвання ілжывага ўспрымання Другой сусветнай вайны, змяншэння ролі савецкага народа ў справе Вялікай Перамогі.

У апошнія часы сусветнае супольніцтва сутыкнулася з феноменам неанацызму, які праяўляецца ў частковым апраўданні фашызму, праслаўленні былых членаў арганізацыі «Ваффен СС» і рэанімацыі яе расавай і нацыянальнай нецярпімасці. Самае дзіўнае, што нават некаторыя палітыкі і навукоўцы спрабуюць перапісаць гісторыю. Згадаем: яшчэ падчас святкавання 60-годдзя Перамогі прэзідэнт Латвіі В. Віке-Фрэйберга заявіла аб сваім незадавальненні тым, што правядзенне міжнароднага святкавання адбудзецца ў Маскве, бо змаганне Савецкай арміі з фашысцкімі захопнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, па яе словах, латышы ўспрымаюць як савецкую акупацыю, рэабілітуючы такім чынам латышскіх ветэранаў СС. І нават сёння даводзіцца чуць галасы аб адмаўленні Халакосту, што зусім не даравальна, калі гэта чуеш ад каталіцкіх высокапастаўленых асоб.

Калі палітыкі такога высокага ўзроўню дапускаюць рэабілітацыю фашысцкіх зверстваў, то гэта знаходзіць свой адбітак і на выхаванні сучаснай моладзі. У свядомасці маладых людзей, якія зусім не ведаюць вайну, фарміруюцца нігілістычныя адносіны да мінулага. У той жа час у сучаснай моладзі фарміруюцца няправільныя маральныя прыярытэты пад уплывам масавай культуры. Гэта сведчыць аб палітычнай некарэктнасці і праявах непавагі да старэйшага пакалення, якое прайшло вайну, аб несфарміраванасці маральных прыярытэтаў у ацэнцы вайны, нацыяналізму, антысемітызму, ксенафобіі, расавай або рэлігійнай нецярпімасці. Каб выхаваць у маладых людзей каштоўнасці, створаныя стагоддзямі, іх асноўнымі маральнымі арыенцірамі павінны быць культурна-цывілізаваныя і ваенна-гістарычныя аспекты.

Так, вайна пакінула крывавы след у гісторыі нашага народа, у кожнай беларускай сям'і, яе лёсе. Нават тыя, каму ўдалося выжыць, вярталіся з вайны інвалідамі, духоўна скалечанымі людзьмі. Ці ж такое забываецца?! У Беларусі загінуў кожны трэці яе жыхар. Сума матэрыяльных страт Беларусі склала 75 млрд. руб. (у цэнах 1941 г.). Спалены поўнасцю ці часткова знішчаны фашыстамі 9200 беларускіх вёсак. Такое не забываецца.

«Гістарычная памяць — аснова патрыятызму», — сказаў Прэзідэнт краіны А. Р. Лукашэнка. І гэта сапраўды так. Нам, моладзі, трэба шанаваць гэтую памяць і данесці яе наступным пакаленням.

Ацэнка дасведчанасці вучняў мінскіх школ адносна падзей Вялікай Айчыннай вайны

Ва ўмовах такога рознага стаўлення да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі выхоўваецца новае пакаленне беларусаў, далёкае ад падзей Вялікай Айчыннай вайны. Якім чынам маладое пакаленне ўспрымае гэтую вайну? Які вобраз Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца прыярытэтным для маладых людзей, улічваючы тое, што інфармацыя аб ёй перадаецца так супярэчліва? З аднаго боку, адносіны да Вялікай Айчыннай вайны ў маладога чалавека фарміруюцца падчас яе вывучэння ў школе. Аднак ці ўражваюць урокі

гісторыі падлеткаў так, як уражвае матэрыял, пададзены ў СМІ? Увогуле, ці цікавіць сучаснага маладога чалавека гісторыя Вялікай Айчыннай вайны? Ці ўсведамляюць маладыя людзі сябе нашчадкамі народа, які спыніў «карычневую навалу», ахвяраваў сабой дзеля свабоды нашай краіны і мірнага жыцця?

Здаецца, не цікавіцца гэтым проста нельга. Трагедыя Вялікай Айчыннай вайны закранула фактычна кожную беларускую сям'ю, пакінуўшы невылечную рану ў сэрцах родных і блізкіх. Не ў кожнай сям'і былі непасрэдныя ўдзельнікі ваенных дзеянняў на фронце, але былі і партызаны, і падпольшчыкі, і проста жыхары акупаваных тэрыторый, якім прыходзілася выжываць у жудасных умовах, і людзі, якія зведалі на сабе ўсе жахі фашысцкіх канцлагераў. Ці ведаюць маладыя людзі пра тыя выпрабаванні, праз якія вымушаны былі прайсці іх родныя, ці цікавяцца яны іх лёсам, гісторыяй сваёй сям'і? Гэтыя пытанні былі пакладзены ў аснову даследавання. Гісторыя вайны, разгледжаная ў маштабе лёсу аднаго чалавека, выклікае значна большую цікавасць, чым сухія факты і лічбы школьных падручнікаў.

Менавіта таму мэта даследавання — выяўленне ступені дасведчанасці старшакласнікаў аб Вялікай Айчыннай вайне і яе ролі ў гісторыі нашага народа.

Даследаванне праводзілася метадам анкетнага апытання з выкарыстаннем элементаў інтэрв'ю. У ходзе даследавання былі апытаны 434 рэспандэнты — вучні 8–11 класаў СШ № 210 з эстэтычным ухілам і агульнаадукацыйнай СШ № 200. Ім была прапанавана анкета з наступнымі пытаннямі:

1. Што Вы ведаеце аб Вялікай Айчыннай вайне?
2. Якія подзвігі беларусаў Вам вядомы?
3. Які з іх Вас найбольш уразіў?
4. Паспрабуйце вызначыць ролю беларускага народа ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайне.
5. Дзе знаходзіліся Вашы родныя ў час Вялікай Айчыннай вайны?
6. Ці прымалі яны актыўны ўдзел у змаганні з фашыстамі?
7. Якія гісторыі таго часу захаваліся ў Вашай сям'і?
8. Як паўплывала Вялікая Айчынная вайна на сённяшняе жыццё Беларусі і яе імідж у сусветным супольніцтве?

Былі вырашаны наступныя задачы:

– выявіць ступень дасведчанасці рэспандэнтаў па кожным пытанні анкеты;

– параўнаць дасведчанасць вучняў, якія толькі што вывучалі гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, з астатнімі;

– параўнаць дасведчанасць вучняў, якія не вывучалі гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, з астатнімі;

– выявіць, які вобраз вайны з'яўляецца для рэспандэнтаў прыярытэтным: сфарміраваны школай, СМІ ці сямейнай гісторыяй.

Аналіз вынікаў даследавання

Былі атрыманы наступныя вынікі:

На пытанне «Што Вы ведаеце аб Вялікай Айчыннай вайне?» вучні адказалі наступным чынам:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: 40% рэспандэнтаў указвалі толькі краналагічныя рамкі вайны; 30% — асобныя факты з гісторыі (што сведчыць аб частковым валоданні інфармацыяй); 19% апытаных паказалі добрыя веды ў межах школьнай праграмы; 9% вучняў зададзенае пытанне выклікала цяжкасці пры адказе; 2% вучняў увогуле давалі памылковыя звесткі.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 39% рэспандэнтаў указвалі толькі краналагічныя рамкі вайны; 28% — асобныя факты з гісторыі (што сведчыць аб частковым валоданні інфармацыяй); 9% — паказалі добрыя веды ў межах школьнай праграмы; 24% вучняў зададзенае пытанне выклікала цяжкасці пры адказе; у рэспандэнтаў СШ № 200 адказаў з памылковымі звесткамі не аказалася.

Другое і трэцяе пытанні аб найбольш вядомых подзвігах беларусаў выклікала цяжкасці:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: 19% вучняў не змаглі ўказаць ні аднаго подзвігу; 21% рэспандэнтаў прыводзілі ў прыклад подзвігі і герояў, звесткі аб якіх яны атрымалі са школьнай праграмы, і паказалі добрае валоданне матэрыяламі школьных падручнікаў; 21% апытаных пісалі толькі агульныя звесткі аб подзвігу ўсяго беларускага народа; 17% вучняў у сваіх адказах указвалі толькі імёны герояў; 16% вучняў — наадварот, толькі іх подзвігі — гэта сведчыць аб няпоўным валоданні фактычным матэрыялам; 6% рэспандэнтаў далі няправільныя звесткі, памылкова ўказваючы герояў (І.Сусаніна), блытаючы герояў і здзейсненыя імі подзвігі.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 13% вучняў не змаглі ўказаць ні аднаго подзвігу; 45% рэспандэнтаў прыводзілі ў прыклад подзвігі і герояў, звесткі аб якіх яны атрымалі са школьнай праграмы, і паказалі добрае валоданне матэрыяламі школьных падручнікаў; 3% апытаных пісалі толькі агульныя звесткі аб подзвігу ўсяго беларускага народа; 17% вучняў школ у сваіх адказах указвалі толькі імёны герояў; 11% вучняў — наадварот, толькі іх подзвігі — гэта сведчыць аб няпоўным валоданні фактычным матэрыялам; 11% рэспандэнтаў далі няправільныя звесткі, памылкова ўказваючы герояў (І. Сусаніна), блытаючы герояў і здзейсненыя імі подзвігі.

На жаль, і з чацвёртым заданнем (вызначэнне ролі беларускага народа ў Другой сусветнай вайне) большасць рэспандэнтаў не справіліся ўвогуле або выканалі яго няправільна:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: 53% вучняў не справіліся з пытаннем; 47% вучняў правільна вызначылі ролю беларусаў і іх уклад у справу вялікай Перамогі.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 54% вучняў не справіліся з пытаннем; 46% вучняў правільна вызначылі ролю беларусаў і іх уклад у справу вялікай Перамогі.

Пятае і шостае пытанні дапамаглі вызначыць, наколькі добра нашы равеснікі знаёмы з гісторыяй сваёй сям'і ў гады вайны:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: 31% — родныя прымалі непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях на фронце; 30% апытаных сцвярджаюць, што іх родныя падчас вайны знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі, але актыўнага ўдзелу ў змаганні з фашысцкімі захопнікамі не прымалі; 9% вучняў — хтосьці з родных быў у палоне ці канцэнтрацыйным лагеры; 3% вучняў — на прымусовых працах у Германіі;

6% рэспандэнтаў маюць родных — удзельнікаў партызанскага руху; 4% — родныя супрацоўнічалі з партызанамі; 1% вучняў — родныя знаходзіліся ў тыле. На жаль, 16% апытаных не змаглі адказаць на пастаўленыя пытанні, а гэта сведчыць аб адсутнасці цікаўнасці да свайго асабістага мінулага, гісторыі сваёй сям'і.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 40% — родныя прымалі непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях на фронце; 26% апытаных сцвярджаюць, што іх родныя падчас вайны знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі, але актыўнага ўдзелу ў змаганні з фашысцкімі захопнікамі не прымалі; 9% вучняў з родных быў у палоне ці канцэнтрацыйным лагеры; 2% вучняў — на прымусовых працах у Германіі; 6% рэспандэнтаў маюць родных — удзельнікаў партызанскага руху; 4% — родныя супрацоўнічалі з партызанамі; 1% —родныя знаходзіліся ў тыле; 10% апытаных не змаглі адказаць на пастаўленыя пытанні, а гэта сведчыць аб адсутнасці цікаўнасці да свайго асабістага мінулага, гісторыі сваёй сям'і.

У сёмым заданні, у якім неабходна было ўспомніць адну з сямейных гісторый перыяду вайны, ставілася мэта высветліць асабістую зацікаўленасць падлеткаў у веданні гісторыі сваёй сям'і. У выніку высветлілі:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: толькі 5% вучняў у поўнай ступені валодаюць інфармацыяй аб гісторыі сваёй сям'і; 42% рэспандэнтаў валодаюць інфармацыяй часткова і ведаюць толькі найбольш цікавыя факты з жыцця сваіх продкаў.

Астатняя частка апытаных не ведаюць ніякіх сямейных гісторый ваеннага перыяду па розных прычынах: 45% вучняў — таму што самі не цікавяцца гэтай тэмай; 4% — таму што ўжо няма жывых сведак вайны; 4% вучняў — таму што тэма вайны у сям'і па нейкіх прычынах не абмяркоўваецца.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 5% вучняў у поўнай ступені валодаюць інфармацыяй аб гісторыі сваёй сям'і; 36% рэспандэнтаў валодаюць інфармацыяй часткова і ведаюць толькі найбольш цікавыя факты з жыцця сваіх продкаў.

Астатняя частка апытаных не ведаюць ніякіх сямейных гісторый ваеннага перыяду па розных прычынах: 52% вучняў — таму што самі не цікавяцца гэтай тэмай; 4% — таму што ўжо няма жывых сведак вайны; 3% вучняў — таму што тэма вайны у сям'і па нейкіх прычынах не абмяркоўваецца.

Апошняе пытанне «Як паўплывала Вялікая Айчынная вайна на сённяшняе жыццё Беларусі і яе імідж у сусветным супольніцтве?» аказалася найбольш цяжкім для адказу:

СШ № 210 з эстэтычным ухілам: 45% рэспандэнтаў так і не здолелі на яго адказаць; 39% апытаных лічаць, што ўклад беларускага народа ў справу перамогі ўзняў аўтарытэт нашай краіны ў свеце і паўплываў на фарміраванне беларусаў як нацыі; 13% вучняў засяроджваюць увагу на негатыўных праяўленнях вайны, такіх, як шматлікія разбурэнні, знішчэнні вялікай колькасці мірнага насельніцтва, пасляваенны эканамічны крызіс і інш; 3% апытаных лічаць, што Вялікая Айчынная вайна ўвогуле не аказвае ніякага ўплыву на сённяшняе становішча краіны і з'яўляецца проста часткай гісторыі мінулага Беларусі.

Агульнаадукацыйная СШ № 200: 36% рэспандэнтаў так і не здолелі на яго адказаць; 44% апытаных лічаць, што ўклад беларускага народа ў справу перамогі

ўняў аўтарытэт нашай краіны ў свеце і паўплываў на фарміраванне беларусаў як нацыі; 20% вучняў засяроджваюць увагу на негатыўных праяўленнях вайны, такіх, як шматлікія разбурэнні, знішчэнні вялікай колькасці мірнага насельніцтва, пасляваенны эканамічны крызіс і інш; 1% апытаных лічаць, што Вялікая Айчынная вайна ўвогуле не аказвае ніякага ўплыву на сённяшняе становішча краіны і з'яўляецца проста часткай гісторыі мінулага Беларусі.

Параўнаўшы адказы вучняў СШ № 200 і СШ № 210 з эстэтычным ухілам, мы прыйшлі да высноў, што дасведчанасць рэспандэнтаў абедзвюх школ знаходзіцца прыкладна на адным узроўні незалежна ад статусу школы, у якой яны вучацца (агульнаадукацыйная ці з эстэтычным ухілам).

Таксама мы прыйшлі да высновы, што фактычным матэрыялам па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны лепш за іншых валодаюць вучні 9 класаў, якія непасрэдна ў студзені скончылі вывучэнне гэтага перыяду. Веды вучняў 8, 10 і 11 класаў знаходзяцца прыкладна на адным ўзроўні. Аднак трэба адзначыць, што адзінаццацікласнікі ў большай ступені асэнсоўваюць гістарычныя падзеі, іх значэнне і ролю ў сусветнай гісторыі на прыкладах свайго народу.

Самы тыповы адказ на пытанне аб тым, што яны ведаюць аб Вялікай Айчыннай вайне, быў наступны:

— Вялікая Айчынная вайна пачалася 22 чэрвеня 1941 г. Распачала вайну Германія, нечакана напаўшы на СССР. Скончылася вайна перамогай СССР 9 мая 1945 года.

— Кожную гадзіну на палях вайны гінула 14104 чалавека, кожную хвіліну — 10 чалавек, 6 секунд забіралі жыццё аднаго чалавека. Мова лічбаў скупая, але вы толькі ўявіце, што калі б мы захацелі ўшанаваць памяць кожнага з загінуўшых у вайне хвілінай маўчання, то чалавецтву прыйшлося б анямець на 20 мільёнаў хвілін, на 38 з лішнім гадоў. (10 клас СШ № 210)

Самым цікавым, на наш погляд, адказам аб подзвігах беларусаў, які сустрэўся ў анкетах толькі аднойчы, быў аб подзвігу А. Р. Мазанік, Н. В. Траян, М. Б. Восіпавай, якія былі удзельніцамі аперацыі па знішчэнні генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ 22 верасня 1943 г.

У анкетах сустракаліся адказы, якія сведчаць аб тым, што вучні блытаюць падзеі і герояў розных гістарычных эпох. Напрыклад:

— Мяне найбольш уразіў подзвіг І. Сусаніна, які завёў вялікую нямецкую армію ў лес, якія больш адтуль не выйшлі, і сам па-геройску загінуў.

Тыповымі фармулёўкамі аб ролі беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне былі наступныя:

— Самы вялікі подзвіг, які быў здзейснены ў час вайны, — гэта подзвіг народа. Беларускі народ вылучыўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны стойкасцю і сілай духу. Мы сталі першымі на шляху фашыстаў. Дзякуючы барацьбе беларускага народа быў сарваны план «маланкавай вайны» фашыстаў і з'явіўся час для падрыхтоўкі абароны Масквы.

— На тэрыторыі Беларусі дзейнічала вялікая колькасць партызанскіх атрадаў, была разгорнута актыўная падпольная дзейнасць. Адной з найбуйнейшых

аперацый партызан стала «рэйкавая вайна», падчас якой былі знішчаны многія чыгуначныя камунікацыі ворага.

Адказы на апошняе пытанне аб уплыве Вялікай Айчыннай вайны на сённяшняе жыццё Беларусі і яе іміджы ў свеце, былі самыя разнастайныя:

— Гэта вайна паўплывала на наша жыццё і нашу культуру. У Беларусі створана шмат кінастужак на ваенную тэматыку, беларускія пісьменнікі, такія як І. Шамякін, В. Быкаў, А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Танк, звярталіся да падзей Вялікай Айчыннай вайны ў сваіх творах. Шмат музеяў выстаўляюць экспазіцыі па тэме Вялікай Айчыннай вайны, якія вяртаюць нас у тыя цяжкія гады нашых дзядоў і бабуль.

— Калі б не было Вялікай Айчыннай вайны, мабыць, чалавек не задумваўся б аб тым, што сваю Радзіму трэба шанаваць, любіць, абараняць яе і захоўваць сваю гістарычную спадчыну, бо ў любы момант мы можам страціць яе.

На мой погляд, на імідж нашай краіны Вялікая Айчынная вайна ніяк не паўплывала. Па-першае, мала хто ведае ў свеце, што ўвогуле існуе такая краіна, як Беларусь. А па-другое, тыя краіны, што ўваходзілі ў антыгітлераўскую кааліцыю, прызнаюць перамогу сваёй заслугай. Але памяць аб перажытым і нянавісць да ворагаў застануцца назаўсёды ў душах беларусаў.

Заключэнне

Такім чынам, прааналізаваўшы сабраную інфармацыю, мы прыйшлі да агульных высноў: веды сучасных школьнікаў аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны фарміруюцца школай, а не сямейным выхаваннем ці СМІ і з'яўляюцца дастаткова павярхоўнымі. На вывучэнне тэмы вайны ў школьнай праграме адведзена недастаткова часу. Нельга абмяжоўваць вывучэнне гісторыі сваёй краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны некалькімі гадзінамі, падчас якіх нават фактычны матэрыял немагчыма засвоіць у поўнай ступені.

Вельмі добра, што ў 2006 годзе быў уведзены новы абавязковы курс «Вялікая Айчынная вайна». Ён паглыбіць веды школьнікаў, дасць ім магчымасць па-новаму асэнсаваць вайну. Аднак, на наш погляд, такі курс павінен уводзіцца не ў 11 класе, калі ў вучняў ужо ў значнай ступені сфарміравана ўяўленне аб асноўных падзеях вайны, а значна раней, каб з маленства дзеці ўсвядомілі сябе нашчадкамі народа, які здолеў перамагчы фашысцкіх захопнікаў.

Галоўнай матывацыяй пры вывучэнні Вялікай Айчыннай вайны, як і любой іншай тэмы, для вучняў з'яўляецца сацыяльная: жаданне атрымаць высокую адзнаку. Таму набытыя веды нетрывалыя, бо наша памяць захоўвае толькі тое, што асэнсавана намі на эмацыянальным і духоўным узроўні, што «прапушчана праз сябе». Таму адсутнасць у падручніках матэрыялу, які даваў бы магчымасць «ажывіць» герояў, дапамагчы зразумець матывы іх учынкаў, асэнсаваць усе жахі вайны негатыўна ўплывае на фарміраванне вобразу вайны ў падлеткаў. Аналіз гістарычных падзей мінулага дапамагае знаходзіць выйсце з сучасных канфліктных сітуацый.

Мы лічым, што ўсім нам трэба задумацца аб будучыні нашай краіны. Што будзе з краінай, калі яе маладое пакаленне забываецца на яе гістарычную спадчы-

ну, калі маладыя людзі перастаюць цікавіцца не толькі гісторыяй сваёй краіны, але і асабістай гісторыяй сваёй сям'і? Мы рызыкуем паўтарыць памылкі нашых продкаў, калі не будзем лічыцца з тымі ўрокамі, якім навучыла нас гісторыя. Мы павінны рабіць усё магчымае, каб Вялікая Перамога засталася з намі, стала сучаснасцю, легла ў падмурак нашай ідэалогіі, а не ўспрымалася як частка гісторыі.

Многія з удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны яшчэ жывуць сярод нас, і мы маем не шмат часу для таго, каб дазволіць ім сказаць свае словы гісторыі, якую яны некалі стваралі. А праўда аб вайне, памылках мінулага нам вельмі патрэбна, асабліва цяпер. Менавіта ў гэты час, калі перад нашай краінай стаіць пытанне аб фарміраванні нацыянальнай ідэалогіі, праблема пошуку асабістага шляху, тых каштоўнасцей, якія будуць пакладзены ў падмурак новай дзяржавы, мы павінны звярнуцца да нашага гістарычнага мінулага. Трэба ўсвядоміць, што нельга пабудаваць новае дэмакратычнае грамадства, калі замест мінулай хлусні ці ўпрыгожвання гісторыі будуць пладзіцца новыя фальсіфікацыі. Да якога больш справядлівага жыцця можна прыйсці на пустым месцы, без сапраўднага і моцнага падмурку?

Наша Перамога вартая таго, каб ёй ганарыліся не толькі мы, але і нашы нашчадкі, людзі на ўсёй планеце, таму што гэта агульная Перамога ўсіх народаў над фашызмам. Памяць аб ёй не павінна служыць сродкам канфрантацыі ні ў нашай краіне, ні за мяжой. Наадварот, яна прызначана яднаць людзей на шляху да лепшай будучыні. На тое вельмі спадзяваліся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

9 Мая адзначаецца нашымі людзьмі як свята і асабістае, і сямейнае, і дзяржаўнае, і інтэрнацыянальнае. Зноў і зноў углядаемся ў падзеі Вялікай Айчыннай вайны, імкнёмся глыбей зразумець значэнне бітваў, якія адбыліся на беларускай зямлі і адыгралі важную ролю на шляху да поўнай перамогі над фашысцкай Германіяй. Цяжкім быў гэты шлях. Памяць аб ўсіх, хто не вярнуўся з фронту, хто загінуў, абараняючы зямлю сваіх бацькоў, свяшчэнная. Яна – галоўны фактар дзяржавы. Не будзе такой памяці — не будзе і дзяржавы.

Але вынікі і ўрокі Вялікай Айчыннай вайны накіраваны не толькі ў мінулае. Калі глядзіш на сучаснае палітычнае становішча ў свеце, разумееш, што не ўсведамляюць нашы сучаснікі ўсіх жахаў вайны, не жадаюць вучыцца на памылках мінулых пакаленняў. Гэта знаходзіць свой адбітак у развязванні лакальных войнаў, патуранні міжнароднаму тэрарызму, экспансіі «бархатных» рэвалюцый, прапагандзе культу насілля і нажывы. Людзі забываюцца на тыя жудасныя падзеі, якія ўскалыхнулі ўсю Еўропу 65 гадоў назад: забываюцца на Асвенцым і тыя 1,5 млн. чалавек, якіх знішчылі там гітлераўцы, на ўрокі Халакосту — мэтанакіраванага і жудаснага знішчэння яўрэйскага насельніцтва фашыстамі (6 млн.), на кожнага трэцяга беларуса, забітага падчас Вялікай Айчыннай вайны. Але на гэта нельга забыцца, бо ёсць магчымасць паўтарыць жудасную памылку Еўропы 40-ых гадоў XX стагоддзя. Менавіта таму сёння неабходна зрабіць усе намаганні, для абуджэння цікавасці да вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, асабліва сярод маладога пакалення, якому належыць будучыня, за якім стаіць лёс чалавецтва. Ад таго, наколькі добра ў маленстве яны ўсвядомяць, што такое вайна, залежыць іх грамадзянская пазіцыя ў будучыні, а значыць — і сама будучыня.

Вынікі адказаў на першае пытанне вучняў СШ № 210

Вынікі адказаў на першае пытанне вучняў СШ № 200



Вынікі адказаў на другое і трэцяе пытанне вучняў СШ № 210

Вынікі адказаў на другое і трэцяе пытанне вучняў СШ № 200

Вынікі адказаў на чацвёртае пытанне вучняў СШ № 210

Вынікі адказаў на чацвёртае пытанне вучняў СШ № 200

Вынікі адказаў на пятае і шостае пытанні вучняў СШ № 210



Вынікі адказаў на пятае і шостае пытанні вучняў СШ № 200

Вынікі адказаў на сёмае пытанне вучняў СШ № 210

Вынікі адказаў на сёмае пытанне вучняў СШ № 200



Вынікі адказаў на восьмае пытанне вучняў СШ № 210



Вынікі адказаў на восьмае пытанне вучняў СШ № 200

Вольга КАВАЛЁВА

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Федарцова Т. М., канд. філ. навук, дацэнт кафедры беларускай мовы

Дзяцінства, апаленае вайной

Выжылі яны на зло вайне

Уступ

Ганарыцца славаю сваіх продкаў не толькі можна, але і трэба. Веданне гісторыі сваіх бацькоў і дзядоў спрыяе выпрацоўцы актыўнай жыццёвай пазіцыі, першым чынам патрыятызму. Для таго, каб па-сапраўднаму любіць сваю Радзіму, трэба добра ведаць яе гісторыю, людзей, якія ствараліе гістарычнае мінулае роднай краіны.

...22 чэрвеня 1941 года. Гэта дата памятная нам як адна з самых трагічных у гісторыі нашай Радзімы. У гэты дзень фашысцкая Германія напала на СССР. Над светам навісла смяротная небяспека.

Вялікая Айчынная вайна была жахлівай падзеяй не толькі для тых, хто на перадавой ірваўся ў бой пад шквальным агнём фашыстаў, у каго на вачах варожыя снарады разрывалі на шматкі цела сябра, з якім на прывале, у час кароткага адпачынку перад боем, выкурылі адну на дваіх цыгарэту. Вайна была жахам і для тых, хто глядзеў на свет праз краты нямецкіх лагераў смерці.

Нямецка-фашысцкія канцэнтрацыйныя лагеры — гэта месцы масавага зняволення і фізічнага знішчэння праціўнікаў нацысцкага рэжыму, ваеннапалонных і грамадзянскіх асоб.

У 1944 годзе ў распараджэнні фашыстаў знаходзілася 20 асноўных канцлагераў, не лічачы сотняў іх філіялаў. Для забойства зняволеных немцы выкарыстоўвалі атрутныя рэчывы, газавыя камеры. Трупы закопвалі ў зямлю або спальвалі ў адмысловых печах. Сотні тысяч грамадзян знішчаліся адразу ўжо па прыбыцці ў лагер смерці. Вязні выкарыстоўваліся на розных цяжкіх працах для «патрэб Трэцяга рэйха».

Паўсядзённы гвалт і тэрор з боку ахоўнікаў, рабская праца, недаяданне і хваробы знясільвалі арганізмы зняволеных, даводзячы іх да смерці ў самы кароткі час. У вязняў адбіралася ўся лішняя маёмасць, а знойдзеныя каштоўнасці перадаваліся ў веданне імператарскага банка. З 1933 па 1945 гады праз нямецкія канцлагеры прайшлі каля 18 мільёнаў чалавек, з якіх 11 мільёнаў былі забіты і закатаваны. Шматлікія вязні, якія змаглі выжыць, назаўжды засталіся інвалідамі.

Час ідзе... Ужо прайшло больш за шэсцьдзесят год, як скончылася Вялікая Айчынная вайна. Але ў сэрцы народа назаўсёды засталася памяць пра мінулае. Мы ўшаноўваем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, з падзякай успамінаем іх ратныя і

працоўныя подзвігі. Абавязкова ўспамінаем і тых, хто ўсе жахі вайны спазнаў яшчэ дзіцём. Дзеці і вайна. Два паняцці, якія не могуць існаваць разам. Дзеці безабаронныя і нявінныя. Для шматлікіх мільёнаў дзень 22 чэрвеня 1941 года стаў апошнім днём дзяцінства. Вайна перавярнула ўсё іх жыццё.

Колькі дзяцей было ў дзеючым войску, у партызанскіх атрадах і падпольных арганізацыях?! Радзіма не забыла подзвігаў маленькіх абаронцаў: многія з іх былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза. Але былі і тыя, для якіх жахі вайны пагаршаліся іх поўным бяспраўем, штодзённымі знявагамі і жахам за сваё жыццё. Гэта малалетнія вязні канцлагераў.

1 Дзяцінства за калючым дротам

1.1. Засталіся толькі горы маленькіх чаравікаў…

Пускай сегодня знают люди
Про тех, кто вырос в дни войны.
Мы никогда не позабудем,
Что были дважды рождены…
С. Воўк

Гэтыя радкі з верша Самуіла Рафаілавіча Ваўка, малалетняга вязня Мінскага гета, можна аднесці да ўсіх дзяцей вайны, але асабліва да тых, хто правёў свае дзіцячыя гады ўдалечыні ад Радзімы, за калючым дротам у фашысцкай няволі, на прымусовых працах. Дзіцячыя гады без дзіцячых гульняў і смеху, без самых блізкіх людзей, якія маглі б абараніць і прыгалубіць, праспяваць калыханку. Ці можна забыць пекла, праз якое прайшлі гэтыя людзі ў самую пяшчотную пару жыцця — у дзяцінстве?

Вайна — усенародная бяда. І гэта агульнавядомая ісціна. Але калі яе так разумеюць сталыя людзі, то дзеці... У іх сваё ўспрыманне свету: пачуццёва-каляровае. Радасць — гэта мяккія добрыя рукі маці, цяпло сонца, зеляніна травы. У бяды зусім іншыя колеры — шэра-чорны, халодны і галодны, адчуванне страху, болю, якія ўтойваюцца ў вачах і ў рухах, у імкненні стаць непрыкметным, нябачным, заплюшчыць вочы — тады зло абыдзе цябе, не ўбачыць. Гэта чыста дзіцячае жаданне ўцячы, схавацца хаця б у мроях. Толькі хіба ўцячэш ад памяці? Памяць, горкая, страшная ўсплывае па начах, калі былыя малалетнія вязні засынаюць пасля працоўнага дня, хатніх клопатаў. Гавораць, што з гадамі да чалавека зноў прыходзіць дзяцінства: здавалася, шматлікае забылася, сцерлася, але потым па пэўных законах псіхікі рэальныя падзеі дзіцячых гадоў усплываюць так выразна, ясна і праўдзіва, нібы на кінаэкране пракручваецца зноў тваё жыццё. Часам гэтыя ўспаміны такія вострыя, што былыя

дзеці-вязні нібы нанава перажываюць ўсё тое, што было ў дзяцінстве. І балюча заходзіцца сэрца, і страх падступае да горла, і фары машыны, якая праязджае па начной вуліцы, падаюцца пражэктарамі, снапамі святла, якія наносяць удар па цёмным бараку, і пакой напаўняецца пахам попелу спаленых людзей.

Вайна — гэта галоўным чынам знявечанае дзяцінства, адчай і гора маці. Увесь час у войнах былі забітыя і палонныя, але ні ў адной вайне так не пакутавалі дзеці, як падчас Вялікай Айчыннай вайны. Фашызм не прызнаваў узроставага адрознення. Гітлераўская машына знішчэння людзей перамолвала ўсіх з аднолькавай акуратнасцю і бязлітаснасцю: старых, жанчын, дзяцей. Дзень і ноч дымілі крэматорыі незлічоных лагераў смерці на тэрыторыі самой Нямеччыны і акупаваных ёю дзяржаў. Нібы чорны сып, пакрыла цела Еўропы сетка гэтых лагераў.

Больш за мільён дзяцей і падлеткаў у час вайны было вывезена ў канцлагеры і асуджана на рабства, дзе працягласць жыцця не перавышала сямі-дзевяці месяцаў. Дзіцячая праца неміласэрна эксплуатавалася на аб'ектах Трэцяга рэйха. Маленькія вязні станавіліся прымусовымі донарамі, біялагічнай сыравінай для злачынных, нялюдскіх медыцынскіх эксперыментаў. Яны выкарыстоўваліся як жывое прыкрыццё для фашысцкага войска, іх пасылалі для «прачэсвання» мінных палёў і смяротных дарог. Толькі адзін з дзесяці дзяцей-вязняў канцлагераў застаўся жывы і быў вызвалены. Колькасць астатніх, знішчаных або памерлых, ужо ніколі не будзе ўсталявана. Ад іх засталіся толькі горы маленькіх чаравікаў ды цацак...

Сёння людзей, якія ў дзяцінстве перанеслі жах і нягоды жыцця ў канцлагеры, застаецца ўсё менш, і трэба спяшацца, каб дапамагчы ім пакінуць нашчадкам урок мужнасці і стойкасці. А зрабіць гэта можна толькі падчас сустрэч і размоў са сведкамі тых жудасных падзей, якія адбываліся ў лагерах смерці. Вядома, такія сустрэчы для былых малалетніх вязняў — няпростае выпрабаванне, бо яны нібы зноў перажываюць перанесеныя ў дзіцячыя гады жахі. Мяркуючы па тым, як хвалююцца нашы суразмоўцы, успамінаючы перажытае, відаць, што праз усё жыццё неслі яны боль, жах і роспач. Ім цяжка без слёз ўспамінаць тыя дні, але яны робяць гэта, каб распавесці сваім нашчадкам праўду пра змаганне народа за сваё жыццё, за сваю волю і абудзіць у іх пачуццё адказнасці за сучаснасць і будучыню.

У творчай працы пададзены старонкі з жахлівай гісторыі вязняў канцлагераў, а таксама ідзе размова пра канкрэтных людзей, якія перажылі ў іх свае дзіцячыя

гады, змаглі выжыць у цяжкіх умовах вайны, змагаліся з цяжкасцямі, не баяліся працы. На жаль, зараз мы несправядліва і незаслужана мала ўспамінаем пра тых, хто таксама выпакутаваў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, чые лёсы звязаныя з гітлераўскім палонам. Хацелася, каб іх біяграфія не была намі забыта, як забываюцца шматлікія іншыя.

1.2 Не, пра вайну не буду

— Дзядуля, дзядуля, а я хачу паслухаць што-небудзь цікавае!

— Не, ўнучак. Не бачыш, што мне зараз няма калі?

— Дзядулечка, хоць трошачкі...

— Ну толькі трошачкі. І ўсё. І што ж ты жадаеш, шкодны хлопчык?

— Пра вайну. І пра танк, пра той, што мне дзядзька Антось падарыў.

Дзядуля цяжка уздыхнуў.

— Не, пра вайну не буду. Ідзі адсюль...

Раззлаваны Дзімка пабег у сад да свайго «сховішча» пад яблыняй. «Чаму, ну чаму ж дзядуля заўсёды так гаворыць? — бубніў хлопчык. — Гэта ж так цікава: танкі, кулямёты...»

Шмат гадоў прайшло з таго часу. Дзімка зусім вырас і зараз вучыцца ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. На жаль, яго дзядулі, Пудава Пятра Мікалаевіча, ужо няма ў жывых. Але засталася памяць пра гэтага цудоўнага чалавека, якую захаваў не хто іншы, як яго ўнук, які толькі праз некаторы час зразумеў, чаму ж дзядуля так не жадаў расказваць пра вайну. Незадоўга да смерці Пятра Мікалаевіча Дзмітрый зноў задаў дзядулю тое ж пытанне. Але цяпер яго ўжо цікавілі не танкі і кулямёты, а менавіта жыццё Пятра Мікалаевіча ў вайну і пасля яе. Дзякуючы гэтаму, на доўгія гады ўнук захаваў памяць пра свайго дзядулю, які падчас Вялікай Айчыннай вайны быў вязнем працоўнага і канцэнтрацыйнага лагераў.



Дзядуля разам з унукам

...Вёска Пруткі, якая знаходзілася ў Віцебскай вобласці, да вайны жыла звычайным жыццём Беларусі. Белая Русь. Куток, дзе кожны чацвёрты, а па апошніх звестках, кожны трэці загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. А колькі лёсаў пакарабачана ёю — гэтага не падлічыць.

Маленькі вязень (г. Рыга)

Вайна зрывала людзей з наседжаных месцаў. Нямала пакут яна прынесла людзям, якія апынуліся ў акупацыі. Сваім чорным кры-

лом кранула яна і сям'ю Пудавых. Калі яшчэ малому Пятру споўнілася толькі дзевяць год, то яго разам з бацькамі, братам і сястрой накіравалі ў канцэнтрацыйны лагер Саласпілс.

Усіх прывезлі на чыгуначную станцыю. Там ужо было шмат народу: жанчын, дзецей, старых і хворых мужчын, якіх не ўзялі ў войска па хваробе, такіх жа арыштаваных сем'яў, як і сям'я Пятра. Перагрузілі усіх у таварны вагон, які быў бітком набіты людзьмі.

Саласпілс — лагер, які падчас Другой сусветнай вайны знаходзіўся на тэрыторыі Латвіі за васемнаццаць кіламетраў ад Рыгі. Раней там знаходзіўся палігон для салдат царскага войска, якія стралялі па мішэнях. Для гітлераўцаў мішэнямі сталі людзі...

Калі змардаваныя людзі з хворымі, закатаванымі дзецьмі заганяліся за дрэцяную агароджу канцэнтрацыйнага лагера, для дарослых і асабліва для безабаронных дзяцей пачыналася пакутлівае існаванне, насычанае цяжкімі псіхічнымі і фізічнымі катаваннямі і здзекамі з боку немцаў і іх паслугачоў.

Пудаў Пётр Мікалаевіч успамінаў, як усіх сагналі разам і размеркавалі па бараках. На другі дзень аб'явілі каранцін, прымусілі прайсці праз горача напаленую лазню, прымусілі распрануцца. Каранцін цягнуўся тры дні, пакуль вопратка палонных не прайшла хімічную апрацоўку.

Хворых і малых дзяцей адабралі яшчэ ў першыя дні. Адабралі і маленькую сястрычку Пятра, якую ён больш ніколі не бачыў: з яе «высасалі» ўсю кроў. Хворых змясцілі ў лякарню, абяцалі іх адпусціць дахаты, але на працягу двух тыдняў усіх атруцілі. У лагеры Пётр лічыўся ўжо дарослым дзіцём, і таму яго разам з іншымі дзецьмі вазілі у Рыгу на працу.

Найбольш сумную вядомасць лагер Саласпілс атрымаў менавіта з-за асобых адносін да дзяцей, якія, пачынаючы з груднога ўзросту, утрымліваліся немцамі асобна і строга ізалявана.

З Акта аб знішчэнні нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Латвійскай ССР 35000 савецкіх дзяцей:

«Грязные, вонючие камеры фашистских тюрем никогда не проветривались, их не отапливали в самые лютые морозы. На грязных, кишевших насекомыми, сырых и холодных полах валяются несчастные матери, которые были вынуждены собственными глазами беспомощно наблюдать постепенное угасание своих детей, если пуля фашиста не причиняла им более легкую смерть. 100 гр хлеба в день и пол-литра мутной воды было тем питанием, которым дети пользовались наравне со взрослыми. Медицинская помощь не оказывалась. При кровавых расправах с заключёнными в тюрьмах, где немцы расстреливали в один приём по несколько сот человек, не существовало исключения для детей. Они гибли той же смертью.

Иногда немцы, расстреливая мать, забывали расстрелять её детей, и дети продолжали влачить мучительное существование до той поры, пока не наступала смерть, или немцы при очередном расстреле убивали и этих маленьких несчастных страдальцев».

Бруд, нястача ежы прыводзілі да таго, што дзеці масава гінулі. Нямецкая ахова штодня ў вялікіх кошыках выносіла з дзіцячага барака адубелыя трупікі малых вязняў, якія загінулі пакутлівай смерцю. Трупы скідаліся ў выграбныя ямы, спальваліся за агароджай лагера і часткова закопваліся ў лесе.



Мемарыяльны комплекс на месцы канцлагера Саласпілс

З Акта аб знішчэнні нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Латвійскай ССР 35000 савецкіх дзяцей:

«Немецкие фашисты изобретают гнусный способ использования советских детей до их окончательного истребления. Фашисты организовывают сеть распределительных пунктов, в которых торгуют детским невольничьим трудом... Советские дети-малютки, не могущие быть использованными в качестве рабочей силы, возились немцами из лагерей в русский женский монастырь, гор. Рига. В апреле 1943 года к женскому монастырю г. Рига, по ул. Кр. Барона 126 подходят крытые военные немецкие автомашины. Их сопровождают немецкие солдаты под командой офицера. Жуткая картина представилась перед глазами очевидцев: из закрытых грузовиков не раздаётся ни звука, не слышны детские голоса. Когда откидывается брезент, взору открываются десятки замученных, больных, изнурённых детей. Они скорчились и дрожат от холода. Лохмотья еле прикрывают маленькие тельца, покрытые нарывами, лишаями и коростой. Дети босы, без головных уборов. Из-под грязных тряпок, прикрывающих несчастных, на груди виднеются кусочки грязного картона, привязанного на верёвке. На этих табличках имеются надписи: фамилия, имя и возраст ребёнка. Целый ряд бирок, однако, содержит только одно слово: «УНБЕКАННТЕР» (неизвестный). Дети жмутся друг к другу и молчат. Детский барак в лагере, вечный страх и угрозы, пытки и террор фашистских садистов отучили маленьких страдальцев говорить. Машина следует за машиной. 579 измученных советских ребят в возрасте от 1 года до 5 лет доставляют фашисты в женский монастырь...»

Бесперапынную смяротнасць дзяцей выклікалі тыя эксперыменты, для якіх у ролі лабараторных жывёлін выкарыстоўваліся маленькія пакутнікі Саласпілса. Нямецкія лекары-дзетазабойцы з доктарскімі дыпломамі хворым дзецям рабілі інъекцыі — упырсквалі разнастайныя вадкасці, уводзілі у прамую кішку мачу, прымушалі прымаць «лекі», кармілі атручанай кашай. Усе гэтыя медыцынскія прыёмы выклікалі адзін агульны нязменны вынік — дзеці паміралі. Кіраваў гэтымі эксперыментамі нямецкі лекар Майзнер.

Аднак самым агідным злачынствам у дачыненні да знішчаных немцамі ў канцэнтрацыйным лагеры дяцей было «выкачванне» дзіцячай крыві. Пры харчаванні, якое складалася з 100 грам хлеба і ½ літра вадкасці накшталт супу ў дзень, худыя і хворыя дзеці выкарыстоўваліся як крыніца крыві для патрэб нямецкіх шпіталяў. Фашысты арганізавалі ў лагеры Саласпілс цэлую фабрыку, дзе за ўвесь час існавання лагера імі было «выкачана» з савецкіх дзяцей не менеш за 3500 літраў крыві.



Пудаў Пётр Мікалаевіч

У кастрычніку 1944 года, каб замесці сляды дасканалых злачынстваў, канцлагер Саласпілс быў знішчаны, а яго персанал — як немцы, так і латышскія паліцаі, — эвакуіраваны. Шматлікія з іх так і не панеслі пакарання.

У Саласпілсе былі закатаваны больш за сем тысяч дзяцей...

Хіба толькі цудам можна растлумачыць тое, што Пётр Мікалаевіч застаўся ў жывых, пасля таго як прайшоў усе жахлівыя колы фашысцкага пекла ў Саласпілсе.

Да вясны 1944 года ў асноўным толькі маладых вязняў адпраўлялі ў іншыя краіны, якія былі акупаваныя фашыстамі. Такім чынам Пётр Мікалаевіч апынуўся ў Аўстрыі. Пасля лагера смерці Саласпілса лёс закінуў хлапчука ў працоўны лагер.

Па даных Міжнароднага Чырвонага Крыжа, у час Вялікай Айчыннай вайны ў Германію і Аўстрыю былі вывезены каля 100 000 дзяцей. Сярод іх апынуўся і Пётр Мікалаевіч.

Насельніцтва працоўнага лагера ўвесь час бадзялася па паддашках, хлявах, зямлянках. Людзі месяцамі не мелі магчымасці памыцца. Вашывасць, бруд, голад і холад прыводзілі людзей да хвароб і смерці. Усіх памерлых скідалі ў глыбока выкапаныя траншэі.

Цяжкія выпрабаванні перанес Пётр Мікалаевіч. Часта яму прыходзілася на сняданак, абед і вячэру задавольвацца невялікім кавалкам хлеба з пілавіннем. Разам з іншымі дзецьмі ён працаваў з раніцы да позняга вечара, недаядаў і недасыпаў. Хлопцы і дзяўчаты былі падобныя на хадзячыя шкілеты.

У абавязкі хлапчука ўваходзіла карміць сабак. Здаецца, справа зусім нескладаная. Але як цяжка яна давалася хлапчуку! Жывёлінам трэба было несці ежу, якая зусім не была падобнай на тую, што давалі вязням. Часам гэта былі косці з кавалачкамі мяса, іншы раз — магла быць каша, якая была густа запраўлена тлушчам. Як у гэтым выпадку галодны, знясілены хлапчук мог выстаяць перад такой спакусай? Усю дарогу да сабак ён прагна глытаў прыгатаваную для жывёл ежу. Але аднойчы Пятру не пашанцавала. Яго ўбачыў наглядчык. Хлапчука жудасна пабілі.

Пётр Мікалаевіч разам з жонкай і дзецьмі

У працоўным лагеры жылі і яўрэі. Адзін з іх навучыў Пятра будаваць печы, за што Пётр Мікалаевіч быў удзячны яму ўсё сваё жыццё.

Не думалася малалетняму вязню, што выжыве... І ўсё ж такі выжыў, вярнуўся з чужой зямлі дадому. На гэты момант хлапчуку было трынаццаць гадоў.

Цяжкі і складаны пасляваенны час нёс не менш пакут, чым сама вайна, якая і прынесла іх. Голыя і галодныя дзеці імкнуліся да жыцця, жадалі атрымаць адукацыю. Перад вайной Пётр Мікалаевіч скончыў два класы, але зараз працягваць вучобу было немагчыма: трэба было дапамагаць сваім бацькам аднаўляць гаспадарку, зноў будаваць жыццё.

Скончылася вайна. Каб жа на гэтым скончылася гора хлопца. Доўга яшчэ на яго глядзелі з аглядкай, маўляў, быў у палоне. У лагеры і жалезнаму няцяжка было зламацца. Пётр Мікалаевіч вытрываў. А калі аказаўся на волі, хацелася пагаварыць пра перажытае. Не было з кім...

Увесь час Пётр Мікалаевіч працаваў на роднай зямлі. Усю моц, усе намаганні ён аддаваў на тое, каб аднавіць родны куточак пасля той жудаснай вайны, якая закранула і яго лёс. Ён заўсёды марыў пра ўласных дзяцей і пра тое, каб яны ніколі не чулі слова «вайна», каб не перанеслі тыя нягоды, якія яна прыносіць. Так і здарылася. Яго жонка, Лідзія Яўхімаўна, падаравала яму двух сыноў, якія ўвесь час былі апорай для свайго бацькі. Праз некаторы час з'явіўся і ўнук Дзімка. Вядома, зараз ён ужо зразумеў, чаму дзядуля так цяжка ўздыхнуў, калі малы хлопец хацеў пачуць аповед пра танкі і кулямёты...

Цяжка чытаць, глядзець па тэлебачанні, слухаць аповед сведак. Але як жа цяжка было перыжыць усё гэта?! Якой трэба было валодаць мужнасцю і адвагай, каб застацца жыць? Быць практычна адзінокім і, нягледзячы на гэта, здолець выжыць у цяжкіх умовах акупацыйнага рэжыму, змагацца з цяжкасцямі, пэўна, змог бы не кожны дарослы, а тым больш дзіця. Але Пётр Мікалаевіч змог зрабіць гэта.

1.3 Вязень №167302

Жыццё па-сапраўднаму сутыкнула мяне з малалетнім вязнем канцлагера — Анатолем Васільевічам Губаравым. З дзяцінства памятаю я гэтага дзівоснага чалавека. Але пра тое, што ў малым ўзросце ён знаходзіўся ў няволі, даведалася зусім нядаўна ад сваёй бабулі, якая ўсё жыццё сябравала з Анатолем Васільевічам.

Губараў Анатоль Васільевіч

«Партызанскія злучэнні Полацка-Лепельскай зоны пасля працяглых жорсткіх баёў з фашысцкімі карнікамі ў маі 1944 года каля вёсак Пліна і Паперына здзейснілі легендарны прарыў варожай блакады. Іх было 17195 супраць 60 тысяч. Мужнасць народа перамагла. Смерць стала неўміручасцю».

Сярод гэтых людзей была і сям'я Анатоля Васільевіча Губарава. Пасля «прарыву» яго

бацька, Васіль Апанасавіч, вярнуўся да партызан, пакінуўшы жонку з трохгадовым сынам у вёсцы, дзе ўжо былі фашысты.

«Маці часта ўспамінала баі ў маі 1944 года. Яны былі настолькі жахлівымі, што маленькая рачулка Ушачка, якая працякала ўздоўж лініі абароны, была поўная крыві. Крывёй было заліта ўсё вакол. «Прарыў» цяжка даўся савецкім людзям.

«Змагацца або памерці» — такі быў дэвіз байцоў партызанскіх атрадаў, і яны засталіся яму вернымі да канца».

Пасля блакады немцы пачалі шукаць тых людзей, у якіх атрымалася прайсці праз агністае кальцо акружэння. Дзеля выратавання Таццяна Аляксееўна, маці маленькага Толі, узяла назад сваё дзявоцкае прозвішча і запісала сябе і сына на Цюлекавых. Аднак гэта не выратавала іх. Сярод мясцовага насельніцтва было шмат не толькі абаронцаў Радзімы, але і здраднікаў.

«Пасля блакады хтосьці выдаў. Забралі вяскоўцаў у чым яны былі, не даўшы нікому ўзяць нічога з рэчаў. Прывезлі нас у Полацк, да вакзала, куды пад'язджалі машыны і згружалі чарговую партыю людзей. Крык. Плач. Людзі абдымаліся, енчылі, быццам разумеючы, што развітваюцца назаўжды. Быў сфарміраваны цягнік, у якім апынуўся я, сястра і маці. Ён накіраваўся ў Асвенцым... »

Асвенцым быў буйнейшым лагерам знішчэння, яго звалі «фабрыкай смерці», «канвеерам смерці», «машынай смерці». Фактычна ў польскай Сілезіі на некалькіх тысячах гектараў была пабудавана самая жахлівая «дзяржава» ў свеце з насельніцтвам у некалькі мільёнаў чалавек, з якіх ацалелі менеў за тры тысячы.

У маі 1940 года гітлераўцы стварылі канцлагер Асвенцым (Аўшвіц) — самы буйны ў Польшчы канцлагер, які стаў месцам правядзення масавага генацыду. Лагер Аўшвіц займаў тэрыторыю ў 4675 гектараў, на якой знаходзіліся 40 лагераў. У шасцістах дваццаці бараках лагера Асвенцыма ўтрымоўвалася ад ста васьмідзесяці да двухсот пяцідзесяці тысяч зняволеных. Першыя вязні з'явіліся ў Асвенцыме ў 1940 годзе. З прыбылых тады ў лагер 728 жыхароў Кракава не выжыў ніхто. 23 верасня 1941 года ў Асвенцым былі дастаўлены першыя савецкія ваеннапалонныя. Усе яны былі знішчаныя ў газавай камеры. Усяго па розных звестках у Асвенцыме загінула ад паўтара да трох з паловай мільёнаў чалавек, сярод якіх — больш за мільён дзвесце тысяч яўрэяў, сто сарок тысяч палякаў, дваццаць тысяч цыганаў, дзесяць тысяч савецкіх ваеннапалонных і дзесяткі тысяч вязняў іншых нацыянальнасцей.

З дня заснавання да вызвалення Асвенцыма савецкімі войскамі 27 студзеня 1945 года ў ім загінулі каля чатырох мільёнаў вязняў, больш за ўсё яўрэяў і жыхароў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Больш за 5 000 вязняў Аўшвіца складалі жыхары Беларусі (у асноўным з Мінскай і Віцебскай абласцей), адпраўленых у лагер падчас барацьбы з партызанамі. Пераважна гэта былі жанчыны і дзеці. З усіх вязняў Асвенцыма дзеці і падлеткі, узрост якіх не перавышаў васемнаццаці гадоў, складалі каля 234 000 тысяч. З іх — 220 000 тысяч яўрэйскіх дзяцей, 11 тысяч цыганскіх; некалькі тысяч беларускіх, украінскіх, рускіх, польскіх.

Вытрымка са стэнаграмы пасяджэння Міжнароднага Ваеннага Трыбунала ў Нюрнбергу:

«До лета 1941 г. Освенцим был преимущественно концентрационным лагерем, в котором пока ещё не производились массовые уничтожения. Поэтому первые массовые уничтожения явились для заключённых лагеря неожиданностью. Они начались летом 1941 г., когда однажды вечером различные номера были вызваны после проверки (я очень хорошо помню, что среди них было 18 мужчин только из Кракова). Людям, номера которых были названы, было приказано явиться в раздевалку, где они должны были снять свою одежду; вместо неё они получили старые лохмотья (рубашку и штаны).

Затем они были отведены к карьеру, где добывали гравий, и расстреляны из пистолетов с близкого расстояния. Другие заключённые не присутствовали во время расстрела, но казни проводились таким образом, что почти весь лагерь мог являться свидетелем этого. После казни была назначена зондеркоманда для закапывания трупов. Это происшествие вызвало сильное беспокойство в лагере, так как мы до сих пор полагали, что отправка в концентрационный лагерь исключала смертную казнь за преступления против безопасности Германской империи. Начиная с этого дня казни проводились через более или менее регулярные промежутки времени, жертвы вызывались по вторникам и пятницам. Позднее на территории лагеря было отведено особое место для казней – свободное место между блоком № 10 и блоком № 11, где в дальнейшем казни, как правило, проводились по утрам».

Для лагернага начальства дзеці былі непатрэбным баластам. Наконт іх меліся адмысловыя загады. Ніхто з дзяцей не адважваўся пакідаць блок. Лагернае начальства меркавала, што дзецям досыць свежага паветра, пакуль яны стаяць на апелях. Ім не дазвалялася мець цацак, маленькія вязні павінны былі ціха сядзець у куце барака.

Вошы, крываўка, дыфтэрыя, адзёр... Пакутлівай смерцю паміралі малалетнія дзеці, і смерць гэтая прымалася як пазбаўленне ад пакут. Страшны факт: сярэдняя працягласць жыцця ў Асвенцыме не перавышала пяці-шасці месяцаў. Дыпламаваныя забойцы ў белых халатах праводзілі садысцкія доследы над людзьмі.

Ці шмат засталося у вас ўспамінаў з дзяцінства, калі вам было ўсяго тры-чатыры гады? Вядома, у кожнага ў памяці ўсплываюць якія-небудзь яркія падзеі. Але нішто не параўнаецца з тым, што і па гэты дзень памятаюць маленькія вязні, якія знаходзіліся ў Асвенцыме. Дзяцінства, якое было перакрэслена вайной, пакінула ў іх душах жахлівы адбітак на ўсё жыццё.

«Канцлагер — лагер смерці. Калі прыехалі, то нас адразу расфарміравалі. Дзяцей разлучылі з маці».

Вытрымка са стэнаграмы пасяджэння Міжнароднага Ваеннага Трыбунала ў Нюрнбергу:

«Транспорт, который я видел, состоял из польских евреев. Целыми днями они не получали воды. Когда двери товарных вагонов были открыты, мы получили приказ выгнать их с громким криком. Они были совершенно изнурены,

и около ста человек умерло в пути. Оставшиеся в живых должны были построиться в пять шеренг. Наша работа заключалась в том, чтобы вытащить из вагонов трупы, умирающих и их пожитки. Трупы (а к ним теперь причислялся каждый, кто больше не мог держаться на ногах) были сложены в кучу. Чемоданы и узелки были собраны и сложены отдельно. Затем пришлось основательно почистить железнодорожные вагоны, так чтобы не было заметно никаких следов ужасного груза.

Комиссия политического отдела начала «отбор» приблизительно 10 процентов мужчин и 5 процентов женщин и распорядилась доставить их в лагеря. Остальные были погружены на грузовики, отправлены в Биркенау и там умерщвлены газом; мертвые и умирающие были доставлены непосредственно к печам для сжигания. Часто случалось, что маленьких детей живыми бросали на грузовики вместес трупами».

«Часам нам давалі з ёй сустракацца. Вядома, яна як магла дапамагала мне і малодшай сястрычцы: перадавала хоць трошкі нейкіх харчоў. Тое, што прыносіла маці, падавалася вельмі смачным. Ужо пасля вайны я даведаўся, што гэта было на самой справе. Зараз можа здацца неверагодным, але тым нераўзыдзеным смакам валодаў гнілы сыр.

Доўгі барак, трохпавярховыя нары, састаялае паветра. Дзеці размяшчаліся ў бараках па ўзросце. Тыя, хто былі старэйшымі, адбіралі, што можна было, у меншых. Жылі па прынцыпе «хто выжыве». Часам і тое, што прыносіла мне маці, даставалася іншым.

Нам строга забаранялася пакідаць барак. Але дзеткі залазілі на нары і глядзелі ў вакенцы на святло, на сонца, на снег. Дрэў паблізу не было. Вакол гола і шэра. І нейкі прыкры пах дыму. Ад яго шчыкала ў вачах. Вельмі хацелася есці.

Дзяцей, якія былі зусім маленькімі, адбіралі, каб вопыты праводзіць. Кроў у іх бралі для нямецкіх салдат.

Кармілі нас бручкай — варанай баландай, рэдкай і невыноснай. Пах гэтай поліўкі настолькі ўеўся, што і зараз памятаю яго. Доўга яшчэ пасля вайны не мог пераносіць пах варанай гародніны. Калі маці свінням варыла — уцякаў кожны раз. Невыносны пах.

Барак. Памятаю, пасярод ад печы праходзіла доўгая труба, якая ўвесь час была «абчэпленая» дзецьмі. Быў жудасны холад, і мы ўсаджваліся на яе і хоць трохі саграваліся.

Шторанку прыходзілі немкі ў эсэсаўскай форме. Яны запускалі аўчарак — адганялі нас ад трубы на нары. За ноч некаторыя паміралі, таму дзяцей пералічвалі.

Зіма. На вуліцы было шмат снегу. Малым апраналі драўляныя чаравікі і выпускалі на вуліцу. З часам пласт снегу прыліпаў да такога абутку. Хадзіць было немагчыма і вельмі цяжка. Усе падалі…

У лагеры маці пазнаёмілася з полькай Ірэнай Бялых. Гэта жанчына працавала ў шпіталі і час ад часу дапамагала туды ўладкоўвацца — там лепей кармілі, можа, дзякуючы гэтаму і засталіся жывыя.

Зрэдку нас выводзілі гуляць па лагеры, дыхаць свежым паветрам. Падчас такіх «прагулак» мы праходзілі каля вялізных памяшканняў, у якіх, напэўна, не было дзвярэй, і таму ў нас была магчымасць убачыць усё, што ў іх знаходзілася. Трупы там ляжалі даверху...

Яўрэяў, якіх прывозілі ў Асвенцым, адразу адпраўлялі ў крэматорый».

Вытрымка са стэнаграмы пасяджэння Міжнароднага Ваеннага Трыбунала ў Нюрнбергу:

«Евреи должны были по прибытии оставлять все свои вещи на перроне. До того как их пропускали, им приказывали раздеться, и их одежда и прочие вещи, которые они с собой привозили, оставались на перроне, а затем направлялись в большие бараки, где разборку вещёй производила команда, которую называли «Канада». В бараках вещи сортировали и отправляли в Германию. Там были всевозможные предметы, драгоценности, меховые манто и т. д.».

«Былі нават негры з афрыканскага фронту, цыгане. З імі не зацягвалі: адразу знішчалі. Маці потым успамінала, што чорны дым цэлымі днямі вісеў над канцлагерам тоўстым дыванком».

З пісьмовага сведчання кашталяна лагера Асвенцым Рудольфа Гесса:

«Очень часто женщины пытались спрятать своих детей под одеждой, но, конечно, когда мы обнаруживали их, мы отправляли их в камеры уничтожения. Нам было приказано проводить все это истребление тайно, но ужасающий тошнотворный смрад от постоянного сжигания трупов заполнял всю территорию, и всё население, проживающее в окрестностях, знало, что в Освенциме проводилось истребление людей».



Анатолій Васільевіч з жонкай і дачкой

«У фашыстаў нічога не знікала. Эшалоны дабра ішлі ў Нямеччыну. Валасы, золата (нават залатыя зубы!), скура чалавечая... А ад печаў адыходзілі сцёкі, так па іх чалавечы тлушч сцякаў. І яго выкарыстоўвалі...

Вызвалілі нас 27 студзеня 1945-га года войскі Першага Беларускага і Першага Украінскага франтоў. Памятаю, спачатку самалёты лёталі, лістоўкі скідвалі. Неўзабаве і нашы Чырвоныя прыйшлі (я думаў, што іх Чырвонымі завуць таму, што твар чырвоны ва ўсіх салдат быў (смяецца), мне ўсе вайскоўцы вельмі смешнымі падаваліся).

Народ бегаў. Жанчыны дзяцей адразу пачалі шукаць. Немцы шматлікіх людзей сагналі.

Адправілі нас у Кракаў, даведкі складаць. Дзе былі, у двары танк стаяў падбіты, дык дзеці там увесь час гулялі.

Дахаты дарога цяжкая вельмі была. Шмат цягнікоў змянілі, на вакзале жылі... »

З гэтых маленькіх урыўкаў можна скласці поўную карціну, якая адбывалася ў Асвенцыме. І яна жудасная.

Вайна скончылася, і, нягледзячы на ўсе цяжкасці, трэба было працягваць жыць. У 1947 годзе Анатоль Васільевіч пайшоў у школу, а праз дзесяць гадоў паехаў у Мінск, каб паступіць у Тэатральна-мастацкі інстытут на мастацкі факультэт. Аднак гэтаму не наканавана было адбыцца.

«У Мінск прыехаў я з сябрам. Тады яшчэ вакол ўсё ў развалінах было — адны руіны. Горад і немцы, і нашы аднаўлялі. З дзяцінства падабалася мне маляваць, і, сказаць па праўдзе, нядрэнныя працы атрымоўваліся. Таму і вырашыў у інстытут на мастацкае аддзяленні паступаць.

Здалі мы свае працы ў прыёмную камісію. Праз некаторы час дайшлі да дэкана, а той параіў нам паступаць лепш у Віцебскую мастацкую вучэльню, бо ў Мінску конкурс занадта вялікі быў, а ў Віцебску ўжо паменш. Наогул, школа, у якой я вучыўся, была вельмі добрая. Некаторыя нават пасля таго, як заканчвалі ў ёй вучыцца, атрымоўвалі далейшую адукацыю ў вайсковых установах. І ганьба была таму, хто нікуды не змог паступіць. Таму дахаты вяртацца ні з чым было сорамна, і мы паехалі ў Віцебск.

Вучыцца мне спачатку падабалася. Але праз некаторы час прыйшоў час практыкі, якую праходзілі ў школьных установах. Значыць, трэба было працаваць настаўнікам! А менавіта гэтага мне хацелася менш за ўсё, бо праца з дзецьмі — гэта ўжо сапраўды не для мяне.

Да гэтага часу я пазнаёміўся са студэнтамі Віцебскага медыцынскага інстытута. Атрымоўвалася так, што вялікую частку свайго часу я праводзіў з імі: займаўся ў інструментальным ансамблі, гуляў па вуліцах Віцебска, нават наведваў іх інстытут. Неўзабаве я ўсвядоміў: медыцына стала прыцягваць мяне больш, чым выкладанне. На першым курсе ў шматлікіх вышэйшых навучальных установах праграма была амаль аднолькавая, і таму, здаўшы некаторыя прадметы, я вырашыў перавесціся ў медыцынскі інстытут».

Такім чынам, Анатоль Васільевіч пераквалiфікаваўся з мастака ў лекара. Менавіта ў гэтым інстытуце ён сустрэўся са сваёй будучай жонкай. Любоў Аляксандраўна на ўсё жыццё стала яго лепшым сябрам. Пасля атрымання дыпломаў, маладую сям'ю накіравалі працаваць у гарадскі пасёлак Бешанковічы, які знаходзіцца ў Віцебскай вобласці, а праз некаторы час яны пераехалі ў горад Наваполацк. Любоў Аляксандраўна стала працаваць у дзіцячай паліклініцы старшай медсястрой, а Анатоль Васільевіч — у цэнтральнай гарадской бальніцы гастраэнтэролагам. У хуткім часе ў іх нарадзілася дачка Аляксандра.



Першакласны адмысловец

Доўгія гады Анатоль Васільевіч працаваў для людзей. Ён быў першакласным спецыялістам, і гэта я ведаю не па

чутках, бо сама не раз заходзіла ў кабінет эндаскапіі Наваполацкай гарадской бальніцы. Пацыенты Анатоля Васільевіча папраўлялі сваё здароўе і зараз працягваюць жыць менавіта дзякуючы гэтаму чалавеку.

Сёння Анатоль Васільевіч ужо не працуе. Гады з кожным днём даюць ведаць пра сябе. Разам з ім заўсёды знаходзяцца яго родныя і любімыя людзі: жонка, дачка і ўнучкі. І ён заўсёды застаецца такім жа жыццярадасным, якім быў і ў студэнцкія гады.

Анатоль Васільевіч перажыў Асвенцым. Ён змог устаяць. Ён змог не зламацца духам. Дзяцінства, перакрэсленае вайной, не перашкодзіла стаць гэтаму чалавеку лепшым спецыялістам, кахаючым мужам, клапатлівым бацькам і дзедам.

Мне здаецца, што ў дзяцей-вязняў, ды і наогул усіх дзяцей вайны былі цалкам іншыя каштоўнасці ў жыцці, чым у сучасных дзяцей. Яны шанавалі тое, што нам, можа быць, падаецца цалкам звычайным. Мы імкнёмся да нейкіх вышыняў, спрабуем дасягнуць нязведанага. А для людзей, якія перажылі пекла і жах лагераў, галоўным было і з'яўляецца спакой ва ўсім свеце.

Я гляджу ў вочы свайму суразмоўцу — яны напоўнены горыччу страт і пакут, крыўдай, якая і дагэтуль жыве ў сэрцы, несціхальным болем, недараваннем тым, хто адняў у яго дзяцінства. Менавіта зараз мне давялося перажыць з ім усё зноў. Разам з ім я змагла акунуцца ў гушчыню тых падзей, як быццам сама пабывала ў Асвенцыме. Перадаць усе пачуцці ад таго, што паведаміў мне Анатоль Васільевіч, немагчыма, іх проста нельга выказаць словамі на лісце паперы.

Ён маўчаў. Не магла больш задаваць пытанні і я. Кожны з нас быў паглынуты сваімі думкамі. Анатоль Васільевіч быў устрывожаны: пальцамі левай рукі церабіў абрус. «Як жа можна было быць такімі нялюдскімі? — падумала я. — Рудольф Гёс, Ёзэф Мэнгеле… Яны былі гаспадарамі жыцця і смерці ў лагеры. Безумоўна, гэтыя імёны кожны з нас чуў у сваім жыцці. Але ці сапраўды мы ўсвядомілі тое, што здзяйснялі яны ў Асвенцыме? Як сусветная супольнасць магла дапусціць такія здзекі з людзей?»

І толькі зараз мой позірк спыніўся на левай руцэ былога вязня — нумар 167302. Так, гэта быў адзін з тых нумароў, які прысвойваўся кожнаму зняволенаму ў лагеры і замяняў яму прозвішча. Нумаравалі ўсіх, нават немаўлят. І нумары гэтыя заставаліся не толькі на руках, але і ў душах усіх былых вязняў лагераў смерці на ўсё жыццё...

«Пасля вайны нацягнутыя адносіны былі да тых, хто быў у палоне, у канцлагерах. Людзі маўчалі, яны нікому не казалі, што падчас вайны былі ў няволі. А я — не. Заўсёды ў анкеце адзначаў, што быў палонным. Гэта зараз ужо паіншаму стала. А раней… »

Сапраўды лёс былых вязняў быў трагічны. З падачы Сталіна яны станавіліся «здраднікамі». Вырваўшыся з фашысцкага палону, людзі траплялі ў абдымкі савецкіх лагераў. Рэпрэсіям падвяргаліся іх сваякі і дзеці. Душа гэтых людзей была поўная глыбокага жаху.

Сустрэча з Анатолем Васільевічам дала мне шмат адказаў на розныя пытанні, але ў мяне з'явілася яшчэ больш пытанняў, на якіх няма адказаў.

Чалавеку дадзена адно жыццё, і ніхто не ў праве быць суддзёй у вырашэнні пытання жыцця і смерці.

Прайшло шмат часу, і звераватыя каты Асвенцыма — Крам'ер, Грэзі, Клейн, Геслер — паплаціліся ўласным жыццём за смерць і пакуты дзесяткаў тысяч нявінных людзей. Але ніколі не забыць Анатолю Васільевічу чорныя дні, праведзеныя ў пекле Асвенцыма.

2 Праблема адносін ў грамадстве да малалетніх вязняў

2.1. Адносіны дзяржавы да малалетніх вязняў

Вялікая Айчынная вайна знішчыла мільёны жыццяў, а як зрабіць так, каб гэта ніколі не паўтарылася? Гэта адна з самых важных праблем нашага часу і мы павінны яе вырашыць. Патрэба ў вывучэнні дадзенага гістарычнага матэрыялу абумоўлена тым, што на тэрыторыі нашай краіны сёння пражывае вялікая колькасць былых малалетніх вязняў фашысцкіх канцлагераў.

Лёс дзяцей, якія падчас вайны знаходзіліся ў канцлагерах, іх барацьба, жыццё пасля вайны доўгі час з'яўляліся «забароненай тэмай» у гісторыі не толькі Вялікай Айчыннай вайны, але і Савецкай гістарычнай навукі. Малалетнія вязні прайшлі жахі канцлагераў. У іх было імкненне выжыць і застацца звычайнымі людзьмі, навучыцца жыць для будучыні. І яны зрабілі гэта. Але рэпатрыянты, якія вярнуліся на Радзіму, станавіліся людзьмі «другога гатунку» і праз усё жыццё ім прыйшлося несці нялёгкі груз «прыгнечаных». Калі малалетнія вязні выраслі, то сумленна працавалі, ніколі не былі ўтрыманцамі, але нярэдка яны падвяргаліся знявазе чыноўнікаў і цярпелі іх абыякавасць.

Нейкім пачуццём былыя вязні знаходзілі адзін аднаго ў шэрагах і натоўпах. Збіраліся разам, успаміналі нялёгкія часіны зняволення. Верылі, што на іх некалі дзяржава зверне ўвагу.

Нарэшце, у 1986 годзе адбыўся XXVII з'езд КПСС, пасля якога ў грамадстве пачалося «пацяпленне» адносін да ахвяр сталінскіх рэпрэсій, якімі нярэдка станавіліся і былыя вязні фашысцкіх канцлагераў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання.

У сувязі са з'яўленнем галоснасці з 1988 года ў Маскве пачаў дзейнічаць «Міжнародны саюз былых малалетніх вязняў фашызму», які існуе і сёння. У руху былых малалетніх вязняў цяпер удзельнічае звыш 550 тысяч чалавек — грамадзян Расіі, Украіны, Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Малдовы, Казахстана, Узбекістана.

У 1990 годзе Савет Міністраў СССР выдаў пастанаўленне аб распаўсюджванні льгот і прывілеяў, якімі карысталіся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку, былыя непаўналетнія вязні канцлагераў.

«Предоставить бывшим несовершеннолетним узникам фашистских концлагерей с 1 июля 1990 г. прав бесплатного пользования на территории Белорусской ССР городским пассажирским транспортом (за исключением такси), а в сельской местности — автобусами на пригородных и междугородных маршрутах в пределах административного района по месту жительства».

Гэта было замацавана ўжо ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь Законам «Аб ветэранах» (1992 г.). Але неўзабаве Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб упарадкаванні некаторых ільгот для асобных катэгорый грамадзян», які быў прыняты ў 1995 годзе, прыпыніў яго дзеянне.

Праз некаторы час кіраўніцтвам нашай дзяржавы зацвярджаліся заканадаўчыя акты, якія былі звязаны з атрыманнем ільгот былымі вязнямі фашысцкіх канцлагераў, у тым ліку і былымі непаўналетнімі вязнямі:

«Положение о порядке обеспечения инвалидов, а также пенсионеров и иных категорий граждан, которые не являются инвалидами, но по медицинским показаниям нуждаются в средствах реабилитации, техническими средствами социальной реабилитации, выделяемыми бесплатно или на льготных условиях органами здравоохранения».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Савецкае кіраўніцтва адмаўлялася прымаць рэпарацыі ад Германіі ў поўным аб'ёме, матывуючы гэта магутнасцю краіны, але рэальна не прыдпрымала нічога для сацыяльнай падтрымкі ахвяр фашызму. Толькі 14 чэрвеня 1993 года пастановай Савета Міністраў быў заснаваны Беларускі рэспубліканскі фонд «Паразуменне і прымірэнне». На працягу 1993–1995 гадоў урад ФРГ пералічыў фонду грошы для выплат фінансавай дапамогі грамадзянам.

Выплаты праводзіліся былым вязням канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, якія былі створаны фашыстамі і іх саюзнікамі. 12 жніўня 2000 года ўступіў у сілу Закон ФРГ «Аб стварэнні фонду "Памяць, адказнасць і будучыня"». Стварыўшы дадзены фонд, урад ФРГ і германскія прадпрыемствы жадалі прадэманстраваць усведамленне сваёй гістарычнай і маральнай адказнасці за падзеі Другой сусветнай вайны і дапоўніць кампенсацыйныя меры, якія выконваліся дагэтуль. Мэта фонду — выплата фінансавых сродкаў прымусовым працаўнікам і пацярпелым ад іншай самаўпраўнасці ў гады вайны У нашай рэспубліцы было вырашана здзяйсняць такія выплаты праз Беларускі рэспубліканскі фонд «Паразуменне і прымірэнне».

У цяперашні час былыя вязні нацызму забяспечаны бясплатнымі лекавымі прэпаратамі. 1 кастрычніка 1998 года Фондам і Евангельскай Царквой у Гесэн і Насаў (Нямеччына) у Мінску быў адчынены бясплатны аптэчны пункт для пацярпелых ад нацысцкай самаўпраўнасці. У далейшым такія ж бясплатныя аптэчныя пункты для былых вязняў былі адчыненыя ў Брэсце і Віцебску. У дабрачынных аптэках Беларускага рэспубліканскага фонду «Паразуменне і прымірэнне» бясплатна атрымоўваюць медыкаменты былыя вязні фашызму ўсіх катэгорый старэйшыя за 70 гадоў, а таксама, незалежна ад узросту, былыя вязні канцлагераў, турмаў і гета.

У 1992 годзе ў Беларусі было створана грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму» (у 1989-1992 гадах існавала секцыя «Дзеці вайны» пры Беларускім дзіцячым фондзе). Асацыяцыя аб'ядноўвае тысячы былых непаўналетніх вязняў фашызму (фашысцкіх лагераў, турмаў і іншых месцаў прымусовага ўтрымання) і з'яўляецца рэспубліканскай

арганізацыяй, дзеючай на прынцыпах добраахвотнасці, самастойнасці і галоснасці. Мэта арганізацыі — садзейнічаць рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных, арганізацыйных і культурных правоў былых малалетніх вязняў.

Асацыяцыя спрыяе захаванню сярод насельніцтва і маладога пакалення ідэалаў гуманізму, літасці і адданасці Бацькаўшчыне, выхаванню падрастаючага пакалення на прынцыпах высокіх маральна-эстэтычных і грамадзянска-палітычных норм, фарміраванню яго актыўнай жыццёвай пазіцыі. Практыкуецца правядзенне ў школах і вайсковых частках выступаў былых вязняў, дзе яны расказваюць пра свой лёс і перажытых наступствах.

Шматлікім ахвярам палону, пакінутым у жывых, выплачваюцца кампенсацыі, але ўжо ніхто не зможа вярнуць гэтым людзям іх дзяцінства і ўжо ніхто не верне загубленыя дзіцячыя душы.

11 красавіка — Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, гэты дзень таксама з'яўляецца днём былога малалетняга вязня. Аднак мы павінны памятаць аб гэтых людзях не толькі ў гэты дзень. Ім патрэбна дапамога, у тым ліку і грашовая, бо сёння былыя вязні ўжо людзі сталага ўзросту, і іх былое знаходжанне ў канцлагерах адбілася на іх здароўі.

Большасць былых дзяцей-вязняў — інваліды, практычна ўсё маюць матэрыяльную патрэбу. Малалетнія вязні не паспелі атрымаць патрэбную адукацыю, працавалі чорнарабочымі, таму і пенсіі ў іх невялікія. Раны, атрыманыя ў дзяцінстве, не зацягнуліся — з надыходам старасці яны адкрываюцца зноў, каб загаіць іх, патрэбныя не толькі дарагія лекі, але і высакароднасць усіх людзей.

Выгад для сябе малалетнія вязні фашызму не шукаюць. Жыццё прывучыла іх жыць сумленна. Яны патрабуюць для сябе аднаго— людзьмі звацца. Наша ўвага, наш клопат павінны стаць ім гарантыяй у гэтым.

2.2. Стан праблемы ў сучасным грамадстве

У цяперашні час, асабліва сярод моладзі, распаўсюджана меркаванне аб тым, што нельга дасканала вывучыць гісторыю сваёй Радзімы і свету ў цэлым, што кожны чалавек павінен ведаць толькі асноўныя факты і паняцці, з дапамогай якіх з'яўляецца магчымасць павярхоўна пазнаёміцца з этапамі фарміравання і станаўлення свету. Падобныя высновы матывуюцца тым, што наш сучаснік стаў носьбітам новых меркаванняў аб свеце, якія якасна адрозніваюцца ад меркаванняў нашых продкаў, якія больш уважліва ставіліся да гісторыі свайго краю. Сучасны чалавек думае рацыянальна, і меркай праўдзівасці яго меркаванняў становіцца эксперымент. Галоўная роля пачынае адводзіцца развіццю новых тэхналогій, укараненню інавацый. Людзі імкнуцца дасягнуць неймаверных вышынь, стварыць прагрэсіўную краіну. І гэта вельмі добрыя мэты. Але немагчыма пабудаваць хату, калі няма падмурка. Так і грамадству, якое не ведае сваіх каранёў, гісторыі Радзімы, немагчама развівацца ў правільным напрамку, будаваць вышэйшы ўзровень свайго развіцця.

Праблема захавання пераемнасці гісторыі народа у адносінах паміж пакаленнямі вельмі актуальная на сучасным этапе развіцця грамадства. Пе-

раемнасць як механізм перадачы калектыўнага досведу мінулых пакаленняў аказвае ўплыў на самаадчуванне чалавека, яго ідэнтыфікацыю з пэўным этнасам. Асабліва гэта важна для тых груп, якія ў сілу шэрагу чыннікаў знаходзяцца ў кантактах або пераходных этнічных зонах. Да падобных груп адносяцца гарадскія жыхары.

З мэтай вызначэння ступені інфармаванасці сучаснага грамадства, а таксама яго адносін да былых малалетніх вязняў у ходзе даследчай працы сярод розных узроставых груп насельніцтва гарадоў Беларусі было праведзена анкетаванне. Рэспандэнтам была прапанавана анкета, якая ўключала ў сябе пытанні, у якіх разглядалася тэма дзяцей-вязняў, якія апынуліся падчас Вялікай Айчыннай вайны ў канцлагерах.

Анкета паказала, што значная частка насельніцтва ведае аб лёсе былых малалетніх вязняў вельмі павярхоўна (45%). Варта адзначыць, што асноўную частку гэтай групы складае маладое пакаленне (школьнікі, студэнты). Рэспандэнты адзначалі, што ва ўстановах адукацыі падчас навучальнага працэсу тэме вязняў і, наогул, канцлагераў надаецца мала ўвагі.

Большасць рэспандэнтаў паказалі, што яны са спагадай ставяцца да былых малалетніх вязняў канцлагераў (72%). Гэты факт звязаны са светаўспрыманнем беларусаў, якія з'яўляюцца спачувальнай і неабыякавай у адносінах да любога чалавека нацыяй.

Толькі 27% працэнтаў апытаных лічаць дзяцей-вязняў несправядліва асуджанымі. Настолькі невялікі працэнт звязаны адсутнасцю або недастатковасцю інфармацыі аб вязнях не толькі ў перыяд іх зняволення ў канцлагерах, але і ў пасляваенны час. Рэспандэнты, сярод якіх вялікую частку складае маладое пакаленне, не ведаюць, што пасля фашысцкіх канцлагераў былыя вязні аказаліся ў сталінскіх лагерах у якасці ворагаў савецкага грамадства. Але як жа людзі, якія вынеслі столькі пакут, якія не здрадзілі сваёй Радзіме, могуць быць яе ворагамі? Яны так чакалі вызвалення, яны марылі аб мірным жыцці, а ўсё апынулася па-іншаму...

Абыякава ставіцца да дзяцей-вязняў 21% працэнт апытаных. Сярод іх 13% — падлеткі ва ўзросце ад 14 да 16 год, якія навучаюцца ў сярэднеадукацыйных школах. Гэты паказчык дае магчымасць меркаваць аб тым, што ў школах патрэбна надаваць большую увагу тэме былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, тым больш, што яна закранае пытанні аб дзецях і падлетках вайны. Такім чынам, навучэнцы змогуць зразумець актуальнасць дадзенай праблемы.

Студэнтам і школьнікам было прапанавана наступнае пытанне: «Ці праводзіліся ў вашай навучальнай установе сустрэчы з былымі вязнямі канцлагераў, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны?» Толькі 34% з усіх апрошаных рэспандэнтаў адказалі, што кіраўніцтвам навучальных устаноў арганізоўваліся падобныя сустрэчы. Адсюль становяцца зразумелымі абыякавыя адносіны некаторых навучэнцаў да праблемы былых малалетніх вязняў фашысцкіх канцлагераў (як ужо адзначалася раней, у гэту групу уваходзяць 21% рэспандэнтаў). Апытаныя звярталі ўвагу на тое, што сустрэчы з удзельнікамі

Вялікай Айчыннай вайны патрэбна праводзіць часцей. Кнігі, часопісы, інтэрнэт даюць нам некаторую інфармацыю, звязаную з падзеямі вайны, але нішто так відавочна не дапаможа зразумець усю сутнасць пастаўленнага пытання, як знаёмства з лёсам тых людзей, якія прайшлі ўсё пекла фашысцкага прыгнёту.

Па звестках анкет можна зрабіць вынік аб тым, што ў насельніцтва нашай краіны веды аб былых малалетніх вязнях вельмі кароткія і павярхоўныя, гэта тлумачыцца надахопам інфармацыі па гэтым пытанні. У асноўным, менавіта маладое пакаленне вельмі аддалена ад дадзенай праблемы і, пазнаёміўшыся з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны па агульнаадукацыйнай праграме, яно не можа цалкам усвядоміць тое, што перажыў савецкі народ падчас фашысцкай акупацыі. На занятках па гісторыі Беларусі выкладаецца тэарэтычны матэрыял, які выкарыстоўваецца «для завучвання». Здаецца экзамен. З ім праходзяць і ўсе «завучаныя» веды, а ў сэрцы нічога не застаецца. Тэорыя не кранае сэрца, яна не вучыць спачуванню, павазе да людзей, якія выжылі ў барацьбе за сваё жыццё, за будучыню Радзімы.

У савецкім грамадстве тэма былых вязняў канцлагераў была не столькі не закранута, колькі забаронена. У наш жа час былым вязням проста мала надаюць увагі. Вядома, існуюць розныя фонды і асацыяцыі, дзе кожнаму, хто мае патрэбу ў дапамозе, акажуць яе. Але, ставячы гэтае пытанне, я маю на ўвазе кожнага грамадзяніна нашай краіны. І кожны ў сілах зрабіць нешта дзеля тых, чыё дзяцінства было апалена вайной. У Рэспубліцы Беларусь такіх «дзяцей» вельмі шмат, некаторыя нават да гэтага часу баяцца прызнацца ў тым, што падчас Вялікай Айчыннай вайны яны былі ў фашысцкім палоне. Некаторыя з гэтых людзей праводзяць сваю старасць у адзіноце. Нямеччына выплаціла ім кампенсацыі, але ім патрэбны не грошы. Больш за ўсё ім неабходна ўвага і клопат. А гэта можа аказаць кожны чалавек, які паважае свой народ і ўдзячны тым людзям, якія зрабілі так, каб сёння наша неба было блакітным, а не чорным ад выбухаў снарадаў, каб мы чулі спевы птушак, а не стралянінy з аўтамата.

Заключэнне

На лёс пакалення былых вязняў, каму зараз 70–80 гадоў, выпаў неверагодны цяжар перажыць тое, чаго, здаецца, быць не магло. Месяцы і гады іх дзяцінства прайшлі на нарах, у бараках і адрынах на чужой зямлі, у няволі з марамі і снамі пра радзіму і бацькоўскую хату... Перажыўшы знявагі, замахі на жыццё, трагедыю вайны і палону, яны ў сваіх параненых сэрцах захоўваюць трагічныя ўспаміны ваеннага ліхалецця. Яны і дагэтуль баяцца сабак, калючага дроту, памятаюць бамбёжкі і свіст канчукоў, падпаленыя баракі з людзьмі і дым печаў крэматорыяў.

Гады ляцяць імкліва. На змену дзецям вайны прыходзіць новае пакаленне людзей, якія выраслі пад мірным небам. Для ўсіх пакаленняў і для кожнага пэўнага чалавека яно аплочана пакутамі мільёнаў, таму памяць пра гады ліхалецця павінна быць захавана жывымі.

З кожным месяцам становіцца ўсё менш сведкаў пакут і страхаў, якія выпалі ў гады вайны на дзіцячыя галовы вязняў-пакутнікаў. Але тое, што адбылося з імі, павінна застацца ў памяці народа назаўсёды. Каб ніколі не паўтарылася пекла

Бухенвальда, Асвенцыма, Саласпілса, каб наша Радзіма заўсёды была незалежнай і суверэннай краінай. Мы павінны паважаць усіх тых, хто прайшоў Вялікую Айчынную вайну. І як сказаў Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнках: «Гэта было вялікае пакаленне пераможцаў. І зараз менавіта высокі патрыятызм — краевугольны камень у аснове нашага агульнага дома, імя якому Беларусь».

Таццяна КІШКО

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Кузьміч В. А., загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік адукацыі БССР, выдатнік адукацыі

Азарычы – боль мой на ўсё жыццё

Суайчыннік! Запомні навек

Колькі выпрабаванняў выпала на тваю долю, родная краіна. Колькі гора, бяды і няшчасця вынес наш працавіты і сціплы народ падчас Вялікай Айчыннай вайны?! Такое нельга ні прабачыць, ні забыць. І пра такое варта помніць усім: тым, хто змагаўся за Перамогу, і тым, хто сёння спажывае галоўную заваёву — жыццё. Жыць і помніць — такі запавет для моладзі. Помніць дзеля таго, каб ніколі, ніколі, не было паўтарэння жудасных старонак гісторыі.

Балюча будзе чытаць старонкі са страшнымі лічбамі, за якімі стаяць лёсы, жыцці ні ў чым не павінных людзей.

Але чытайце, людзі! Асэнсоўвайце, думайце, рабіце высновы.

Мне таксама баліць. Там, у азарыцкіх балотах гінулі і змагаліся за жыццё любыя мне людзі. Верагодна, няма ў нашай краіне сям'і, якая б не спазнала гора ад той вайны, якую распачалі людзі-нелюдзі.

Дакументальныя лічбы — сведчанне таму. І пакуль жыве памяць, будзе мір, будзе той светлы дзень, які мы маем сёння.

Дык няхай ён будзе назаўсёды! Няхай ніколі свет не здрыганецца ад такіх бедаў і няшчасцяў, якія спазнала Беларусь.

Любіце жыццё! Беражыце мір! Цаніце родную Бацькаўшчыну і слаўных людзей яе!

Ад аўтара

Вялікая Айчынная... Яна падзяліла людзей на жывых і забітых, але ўсе яны навекі засталіся ў адзінай памяці нашай Радзімы. Вайна — знявечаныя людскія лёсы, незваротныя страты, кроў і жах. Такое ніколі не забудзеш.

Пра фашызм чалавецтва ведае, здаецца, усё. Попел мільёнаў яе ахвяр стукае ў сэрцы людзей.

І ўсё ж сям-там спрабуюць зноў і зноў абяліць гэтую чуму XX стагоддзя — у вачах новых пакаленняў, якія самі не перажылі жахаў Другой сусветнай вайны.

Аднак жа ёсць яна, жыве народная памяць — непадкупная памяць пра фашызм гестапаўскі, канцлагерны, хатынскі. Суд народаў не закончыўся ў Нюрнбергу. Ён працягваецца ў памяці народнай. Суд гэты ідзе дзеля жыцця. Бо нездарма гаворыцца, што той, хто не памятае свайго мінулага, асуджаны зноў яго перажыць. І таму так важна, жыццёва важна, каб на ўвесь свет гучала народная памяць, праўда пра фашызм.

Гісторыя любога народа пішацца розным колерам. І разам са святочнымі датамі стаяць чорныя, трагічныя, напоўненыя ўсеагульным болем. Так, 22 чэрвеня 1941 г. для многіх людзей гэты дзень стаў апошнім, а для астатніх — незагойная рана на ўсё жыццё. Менавіта ў гэтую раніцу мірнае жыццё савецкага народа было прыпынена вайной. Беларуская краіна адной з першых апынулася пад фашысцкімі бомбамі і да канца жніўня 1941 г. была поўнасцю акупавана нямецкімі захопнікамі.

Акупанты стварылі на тэрыторыі Беларусі сістэму турмаў, канцэнтрацыйных лагераў і гета, дзе без суда і вызначэння тэрміну зняволення знаходзіліся сотні тысяч людзей. На акупаванай тэрыторыі дзейнічалі больш за 200 канцэнтрацыйных лагераў, іх філіялаў і аддзяленняў: для ваенапалонных і для цывільнага насельніцтва, жаночыя, штрафныя, перасыльныя лагеры СС і інш. (Дадатак А).

Знішчэнне насельніцтва мела мэтанакіраваны характар, што вынікала з нацысцкай ідэалогіі і захопніцкай палітыкі германскіх акупантаў. Расправы над людзьмі былі жудасныя і пераўзыходзілі па жорсткасці сярэдневяковыя варварствы.

Такое нельга ні прабачыць, ні забыць!

Нявінныя душы

Прысвячаецца былым вязням фашысцкіх канцлагераў.
Упершыню выконвалася на мітынгу ў Азарычах (чэрвень 2002 г.)

Музыка І. Лучанка

Словы І. Цітаўца

У сумнае пекла ішлі эшалоны,
Дыміўся Асвенцым. Стагнаў Трасцянец.
І неслі Азарычы катам праклёны,
І меры не ведаў свінец.

Прыпеў:
Вязні былыя,
Вязні былыя,
Чорнага часу дымы.
Чым правініліся душы нявінныя,
Сонца нязгасныя, Вы?

Дык схілім, мой сябра, галовы сівыя
Над прахам ахвяраў Айчыннай вайны,
З табой мы — далёкія сведкі жывыя,
З кім слёзы дзялілі яны.

Прыпеў

Часцінка малая ад іх засталася,
Ад тых незлічоных, знямоглых жывых.
Ды памяць людская з тым горам сплялася –
Тых жыццяў апошні ўздых.

Прыпеў

1. Азарыцкі лагер смерці

Яшчэ пасля разгрому пад Масквой у фашысцкага кіраўніцтва з'явілася ідэя аб стварэнні бактэрыялагічнай зброі. Аб яе практычным карыстанні загаварылі пры стварэнні лагераў смертнікаў на пярэднім краі абароны вермахту.

«Азарычы» сталі буйнейшым лагерам такога тыпу. Рэдкалесная забалочаная тэрыторыя, абнесеная калючым дротам... Тут людзей нічым не кармілі, і кожны дзень адбіраў чалавечыя жыцці.

Адгароджаныя ад Чырвонай Арміі, якая ішла ў наступленне, масай мірнага насельніцтва, як шчытом прыкрыцця, камандаванне вермахту збіралася праз заражаных вязняў распаўсюдзіць эпідэмію сыпнога тыфу ў нашых перадавых часцях і тым самым сарваць наступленне савецкіх войскаў.

Людзі змяшчаліся ў загонах пад адкрытым небам, абгароджаных калючым дротам, якія ахоўваліся з вышак, пастаўленых па перыметры. Падыходы былі замініраваны. Тэмпература паветра ў той час хісталася ад 0°С да –15°С, выпадаў снег, дажджы змяніліся маразамі. Крыніц водазабеспячэння не было: людзі елі снег або пілі ваду з балот на тэрыторыі лагера. Арганізаванага харчавання ў лагеры не было, палонным раз у некалькі дзён на тысячы чалавек давалі бульбу і па некалькі дзесяткаў буханак хлеба. Хлеб ахова лагера кідала ў галодны натоўп. Палонным забаранялася разводзіць кастры, збіраць сучча на падсцілку. За спробу парушэння гэтага рэжыму палонных расстрэльвалі.

У лагеры было шмат дзяцей, якія страцілі сваіх бацькоў. Памерлых хавалі тут жа, на тэрыторыі лагера. Частка забітых заставалася непахаваная.

Паводле плана нямецкага камандавання першапачаткова было вырашана стварыць адзін магутны лагер, які ўмяшчаў бы 46 000 чалавек. Затым было вырашана абсталяваць 3 лагеры перад пярэднім краем абароны немцаў, у якія сагналі ў паўтара раза больш людзей, 70 834 чалавек. Палову з іх склалі дзеці да 15 гадоў. Гэтыя канцлагеры знішчэння размяшчаліся ў населеных пунктах Дзерць, Азарычы, Падасіннікі як асноўныя. Акрамя таго, былі лагеры «прамежнага» значэння. Там здаровая частка насельніцтва перамешвалася з хворымі на тыф.

Калі немцы адступалі, яны пакідалі за сабой выпаленую «мёртвую зону». Больш за трыста жанчын з дзецьмі, старых, сабраных для этапіроўкі ў канцлагер «Азарычы» і «Падасіннікі», каля вёскі Любань яны загналі ў спецыяльныя ўкрыцці. Затым гэтыя ўкрыцці былі ўзарваны, а людзі, якія засталіся жывыя, знішчаліся з агнямётаў.

...Вызваленне канцлагера «Азарычы» пачалося 19 сакавіка 1944 г. войскамі 65-й арміі пад камандаваннем П. Батава. Пры вызваленні мястэчка загінула больш за дзве з паловай тысячы савецкіх салдат і афіцэраў.

Лёс азарыцкіх вязнікаў — гэта сімвал лёсу ўсяго беларускага народа, які пазнаў гора Хатыні, Трасцянца, Дальвы... Па колькасці знішчанага грамадзян-

скага насельніцтва канцлагер «Азарычы» займае другое месца пасля Трасцянца. Тут загінула 51 000 чалавек.

Такое нельга ні прабачыць, ні забыць!

2. Вайна — незагойная рана для маёй сям'і

Вайна... Яна не абышла і маю сям'ю. На фронце ваявалі прадзядул У канцлагеры каля мястэчка Азарычы змагаліся за сваё жыццё бабуля і прабабуля.

Мая бабуля, будучы тады яшчэ малой дзяўчынкай, зведала ўсе жахі і пакуты канцлагернага рэжыму (Дадатак В). І заўсёды, калі я прашу расказаць пра канцлагер, ёй зрабіць гэта нялёгка. Даводзіцца зноў вяртацца ў той стан у тыя канкрэтныя адчуванні дзіцячага ўзросту. Здавалася б, гэта немагчыма Але адбываецца дзіўнае: праз воблік пасівелай жанчыны раптам праглядае маленькая дзяўчынка, якая ў свае дзесяць гадоў змагалася за жыццё, змагалася па-даросламу. Яна перажыла за гэтыя некалькі дзён амаль усё жыццё, бачыла смерць любых ёй сястрычак, зведала голад і холад. Але ж самае галоўнае — яны засталіся жывымі.

І ў памяць аб тых, хто застаўся ляжаць назаўсёды на той зямлі, яны — вязні канцлагера «Азарычы» — кожны год прыязджаюць туды і са слязьмі на вачах успамінаюць тыя жудасныя дні.

4. Сокур (Литвинович) Мария Ивановна, 1934 г.р. жительница г. п. Паричи Светлогорского р-на, Гомельской обл. Малолетний узник концлагеря „Озаричи"

В январе 1944 г. нас, жителей д. Козловки, немцы вывезли в д. Корчма Слободского поселкового с/с. г. Бобруйска. В марте мы рано утром всех жителей этой деревни выгнали на улицу и стали загонять в машины. Машины были крытые и никто не знал куда нас везут. Где-то к обеду нас высадили в лесу и всех погнали к реке. Уже была хорошая тропинка. В лагере уже были люди. Когда нас пригнали за проволоку, всем дали по одной картошине и по луковке

лагерь. Малых и немощных везли
на телегах, все остальные шли
пешком. Кто отставал, тут же
стреляли. На дороге было много
убитых. Второй лагерь был
также огорожен колючей про-
волокой. По углам стояли выш-
ки, на которых стояли немцы
с автоматами. В этом лагере
нам не давали ни еды, ни воды.
Люди ели снег с грязью, чтобы
утолить жажду. В один из
дней к лагерю подъехали
машины. По лагерю пронесся
слух, что привезли хлеб.
Все люди бросились к проволоке.
Немцы стали бросать хлеб, как
голодным собакам. Моей маме
хлеба не досталось, но наш
сосед дал нам полбулки хлеба.
К вечеру из болота принесли
воду и давали пить. Люди были
голодные, холодные и к вечеру

почти все спали. Кто-то уснули уже навсегда. Утром, когда люди проснулись, немцев уже не было. Вскоре появились наши разведчики. Всех заключенных вывели на дорогу и сказали, чтобы с дороги не сходили, потому что всё заминировано. Стоял прекрасный, солнечный день.

Когда мы пришли к нашим, солдаты нас накормили, но есть много не давали, потому что после многих дней голода много есть нам было нельзя.

Выйдя из лагеря мы с мамой Пелагеей Прокоповной 1907 г. р. остались одни. Моя сестра Галя и бабушка умерли.

С лагеря мы дошли до д. Шатилки. Сейчас это город Светлогорск Гомельской обл.

Мама заболела тифом и её увезли в больницу, а я осталась одна, но среди добрых людей,

которые не дали мне умереть пока мама была в больнице.

Сейчас я живу в г.п. Паричи Светлогорского р-она Гомельской обл. На пенсии. Родила и воспитала двоих детей. Сын Виктор живет в г. Светлогорске, дочь Галина в г. Бресте. В 2003 г. умер муж. Имею четырех прекрасных внучек. Дай вам бог не видеть того, что мы увидели, пережили и испытали на себе во время войны. Берегите себя и свои семьи.

С уважением Сокур Мария Ивановна

Дай Вам бог не видеть того, что мы увидели, пережили и испытали на себе во время войны. Берегите себя и свои семьи.

С уважением Сокур Мария Ивановна

3. Успаміны вязняў канцлагера сведчаць

З успамінаў былога кіраўніка медыцынскай службы 65-й арміі генерал-маёра У. А. Калодкіна аб уратаванні вязняў Азарыцкіх лагероў.

Часці якія пачалі наступленне размініравалі падходы к Азарыцкім лагерам смерці і вызвалілі цудам выжыўшых вязняў.

У гады ваеннага ліхалецця Азарычы былі зонай смерці. На гэтай тэрыторыі гітлераўцы зрабілі тры канцэнтрацыйныя лагеры асабога прызначэння. Яны хацелі выявіць, як сыпны тыф падзейнічае на савецкіх воінаў, якія будуць вызваляць хворых вязняў. Больш за 50 тысяч жанчын, дзяцей і старых сталі матэрыялам для бесчалавечных доследаў. Савецкія салдаты змаглі вызваліць толькі каля 35 000 вязняў. Гэтыя тры лагеры размяшчаліся: першы — на балоце сярод невысокага лесу за 1 км на захад ад хутара Дзерць (памерам 200×400 м); другі — у балоцістым лесе — за 2 км паўночней мястэчка Азарычы (памерам 600×350 м); трэці (памерам 350×650 м) — на балоце — за 2 км на захад ад вёскі. Гэтыя лагеры ўяўлялі сабой нічым не абсталяваныя пляцоўкі, абнесеныя калючым дротам, подступы да іх былі заміраваны. Ніякіх будынкаў, нават самага лёгкага тыпу, на тэрыторыі лагераў не было. Людзі размяшчаліся на снезе пад дрэвамі, а нека-

торыя ў шалашах з галля дрэў. Сярод вызваленых з лагераў дзеці складалі каля 60%, да 15% — людзі сталага ўзросту, а астатнія — жанчыны. У лагерах было каля 500 дзяцей, якія страцілі сваіх бацькоў. Ва ўсіх лагерях памерлых хавалі тут жа, на тэрыторыі лагера. Частка забітых заставалася непахаванымі.

У лагеры знаходзілася частка людзей, якія былі хворыя на сыпны тыф, большая частка з іх не магла самастойна перамяшчацца па тэрыторыі лагера.

Пры набліжэнні нашых войскаў гітлераўская ахова ўцякла. Палонныя зламалі агароджу і ўсе, хто мог рухацца, хлынулі насустрач наступаючым войскам. Людскія натоўпы літаральна захлынулі перадавыя падраздзяленні некоторых часцей арміі. Вызваленыя горача дзякавалі воінам за ўратаванне. Воіны дапамагалі вызваленым выйсці на дарогу, дзяліліся з імі прадуктамі харчавання і аказвалі іншыя віды дапамогі. Такім чынам, частка перадавых падраздзяленняў арміі мела цесную сувязь з вызваленымі з лагераў і гэта было абумоўлена эпідэміялагічнымі вынікамі.

Вызваленае насельніцтва, якое імкнулася абагрэцца і абсушыцца, памкнулася да бліжэйшых населеных пунктаў, і гасцінныя гаспадары з радасцю далі ім прытулак, не задумваючыся пра небяспеку заражэння.

Медыцынскі аддзел арміі, маючы гэту інфармацыю, ацаніў становішча і адзначыў напрамкі асноўных намаганняў медыцынскай службы:

— ратаваннне жыццяў насельніцтва, вызваленага з канцэнтрацыйных лагераў;

— прадухеленне заносу сыпнога тыфу ў войскі Чырвонай Арміі;

— ліквідацыя эпідэміі сыпнога тыфу сярод асоб, якія былі вызвалены з лагераў.

— прадухіленне распаўсюджання сыпнога тыфу сярод насельніцтва.

Было прызнана неабходным стварыць аператыўную групоўку медыцынскага аддзела арміі пад кіраўніцтвам армейскага эпідэміёлага, падпалкоўніка медслужбы С. М. Юлаева для арганізацыі і правядзення намечаных мерапрыемстваў.

Для абслугоўвання насельніцтва, вызваленага з лагераў, з армейскага запасу выдзелены зводны батальён колькасцю 536 чалавек. Пасля выканання асноўных работ на працядгу 18 і 19 сакавіка частка асабовага складу была вернута ў полк, астатнія 327 чалавек неслі службу аховы на рубяжы р. Іпа і чыгуначнай лініі Шацілкі-Калінкавічы, ахоўваючы каранцінную зону.

Было выяўлена, што на тэрыторыі лагера Азарычы на 19.03.1944 года вязні сканцэнтраваліся ў населеных пунктах Рылавічы, Хамічы, Замашчаны, Курадзішчы. У гэтыя населеныя пункты былі накіраваны эпідэмгрупы, узначаленыя ўрачамі армейскага санітарна-эпідэміялагінага атрада: маёрам медыцынскай службы Голубевым і капітанам Фёдзер з чатырма ўрачамі, дэзтэхнікай і двума баннымі атрадамі.

Інтэрв'ю з Жураўлёвай Нядзеяй Канстанцінаўнай

Я жыла ў вёсцы да лютага 1944 года. Калі да Рагачова пачалі падыходзіць войскі Чырвонай Арміі немцы эвакуіравалі нас у глыбокі тыл. Я трапіла ў вёску Хамутоўка Кіраўскага раёна Магілеўскай вобласці.

Там я пражыла адзін тыдзень. У нядзелю раніцай у Хамутоўку прыйшлі машыны, на якія пагрузілі ўсіх жыхароў і павезлі да станцыі Цялуша — тут нас адразу пагрузілі ў вагоны. У вагоне, дзе я ехала, было 75 жанчын з дзецьмі. Вагонаў было шмат: мая сястра налічыла 65. Наступнай раніцай мы былі ўжо на станцыі выгрузкі. Гэтую станцыю я не ведаю, толькі пасля выгрузкі нас адвялі кіламетры за тры ў лагер, абнесены калючым дротам.

Тут мы засталіся на начоўку, а раніцай усіх жанчын з малымі дзецьмі пагрузілі ў грузавыя машыны. Старых і інвалідаў у машыны не саджалі. Калі адна жанчына (пасля я даведалася, што яна была са Жлобіна) хацела ўзяць з сабой сваіх бацькоў, дык нямецкі салдат, рэгуляваўшы пагрузку, нічога не кажучы, з пісталета застрэліў іх абодвух. Яны тут жа ўпалі ў гразь.

Разам са мной было тры мае сыны (4-х, 8-мі і 14-ці гадоў), а таксама бацька 75-ці гадоў. Я з малодшым сынам узлезла на машыну і за рукі начала ўсцягваць другога сына, Генку. Афіцэр, які стаяў побач з машынай (казалі, што гэта камендант) узяў у салдата вінтоўку і стукнуў Гену па назе. У выніку ў сына атрымаўся пералом нагі. Я паехала з двума малодшымі сынамі, а бацька і старэйшы сын засталіся. Прыехалі мы ў лагер. Праз некаторы час да нас далучыўся і мой бацька. Вось тут я даведалася, што майго старэйшага сына Толю немцы забралі і кудысьці вывезлі, пры гэтым яго моцна білі палкамі.

У гэтым лагеры мы прабылі тры ночы. Нас зноў пагрузілі на машыны і павезлі ў наступны лагер. На нейкай мясцовасці, дакладна не ведаю, але перад лагерам пралягаў шлях, які вёў у Азарычы (прыкладна 4 – 5 км ад Азарычаў). Так як лагер быў запоўнены, нам прыйшлося размясіцца ля варот. Прабылі мы тут тры дні, пасля чаго лагер быў вызвалены Чырвонай Арміяй.

Сярод палонных у лагеры было шмат хворых. Большую колькасць хворых немцы прывозілі, але шмат палонных захворвалі ў лагеры. Асноўная маса хворых — тыфозныя. Да іх немцы адносіліся асабліва па-варварску. Знаходзячыся ля варот, я назірала, як пад'язджалі машыны з хворымі на тыф, выгружаныя такім чынам. Кожная машына змяшчала каля 60 чалавек, магчыма і больш. Увогуле на маіх вачах скінулі больш за 100 чалавек. Хворых скідвалі прама на бальшак, а нас прымушалі перацягваць іх на тэрыторыю лагера. Жанчыны, убачыўшы такія машыны, самі беглі да іх, разгружалі — большая частка там былі дзеці ва ўзросце ад года да пяці. Маладых дарослых амаль не было. У выніку здзекаў са 100 чалавек хворых, скінутых з машын, не менш за 40 памерлі адразу ж, а астатнія — праз некаторы час. Большая колькасць загінуўшых — старыя людзі. Дзеці выжывалі. На адной з машын прывезлі дзяўчыну, на выгляд гадоў 17 – 18. Яна была зусім голая і вельмі хворая, не магла гаварыць — не адказвала ні на адно наша пытанне. Яна ляжала на снезе ў тым рыззі, якое ёй надзелі жанчыны. Праз два дні яна памерла. Смяротнасць у лагеры была вялікай. Я бачыла шмат загінуўшых дзяцей і старых. Хто меў родных, быў пахаваны. Адна з жанчын налічыла 61 магілу.

Пасля вызвалення лагера войскамі Чырвонай Армі жанчыны знаходзілі сваіх дзяцей у іншых лагерах.

Інтэрв'ю з Лазебнікавай Наталляй Барысаўнай

Прыкладна 15 лютага 1944 года, знаходзячыся у сваей хаце, я захварэла на тыф, праляжала 10 дзён. Мяне ніхто не лячыў. У гэты час па вуліцах нашай вёскі хадзілі нямецкія жандармы, якія вышуквалі хворых. Даведаўшыся, што я хворая на тыф, яны ў той жа дзень адправілі да мяне салдата, які на возе адвёз мяне ў вёску Прыстой — за 8 км ад нашай вёскі. У гэтай вёсцы быў лазарэт, у які немцы звозілі хворых жыхароў з усіх бліжэйшых сёл. Калі мяне прывезлі сюды, там было ўжо каля 150 чалавек. З іх 70 – 80 — хворыя на тыф, астатнія хварэлі на грып, былі разбіты паралічом, а таксама былі раненыя ў час абстрэлу.

Тут быў адзін рускі ўрач і каля 10 медсясцёр. Прадуктаў харчавання нам не давалі — мы елі тое, што прыносілі родныя з дому. У лазарэце я прабыла 17 дзён.

Рэха вайны дакацілася і да Віцебска. Жыхары горада не ведалі, што рабіць, куды кідацца, якія меры прымаць. Вайна… Як тыя крумкачы, над горадам ужо які круг наразалі месершміты, іх драпежны гук увабраўся ў кожную цэглу, у кожную пясчынку, якіх так многа на брукаванай дарозе. Здавалася, што не з паветра складалася атмасфера, а з роспачы і адчаю. Усё было апантана страхам. Вочы выядаў дым, пахі гарэлага разносіліся па ўсім горадзе, не было чым дыхаць. То тут, то там чуўся тонкі свіст падаючай цені, а потым выбух, яшчэ і яшчэ. Гэтае пекла не мела ні пачатку, ні канца. Горад ператварыўся ў вялікую ззяючую рану, нідзе не было прытулку, адны толькі разваліны. Людзі імкнуліся ўратавацца, беглі ў роспачы ў бамбасховішча і нярэдка заставаліся на асфальце з вачамі, якія толькі хацелі жыць.

Каторы дзень Антаніна са сваёй маці не выходзілі на вуліцу. У бамбасховішчы вельмі душна, не хапае свежага паветра, якое было наэлектрызавана чалавечымі пакутамі, болем, адчаем. Але так больш не магло працягвацца. Вырашылі: пара ісці дамоў і ратаваць маёмасць, якая толькі засталася. Да таго часу ў доме Старыковічаў амаль нічога каштоўнага не засталося, але была карміцелька – швейная машынка, якая ўсё ж такі уяўляла сабой пэўны скарб для маленькай сям'і. Калі горад ахутала ноч і адносна сціхла бамбёжка, швейная машынка была закапана недалёка ад дома: набліжаліся немцы, і невядома чаго ад іх чакаць. Усе вокны цяпер былі пераклеены крыж накрыж папернымі стужкамі, каб шыбы маглі ўтрымаць націск гукавых хваляў. Не хапала вады, за ёй стаялі кіламетровыя чэргі, не хапала хлеба, зноў чэргі.

Кожны дзень пачынаўся і заканчваўся як учарашні дзень. Асада… Усе дзеяздольныя мужчыны былі мабілізаваны, нават падлеткі і тыя ішлі туды, адкуль набліжалася смерць. Жанчыны, старыя капалі абарончыя муры, акопы, майстравалі барыкады. Яны ледзь перастаўлялі ногі, але сцяўшы зубы зноў і зноў прымаліся за працу. Пясок засыпаў рот, нос, вочы – ён быў паўсюль, але людзі не здаваліся, як тыя пчолкі змагаліся супраць трутняў.

«Чарга… Вось яно чаканае вядзерца вады, і не мае сэнсу, што яна не зусім чыстая – гэта ж вада. Вядро цяжкае, але гэта прыемна, бо адчуваеш сябе пераможцам над спёкай, над стомай, над смагай. Вечарам прыйдзе мама Агатка, будзе рада такой падзеі. Хлеб ужо ёсць, ляжыць на стале пад сурвэткай, яго няшмат, ды час нялёгкі. Пакаштаваць бы яго, але неабходна дачакацца матулю. Толькі адну маленькую крошачку, не, нельга», – зусім не дзіцячыя думкі лётаюць ў дзіцячай галоўцы Антаніны. Спакуса вялікая, але яна пераможана.

Агата вяртаецца дамоў, калі стрэлкі гадзінніка ўжо набліжаліся да дванаццаці. Чалавечае цела падобна да сенніка: кожны мускул аддае болем, і гэты боль ужо не адчуванне, а стан усяго арганізма, калі нават вочы амаль не адлюстроўваюць ніякіх пачуццяў. Убачыўшы скарб, які здабыла дачушка, Агата ледзь прытуліла яе да сябе: на большае не хапіла сілы, але малая ўсё разумела і не патрабавала большага. Падсілкаваўшыся, жанчына забылася сном, заўтра паўтарэнне сённяшняга і так невядома колькі часу. Абуджэнне было цяжкім. Агата сніла сон пра свайго сваяка – Андрэя (мужавага брата), ён у Ленінградзе, можа яго не дастане гэта вайна. Ізноў акопы…

****

Зіма змяніла лета, акупацыя змяніла асаду.

Сцюжа… У дамах паляць мэблю, таму што толькі так можна сагрэцца. У доме Старыковічаў застаўся апошні ложак… Новая ўлада, новыя парадкі. Адусюль гучыць гэтая цяжкая мова, якая нібыта тупы ржавы нож у самае сэрца.

Ноч. Горад. Каменданцкая гадзіна. Ціхуткі стук у шкло. Агата не адразу зразумела, што гэта такое: спачатку доўга прыслухоўвалася, а затым павольна, цяжкім крокам падышла да акна. Знадворку было вельмі цёмна, гэтая цемра адштурхоўвала ад сябе нейкай брыдкай слізкасцю небяспекі, а таемны стук вабіў, клікаў да сябе, абяцаў нешта невядома-спакуслівае. Нарэшце Агата адважылася і марудна адхінула тое, што некалі называлася цюлем. Цемра выядала вочы, нічога не было відаць, але паціху зрок прызвычаіўся да такога стану. Спачатку вочы кабеты аддзялілі ад цемры размыты стан чалавека, потым стаў відаць і твар. Ён быў такім, як і мільёны іншых, але нешта было ў ім не такое, як у астатніх: сярэдні лоб, перарэзаны некалькімі глыбокімі маршчынамі, скулы, якія выступалі наперад на дазволеную адлегласць, былі шчыльна, вельмі шчыльна абцянуты скурай, здавалася, што гэта жывая мумія, якая праз столькі год так добра захавалася; нос суровы, так, менавіта суровы, востры падбародак, моцны і адважны, вялікі рот, які даўно не ведаў усмешкі, вусны, абветраныя, шчыльныя і нямыя, бровы і вочы нагадвалі сваім знешнім выглядам звера, дзікага і неўтаймаванага, колер скуры быў зямельным, грубым. На Агату ўпаў позірк асцярогі, і раптам ён змяніўся позіркам надзеі і чакання. Жанчына не спачатку пачала разумець, што адбываецца: яна не ведала гэтага чалавека, ёй стала вельмі страшна ад гэтага начнога прывіду, але вочы, вочы не адпускалі яе. Яны прываблівалі і супакойвалі, яна недзе, калісьці іх бачыла… «Іван», –– толькі і здолела прамовіць збялелая жанчына.

У халодным цёмным пакойчыку чутно перашэптванне двух людзей: яны сядзяць на ложку, шчыльна прытуліўшыся адзін да аднога. Мужчына ўвесь час нешта расказвае, а жанчына слухае, цяжка і ўважліва. Яе браты, яны тут у гэтую трывожную гадзіну, усе тут. Прыйшоў толькі Іван, старэйшы, бо паўсюль немцы, небяспечна.

З пекла ў пекла: з Сібіры ў падпольшчыкі ў акупаваным горадзе, але ў кожнага сваё прызначэнне на зямлі, якую зараз неабходна бараніць. Тут ужо не мае сэнсу, хто ты, які ты. Галоўнае, што ты сын сваёй Радзімы…

Больш Агата не бачыла Івана, ён не прыходзіў. Падпольшчык адказваў не толькі за сябе, але і за тых, з кім меў якія-небудзь зносіны. Агата ведала, што браты тут, усе пяцёра, і ад гэтага было пяплей і ўтульней: яна не адна.

****

Жыццё і вайна, вайна і жыццё... Яны былі непадзельныя. Зразумела, што гэта вельмі несумяшчальныя панятці, але тым не менш яны суіснавалі адзін з адным. Час ішоў. Прайшла адна зіма акупацыі, наступіла другая...

Горад абараняўся як мог: то тут, то там узрываліся нямецкія штабы, арганізоўваліся сабатажы, падрывалася дзейнасць нямецкіх улад. Падполле дзейнічала, не давала спакою акупантам. Яно шырылася, мацнеючы з кожным днём. Але заўсёды знойдзецца Іуда, які прадасць любога і кожнага толькі з мэты дагадзіць. У адзін момант нябачнае, але моцнае падполле перастала існаваць. Рука ворага дацягнулася да яго праз дзеянні і намаганні здраднікаў.

Замест дрэў на вуліцах горада раслі шыбеніцы. На іх вісела жудасная, страшная, нямая садавіна, калі гэта можна так назваць. Пакаранні адбываліся прылюдна, каб усе бачылі, з мэтай застрашэння. Але перад пакараннем ахвяры праводзілі пекла, пасля якога нават шыбеніца здавалася роднай і мілай. Каты не ведалі літасці, іх садысцкі розум нараджаў фантазіі, якіх не ведаў нават д'ябал. У кожнага палоннага быў свой асабісты «нумар», які знаходзіўся ў бетонным падзямеллі. Палонным нажом выразалі на спінах зоркі, выдзіраліся абцугамі пазногці, аблівалі на марозе сцюдзёнай вадой і пакідалі замярзаць, выцягвалі ногі, рукі, раструшчвалі косці. Усё гэта рабілася з адной мэтай: сабраць як мага больш інфармацыі ад гэтых маўклівых вязняў. Нарэшце закатаваныя, знясіленыя людзі падымаліся на эшафот, але яны не прасілі аб літасці, а неслі незламаную годнасць у вачах, сэрцах і душах. Яны ведалі, што не проста прыйшлі ў гэты свет, прыйшоў іх час.

Пяцёра братоў... Іх больш не стала. Яны зведалі ўсё, што толькі можна зведаць: сібірскую ссылку і нямецкія здзекі. Але яны выканалі свой абавязак: таму яны пахаваны ў роднай зямельцы, а не там, дзе ўвесь час холадна і дзе няма імёнаў, а толькі асабістыя нумары.

****

Людзі вынішчаліся як тараканы: расстрэльваліся вёскі, задыхаліся ў душагубках гарады, спальвалася ўсё жывое. Але фашыстам было мала: яны арганізоўвалі лагеры смерці і зганялі, зганялі туды людзей з усіх мясцовасцяў, з усяго Савецкага Саюза.

Лагер смерці ў Кёнінгсбергу (сучасны Калінінград). Там апынуліся Агата і Антаніна Старыковіч.

Месца, дзе знаходзіліся людзі, уяўляла сабой квадрат, больш ці менш правільнай формы, які быў абгароджаны некалькімі радамі

калючага дроту. Праз кожныя пяцьсот метраў стаяла невялікая абзорная пляцоўка, дзе размяшчаўся канвой. І паўсюль, паўсюль гэтыя лютыя пачвары – аўчаркі, якія прызначаны выконваць адзіную функцыю – запалохваць палонных, усяляць жах у іх сэрцы.

Людзі, як быдла, жылі ў брудзе і смуродзе. Так, людзі жылі ў загоне пад адкрытым небам. Дожд, снег асядаў на галовы людзей, а яны корчыліся і шукалі больш сухога месца, каб там пасядзець, бо стаяць ужо не было сілы, некаторыя сядалі ў сцюдзёную гразь, а потым заставаліся там. Сцюдзёны вецер працінаў да самых касцей, тканкі цела ўжо не адчувалі болю, балелі косці… Вочы заплюшчваліся самі па сабе, прыемны, салодкі дурнап'ян ахутваў усю істоту чалавека, ён забываўся на ўсё, яму так хораша, так добра. Але яго штурхалі пад бокі – смерць неахвотна адпускала са сваіх абдымкаў.

Спёка. Сонца, выконваючы свае абавязкі, няўмольна паліла, людзі не ўсміхаліся яму, як некалі, а прасілі толькі аб адным: сцішыць свой моц. Нідзе, нідзе нельга было схавацца ад натуральных з'яў прыроды, якія яшчэ ўчора былі мілыя сэрцу. Горла перасыхала ад смагі, голас не слухаўся, замест яго ў паветра вылятаў толькі скрыпучы сухі хрып. Палонныя амаль не ведалі, што такое вада. Яе, брудную, пацвілую, налівалі ў пэўны час у вялікую даўгаватую пасудзіну, якая нагадвала карыта. У такія моманты людзі не людзі, а жывёлы: распіхвалі адзін аднога, ішлі па спінах, скурчыўшыся пілі ваду, пры гэтым гучаў вар'яцкі смех. Ежа – слова незнаёмае, замест яго – баланда. Гэта цёмнае рэчыва, аснову якога складала прамерзлая гнілая бульба.

Смерць спраўляла тут свае ігрышчы, гэтае месца можна было назваць яе прытулкам, куточкам яе змрочнага каралеўства. Яна заглядвала кожнай ахвяры прама ў вочы, перш чым забраць душу чалавека, яго дыханне і слабы бляск жыцця. Разнастайныя хваробы аддана дапамагалі ёй у гэтым, непрыкметна падкрадваліся да чалавека і ўпэўненым крокам вялі яго да трону смерці. Адна з такіх служак напаткала і Агату Старыковіч. Сухоты…

Хваробе прыйшлося нялёгка. Агата і Антаніна здолелі дачакацца прыходу Чырвонай Арміі. Дзякуючы ёй многія набылі тое, аб чым так доўга і пакутна марылі. Слёзы шчасця ніяк не хацелі спыняць свой імклівы ручаёчак. Яны каціліся і каціліся, вымываючы з цела бруд канцлагера. Вязняў адразу ж перавезлі ў шпіталі, зрабілі медыцынскі агляд, але перш-наперш усіх накармілі. Людзі не верылі, што гэта сапраўдная ежа, а не якая-небудзь там баланда. Многія не хацелі прачынацца: думалі, што гэта ўсё не больш за сон. Але ўсё да апошняй хвіліны было сапраўдным як ніколі.

****

Па сценах шпіталя распаўзаецца стогн раненых і хворых. Тут усе: раненыя вайскоўцы і былыя вязні канцлагера. Кроў, боль, кашаль, перадсмяротны хрып, непатрэбныя ўжо нікому рука, нага… Санітаркі не могуць даць рады

гэтаму сховішчу пакут. Пад белай хусцінкай пазнаецца тварык Антаніны. Яна тут, дапамагае наглядаць за хворымі. Ёй яшчэ няшмат год, але рук не хапае, і таму рады любой дапамозе, тым больш, што яе мамачка ў гэтым шпіталі. Можа, лёс злітуецца і Агата будзе жыць... Дарма, хвароба моцна трымаецца за лёгкае цельца, якое амаль высахла, ператварылася ў шкілет, абцягнуты скурай. Сухі і востры кашаль не дае спакою, ды і з лёгкіх адыходзіць усё больш і больш крыві.

Кёнігсберг. Брацкая магіла. Агата Старыковіч...

****

Адзінота. На свеце няма нікога роднага, але застаўся дружа Віцебск. Туды, туды як толькі мага хутчэй. Антаніна вяртаецца дадому...

Віцебск, такі родны і мілы, што з табой сталася, дзе твая былая веліч і прыгажосць. Усё з'ела вайна. Горад здзічэў у прамым сэнсе гэтага слова. Няма ніводнага цэлага збудавання. Паўсюль адны руіны. Людзі хадзілі толькі па трамвайных шляхах, ніхто не адважваўся прайсці каля разбуранага дома. З пустых аканіц знявечаных будынкаў выскоквалі ваўкі. З лесу іх выгнаў голад, там больш не засталося траваядных жывёл, усе знішчаны вайной. Цяпер воўк паляваў на чалавека ў цэнтры некалі буйнога горада. Гэта не фільм жахаў, а рэальнасць.

Пры дапамозе суседзяў і знаёмых Антаніна ўсё ж здолела знайсці сваю дальнюю родзічку, якая прыняла яе да сябе. Менавіта праз яе дзяўчына пачула гісторыю, якая адбылася ў блакадным Ленінградзе.

****

Блакада як туман апусцілася на горад. Але гэты туман не рассейваўся над горадам вельмі-вельмі доўга. Тут ён напаткаў і студэнта Андрэя Старыковіча. Металічны дождж бомбаў так і паліваў горад дзень за днём. Здавалася, што горад ужо прызвычаіўся да гэтага. Людзі жылі далей. Працавалі навучальныя ўстановы, бібліятэкі, дзіцячыя садкі, дамы культуры. Але кола блакады паступова звужалася, душыла людзей голадам. Ён панаваў над горадам, падштурхоўваў людзей да звярыных учынкаў, інстынкт самазахавання браў верх над прыстойнасцю і мараллю. Зіма падтрымлівала голад сцюжай, марозам, завеямі і калючым снегам. Белы жах...

Дзень як дзень і вуліца як вуліца. Андрэй вяртаецца з заняткаў у здымную кватэру. Зноў бамбёжка горада.

Люк бамбавоза адкрыўся, адтуль вылецела бомба і нямым ценем паляцела да зямлі, разрываючы паветра на кавалкі. Вось яна дакранулася да цвёрдай

паверхні і адразу разарвалася на мільёны маленькіх аскалёпкаў. Момантам раней на дарогу ступіў Андрэй.

Нязвыклы боль працяў яго жывот, млявасць разам з болем распаўзалася па ўсім целе. Крануўшы месца, дзе адчуваўся пякучы боль, юнак рукой адчуў нешта цёплае і слізкае – гэта была кроў. Хлопец паспрабаваў зрабіць некалькі крокаў, але гэта вельмі дрэнна атрымоўвалася. Вуліца плыла перад вачыма, ногі падкошваліся і ўпарта не хацелі слухаць свайго гаспадара. Марозна, а да кватэры яшчэ далёка. Выйсце адно – папрасіць прытулку ў людзей. Абапіраючыся аб сцяну дома, хлопец як-ніяк дашкандыбаў да першага пад'езда. Больш ён адтуль не выйшаў…

А ў Віцебску яго чакала адданае і мілае сэрца дзяўчыны Зоі. Андрэй і Зоя павінны былі ажаніцца…

****

Швейная машынка «Zinger» дачакалася сваёй малодшай гаспадынькі. Яна – адзінае, што засталося Антаніне ад сваёй матулі. Гэта не рэч, а памяць.

****

У 1954 г. Іосіф Старыковіч быў рэабілітаваны.

Пасляслоўе

Раніцаю дваццаць другога чэрвеня сорак першага года на адной з брэсцкіх вуліц ляжала забітая дзяўчынка з расплеценымі коскамі і лялькай.

Многія запомнілі гэтую дзяўчынку. Запомнілі назаўсёды.

Што можа быць даражэйшае за дзяцей? Для кожнай маці? Для кожнага бацькі? Для кожнага народа?

А хто падлічыць, колькі дзяцей забівае вайна,– яна ж забівае іх двойчы. Забівае тых, хто нарадзіўся. І забівае тых, хто павінен быў прыйсці ў гэты свет. У «Рэквіеме» беларускага паэта Анатоля Вярцінскага над полем, дзе засталіся ляжаць забітыя салдаты, гучыць дзіцячы хор – гэта боль ненароджаных дзяцей. Яны і сёння крычаць і плачуць над кожнай брацкай магілай.

Ці засталося дзіцём тое дзіця, якое прайшло праз жахі вайны? Хто верне яму дзяцінства? Што помняць яны? Што могуць расказаць? Павінны расказаць!

Таму што і цяпер таксама дзесьці рвуцца бомбы, свішчуць кулі, рассыпаюцца ад снарадаў на друз, на пыл дамы, дзе стаялі дзіцячыя ложкі. Таму што і сёння некаму сніцца вялікая вайна, сусветная Хірасіма.

Што гераічнага ў тым, каб у пяць – дзесяць альбо дванаццаць гадоў прайсці праз вайну? Што маглі зразумець, запомніць дзеці?

Многае!

Што помняць яны пра маці? Пра бацьку? Толькі іх смерць: «…застаўся на вуголлі адзін гузік ад мамінай кофты. А ў печы два боханы цёплага хлеба…» (Аня Точыцкая – 5 гадоў). Як бацьку рвалі нямецкія аўчаркі, а ён крычаў: «Сына адвядзіце… Сына адвядзіце, каб не бачыў…» (Саша Хвалей –

7 гадоў). Яшчэ яны могуць расказаць, як паміралі ад голаду і страху. Як уцякалі на фронт: «Мам, пусці на вайну... – Не пушчу! –Тады я сам пайду!» (Баля Дончык – 10 гадоў).

Сёння яны апошнія сведкі тых трагічных дзён. За імі не застаецца нікога, хто б яшчэ мог расказаць. У блізкім суседстве са смерцю яны станавіліся дарослымі і мудрымі не па-дзіцячы, і нават не па-чалавечы. Параненыя дзіцячыя душы палохалі іншы раз больш, чым сама смерць.

На Планеце Людзей дзеці – самы лепшы народ. Як зберагчы яго ў трывожным дваццаць першым стагоддзі? Як зберагчы яго душу і яго жыццё? А разам з тым і наша мінулае, і наша будучае?

У апошні час сродкі масавай інфармацыі перапоўнены звесткамі пра здарэнні разнастайнага кшталту: катастрофы, крушэнні, аварыі, узброеныя канфлікты. У гэтых здарэннях гінуць сотні людзей, тысячы атрымоўваюць калецтвы. Людзі слухаюць гэта, хвалююцца за іншых, выказваюць свае шкадаванні, а між тым у сэрцах яны радуюцца таму, што гэта адбылося не з імі. Аргументацыя гэтага вельмі прымітыўная: «У нас не можа такога здарыцца». Але ніхто не ведае, якім будзе заўтра і якімі мы будзем заўтра.

Усё можна змяніць і выправіць, толькі смерць нязменная. Яна прыходзіць, але больш нікуды не адыходзіць, а застаецца назаўжды, забраўшы сваю ахвяру. У свеце няма нічога больш страшнага за адыход блізкага чалавека ў другі свет. Зразумела, што ад гэтага нікуды не схавацца: так загадала прырода. Ды толькі бацькі не павінны хаваць сваіх дзяцей.

У прыродзе ўсё зразумела: забіваюць толькі для таго, каб харчавацца, а харчавацца для таго, каб жыць. А нашто забівае чалавек? З якой прычыны, з якой нагоды, з якой мэты? Мы ж усе маем адзіных продкаў. Нашто ламаць жыццё чалавека, нашто яго забіваць. Пытанняў вельмі шмат, а адказаў няма.

Чалавек – істота сацыяльная, таму ён і ад яго залежаць іншыя. Жыццё кожнага з нас нагадвае картачны домік: упадзе адна карта, а за ёй астатнія. Ламаць няцяжка, але ці патрэбна гэта.

Галодная пачвара, якую нацкавалі на ахвяру, можа выйсці з-пад кантролю і як вынік – праглынуць сваіх гаспадароў. Яна не зважае на тое, хто ты, на якой ступеньцы сацыяльнай лесвіцы стаіш. Для яе галоўнае напоўніць сваё ненажэрнае нутро.

ЛЮДЗІ, НЕ ВЫПУСКАЙЦЕ ПАЧВАРУ ВАЙНЫ НА НАШУ БЛАКІТНУЮ І ТАКУЮ РОДНУЮ ЗЯМЛЮ! НЕ ДАЗВАЛЯЙЦЕ ЯШЧЭ РАЗ ПАЗНАЦЬ ГОРА І ПАКУТЫ НАШЫХ РОДНЫХ, БЛІЗКІХ НАМ ЛЮДЗЕЙ. УРОКІ МІНУЛАГА НЕ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ. ЯНЫ ВУЧАЦЬ ЦАНІЦЬ САМАЕ ДАРАГОЕ – ЖЫЦЦЁ, МІР І СПАКОЙ. ПОМНІЦЕ ПРА ГЭТА! БЕРАЖЫЦЕ СВОЙ РОД, НАРОД, КРАІНУ!

Вікторыя ЦЫГАНОК

Студэнтка факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі (ХТіТ)

Кіраўнік: Жукоўская Т. У., выкладчык кафедры беларускай мовы

Паўстала песня народная

Вусная народная творчасць — натхняльнік перамогі

Уводзіны

Ніхто з нас не мае права сказаць: «Я ведаю вайну». Ніхто вайну не ведае. Магчыма, ведае нейкую частку. Адзін больш, другі менш. Вайну ў цэлым ведае народ, і народ трэба распытваць пра яе.

К. Сіманаў

Асноўнай умовай магутнасці і стабільнасці любой дзяржавы выступае згуртаванае грамадства, якое абапіраецца на адзіныя грамадска-палітычныя ідэалы, грунтуецца на маралі, гістарычных і этнічных традыцыях, рэлігіі, пачуцці нацыянальнага гонару, фарміраванне якіх з'яўляецца асноўнай задачай сучаснай ідэалогіі беларускай дзяржавы. Ідэйна-маральнае, патрыятычнае выхаванне разглядаецца як прыярытэтнае ў духоўным станаўленні і развіцці асобы, таму што ўстойлівае развіццё любой дзяржавы залежыць ад таго, наколькі ў кожным яе грамадзяніне сфарміраваны такія якасці , як патрыятызм і маральнасць.

Выхаванне патрыятызму, станаўленне асобы, якая валодае сталай грамадзянскай пазіцыяй , магчыма толькі праз суперажыванне, любоў і павагу чалавека да чалавека, да супольнасці людзей, да сям'і, да роднай зямлі і сваёй краіны. І гэтаму служаць тыя імкненні, помыслы, дзеі беларускага народа, якія знайшлі выхад у вуснай народнай творчасці суровага часу, часу выпрабаванняў – Вялікай Айчыннай вайны. Фальклорныя творы павінны яшчэ раз абудзіць гістарычную памяць сучаснікаў пра тое, якой цаной дасталася беларускаму народу незалежнасць ад захопнікаў. Калі моладзь усвядоміць грамадзянскі подзвіг і гераізм старэйшага пакалення, то можна быць упэўненым у тым, што маладыя патрыёты будуць ставіцца да роднага краю з такой жа адказнасцю і ахвярнасцю, як слаўныя продкі.

1 Фальклор мужнасці і гераізму

На працягу многіх стагоддзяў намаганнямі вялікіх калектываў людзей і нават цэлых пакаленняў была створана значная колькасць паданняў, легенд, казак, песень, частушак, прыказак, прымавак, загадак. Гэтыя творы жывуць

сярод шырокіх народных мас, апрацоўваюцца, шліфуюцца імі падобна да таго, як мора і ноччу і днём нястомна шліфуе прыбярэжнае каменне, і пераходзяць ад аднаго чалавека да другога, з аднаго пакалення ў другое не праз рукапісы і кнігі, а галоўным чынам вусна, па памяці.

У сваіх творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны народ сцвярджае сілу і магутнасць духу, услаўляе подзвігі, выкрывае ўнутраных і знешніх ворагаў. Шырока адлюстравана ў беларускім фальклоры тэма ўз'яднання беларускага народа ў гэты перыяд. Пачуццё глыбокай і шчырай удзячнасці выказваюць вызваленыя браты-беларусы савецкаму народу ў сваіх песнях, частушках, вусных расказах, анекдотах.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945) на Беларусі ўзнікае асабліва багаты фальклор, які адлюстроўвае масавы гераізм народа ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. Гераічныя справы і подзвігі народа патрабавалі такіх гераічных мастацкіх твораў, якія б дапамагалі граміць чужынцаў, ачышчаць ад іх нашу свяшчэнную беларускую зямлю. Менавіта такія актыўна дзейсныя творы і складаў народ у гады ваеннага ліхалецця.

Помста нас кліча, заве да расплаты,
За мукі, за здзекі, за кроў. —
Біце фашысцкага ката,
Знішчайце фашысцкіх звяроў!

29 чэрвеня 1941 г. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі і Савецкі ўрад звярнуліся да народаў СССР з заклікам мабілізаваць усе свае сілы на адпор ворагу. Вострай зброяй у барацьбе з азвярэлым фашызмам было побач з савецкай літаратурай мастацтва вуснай народнай паэтычнай творчасці. Беларусы таксама дастойна адказалі на заклік партыі, і гераічнымі баявымі справамі і шчырым паэтычным словам было:

У сэрцы кожнага дума ўпартая —
Баявы ажыццёвіць загад,
І па закліку роднае партыі
За атрадам спяшае атрад.

У сорак першым на граніцы
Немцы бомбы скінулі:
Вілі, Альберты і Фрыцы
На наш край нахлынулі.

2 Песня народная

Вялікая Айчынная вайна стала цяжкім выпрабаваннем для народа. Усе сілы былі накіраваны на барацьбу з бязлітасным і каварным ворагам. Справе перамогі над фашызмам служыла і беларуская народная песня.

Фашысты дзейнічалі на нашай зямлі згодна «з планам Барбароса»: разбуралі гарады, палілі вёскі, забівалі людзей, моладзь гвалтоўна звозілі на катаржныя работы ў Германію, словам, уводзілі свой «новы парадак» і нішчылі ўсё, што было на іх крывавым шляху для стварэння так званай «Вялікай Германіі».

У народнай творчасці тых часоў гаварылася:

Прыехалі ў вёску фашысцкія каты,
Крывавыя бачыш сляды:
Усё тут ад хаты да хаты
Бандытамі пушчана ў дым.

Людзей расстралялі багата,
Уводзячы «новы закон»,
А хлопцаў усіх і дзяўчат
Угналі ў фашысцкі палон.

Фашысцкае нашэсце народ наш успрыняў і характарызаваў у сваёй творчасці як драпежныя дзеянні «дзікай зграі раз'юшаных бандаў», як крывавыя расправы над савецкімі людзьмі лютых «падонкаў чалавецтва».

Вельмі цяжкімі былі ўмовы жыцця і барацьбы беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Але народ наш ні на хвіліну не губляў веры ў сваю перамогу. Ідэя народнага супраціўлення была адной з вядучых у масавай паэтычнай творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Не на тое мы раслі,
У шчасці гадаваліся,
Каб фашысцкія сабакі
З намі распраўляліся.

Людзі пакідалі свае хаты, вёскі, гарады, не баяліся ні балючых ран, ні самой смерці, абы толькі знішчыць ворага і вярнуцца з перамогай.

І жыццё шкадаваць мы не будзем,
Каб не цешыўся бэшчаны кат,
Мы ў баях перамогу здабудзем,
Праз баі мы праб'ёмся назад.

2.1 Песні народных змагароў

Усё мацней і мацней разгаралася полымя народнай помсты ў тыле ворага. Гэта натхняла партызанскіх байцоў ствараць творы шырока абагульненыя, у якіх адлюстроўвалася ўсенародная барацьба супраць акупантаў.

Каб жыць на свабодзе па-людску,
Каб гора ніколі не мець,
Нясуць партызаны са Слуцку
Праклятаму ворагу смерць.
Выходзяць на бітву аршанцы,
Суровы ідзе Магілёў,
Каб помсціць нямецкім паганцам
За гвалты, за здзек і за кроў.

Штыкамі шчацініцца Мозыр,
У гневе гудзе Белавеж,
І помста бязлітасна, грозна
Паўстала з сялянскіх застрэш.
Бушуе народным паўстаннем
І Гомель, і Віцебск, і Пінск,
І ворагу помсціць за раны
Наш родны разбураны Мінск.

Куды б ні ступіла нага фашысцкага ката, усюды яго паражала партызанская куля:

І на Пцічы, і на Сожы,
Ля Вілеі і Свінцян
Метка б'юць салдат варожых
Кулі слаўных партызан.

Формы партызанскай вайны былі вельмі разнастайнымі. І ўсе яны знайшлі свой адбітак у паэтычнай творчасці народных мсціўцаў:

Мы арыйскія чэрапы крышым.
Каб загінуў навек чорны зброд,
Кулямётам, гранатамі спішам
Злых фашысцкіх звяроў у расход...
Б'ём мы іх на жалезных дарогах,
На шасейках, па вёсках, як мух...

Увогуле тэматыка беларускай партызанскай творчасці поўнасцю абумоўлівалася тымі падзеямі і перажываннямі, якія былі характэрны для жыцця і барацьбы нашых людзей у тыле ворага. Таму партызанскі фальклор і адлюстроўвае ў сваёй гістарычнай дынаміцы па ходу вайны ўсе асноўныя формы партызанскіх баявых аперацый: начныя налёты, засады, мініраванне падыходаў да сваіх баз, лясныя завалы, дыверсіі на варожых камунікацыях, рэйкавая вайна, падпалы ваенных складаў, напады на аэрадромы, падрывы мастоў, разгром фашысцка-паліцэйскіх штабаў, гарнізонаў і г. д. Вось для прыкладу фрагменты з розных твораў:

Моўчкі калышуцца хвоі,
К берагу лашчыцца Друць,
А партызаны-героі
Ноччу на бітву ідуць...

Або:

На полі, акрытым туманам,
Туды, дзе дыміцца цягнік,
Ішлі змагары-партызаны,
Іх вёў камандзір-падрыўнік...

Ці:

Шумець, гудзе завея злая,
Наўкола быццам бы туман,
Сядзіць і ворага чакае
У снягу засада партызан...

Разгром фашыстаў на Волзе, пад Ленінградам, на Арлоўска-Курскай дузе паставіў гітлераўскую ваенную машыну перад поўнай катастрофай. Народ з уласцівай трапнасцю адзначыў гэта ў сваёй творчасці:

Ой, не спіць Адольф-скаціна,
Гебельсу не дрэмлецца:
Іх ваенная машына
У канаву вернецца.

Удары нашых войск зліваліся з ударамі народных мсціўцаў. Крок за крокам ачышчалася родная зямля ад гітлераўскіх полчышчаў. Армія гнала ворага на за-

хад. Гэта ваенна-гістарычная перамога яшчэ больш актывізавала партызанскую вайну і выклікала новыя матывы ў масавай творчасці народных мсціўцаў. Былы партызан І. В. Куляшоў (псеўданім Я. Прадвесны), зараз выкладчык беларускай мовы ў Дзяржаўным лінгвістычным інстытуце, пісаў:

Фашысцкаму лютаму зверу
Цяпер не схавацца нідзе:
Чырвоная Армія ўперад
Штодзень пераможна ідзе.

І ярасны гнеў узрастае
У варожым тылу ў людзей,
Іх помста, заўсёды святая,
У баях к перамозе вядзе.

Армія-вызваліцельніца хутка набліжалася да дзяржаўных межаў БССР. Гэта акрыляла народ, узнімала яго настрой.

І людзі выпростваюць плечы,
Скідаюць нявольніцтва груз.
Чырвонае войска наўстрэчу
Ідзе да цябе, Беларусь.

Вызваленне станавілася рэальным і відавочным. Яно ішло нястрымным крокам. Яго чулі людзі і ўслаўлялі ў сваіх творах:

Мы чуем вас!
Сыны вялікага народа,
Бо кожны дзень і кожны час
Грымоты блізяцца з усходу...

Пакуль струменіць кроў у жылах,
Пакуль жыцця агонь не згас,
Мы будзем біць фашыстаў з тылу,
Мы чуем вас!

З нататкі «Загадка П. К.», надрукаванай у газеце «Літаратура і мастацтва» 22 сакавіка 1963 г., стала вядома, што верш гэты напісаў былы партызанскі разведчык (старшыня сельсавета Пятро Акімавіч Клімаў) пасля вайны. Аўтар паведамляў: «Верш «Мы чуем вас!» я напісаў у адказ на зварот беларусаў, якія змагаліся на фронце. Нам, партызанам, гэты зварот прынёс вялікую радасць. Мне хацелася выказаць сваё пачуццё, якое перапаўняла сэрца». Такімі ж патрыятычна-пафаснымі былі творы і іншых народных мсціўцаў.

Ты іграй, іграй, гармонік,
А я табе падпяю—
Ачышчаем ад фашыстаў
Мы рэспубліку сваю.

Або:

Крыважэрны Гітлер-звер
Гвалтам пёрся ў СССР.
Разгуляўся звер-прахвост,
Ды адсеклі яму хвост.
Адным словам, «новы лад» —
Б'юць у лоб і б'юць у зад.

Прачула гаворыцца ў партызанскай паэтычнай творчасці пра тых народных мсціўцаў, якія загінулі ў баях за нашу Радзіму, за вялікую справу вызвалення чалавецтва ад фашысцкай навалы:

Ля апушкі лесу
Стары дуб стаіць,
А пад тым пад дубам
Партызан ляжыць.
Ён ляжыць, не дышыць,
Нібы ціха спіць,
Залатыя кудры
Вецер тавяліць...
Палыхае ў агні далятляд,
А таму партызаны
Так выходзілі рана —
Па трывозе сабраўся атрад...
Разгарнулі мы роты
Баявым разваротам
І на немцаў пайшлі мы ў паход,
Рвалі гадаў на часці
За разбітае шчасце
І за гора, што церпіць народ...

Уся ўнутрыжанравая разнастайнасць песень Вялікай Айчыннай вайны была аб'яднана адзіным мэтанакіраваным пачуццём народа — пачуццём патрыятызму, гераізму і веры ў непазбежную перамогу над ворагам.

Партызаны, партызанкі...

Партызаны, партызанкі,
Беларускія сыны,
Біце ворагаў паганых,
Свору чорных псоў вайны.
Няхай у Гітлера-ўрода
Сэрца вораны клююць,
Няхай знае гнеў народа,
Партызан, будзь помстай лют.
Выразаў ён маткам вочы,
Рэзаў старых і дзяцей
І закрыў крывавай ночай
Дзень наш ясны ад людзей.
Чуцен плач дзяцей у няволі,
Стогны дзедаў і бацькоў,
І крывавы колас у полі
Не глядзіць на подлых псоў.
За сясцёр, за брацьеў мілых
І за спалены наш дом
Рвіце вы з праклятых жылы —
Смерць за смерць і кроў за кроў!
Вас мы клічам да пабеды,
Хай вам свецяць шчасцем дні!
Перабіце катам ногі,
Каб не ўскрэслі век яны!
Мы ад нечысці ачысцім
Зямлю, воды, неба сінь,
Не ўбачыць злым фашыстам
Нашы нівы і лясы.
Партызаны, партызанкі,
Беларускія сыны.
Біце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны!

Асноўнымі станоўчымі вобразамі беларускага фальклору Вялікай Айчыннай вайны былі як партызаны, так і воіны Савецкай Арміі. Галоўнымі рысамі іх характараў былі стойкасць, мужнасць, адвага, пагарда да смерці ў імя Радзімы, гераізм. У шмат якіх творах называюцца сапраўдныя імёны лепшых камандзіраў, камісараў, разведчыкаў, кулямётчыкаў. Але ў цэнтры ўвагі партызанскай паэзіі былі подзвігі мас, збіральныя вобразы народных мсціўцаў, вобраз гераічнага партызанскага калектыву:

Добра знае вораг
Партызанаў порах,
Лоўкасць іх змагання,
Стройкасць у баях.
Знішчыць іх няможна,
І непераможна
Твораць яны ўсюды
Для фашыстаў жах.

Партызанская тэма, абумоўленая спецыфікай вядзення вайны на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, раскрывае самаадданую барацьбу беларускіх партызан супраць гітлераўскіх захопнікаў. Яна адлюстравана ў гераічных песнях, песнях-маршах, песнях-закліках, зваротах, песнях-фактах, інфармацыях («Пінская партызанская», «Беларускі Сусанін», «Балада аб партызанцы Галіне», «Вперед, партызаны», «В роще тёмной густой», «Пад ракітай зелёнай» і інш.). Разам з гераічнымі песнямі, якія расказваюць пра бяспрыкладныя подзвігі беларускага народа, існавалі і песні пяшчотныя, лірычныя аб каханні і вернасці баявому другу-партызану, воіну («Голубым цветочком», «Мой платочек, вышитый с каймою» і інш.).

2.2 Песні паланянак

Беларускі фальклор перыяду Вялікай Айчыннай вайны па жанрах вельмі разнастайны. Песня, частушка, прыказка, прымаўка, балада, легенда, пасланне, анекдот, сказ, казка, жарт – кожны з гэтых жанраў атрымаў у ваенны час шырокае развіццё.

Вялікі цыкл у беларускім фальклоры Вялікай Айчыннай вайны складаюць песні людзей, пагнаных у рабства ў фашысцкую Германію (песні паланянак). «Ночь надвигается», «Раскинулся лагерь для пленных», «Раскинулись горы высокие», «Мой милый друг, пора уже настала» — песні, поўныя драматызму, тугі па Радзіме, закліку да вызвалення, творы, у якіх выражаюцца думы, настроі, імкненні і перажыванні беларусаў, асабліва жанчын і дзяўчат, што былі вывезены ў фашысцкую Германію на катаргу. У гэтых песнях выдзяляецца матыў расставання паланянак са сваёй Бацькаўшчынай, блізкімі, роднымі і любімымі:

Раскінуліся рэйкі шырока,
Па іх эшалоны ляцяць,
Яны з Беларусі вывозяць
У Германію нашых дзяўчат...

Або:

Нас загналі, нас закупорылі,
У вагонах мы, бы ў труне.
І вязуць , вязуць , дзесь за горамі
Смерць праклятая нас не міне.

У іншых песенных рытмах і чалавечых інтанацыях, але з такімі ж сумнымі настроямі і перажываннямі апавядаецца пра развітанне з Бацькаўшчынай юнакоў, якіх фашысцкія захопнікі адпраўлялі ў гітлераўскую Германію:

Прашчайце вуліцы роднага горада,
Прашчайце, дзевушкі, ацец і маць!
Вязуць ў Германію, на мукі голада,
Вязуць ў Германію нас паміраць.

Творы паланянак раскрываюць увесь жах фашысцкай няволі, непасільную працу, здзек і немінучую смерць.

Ля станка стаю жалезнага,
Без спачыначку і сна.
Ад біча таго нямецкага
Ныюць ручанькі, спіна...

Тысячы беларускіх юнакоў і дзяўчат загінулі ў лагерах смерці Майданэка, Асвенціма, знішчаны ў крэматорыях Трэблінкі, Бухенвальда, замучаны ў душагубках Інсбрука і іншых фашысцкіх канцлагерах. Але народная памяць захавала навекі іх светлае патрыятычнае аблічча, іх адданасць сваёй Радзіме:

Цёмна, цёмна. Нават зоранькі
Тут не свецяць, як у нас.
Ой, ты, гора, маё горанька,—
Не мінула гэты раз.
Беларусь, мая старонанька,
Лазнякі твае шумяць...

Ой, ты, гора, маё горанька,
Як жа слёзы мне суняць?
Не звіні, крыніца звонкая,
Не муці сваёй вады.
Я з любімаю старонкаю
Буду сэрцам заўсягды.

У сваіх надзеях на вызваленне ахвяры фашызму звярталіся ў думках за дапамогай да воінаў Савецкай Арміі, да сваіх любімых, якія змагаліся ў яе радах:

Чуеш, мілы? Прыйдзі, адзавіся!
Хоць гучным стрэлам прышлі паклон.
Не магу я з табой падзяліцца,
Што нямецкі зрабіў палон...

А яшчэ лепей, каб падарункам
Ты бомбу тонную прывёз.
І выбухам яе пярунным
Наш асвяціў страшэнны лёс.

2.3 Песні літаратурнага паходжання

У фальклоры Вялікай Айчыннай вайны нямала песень, разнастайных па жанры, шырока творча выкарыстоўваецца даваенная творчасць. Найбольш вядомыя з песень «Лявоніха-партызанка», якая ўзнікла на аснове старой папулярнай песні пра Лявоніху. Народ, успрымаючы песні літаратурнага паходжання, у радзе выпадкаў творча пераапраўцовае іх, прыстасоўваючы да пэўных ўмоў. Да іх адносяцца, напрыклад, шматлікія «ваенныя варыянты» песні А. Русака «Бывайце здаровы», або песень Я. Купалы «Праважала маці сына», «Над ракою ў спакою». Гэтыя песні праніклі ў фальклор да вайны, прычым карэнных апрацовак не зазналі, што характэрна для многіх лепшых песень літаратурнага паходжання савецкай эпохі. У перыяд жа вайны гэтыя папулярныя песні загучалі ў новых варыянтах, прыстасаваных да патрабаванняў часу. Гэта відаць, напрыклад, з параўнання купалаўскага верша-песні «Над ракою ў спакою», які ўзнік на аснове народнай балады, з яго фальклорнай «рэдакцыяй» ваенных гадоў, вядомай пад назвай «Балада пра партызанку Галіну».

У Янкі Купалы:

Над ракою ў спакою
Зацвітала каліна;
У сяле за ракою
Вырастала дзяўчына.
Да зялёнай каліны
Прылятала зязюля;
Да дзяўчыны-маліны
Удаваўся Януля.
Над ракой, дзе каліна,
Сенажаць церабілі;
У сяле, дзе хлапчына,
У паход затрубілі.
Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца;
Перастала дзяўчына
З ненаглядным страчацца.
Бедавала зязюля,
Што каліны не стала
Бедавала матуля,
Што дзяўчына ўсыхала.
Па рацэ гналі хвалі
У даль галіны каліны;
Людзі ў рэчцы шукалі
Самагубкі-дзяўчыны...
Над ракою ў спакою
Зацвіла зноў каліна;
А ў зямельцы пад ёю
Спала наша дзяўчына.

У новай народнай «рэдакцыі»:

Над ракою ў спакою
Расцвітала каліна;
У сяле за ракою
Вырастала дзяўчына
На каліну-маліну
Прылятала зязюля;
Да дзяўчыны Галіны
Прыглядаўся Януля.
У сяле, дзе Галіна,
Сенажаці касілі;
А ў сяле, дзе Януля,
У паход затрубілі.
Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца;
Перастала Галіна
З сваім мілым відацца.
Кукавала зязюля,
Што цвяточкаў не стала;
Бедавала матуля,
Што дзяўчына прапала...
Падняла восень хвалі
У рацэ над калінай,
Пайшлі ў бой партызаны, —
Там была і Галіна.

Да асаблівасцей працэсаў, што адбываліся ў песенным жанры фальклору ваеннага часу, трэба аднесці новае жыццё многіх старых традыцыйных салдацкіх песень, таму што яны былі сугучныя часу, становішчу і думкам народа («Ніхто так не лятаіць», «Шлі стральцы да бою», «Ой, жураўка, жураўка» інш.).

3 Сатырычныя народныя творы

Вайна прынесла нязмернае гора народу. Але яна не зламала яго. Праз самыя суровыя выпрабаванні ён пранёс веру ў перамогу, светлы чалавечы аптымізм. У беларускім фальклоры Вялікай Айчыннай вайны было шмат сатырычных жартаў, гумарэсак, анекдотаў пра гітлераўскіх захопнікаў і іх прыслужнікаў, такіх твораў, якія сведчылі аб усведамленні народам сваёй вялікай маральнай перавагі над ворагам, аб духоўным харастве чалавека, аб яго волі і веры ў пагібель чорных сіл фашызму.

Паршывыя гансы,
Вашывыя фрыцы,
Ніхто з партызанаў
Тут вас не баіцца.

Значнага развіцця ў фальклоры перыяду Вялікай Анчыннай вайны дасягнулі сатырычныя творы. Аб іх трапнасці сведчаць такія народныя выслоўі: «Лавіць авец і фрыц маладзец, а як зловяць падляца, дык ён сам, як аўца»; «Дурны, як Гітлер»; «Ішоў да нас ваякам, а назад поўз ракам» і інш. Сатырычныя прыказкі і прымаўкі востра высмейвалі не толькі фашыстаў і іх верхаводаў, але і іх памагатых — здраднікаў народа: «Бургамістр ды кат — адзін другому брат»; «Астроўскі — сабака гітляроўскі». Падобныя вуснапаэтычныя творы ў свой час адыгралі вялікую грамадска-палітычную ролю: яны дапамагалі граміць ворагаў. Невыпадкова беларускі народ даўно пераканаўся ў той ісціне, што «куляй нацэліш у аднаго, у двух, а трапным словам — у тысячу». У гады вайны, напрыклад, на тэрыторыі Брэстчыны ўзнікалі і шырока бытавалі сатырычныя песні, поўныя горкай іроніі і сарказму, накіраваныя на высмейванне няўдачлівых нямецкіх «гора-заваёўнікаў» («Фрыц у рэчцы рыбку вудзіць», «Пазарасталі сцежкі-дарожкі», «Мілая жалка Эльза», «Грязный солдатский платочек»). Асаблівасць формы гэтых песень у тым, што падаюцца яны не толькі ад імя беларускіх грамадзян, але і ад імя нямецкіх салдат, якія зразумелі безвыходнасць становішча, у якім яны аказаліся.

3.1 Анекдоты

Вельмі інтэнсіўна заўсёды развіваліся анекдоты. Асабліва вострыя і важныя анекдоты, у якіх высмейваюцца захопнікі і іншыя ворагі нашай краіны. Для прыкладу можна спаслацца на шматлікія анекдоты перыяду Вялікай Айчыннай вайны, якія бязлітасна выкрываюць фашысцкіх захопнікаў. У прыватнасці, у іх высмейваецца Гітлер, аб чым сведчыць, напрыклад, анекдот «Гітлер-жаніх»:

«Задумаў Гітлер жаніцца, каб дзе ў прымы прычапіцца. Пайшоў ён да дзяўчат. Ды дзе там! Дзяўчаты ад яго, як ад ваўка, уцякаюць. І сапраўды, каму ахвота за такую гарылу замуж ісці?

Пайшоў Гітлер да Гебельса за парадай і пытаецца ў свайго падбрэхіча:

Скажы, братка, як тут быць? Не хочуць за мяне дзеўкі ісці. Кажуць, валасы ў цябе растуць не як у людзей, назад залізаныя ляжаць, і вочы глыбока ў ілбе сядзяць.

Падумаў Гебельс сваёй дурной мазгаўнёй ды й кажа:

— У чым справа? Не гаруй! Ідзі, браце, на Расію вайною, можа тады ў цябе і валасы, і вочы на месца стануць.

— А мо й праўда, — кажа Гітлер.

І пайшоў на Расію. Ваяваў, ваяваў і даваяваўся: і валасы дыбам сталі, і вочы на лоб павылазілі».

3.2 Прыказкі і прымаўкі

Адной з вядучых тэм народнай паэтычнай творчасці з'яўляецца тэма барацьбы за мір. Шматлікую групу складаюць прыказкі і прымаўкі аб Вялікай Айчыннай вайне, якія ўзніклі ў ваенныя і першыя пасляваенныя гады. Характэрная

іх асаблівасць — аптымізм, выражэнне ўпэўненасці ў перамозе нашага народа, які вызначаецца высокай свядомасцю і маральнай устойлівасцю: «Для нас капаюць фашысты ямы, ды палягуць у іх самі»; «Кожнай фашысцкай гадзіне вісець на перакладзіне» і інш. Беларускі народ праяўляў вялікую цікавасць да лепшых фальклорных твораў усіх краін свету на гэту тэму, напрыклад, наступныя прымаўкі і прыказкі: «Дружна за мір стаяць — вайне не бываць» (чэшская), «Верны мір заўсёды лепш мяркуемай перамогі» (італьянская).

У прыказках і прымаўках перыяду Айчыннай вайны яскрава адлюстраваны гераізм савецкіх воінаў і ўсяго народа: «Ад нашага «ўра» дрыжэла немчура»; «Дзень пражыць — фашыста ўлажыць»; «Кожнаму воўку ў горла па асколку». У беларускай народна-паэтычнай творчасці гэтага часу многа твораў прысвечана партызанам і іх барацьбе з фашысцкімі захопнікамі: «Хочаш шчасця для рабочых і сялян — ідзі ў атрады партызан»; «Дзе партызаны жывуць, там фрыцы мруць»; «Цёмная ночка—дзень партызанскі»; «Чым далей у лес, тым горай для эсэс».

Многія прыказкі і прымаўкі звязаны з падзеямі, якія адбываліся ў пэўнай мясцовасці: «Для фашыстаў па ўсёй Беларусі Удранкі» , «На Бягомль цішком, а з Бягомля бяжком». (Удранка – пасёлак Радашковіцкага раёна , дзе партызаны неаднаразова білі фашыстаў; гарадскі пасёлак Бягомль – цэнтр партызанскай барацьбы на Беларусі.) Вярнуліся такія прыказкі: «Не так страшан чорт , як яго малююць», «Будзе і на нашай вуліцы свята».

3.3 Прыпеўка

Беларуская прыпеўка — высокамастацкі жанр беларускай народнай творчасці, прайшоў вялікі і складаны шлях развіцця.

Найбольш трапнае азначэнне жанру знаходзім у манаграфічным даследаванні аб беларускай прыпеўцы Г. Цішчанкі: прыпеўка—«аднастрофная лірычная песенька самага разнастайнага зместу, якая складаецца з чатырох, радзей з шасці або васьмі радкоў па пэўным музычным узоры і выконваецца часам як прыпеў да танца». Спрэчным тут можа быць існаванне сярод сучасных прыпевак шасці- і васьмірадковых. Відаць, цяпер прыпеўка канчаткова выкрышталізавалася ў чатырохрадковую форму. Адсутнічае ў прыведзеным азначэнні і такая важная рыса, што прыпеўка амаль заўсёды выконваецца пад акампанемент музычнага інструмента.

Калі ўлічыць сказанае, то сучасную прыпеўку трэба вызначыць як аднастрофную чатырохрадковую лірычную песеньку самага разнастайнага зместу, якая выконваецца па пэўным музычным узоры пад акампанемент музычных інструментаў і часам як прыпеў да танца.

Яшчэ на пачатку нашага стагоддзя М. Багдановіч пісаў: «...песні, складзеныя з кароценькіх радкоў, даўно вядомы і ў Францыі і ў Італіі (гл. «Іспанскія народныя песні» ў перакладзе Бальманта). Існуюць яны і ў многіх славянскіх народаў: палякаў («кракавякі»), украінцаў («каламыйкі»), беларусаў («прыпеўкі») і г. д.». У сучаснай жа беларускай фальклярыстыцы склалася такое становішча,

што жанр, які добра вядомы народу толькі як прыпеўка, названы фармальным тэрмінам "частушка". Гэта адзін з самых папулярных жанраў нашых дзён, які чуйна рэагуе на жыццёвыя працэсы ў грамадстве і асабістым жыцці людзей.

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны прыпеўка, як і савецкая масавая песня, стала адным са сродкаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Багата складзена прыпевак пра гераічны подзвіг народа, многа твораў прысвечана народным мсціўцам – партызанам, паланянкам – дзяўчатам, гвалтоўна вывезеным на каторжныя работы ў фашысцкую Германію. З'едліва гаворыцца пра гітлераўскіх ваяк і іх паслугачоў («Самалёт ляціць аж зямля дрыжыць, Гітлер з Гебельсам пад мастом сядзіць»), пра рабункі, разбоі, гнеўна асуджаюцца злачынства фашыстаў. Прыпеўкі заклікалі помсціць ненавісным ворагам і славілі Савецкую Армію, што разграміла гітлераўскую Германію:

Нашы мужныя героі
Родны край праславілі,
Над рэйхстагам у Берліне
Чырвоны сцяг паставілі.

4 Апавядальная творчасць

Апавядальная творчасць не такая актыўная, як песня і частушка. Але ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі актыўным застаецца гістарычнае паданне. Яно часам перарастае ў гістарычную легенду, вельмі рэдка ў казку, для прыкладу можна назваць «Варажбітку» – казку пра Гітлера, якая ўзнікла ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

4.1 Паданне

Гістарычныя паданні першапачаткова часта маюць форму сказа – аўтабіяграфічнага вуснага расказа, які распаўсюджваецца і ўбірае ў сябе элементы выдумкі, гэта значыць становіцца гістарычным паданнем у звычайным разуменні гэтага слова, ў асобных выпадках – легендай ці нават казкай.

Як і раней, у наш час гістарычныя паданні звязаны з выдатнымі падзеямі, праслаўленымі мясцовасцямі і імёнамі. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, шырока вядомыя ў Беларусі паданні пра героя-партызана перыяду Вялікай Айчыннай вайны Канстанціна Заслонава.

Пра Заслонава вядома многа паданняў, заснаваных на фактах, якія сталі ўжо гісторыяй. Зразумела, у перадачы гэтых фактаў ёсць тая ці іншая доля выдумкі, але ўсе паданні вытрыманы ў духу верагоднасці. Характэрным з'яўляецца паданне «Як Заслонаў у разведку хадзіў»:

«Апрануўся Заслонаў у форму нямецкага генерала і паехаў у Сянно глядзець нямецкія ўмацаванні. Заходзіць ён да ваеннага каменданта горада:

— Я начальнік вобласці. Прапаную паказаць умацаванні, размяшчэнне немцаў, паліцаяў.

Ну, вядома, нямецкі камендант выцягнуўся ў струнку, рад старацца выканаць загад вышэйшага начальства...

Заслонаў аглядзеў усё і паехаў да сваіх партызан. А ноччу прыйшоў са сваімі партызанамі і разграміў увесь гарнізон».

Ад гераічных паданняў такога тыпу недалёка і да сказаў.

4.2 Сказ

У беларускай народна-паэтычнай творчасці асабліва шматлікія і цікавыя сказы аб Вялікай Айчыннай вайне. Яны простыя і займальныя, заснаваны, як правіла, на рэальных фактах, прыкладам чаго можа служыць сказ «Бабкіна чарга»:

«Стаяў недалёка ад нашай вёскі, у Барадзілаўцы, партызанскі атрад. Трэба было дастаўляць яму і зброю, і правіянт розны. А перавозіць трэба было цераз чыгунку. Ну, а там нямецкая ахова. Кожнага глядзяць. Што тут рабіць? Але партызаны прыдумалі.

Была адна бабка пад 70 год. Як што трэба правезці, – яны да яе. Пасадзяць на хурманку – і перавязе. І да таго ўжо прывыклі, што як толькі трэба нешта адвезці, так ідуць да яе:

– Ну , бабка, табе сёння зноў у нарад. Валяй у Баражзілаўку, – жартуюць партызаны.

А бабка таксама смяецца:

– Я і сама ведаю, што мая чарга.»

4.3 Легенда

У часы Вялікай Айчыннай вайны быў распаўсюджаны і такі жанр апавядальнай творчасці як легенда. Да легенд звычайна адносяць трывала замацаваныя ў фальклорнай традыцыі вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжыць фантастычны вобраз або ўяўленне, звязаныя з гісторыяй працоўных або тлумачэннем розных прыродных і грамадскіх з'яў. Легенды — мастацкія творы, але дамінантнай у іх з'яўляецца не эстэтычная, як у казках, а пазнавальная функцыя.

Беларускія легенды разнастайныя па тэматыцы. У іх адлюстраваны розныя ўяўленні народа, спробы растлумачыць паходжанне сусвету і зямлі, чалавека і жывёл, сутнасць розных з'яў прыроды і грамадскага жыцця. Часам у легендах адчуваецца рэлігійны ўплыў, але ў той жа час многім легендам уласцівы элементы стыхійнага матэрыялізму, у іх асуджаецца эксплуатацыя чалавека чалавекам, сацыяльная няроўнасць, выказваюцца крытычныя адносіны да рэлігійнага вучэння. У некаторых беларускіх легендах распрацоўваюцца розныя маральна-этычныя праблемы, сцвярджаецца неабходнасць добрасумленных адносін да працы, справядлівых і добразычлівых адносін паміж людзьмі, але часам гэтыя станоўчыя ідэі атрымліваюць рэлігійную афарбоўку.

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю затухання гэтага жанру, у часы Вялікай Айчыннай вайны ўзніклі легенды пра мужных абаронцаў нашай Радзімы, пра партызанскіх камандзіраў, Герояў Савецкага Саюза — К. С. Заслонава, А. С. Каўпака і іншых.

І ў нашу эпоху паданні, абрастаючы выдумкай, звычайна ўсё больш адыходзяць ад гістарычнай асновы і часам ператвараюцца ў легенды. Такой легендай пра Заслонава з'яўляецца «Бяссмерце»:

«Расказваюць, што Заслонаў загінуў у Купаваці, але гэта няпраўда, ён жывы. Калі яго ранілі, ён схаваўся ў Купавацкім лесе. Ішоў ён там доўга, сем дзён, і выйшаў каля вёскі Леўкава. Зайшоў ён цёмнай ноччу ў крайнюю хату, стукае і пытаецца:

— Ці ёсць тут хто жывы? Выходзіць з хаты дзядок сівы і кажа:

— А хто ты такі будзеш?

— Я Заслонаў.

Вынес тут дзядок з хаты старадаўні меч, вывеў каня, даў Заслонаву і кажа:

— Будзеш ты пераможцам! Паязджай на захад і гані ворага з нашай зямлі...

І дзе б ён толькі з гэтага часу ні з'яўляўся — бягуць ад яго ворагі. Рубіць Заслонаў іх мячом, страляе з аўтамата... А калі ачысцілася наша зямля ад фашысцкай пошасці і стала зноў вольна жыць народу, Заслонаў разам з іншымі народнымі героямі, са сваімі сябрамі па бою пры Купаваці, стаў жыць на высокай гары бессмяротных герояў. І зараз там жыве».

Гэтая легенда ўзнікла на аснове паданняў аб гераізме Заслонава. Дарэчы, яе легендарны элемент мае сімвалічны характар: «высокая гара бессмяротных герояў» — гэта сімвал вечнай памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны ў сэрцах народа. У сімволіцы менавіта рэалістычнага характару і заключаецца своеасаблівасць большасці легенд ваеннага часу.

Па сваёй асноўнай функцыі — перадачы выпрацаваных папярэднімі пакаленнямі пэўных ведаў або ўяўленняў — да легенд набліжаюцца паданні. Але калі легенды заўсёды фантастычныя па зместу і ў сувязі з гэтым маюць адпаведную паэтыку, паданні даюць звесткі аб рэальных асобах і сапраўдных падзеях, хаця, натуральна, пры перадачы з вуснаў у вусны аддаляюцца ад першаасновы, жыццёвы матэрыял набывае ў іх паэтычную інтэрпрэтацыю.

Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні гістарычныя і тапанімічныя, многія з якіх маюць гістарычную афарбоўку. З вуснаў у вусны перадаваліся паданні. Тэма многіх паданняў — барацьба беларускага народа з іншаземнымі захопнікамі. Гістарычныя паданні складаюць важную частку беларускага гераічнага і гістарычнага эпасу.

Гістарычныя паданні, якія ўзніклі на аснове сказаў, а асноўную масу сацыяльна-бытавых паданняў і тым больш сказаў, як правіла, адкідвае як «пярвічны» фальклорны матэрыял, які нібыта не мае мастацкай каштоўнасці. Гэты пункт гледжання для нас непрымальны, тым больш, што ў наш час сацыяльна-бытавыя сказы і паданні атрымліваюць усё большае распаўсюджанне, з'яўляюцца адным з вядучых відаў сучаснай народна-паэтычнай творчасці. Сапраўды, у наш час многія сказы і паданні з'яўляюцца лепшымі ўзорамі фальклорных твораў. Такія, напрыклад, сказы пажылых людзей аб цяжкай мінуўшчыне, сказы і паданні аб Вялікай Айчыннай вайне. Яны вызначаюцца глыбінёй і займальнасцю, важнасцю жыццёвага матэрыялу.

4.4 Вусныя расказы і апавяданні

Значную цікавасць прадстаўляюць вусныя расказы. У іх адбіліся і лёс рэальных герояў, і «біяграфія» часу, і эстэтычныя погляды народа. У гэтага жанру

асаблівыя адносіны да рэчаіснасці, асаблівыя шляхі раскрыцця праўды жыцця. Напрыклад, аб подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці-героя расказваецца ў многіх творах літаратуры і мастацтва. Мільёны людзей зведваюць ўласнае, неадольнае жаданне самім пабываць на яе свяшчэннай Зямлі, выйсці на бераг Заходняга Буга, пастаяць, падумаць, пагаварыць з крэпасцю, як з жывой істотай.

Гераічны характар беларуса, не зламанага ніякімі выпрабаваннямі, раскрываецца ў многіх вусных расказах. Аб ступені іх распаўсюджанасці можа сведчыць такі факт: пісьменнікі А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік задумалі стварыць кнігу аб беларускіх Хатынях, асноўны змест якой — дакладна запісаныя імі вусныя расказы тых людзей, што якімсьці цудам выратаваліся ад фашысцкага расстрэлу ці не былі спалены жывымі. Стваральнікі кнігі пабывалі ў многіх раёнах Гомельскай, Гродзенскай, Віцебскай і іншых абласцях Беларусі. Сотні мужчын і жанчын расказвалі ім кожны пра сваю трагедыю, пра страшны лёс сваёй сям'і, сваіх аднавяскоўцаў. Каб запісаць усё гэта, спатрэбіліся многія кіламетры магнітафоннай стужкі.

У вусных расказах з бязлітаснай праўдзівасцю паведамляецца аб запланаваных гітлераўцамі масавых знішчэннях жыхароў Беларусі. Ідзе выкрыццё фашызму ў самых страшных яго праяўленнях. Гісторыя шматпакутнай беларускай зямлі дала для гэтага багаты матэрыял. «Многія расказы не проста праўдзівыя, а нават пужаюць сваёй бязлітаснай праўдай», — пішуць аўтары.

Гісторыя беларускіх Хатыняў, адлюстраваная ў вусных расказах, сведчыць: жыве і вечна будзе жыць у памяці народа як вялікі подзвіг і адначасова як найвялікшая трагедыя – мінулая вайна, яе ўрокі забываць небяспечна. Антыфашысцкая накіраванасць вусных расказаў — адна з важнейшых прычын іх папулярнасці. Творы, якія разглядаюцца, самымі цеснымі сувязямі звязаны з сённяшнім днём. Для сусветнай грамадскасці задачы барацьбы з фашызмам, які і зараз утойвае ў сабе пагрозу жыццю на Зямлі, як і раней, вострыя і злабадзённыя.

У сучаснай беларускай прозе значнае месца займае вуснае апавяданне. Збіранне і вывучэнне вусных апавяданняў дало магчымасць выявіць іх асноўныя жанраўтваральныя прыкметы.

Вуснае апавяданне — гэта расказ пра падзеі вялікага грамадска-палітычнага значэння, сведкам або ўдзельнікам якіх быў сам расказчык. У ім захоўваецца гістарычная праўдзівасць, дакументальная дакладнасць, матэрыял мае вялікую ідэйна-эстэтычную, выхаваўчую і пазнавальную каштоўнасць. Нездарма вучоныя называюць творы гэтага жанру «чалавечымі дакументамі», сведчаннямі аб жыцці людзей.

Вусныя апавяданні невялікія па аб'ёму і расказваюць аб фактах і з'явах, што захаваліся ў жывой памяці народа. Бытуюць яны ў народзе здаўна, як асэнсаванне канкрэтных падзей, яго гісторыі, аб чым сведчаць асобныя запісы, зробленыя да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны.

Як правіла, апавяданні запісваліся і публікаваліся разам з іншымі празаічнымі жанрамі фальклору. Сам факт увагі да іх пэўным чынам указвае на жыццяздольнасць гэтага віду народнай творчасці.

Упершыню да сістэматычнага вывучэння вуснага апавядання як крыніцы пазнання духоўнага свету і эстэтычных густаў народа звярнуліся савецкія вучоныя. Пачынаючы з 20-х гадоў вядзецца работа па збіранню і даследаванню гэтага жанру.

Вусныя апавяданні маюць свае адметныя заканамернасці: сціпласць кладання, прастата пабудовы, канкрэтызацыя часу і месца дзеяння. Атмасфера верагоднасці таго, што адбываецца, узнікае ў значнай ступені дзякуючы рэальнай геаграфіі падзей і дакладнаму адлюстраванню фактаў.

У вусных апавяданнях указваюцца геаграфічныя назвы, месцы баёў, расказваецца пра камандзіраў і байцоў партызанскіх атрадаў. Ім не ўласцівы лірычныя адступленні, разгорнутая экспазіцыя і доўгі эпілог. Складаюцца яны з адной або некалькіх эпізодаў, лагічна звязаных паміж сабой, і складаюць адзіную канву апавядання, якое аднаўляецца ў строга храналагічнай паслядоўнасці.

Канкрэтны жыццёвы матэрыял, пакладзены ў аснову вусных апавяданняў Вялікай Айчыннай вайны, незвычайна разнастайны. Успаміны народных мсціўцаў даюць шырокае ўяўленне аб дзейнасці беларускіх партызан, аб іх гераізме, аб «рэйкавай вайне», якую яны вялі, аб іх жыцці і быце, аб цеснай сувязі з мясцовым насельніцтвам. У іх адлюстроўваюцца першыя баі пагранічнікаў, бессмяротны подзвіг народных мсціўцаў, дапамога мірнага насельніцтва сваім абаронцам, расказваецца аб зверствах фашыстаў на акупіраванай беларускай зямлі.

Але першараднае месца ў іх заўсёды займае вобраз абаронцы роднай зямлі, народнага мсціўца. Гэта вызначае ідэйна-мастацкую своеасаблівасць жанру.

Адбываецца працэс цыклізацыі вусных расказаў вакол аднаго героя, партызанскага атрада, крэпасці, горада, вёскі. У шмат якіх творах называюцца сапраўдныя імёны байцоў, камандзіраў, жыхароў гарадоў і вёсак, гаворыцца аб іх мужнасці і гераізме, праяўленых у баях з ворагамі нашай Радзімы.

Шэраг твораў прысвечаны абаронцам Брэсцкай крэпасці, легендарным партызанам К. Заслонаву, С. Каўпаку ці такім менш вядомым героям, як Іван Грунін. Аб яго жыцці, партызанскіх справах і апошняй няроўнай жорсткай сутычцы з фашыстамі расказваюць баявыя таварышы і жыхары в. Антонаўка Гомельскай вобласці.

Цэльнасць і значнасць вобраза героя прадвызначана яго непарыўнай сувяззю з лёсам усяго беларускага народа. Так, у адным з апавяданняў, запісаным ад Івана Сямёнавіча Сіпчука, малюецца гераічны характар беларускага селяніна Мікалая Амельянавіча Аліпы, члена КПЗБ, аднаго з арганізатараў партызанскага атрада імя Варашылава на Брэстчыне. Расказваючы пра яго партызанскую дзейнасць, аўтар захоўваў храналагічны прынцып аднаўлення падзей: «Пачалі збіраць зброю, — успамінае І. С. Сіпчук. — Сабралі каля 20 вінтовак, 15 кулямётаў. У сакавіку звязаліся з групай ваенных. Адзін з іх — Васіль Грабнёў — стаў камандзірам партызанскага атрада імя Варашылава. Першая аперацыя, у якой было знішчана больш за трыццаць немцаў, адбылася па дарозе ў Радзеж. У гэтым баі Аліпа быў

цяжка ранены». Паступова перад намі ўзнікае вобраз чалавека, які вынес за сваё жыццё мноства горкіх узрушэнняў, але застаўся мужным барацьбітом за народнае шчасце, які самазабыўна служыў краіне і ў цяжкія дні ваеннага ліхалецця.

У час экспедыцый выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта было запісана апавяданне і самога легендарнага героя-партызана. Сціпла і стрымана расказвае Мікалай Амяльянавіч пра сваё жыццё, пра сваіх баявых таварышаў. Знешне яго апавяданне суровае і лаканічнае, але адчуваецца ў ім глыбіня пачуццяў, усхваляванасць. Заканчваючы свае ўспаміны, былы партызан гаворыць: «Так у баях і цяжкасцях дажылі мы да 1944 года, да вызвалення. Радасна і балюча было глядзець на вызваленую зямлю, на папялішча ад вёскі».

Ніколі не забудуць народныя мсціўцы Брэстчыны свайго таварыша па зброі мужнага героя-камсамольца Фёдара Маруду. Былы партызан В.Н. Пехцераў успамінае: «У адным з баёў Фёдар Маруда быў цяжка ранены, але нягледзячы на гэта працягваў бой. Заўсёды буду памятаць мужнасць гэтага чалавека. Але не давялося дажыць да перамогі майму таварышу. Варожая куля скасіла яго ў адным з баёў за вёску Ланская».

Устаноўка на дакументальную дакладнасць быццам не дазваляе «расквечваць» успаміны аб суровых, псіхалагічна напружаных падзеях разнастайнымі вобразнымі сродкамі. Аднак ёсць у сабраных матэрыялах творы, якія характарызуюцца яркай мастацкай выразнасцю. Такія ж, напрыклад, успаміны пра беларускую гераіню Вольгу Абрамук, юнага камсамольскага сакратара з в. Вялікарыта Брэсцкай вобласці, запісаныя ад яе маці, Таццяны Пятроўны Абрамук. Расказ яе поўны лірычнасці, авеяны гарачай мацярынскай любоўю, адзначаны яркай мастацкасцю, эмацыянальнай выразнасцю.

Апавяданне вядзецца ў даверальнай манеры, расказчыца часта звяртаецца да слухачоў, робячы іх як бы сведкамі падзей, уцягвае ў працэс суперажывання. Перад намі не бясстрасны пераказ, а драматызаванае ўваскрашэнне перажытага. З апавядання вырысоўваецца і маральны воблік самой расказчыцы, якая ў цяжкі час горда і незалежна вядзе паядынак з ворагам.

Расказчыца выкарыстоўвае вобразную эмацыянальную мову, ласкальныя суфіксы, перадае дыялогі. Пры гэтым яна каменціруе жэсты, міміку ўдзельнікаў, што сведчыць аб элементах псіхалагічнага аналізу.

Аналіз беларускіх вусных апавяданняў паказвае, што ім уласцівы глыбокі ідэйны змест, адбор фактаў, імкненне да строгай праўдзівасці, выкарыстанне эмацыянальнай народнай мовы.

Як правіла, усе вусныя апавяданні носяць сацыяльна-палітычны характар. У іх дамінуюць матывы нападзельнага адзінства народа і Радзімы ў самаадданай барацьбе за свабоду. Яны ўваскрашаюць не толькі подзвігі, выключныя па свайму маштабу, але і гераічныя ўчынкі, здзейсненыя «радавымі гісторыі» ў іх штодзённай барацьбе з ворагам. Усе гэтыя апавяданні падобныя ў жанравых адносінах. Іх аб'ядноўвае рэальная жыццёвая аснова. Значнае месца ў

беларускім фальклоры перыяду Вялікай Айчыннай вайны займаюць творы аб фашысцкіх злачынствах.

Беларускія пісьменнікі А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік запісалі цыкл вусных апавяданняў «Я з вогненнай вёскі...». Гэта расказы нямногіх сведкаў і відавочнікаў, што вярнуліся «з таго свету», выпадкова ўцалелі ад фашысцкіх карнікаў. Прайшло шэсць дзесяцігоддзяў пасля вайны, але народ памятае аб вогненных Хатынях. З пранікнёнай праўдзівасцю апавядаюць людзі пра варварскія злачынствы фашызму.

Эмацыянальная сіла такіх успамінаў вялікая. Мінулае ў памяці расказчыкаў ажывае з такой сілай, што яны быццам зноў вяртаюцца туды, у палаючую вёску. Нярэдка кожнае слова для іх — боль, пакута. Аўтары адзначаюць, што расказваюцца гэтыя апавяданні па-рознаму. Мужчыны, як правіла, гавораць больш скупа, лаканічна. Жаночыя ўспаміны найбольш поўныя, эмацыянальныя. Яны часта перапыняюцца плачам і доўгімі паўзамі.

Не можа забыць свайго сына Алена Іванаўна Булава з в. Слабада Гомельскай вобласці. «Хацеў, бедненькі, праскочыць, а яны яго — раз! — у грудзі сюды во. Толькі крыкнуў ён: «Мамко!..» Заканчвае яна вывадамі горкага і настойлівага роздуму: «Гэта зверы былі, а не людзі. Гэта не людзі былі, гэта — зверы былі» .

Расказ другой маці, Акуліны Сямёнаўны Івановай з в. Баранава каля Полацка, перапыняецца доўгімі паўзамі, але яна не плача, стрымліваецца, быццам збіраецца з сіламі, каб зноў уваскрэсіць у памяці перажытае:

«Вядуць к яме. А большы мальчык:

— Дзядзенькі, не страляйце!

І-меншы... На руках несла... Не помню больш нічога... Ачуцілася ў яме. Толькі бліснула, агонь так...»

У вусным апавяданні «Што было ў Лісіна» адлюстравана нязломленасць духу мірнага насельніцтва. Яго вядзе Марыя Змітраўна Рэвуцкая — сведка страшнай расправы фашыстаў з мірнымі жыхарамі яе роднага сяла. Яна называе дату і месца трагедыі: «18 ліпеня 1942 года ў нашу вёску Лісіна (Карсакоўскага сельсавета Барысаўскага р-на) уварваўся карны атрад немцаў. Азвярэлыя акупанты пад дуламі кулямётаў пачалі допыт сялян аб партызанах. Аднак старыя і жанчыны не пакарыліся ворагу. Сівы селянін Ганчарэвіч, чыя дачка змагалася ў партызанскім атрадзе, дзёрзка і горда кідае ў твар катам: «Яна біла вас, сабак, і будзе біць да той пары, пакуль не будзе ніводнага на нашай зямлі!» Не скарыўся гітлераўцам і стары Маклак. Калі расстрэльвалі абодвух, яны сказалі, звяртаючыся да народа: «Ідзіце, падымайцеся ўсе — і старыя, і малыя — на смяротную бітву супраць фашыстаў. Памагайце нашым братам-партызанам. Калі няма ў вас аружжа, душыце іх сваімі рукамі». Вёска была спалена фашыстамі.

Гэты твор — яркае сведчанне бессмяротнага духу народа-змагара.

У вусных апавяданнях аб нямецкіх злачынствах гучаць не толькі ўрокі мінулага, але і ўрок на будучае, праклянне вайне. І ў нашы дні яны з'яўляюцца вострай зброяй супраць агрэсіўна настроеных сіл.

Сярод вусных апавяданняў сустракаюцца і творы, дзе прыкметна прысутнасць элементаў выдумкі. Прычым многія з іх маюць рысы легендарнага характару. Але легендарнасць тут ужываецца не ў традыцыйным, а ў сучасным сэнсе. Гэта, паводле азначэння А. Квяткоўскага, расказ «аб нейкай выдатнай падзеі ў жыцці грамадства або выдатным учынку асобнага чалавека» .

Так, у многіх вусных апавяданнях расказваецца пра беларускага селяніна, які завёў фашыстаў у багну і сам загінуў.

Вось як аб гэтым расказваецца ў апавяданні, запісаным ад мужа і жонкі Вераб'ёвых: «Аднойчы немцы ішлі ў лес на аблаву. Аднаго жыхара вёскі Рагозіна прымусілі паказваць дарогу да партызан. Стары завёў ворагаў у балота і сам загінуў разам з імі».

Вядома, што подзвігі такога роду — сапраўдны факт. Аб гэтым сведчаць дакументы гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Магчыма дапусціць, што ў свой час першы расказчык праўдзіва абазначыў не толькі вёску, адкуль родам стары, але і яго прозвішча. Але паступова твор адрываўся ад першапачатковага выканаўцы. У наступным пераказе імя старога было забыта, падрабязнасці, дэталі сапраўднай падзеі сцерліся ў памяці, і апавяданне, страціўшы дакументальнасць, наблізілася па сваёй жанравай прыродзе да падання або легенды. Такі пераход з адной жанравай разнавіднасці ў другую вельмі характэрны для працэсу фальклярызацыі. Гэты працэс адчувальней за ўсё праяўляецца ў цыкле беларускіх вусных апавяданняў пра Канстанціна Заслонава, якія будуюцца не столькі на перажываннях і разважаннях героя, колькі на яго дзеяннях, выдатных учынках.

Абапіраючыся на традыцыйны фальклор, выкарыстоўваючы новыя сродкі, народ надзяляе любімы вобраз Нацыянальнага героя побач з мужнасцю, рашучасцю, адвагай, удаласцю, кемлівасцю — нават бессмяротнасцю.

Напрыклад, у «Бяссмерці» апавядаецца пра цудоўнае выратаванне легендарнага Заслонава. Не парушаючы знешняй праўдападобнасці (месца гібелі абазначана дакладна — в. Купаваць), расказчык тым не менш шырока выкарыстоўвае матывы яўна фантастычнага, казачнага плана. Так ствараецца фальклорная сітуацыя.

Вобраз Заслонава інтэнсіўна праходзіць працэс фальклярызацыі. Апавяданні пра яго набылі ўстойлівасць сюжэтаў: ён з'яўляецца на базары, гандлюе рознымі таварамі, яго цікавіць збор патрэбных звестак і сувязь з насельніцтвам, якое мела вострую патрэбу ў падтрымцы.

Прыведзеныя прыклады сведчаць, што перад намі вобраз народнага героя, распрацаваны па законах фальклору. Як і ў традыцыйным фальклоры, дзеянні цэлага калектыву, масы пераносяцца тут на вобраз героя. У працэсе развіцця гэтыя вобразы страцілі канкрэтныя гістарычныя рысы і напоўніліся шырокім абагульняючым сэнсам. Немалаважную ролю ў вусным апавяданні адыгрывае вобраз самога расказчыка. Ён неаддзельны ад апавядання і выступае то як абаронца Брэсцкай крэпасці, то як пагранічнік, народны мсціўца, як сведка страшэнных фашысцкіх злачынстваў на беларускай зямлі.

Непасрэдны ўдзельнік ваенных падзей вядзе расказ у форме маналога, ад першай асобы. Адкідваючы малазначныя дэталі, расказчык усю ўвагу сканцэнтроўвае на чалавеку, на групе асоб. У сваім маналогу-апавяданні ён імкнецца расказаць убачанае і перажытае, у першую чаргу аб чалавеку, які яму асабліва блізкі і дарагі, чый воблік, унутраныя духоўныя якасці служаць яму прыкладам. У гэтым выпадку праўда жыццёвага факта прапускаецца расказчыкам праз асабістае ўспрыняцце, думкі і пачуцці. Апавядальнік адбірае факты, расказвае не ўсе падрабязнасці, а толькі тое, што, на яго думку, будзе цікава для слухача.

Галоўнае для расказчыка — перадаць усё як было, выклікаць спачуванне, ці гнеў, данесці да слухача ўвесь драматызм апісваемых падзей. Пры гэтым часта раскрываецца і воблік самога расказчыка, які ў цяжкі для краіны час змагаўся з ворагам.

Расказчыкі не імкнуцца прыхарошваць сваё апавяданне нейкімі моўнымі хітрыкамі. Мова іх часам нават недастаткова зладжаная, сустракаюцца перарывістыя незакончаныя фразы, доўгія паўзы, якія суправаджаюцца плачам, аднастайнымі зваротамі.

Вось, напрыклад, апавяданне Кацярыны Данілаўны Крот з в. Лазкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці пра тое, як палілі яе родную вёску:

«...Ну, я ў той дзень... У мяне сястра была і бацька, маці не было. Мы жылі ўтраіх...

...Не магу я расказваць... (плача). Тады я з сёстрамі была на рабоце. Стральба адкрылася. Слышым: поезд ідзе, стральба адкрылася. Мы прыйшлі дамоў...

Вось характар — гаварыць не магу» .

Заключэнне

Стан народнай прозы ў гады Вялікай Айчыннай вайны сведчыць аб вялікай жыццяздольнасці вуснага апавядання. Яно прадуктыўна развіваецца ў нашы дні, адыгрываючы значную выхаваўчую ролю ў жыцці народа. Цікавасць да вуснага апавядання ў народных творцаў выклікана жаданнем асэнсаваць вопыт такіх грандыёзных падзей, як Вялікая Айчынная вайна, раскрыць яскравы вобраз мужнага абаронцы роднай зямлі, які працай і крывёй заваяваў перамогу.

Гераічны перыяд Вялікай Айчыннай вайны вельмі багаты вуснай народнай творчасцю, як і ўся наша эпоха. Мужная барацьба нашага народа супраць гітлераўцаў дала вельмі багата ідэйнага і сюжэтнага тэматычнага матэрыялу для развіцця беларускага фальклору. Фальклорныя экспедыцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, педуніверсітэтаў нашай рэспублікі сабралі вялікую колькасць песень і частушак, казак і легенд, пагаворак і загадак, сказаў і былін, у якіх народ наш выказаў гнеў і нянавісць да фашысцкіх захопнікаў, веру ў перамогу, апеў свой гераізм у барацьбе з драпежным ворагам.

Асабліва багатым у Беларусі з'яўляецца партызанскі фальклор. Вялікая колькасць песень створана ў час нямецкай акупацыі Беларусі пра фашысц-

кую няволю, пра ўгон моладзі на нямецкую катаргу, пра цяжкае, невыноснае жыццё паланянак у праклятай гітлераўскай Германіі, пра барацьбу байцоў і афіцэраў Савецкай Арміі з немцамі, пра «рэйкавую вайну» нашых слаўных партызан, пра гераічнае змаганне камуністаў, камсамольцаў і піянераў з фашысцкімі захопнікамі. У фальклоры перыяду Айчыннай вайны вельмі пашыралася сатыра, якая накіравана была супраць ворага. Пры гэтым часта ўдала ў сатырычным плане перарабляліся папулярныя песні «Сіненькі скромны платочак», «Кацюша», «І хто яго знае» і іншыя, у якіх бязлітасна бічаваліся фашысты-фрыцы. У песнях і частушках, казках і анекдотах створаны вобраз фрыца, нахабнага і некультурнага, жорсткага і палахлівага, драпежнага і ліслівага. Ёсць у нашым фальклоры перыяду вайны песні і казкі, у якіх сатырычна высмейваюцца подлыя здраднікі, нямецка-беларускія нацыяналісты, што прадаліся ворагу.

Такім чынам, зыходзячы з меркаванняў і выказванняў, аналізу і характарыстыкі твораў народнай творчасці, прыходзім да высновы: фальклор Вялікай Айчыннай вайны меў велізарны ўплыў на абуджэнне ў беларускага народа патрыятычных пачуццяў, мужнасці і гераізму, гонару за воінаў і партызан, якія абаранялі краіну.

Ёсць горкая памяць у маёй зямлі. Дый як іначай, калі кожны трэці жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. А колькі ў зямлі брацкіх магіл. Першай прыняла яна ўдары ворага і гераічна змагалася з ім, пакуль знішчальны каток вайны не перакаціўся за мяжу. Канцлагеры, дзе кожную хвіліну для кагосць навекі згасаў свет, і шыбеніцы, і расстрэлы. І, у лясах, амаль чатырыста тысяч чалавек пад ружжом, якія да канца, часам цаною жыцця адстойвалі ад ворага чыстыя водар Радзімы. І жонка была гатовая аддаць мужа, а матка паслаць сына ў полымя. І пайсці за імі. На бой, на прарыў блакады. Дзеля таго, каб зберагчы ўсё тое, аб чым я ўжо казала: волю, веру, Бацькаўшчыну. Каб спустошаная вайной краіна ажывілася працаю тых, хто выжыў і перамог, зазяла радасцю і святлом, заквітнела садамі і здзіўляла цудоўнымі будынкамі, зашумела нівамі, зазвінела адвечнай і неўміручай нашай песняй .

Яны, гэтыя мае дзяды і бабулі, біліся, каб зберагчы і пасля ўпрыгожыць маці нашу, зямлю, гэтыя азёры і нівы, сівыя пушчы і светлыя воды, курганы продкаў, старадаўнія і новыя кнігі, песню сваю і слова, веды свае — усё, што за тысячагоддзі яны стварылі.

Старадаўні прынцып, які прыйшоў аднекуль, але, перафразаваны, навекі стаў нашым: людзям — душа, жыццё — свайму дому, сэрца — жанчыне, гонар — нікому.

Пранікнецеся любоўю да маёй роднай Беларусі, людзі. Велічная і гордая, яна таго вартая!

Юлія ШЭМЕЛЬ

Студэнтка факультэта тэхналогіі
і тэхнікі лясной прамысловасці (ТТЛП)

За ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Аўтограф» атрымала Дыплом I ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Публіцыстыка».

Кіраўнік: Савіцкая Н. Я., ст. выкладчык кафедры беларускай мовы

Дарогі болю

Кроў у жылах стыне. Слухаеш і маўчыш...

Уступ
Дзяўчынка і матылёк

Дзяўчынка бесклапотна бегала па лузе. Яна збірала кветкі і насалоджвалася жыццём. Бязвоблачнае неба дарыла радасць. І раптам незвычайны матылёк прыцягнуў яе ўвагу. Яна яшчэ ніколі такога не бачыла. Вялікі, з адмысловым малюнкам на крылцах, матылёк здаўся незвычайным. І яна сама, як матылёк,імкнулася за ім, хацела злавіць і паказаць дома. Матылёк нібы гуляў з дзяўчынкай, то апісваючы роўныя кругі вакол яе, то ўзнімаючыся да сонца. Часам ён садзіўся на кветку, складаў свае яркія крылцы і рабіўся нябачным. Тады смутак напаўняў маленькае сэрца. Але хутка зноў прыходзіла ажыўленне, калі дзяўчынка бачыла імгненныя рухі матылька.

Луг быў любімым месцам дзяўчынкі. Тут расла маладая і даволі моцная бярозка. Менавіта ёй дзяўчынка расказвала пра свае самыя запаветныя жаданні, дзялілася скрухай і заўсёды адпачывала ў час паўдзённай летняй спёкі. Нягледзячы на свой узрост, маладая бярозка была досыць вялікая і шчодра дарыла прахалоду сваёй маленькай сяброўцы.

А матылёк тым часам усё кружыў над лугам, усё больш і больш зачароўваючы дзяўчынку. Лунаў над стракатым лугам з яго сакавітай зелянінай, водарам кветак і маўклівай бярозкай.

Зманая бясконцай беганінай, дзяўчынка прылегла пад ценем сваёй бярозкі і ўсміхалася шчодраму сонцу. На душы было так лёгка-лёгка. Хацелася дарыць шчасце кожнаму сустрэчнаму, дапамагаць у працы.

Нават нарастаючы свіст не прыцягнуў ўвагі, не выклікаў трывогі.

Безліч снарадаў паляцела на зямлю. Увесь луг ператварыўся ва ўзаранае поле. Зямля застагнала ад болю, здзекаў і несправядлівасці...

Гэта пачалася вайна... Самая вялікая і самая страшная, што перайначыла людскія мары і спадзяванні, прынесла невыносныя пакуты.Што чакае наперадзе? Якія дарогі давядзецца прайсці? Ці гэта будуць дарогі, павыгрызаныя гусеніцамі танкаў, здратаваныя і ўтаптаныя імі; падзяўбаныя бомбамі? Ці гэта дарогі з тысячамі бежанцаў і адступаючымі чырвонаармейцамі на ўсход, а побач чорныя каміны спаленых хат, зламаныя прысады...

Дарога першая
Чатыры бярозкі

Жыве ў вёсцы Лучайцы простая вясковая жанчына – Пачопка Валянціна Нікандраўна. Цяжка ўявіць сабе, што калісьці перажыла яна ў сваім жыцці. Цуд, што засталася жывою, але ж якое гаротнае яе жыццё! Калі Вы даведаецеся, што з усёй сям'і Бог выратаваў яе адну, вы зразумееце, што гэта сапраўды так.

Трагедыя гэта здарылася ў лютым 1943 года...

... Дзесьці за два тыдні да трагічных лютаўскіх падзей бацька адправіў Валянціну да роднай цёткі ў вёску Валодзькава, што каля Гатаўшчыны. Валянціна дапамагала ёй па гаспадарцы, хацела крыху падзарабіць сабе і сям'і на жыццё. А дома застаўся бацька – Нікандр Іванавіч, маці – Алена і маленькая сястрычка Фаіна, якой на той час было ўсяго восем гадоў.

У хату да бацькі ўжо даўно па начах наведваліся партызаны – для іх пяклі хлеб. І вось знайшоўся «добразычлівец», які падказаў у паліцыю аб начных візітах партызан. Немцы з паліцыяй наляцелі на вёску раптоўна, раніцай. Адразу акружылі хату Нікандра, увайшлі ў дом і загадалі ўсім членам сям'і пастроіцца. Дасталі спіс сям'і, праверылі па галовах – чатыры душы, усё сходзіцца. Пасля кароткага прысуду за сувязь з партызанамі сталі страляць прама тут – у хаце. Забівалі па чарзе: бацьку, маці, маленькую дзяўчынку... Чацвёрты чалавек у хаце – жанчына – пачала галасіць, яна спрабавала растлумачыць немцам, што яна зусім ні пры чым, нават не радня гэтай сям'і. Але немцам было ўсё роўна. Прагучаў стрэл – і жанчына была забіта.

Так ужо здарылася, што яшчэ вечарам Сапрон Варвара зусім выпадкова зайшла ў гэту хату і папрасіла дазволу пераначаваць да раніцы. Вось так замест Валянціны загінула зусім іншая жанчына.

Калі Валя даведалася пра бяду, яна пешшу пайшла дадому. Ішла доўга, бо пачалося разводдзе. Ля хаты яна ўбачыла толькі брацкую магілу, дзе вяскоўцы закапалі расстраляных...

Дзяўчыне не заставалася ніякага выбару: яна пайшла ў Залессе ў валасную ўправу, дзе і сказала, што здарылася. Дзіўна, але ў гміне да Валянціны аднесліся зусім абыякава. Даталі спіс сям'і, праверылі: было чатыры душы, расстраляна чатыры. Махнулі рукою: «Ты нам ўжо не патрэбна. Ідзі, жыві, радуйся... »

Так Валянціна Нікандраўна засталася жыць.

Валянціна Нікандраўна дагэтуль носіць у памяці вобразы мілых бацькоў і сястрычкі Фані, што загінулі ў лютым 1943-га. А за вёскай, метраў за пяцьсот, у чыстым полі стаіць помнік на месцы трагічнай гібелі сям'і Мірош. І растуць каля яго чатыры бярозкі. І верыцца, што радуецца душа Нікандра з-за таго, што ў тую жахлівую раніцу не аказалася Валянціны дома.

Дарога другая
Трагедыя сям'і

У сакавіку 1943 года ў вёсцы Сасноўка адбылася яшчэ адна трагедыя. Сям'я Жука Уладзіміра Ігнатавіча была вялікая: 7 чалавек. 20-гадовы сын Мечыслаў знаходзіўся ў партызанах. Сям'ю ратавала тое, што ў немцаў пакуль што не было доказаў, дзе канкрэтна знаходзіцца іх беглы сын. Атрымалася так, што ў адну з начэй партызаны выпадкова трапілі ў засаду. Паранены, з абгарэлымі рукамі, Мечык выжыў і здолеў дабрацца да роднай хаты, каб тут знайсці свой прытулак. Бацькі яго схавалі і патаемна лячылі. Аднак нейкім чынам немцам далажылі аб гэтым, магчыма, нехта з мясцовых.

Сакавіцкім ранкам немцы раптоўна наляцелі на вёску і сагналі да хаты Уладзіміра Жука амаль усіх жыхароў. З хаты вывелі ўсю сям'ю, знайшлі і схаванага Мечыслава. Прысуд быў кароткі і жорсткі: усіх членаў сям'і выводзілі па два чалавекі і расстрэльвалі ў паветцы на вачах аднавяскоўцаў і Мечыслава (яго немцы не чапалі).

Пасля гэтай карнай акцыі акупанты забралі з сабой Мечыка і адвезлі яго ў Глыбокае, дзе пасля допытаў і катаванняў ён быў расстраляны ў двары Беразвецкага манастыра, на тэрыторыі лагера для ваеннапалонных.

Месца пахавання сям'і Жука Уладзіміра зараз згублена і пакуль што невядома дакладна, дзе магла знаходзіцца брацкая магіла.

У сакавіку 1943 года ў в.Сасноўка расстраляны за сувязь з партызанамі:

Жук Уладзімір Ігнатавіч, 48 гадоў

Жук Аляксандра Усцінаўна, 45 гадоў

Жук Віктар Уладзіміравіч, 23 гады

Жук Часлава Уладзіміраўна, 13 гадоў

Жук Ксенія Уладзіміраўна, 8 гадоў

Жук Вагдалена, 30 гадоў

Пасля допытаў ў Беразвецкім лагеры смерці быў расстраляны

Жук Мечыслаў Уладзіміравіч, 20 гадоў

Дарога трэцяя
Глыбоцкае гета

То ціха плакала, то галасіла наўзрыд скрыпка. Буйныя кроплі дажджу, нібы слёзы капалі на кветкі, якія палымнелі ля пастамента помніка-абеліска. Плакала прырода, плакалі людзі, не хаваючы слёз, не саромячыся сваіх пачуццяў. А скрыпач, скіраваўшы позірк удалячынь, выводзіў жалобную яўрэйскую мелодыю, пераносячы кожнага ў думках у той трагічны жнівень 1943 года .

2 ліпеня 1941 года немцы ўвайшлі ў мястэчка Глыбокае. Страх і жах ахапілі насельніцтва. Дзесяткі і дзесяткі гадоў жылі тут дружна беларусы, яўрэі, палякі.

Нямецкія ўлады перш за ўсё патрабавалі здачы хлебных лішкаў. Кожнай сям'і, незалежна ад колькасці яе членаў, дазвалялася мець пры сабе толькі 20 кг (мукі, зерня).

Астатні хлеб на працягу некалькіх гадзін трэба было несці ў магістрат. Жаласную карціну ўяўляла вялізная чарга, у якой было многа людзей, якія прынеслі «лішкі» ў 3-5 кг.

Нямецкія ўлады жорстка кантралявалі выкананне гэтага загаду. У Ошара Гофмана ў час праверкі было мукі больш за устаноўленую немцамі норму. За гэта «злачынства» забралі яго з жонкай, дзяцей і старых бацькоў. Іх павялі за горад, прымусілі выкапаць сабе магілу і ўсіх расстралялі.

Гэта злачыннае знішчэнне цэлай сям'і жахліва ўразіла ўсё насельніцтва Глыбокага.

Такое ж пакаранне пагражала яшчэ некаторым сем'ям: Ольмару, Друцу, Кантаровічу, Пліскіну, Панятоўскаму і іншым. У Друца, напрыклад, паліцаі знайшлі вотруб'е, якое ён не аднёс, бо лічыў, што яно не ўваходзіць ў норму хлеба.

Усіх гэтых людзей, як злачынцаў, арыштавалі, і толькі за вялікі выкуп ім на гэты раз удалося пазбегнуць смерці.

З першых жа дзён свайго з'яўлення немцы пачалі адпраўляць усё яўрэйскае насельніцтва (у тым ліку і дзяцей) на работы.

Яўрэяў прымушалі выконваць невыносна цяжкую работу, і пры гэтым акупанты здзекаваліся з іх і мучылі іх. Былі выпадкі, калі дамоў з «работы» прыносілі людзей, збітых да страты прытомнасці. Адвакаты Слонімскі, Натанзон, Пінтаў, Ажынскі былі сярод гэтых ахвяр. Нямецкія наглядчыкі паводзілі сябе як гаспадары з рабамі; яўрэі павінны былі выконваць самыя розныя іх капрызы: спяваць песні, імітаваць жывёл, хадзіць на чацвярэньках, танцаваць, цалаваць абутак у немцаў і г. д.

Немцы прыдумвалі розныя здзекі. Так, напрыклад, тых, хто працаваў на вакзале ў Круляўшчызне, зімой ставілі пад вадакачку і аблівалі халоднай вадой.

Вельмі часта змучаных пасля работы людзей прымушалі заходзіць апранутымі ў возера «пакупацца», а потым класціся на пясок і г. д.

Але ўсё гэта былі яшчэ нявінныя забавы «арыйцаў».

22 кастрычніка 1941 года гебітскамісар аб'явіў, што на працягу паўгадзіны ўсе яўрэі павінны перасяліцца ў гета. Рэчы з сабой было нельга браць, толькі некаторую «рухлядзь», і то з дазволу спецыяльна назначанай камісіі з магістрата.

М.Раяк так апісвае «перамяшчэнне».

«У час перасялення ўвесь горад выглядаў як кірмаш. Усе вуліцы былі забіты старызнай. Яўрэі неслі свае ўбогія рэчы ў адведзены для іх лагер – гета. На вуліцах быў незвычайны шум, крык, валтузня. Паліцыя са свайго боку "наводзіла парадак" і біла людзей прыкладамі, палкамі па галовах, руках, па чым папала».

У гета жылі ў страшэннай цеснаце – некалькі сем'яў месціліся ў адным пакоі. Уся мэбля пакоя звычайна складалася са століка і лаўкі. Спаць клаліся сем'ямі на падлозе.

Спачатку яўрэям было дазволена на працягу дзвюх гадзін рабіць закупкі на кірмашы, але потым наведванне кірмашу было катэгарычна забаронена. Яўрэям не дазвалялася ўвогуле купляць мяса, масла, яйкі, малако.

Зносіны з сялянамі пад страхам смяротнай кары былі забаронены. Але многія сяляне, нягледзячы на пагрозу небяспекі, перадавалі і нават самі насілі прадукты ў гета. Былі выпадкі, што сялянкі надзявалі на рукавы «яўрэйскія знакі» і прыносілі ў гета сваім знаёмым прадукты.

Калі такія «злачынствы» выкрываліся, то вінаватыя расплачваліся жыццём. Да смерці збівалі людзей за знойдзены кавалак масла, дробку солі. Гэту палітыку немцы праводзілі на працягу ўсяго часу свайго гаспадарання.

Жонка Залмана-Вульфа Рудэрмана была затрымана і страшэнна збіта за тое, што спрабавала пры вяртанні з работы пранесці ў гета два яйкі. У пачатку мая 1943 года быў арыштаваны і расстраляны мяснік Шалом Цэнцыпер. Кантроль знайшоў у яго мяшку петуха, якога «злачынца» хацеў занесці ў гета.

Яўрэям было катэгарычна забаронена есці ягады…

Цяжка паверыць, што за некалькі з'едзеных ягад людзей праследавалі як за здзяйсненне страшнага дзяржаўнага злачынства.

З пакалення ў пакаленне займалася кравецкай справай ў Глыбокім сям'я Глозманаў. Чэсныя працаўнікі, цудоўныя майстры, яны карысталіся агульнай павагай і любоўю.

У Зеліка Глозмана быў дзесяцігадовы сын Арон. З надзеяй глядзеў бацька на поспехі свайго першынца. Са школы ён прыносіў толькі добрыя і выдатныя адзнакі, у гульнях і нават у мастацкай самадзейнасці ён заўсёды быў першым. І шавец Глозман з замірaннем сэрца думаў пра будучае сына. «Дзякуй Богу, пры Савецкай ўладзе ўсё можа быць. У Арчыка залатая галава, глядзі, ён вывучыцца на доктара ці на інжынера».

Прыйшлі немцы. І ўжо праз некалькі дзён Арчыка Глозмана шукалі па ўсім горадзе. Гестапавец Гайнлейт падняў усіх на ногі, каб знайсці хлопчыка, «злачынства» якога заключалася ў тым, што ён прынёс у хустцы некалькі ягад.

Хлопчык паспеў уцячы ад аховы, і колькі каштавала бацькам – пры дапамозе добрых знаёмых – схаваць яго.

Між іншым, праз некаторы час былі знішчаны і бацькі і сын Глозманы…

Са снежня 1941 года пачалося сістэматычнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва, якое абазначалася немцамі кароткім страшным словам «акцыя».

Адным са снежаньскіх ранкаў гестапаўцы ўварваліся ў дамы і без усякіх тлумачэнняў схапілі некалькі дзесяткаў чалавек. Гэтых людзей – па іх вызначэнні «непатрэбны элемент» – яны прымусілі голымі ісці па лютым марозе.

«Адна жанчына, – піша М. Раяк, – легла сярод вуліцы са сваімі дзецьмі, плакала і крычала, што не зрушыцца з месца. Яе збілі да страты прытомнасці. Усіх пагналі ў Барок, дзе іх і расстралялі. Бедных дзяцей кідалі ў яму жывымі і так жывымі іх і закопвалі. (Барок – мясцовасць за 1,5 км ад Глыбокага. У мірны час гэта было месца для адпачынку).

У Барку немцы прымусілі ля магілы маладых танцаваць, а старых спяваць яўрэйскія песні… Пасля такіх садысцкіх здзекаў яны прымушалі маладых і здаровых заносіць на руках у яму нямоглых старых і калек і класці іх там. Толькі пасля гэтага трэба было класціся ім самім, і тады ўжо немцы метадычна спакойна расстрэльвалі ўсіх».

Забойствам папярэднічалі жудасныя катаванні: людзям разразалі целы, рвалі зубы, забівалі цвікі ў галаву, трымалі голымі на марозе і аблівалі халоднай вадой, іх збівалі палкамі і прыкладамі…

У Глыбокім, як і ў многіх іншых месцах, немцы выкарыстоўвалі свой любімы правакацыйны метад: раздзяленне на два геты. У другое гета, гаварылі немцы, павінны трапіць «малакарысныя» і «малакаштоўныя» яўрэі. На самой справе ў другое гета трапіла многа спецыялістаў: шаўцы, столяры, краўцы. Немцы вырашылі выкарыстаць гета для грашовай «акцыі»; ад другога гета можна было адкупіцца.

Перамяшчэнне ў другое гета працягвалася каля 2-ух тыдняў, з 20-га мая да першых дзён чэрвеня 1942г. Кожны дзень сюды прывозілі на падводах старых. Чырвонаармейская вуліца была запоўнена старымі і калекамі. Гэта частка не атрымлівала прадуктаў харчавання і павінна была быць знішчана ў першую чаргу.

Пасля ўтварэння другога гета фашысты аб'явілі, што ўсе жыхары першага гета атрымаюць рабочыя пасведчанні як спецыялісты, і гэта гарантуе ім недатыкальнасць. Палач глыбоцкіх яўрэяў Капенвальд афіцыйна заверыў прадстаўнікоў Юдэнрата сваім «чэсным словам2, што ніякай бойні яўрэяў больш не будзе.

У ліпені 1942 года гебітскамісар выдаў указ, каб усе яўрэі, якія засталіся ў жывых, сабраліся ў гета ў Глыбокае. Пры гэтым ён завяраў, што больш яўрэяў забіваць не будуць, ён нават даў пропускі членам Юдэнрата для паездкі ў лес і ў вёскі, каб яны адшукалі там яўрэяў, якія хаваліся, і прывезлі іх у лагер.

У гэты час лагер – гета ў Глыбокім – стаў своеасаблівым «яўрэйскім» цэнтрам; сюды сабраліся асобныя ўцалелыя яўрэі з 42 гарадоў і мястэчак. Тут былі яўрэі з Міёр, Друі, Празарок, Галубіч, Зябак, Дзісны, Шаркаўшчыны, Плісы. Прыйшлі таксама ўцалелыя ад бойні ў Даўгінаве, Друйску, Браславе,

Германавічах, Лужках, Гайдуціжках, Варапаеве, Загацці, Параф'янаве, Шыпах, Порплішчы і інш..

Правакацыя ўдалася – яўрэі былі сабраны ў адно месца.

Цікава тое, што ў Глыбокім былі адзначаны эканамічная эфектыўнасць і карысць, якую «акцыі» над яўрэйскім насельніцтвам прыносілі немцам. Цэлымі днямі немцы везлі, акрамя мэблі, адзенне, абутак, посуд, бялізну, швейныя машыны, а таксама прадметы хатняй гаспадаркі. З нямецкай акуратнасцю і пунктуальнасцю ўсе гэтыя рэчы прыводзіліся ў парадак і складаліся ў свірнах. Праз некаторы час у Глыбокім (па вул. Карла Маркса) з'явіліся магазіны гатовай бялізны, абутку, галантарэйных тавараў, фарфоравага і шклянога посуду, а таксама мэблевы магазін. Дзень і ноч працавала пральня, дзе мыліся рэчы забітых. Працавалі ж у пральні яўрэі. Пры разборцы і мыцці рэчаў адбываліся страшэнныя сцэны. Людзі пазнавалі адзенне і бялізну сваіх замучаных родных.

Па вуліцы Карла Маркса №19 існавала спецыяльнае «бюро гебітскамісара ў Глыбокім», асноўнай задачай якога было прыгатаванне пасылак па заказах нямецкіх устаноў і асоб для адпраўкі іх ў Германію. Кожны дзень рыхтаваліся пасылкі з адзеннем, харчаваннем, пасцельнымі прыналежнасцямі і ў вялікай колькасці адпраўляліся ў Германію.

У ноч з 18 на 19 чэрвеня 1942 г. другое гета было ачэплена паліцаямі і жандарамі. Была крывавая «акцыя»...

Дождж ліў як з вядра, зямля дрыжала ад крыкаў жанчын, плачу і стогну старых і дзяцей. І раптам у страшнай начной цемры пачуліся жалобныя гукі перадсмяротнай малітвы «Эль молей рахамім», якую заспявалі старыя. На світанні людзей пагналі да месца пакарання. Маладая дзяўчына Зельда Гардон з крыкам кінулася бегчы ў накірунку да возера, за ёй пабеглі іншыя. Кулі даганялі ўцекачоў, і на працягу паўтадзіны поле, да самага Барка, было засеяна трупамі. Крывавыя мухі чакалі кожнага, хто адмаўляўся пакорліва ісці на смерць. Самуіл Гардон спрабаваў схавацца ў першым гета (на гэты раз «акцыя» галоўным чынам ахапіла другое гета), але яго злавілі, білі, потым зачапілі качаргой за шыю і доўга цягнулі так па вуліцах, пакуль ён не памёр.

Тыя, хто засталіся ў жывых пасля гэтай «акцыі», ведалі, што іх дні злічаны.

У страшэнных умовах гета, нягледзячы на небяспеку, яўрэі дапамагалі савецкім ваеннапалонным (за 1,5 км ад Глыбокага ў Беразвеччы быў размешчаны лагер ваеннапалонных). Сям'я Казлінера прыносіла ім хлеб. Казлінера заўважылі немцы, пасля гэтага ўсіх членаў сям'і расстралялі.

Цяжка было выйсці з гета. Ахова сперагла на кожным кроку; закон кругавой парукі, устаноўлены немцамі, прызначаны быў для таго, каб трымаць усіх у страху і пакорнасці. Але думкі пра барацьбу, пра помсту жылі ў сэрцы народа.

Ужо вясной 1942 года яўрэйская моладзь праяўляла вялікую знаходлівасць ў здабыванні зброі. Тады ж у Глыбоцкім гета былі створаны першыя падпольныя групы моладзі, якія збіралі зброю і шукалі сувязі з партызанамі. Частку зброі і медыкаментаў яны перадавалі партызанам. Зброю збіралі рознымі шляхамі. Напрыклад, Якаў Фрыдман, пераапрануты ў форму паліцая, на кані аб'язджаў

навакольныя вёскі і здабываў зброю, якую пазней перапраўлялі партызанам. У канцы 1942 г. адважны хлопец пайшоў у лес.

Пасля першага пагрому ў гета група на чале з А.Фегельсонам далучылася да партызан брыгады імя Чапаева. У верасні 1942г. наступная ўзброеная група з 17 чалавек уступіла ў атрад «Мсцівец», з якім яна раней падтрымлівала сувязь.

У пачатку жніўня 1943 г. кіраўніцтва партызанскай брыгады імя Суворава накіравала ў Глыбоцкае гета партызанаў Б.Цымера і М.Лібермана, якія павінны былі падрыхтаваць тут паўстанне. Яны згуртавалі моладзь у колькасці каля 300 чалавек, у якіх былі зброя і падрыўны матэрыял. Потым Б. Цымер вярнуўся ў атрад, прывёўшы з сабой 20 маладых людзей са зброяй. 17 жніўня 1943 года ў Крулеўшчызне (19 км ад Глыбокага) адбыўся цяжкі бой паміж партызанамі і немцамі. У гэтым баі быў забіты Керн, шэф жандармерыі ў Глыбокім, і яшчэ некалькі дзесяткаў немцаў.

Намер атакаваць гета народныя мсціўцы не ажыццявілі таму, што ў ноч з 18 на 19 жніўня 1943 г. прыбыўшыя з Вільні і Дзвінска для барацьбы з партызанамі вайсковыя часці, а таксама жандары і паліцаі ачапілі гета і раніцай былі ўжо гатовыя да наступнага пагрому з мэтай знішчэння ўсіх яўрэяў. Карнікі былі вельмі добра ўзброены.

Яўрэі адразу звярнулі ўвагу на тое, што рыхтуецца нейкая акцыя. Каб «усыпіць» пільнасць вязняў, у чатыры гадзіны нямецкі афіцэр з'явіўся ў Юдэнрат і заявіў, што праз дзве гадзіны яўрэі павінны сабрацца на плошчы для адпраўкі на працу ў Люблін (Польшча). Аднак тыя добра ведалі, што значыць па-карацельску «вывезці на працу» – знішчыць усіх людзей.

Гітлераўцы нечакана для сябе сустрэлі арганізаванае супраціўленне ўзброеных яўрэяў, якія праявілі мужнасць і адвагу. Фашысты папрасілі на дапамогу не толькі сухапутныя войскі, але і авіяцыю, якая пачала паліваць гета гаручай вадкасцю, ад якой ў гета пачаліся пажары.

Нямецкія газеты паведамілі, што ў Глыбокім было знішчана «буйнае партызанскае гняздо» з 3-ох тысяч чалавек на чале з сямідзесяцігадовым равінам.

Перажытае з памяці не сцерці

Сям'я Піпекаў жыла па Замкавай вуліцы. Бацька быў шаўцом. У сям'і расло сямёра дзяцей. Старэйшыя працавалі, дапамагалі бацьку, меншыя вучыліся ў школе. Гаўрыіл быў тады яшчэ хлапчуком, яму было 11 год, але прыйшлося кінуць школу і працаваць ў немцаў. І ваду насіў, і снег расчышчаў зімой. Усё, што скажуць, рабіў старанна, бо калі што-небудзь не спадабаецца ці зроблена са спазненнем, тут жа расстрэл.

Цудам ён застаўся жывым. Раніцай 19 жніўня, калі пачалася страляніна ў гета, немцы, паліцаі выводзілі старых яўрэяў з дамоў і расстрэльвалі, падпальвалі дамы. Гаўрыіл спачатку спрабаваў схавацца ў склепе, але, задыхнуўшыся ад дыму, выскачыў на вуліцу і памчаўся. Напэўна, ужо лёс такі быў застацца ў жывых. Пераскокваў праз трупы, перабягаў праз агонь, на ім загарэлася вопратка, чуў, што ўслед страляюць, нехта побач падае, крычыць... Апамятаўся ў лесе

сярод такіх жа, як і сам. Партызаны потым дапамаглі выжыць. А ўсе родныя, знаёмыя, сябры ляжаць у ямах у Барку.

З сям'ёй жыве шмат год у Ізраілі. Вельмі рады, што ўдалося прыехаць на Радзіму і пакланіцца магілам продкаў.

Вязнем гета Гіта Гесельева (цяпер Ліфшыц) была з першага і да апошняга дня. Відаць, самім лёсам наканавана, каб, прайшоўшы ўсё гэтае пекла, застацца жывой.

У тую трагічную жніўеньскую раніцу ўсе адчулі, што творыцца ў гета нешта страшнае. Немцы, паліцаі так і гойсалі па вуліцах, а да плоту ўсё бліжэй падыходзілі танкі. Яўрэі, якія павінны былі выходзіць на работу, вярталіся дадому. Ім растлумачылі, што блізка партызаны і хутка іх усіх адсюль будуць вывозіць. А тым часам ў гета ўсё часцей чулася страляніна, немцы, паліцаі выганялі людзей з хат. Уво і дым пачаў ахутваць многія дамы. Бацька і маці загадалі Гіце схавацца ў падвал. І толькі яна залезла туды, як у хату зайшлі немцы, нешта сказалі бацькам. Яна чула, як заплакала маці, нешта з грукатам звалілася на падлогу, потым пісталетны стрэл, адзін, другі – і ўсё стала ціха. Відаць, немцы спяшаліся, бо не сталі шукаць падвал, а падпалілі хату. Дым разьеў горла, вочы. Больш Гіта там не магла сядзець. Яна выпаўзла з падвала на вуліцу, убачыла суседзяў, яны дапамаглі ёй пералезці праз плот, там была адарвана дошка, і ўсе пабеглі ў лес. Што можна было ўбачыць? Але і сёння, успамінаючы, дзе бегла, перад сабой бачыць толькі людскія трупы, кроў, агонь і з усіх бакоў чуе страляніну. Апамяталася Гіта. У лесе адна, суседзі, з кім бегла, відаць, загінулі. Босая, ногі параненыя, у адной сукенцы. Толькі тут адчула голад і холад. Праз некалькі дзён са страхам далучылася да нейкай групы людзей. Адна яна не ведала, куды ісці, што рабіць. Гіце было тады ўсяго 14 год. Праз тыдзень сустрэліся з партызанамі брыгады імя Суворава. Так да канца вайны і знаходзілася там. Цяпер жыве ў Вільнюсе, мае сям'ю. З болем ў сэрцы прыязджае ў Глыбокае на Дзень памяці. Ведае, што ў гэтых магілах яе бацькі не пахаваны. Яны згарэлі ў доме, але тут спачывае шмат родных і сяброў.

Вельмі цяжка ўспамінаць усё тое, што прыйшлося перажыць моладзі ў гета. Асабліва здзекаваліся паліцаі. На работу выганялі з крыкам, гвалтам, хоць яны і стараліся выконваць усе іх загады. Можна сказаць, што працавалі дзень і ноч, каб толькі атрымаць паёк. Дзяўчатам было загадана мыць казармы, хлопцы расчышчалі снег. Праз вокны казармы яны бачылі мноства трупаў ваеннапалонных, якія ляжалі на адкрытым полі, не пахаваныя. Відаць, ні паліцаі, ні немцы не маглі ўправіцца з гэтай работай, так хутка гінулі людзі.

Жывучы ў гета, усе адчувалі, што некалі будзе канец. Але немцы ўсё ніяк не маглі адправіць іх у ямы. А стрымлівала іх, відаць, тое, што, у асноўным, у гета к 1943 году заставалася амаль адна моладзь. Старых, нямоглых людзей даўно ўжо забілі. А немцам патрэбна была рабочая сіла. А ў жніўні, гэта была якраз пятніца, моладзь раніцай, як звычайна, падыходзіла да выхаду з гета – вялікіх

варот. Старшы, па прозвішчы Рубашкін, пералічыў усіх і пайшоў дакладваць паліцаю. Але той махнуў рукой і сказаў, што сёння ніхто працаваць не будзе, а ўсіх яўрэяў будуць кудысьці перавозіць. За высокім плотам яны не бачылі, а толькі па гуку здагадваліся аб незвычайным руху: раўлі танкі, вакол снавалі немцы, паліцаі. Усім было зразумела, што сёння прыйшоў апошні дзень. Праз нейкі час усё часцей пачалі страляць у гета, загарэлася некалькі дамоў. Тады моладзь, не чакаючы расправы, даволі вялікай групай людзей, паламала плот і пабегла. Бегчы было цяжка, бо трапілі на ўзаранае поле. Ногі правальваліся, а ўслед біў кулямёт. Да лесу дабегла ўсяго некалькі чалавек. Схаваліся ў балоце, у імху. Вечарам выйшлі, азірнуліся на Глыбокае, яно ўсё было ў агні, даносілася страляніна. Ноччу ішлі лесам, шукалі партызан, а днём сядзелі, схаваўшыся ў хмызняку. Так і дабраліся ў Казьянскія лясы.

Вядома, Соня ўжо і думаць не магла, што сустрэне каго-небудзь з родных. У Глыбокім засталіся браты, бацькі і сёстры. Яна лічыла, што ўсе загінулі. Але аднойчы Соню паклікала сяброўка. Тая сказала, што партызаны знайшлі двух хлопчыкаў. Соня спачатку і ісці не хацела, а потым вырашыла паглядзець. Адным з хлапчукоў быў яе дзевяцігадовы брацік Хаімка. Яго было не пазнаць. Увесь у нейкім шмацці, рукі, твар апухлыя, босыя ногі ўсе ў крыві, ды яшчэ па целе – п'яўкі. Як маглі, аказалі яму дапамогу, памылі, апранулі. Доўгі час Хаімка хварэў, плакаў, не мог нічога есці. Беднае дзіця, колькі яму прыйшлося перажыць…

Нездарма кажуць: той, хто ратуе адно жыццё – ратуе ўвесь свет. Адзіны паратунак нават у самых вялікіх пакутах – не апусціцца, не страціць волю, прыстойнасць, не забыцца, што ты Чалавек.

У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з безнадзейнасці да жыцця і збавення.

Калі жыццё пастаўлена на карту – выбар адзін. У кожнага свой непаўторны лёс, свая адзіная дарога. Кожны з вязняў гета прайшоў яе сумленна, чапляючыся за апошні паратунак, каб выжыць, каб расказаць нашчадкам праўду.

Сёння застаецца толькі дзівіцца іх аптымізму, жыццярадаснасці, жаданню штохвілінна прыносіць карысць людзям.

Пачуццё высокай грамадзянскасці патрабуе ад нас свята ўшаноўваць месцы, дзе вечным сном спачываюць непавінныя. Няхай гэта будуць беларусы, яўрэі, татары, палякі, рускія – людзі любой нацыянальнасці. Усе мы – адна гісторыя шматнацыянальнай краіны.

Дарога чацвёртая
Чорны дзень вёскі Празарокі
(з успамінаў Сцяпана Плавінскага)

На перакрыжаванні дарог Полацк – Глыбокае і Дзісна – Кублічы стаіць невялікая вёска Празарокі. У канцы XIX стагоддзя гэта было мястэчка з некалькіх дзесяткаў крытых саломай хат. Недалёка размяшчалася панская

сядзіба. У гэтых хатах жыла дваровая чэлядзь і яўрэі-сядзельцы. Летам 189[illegible] года ўсё мястэчка згарэла.

Перад першай сусветнай вайной Празарокі аднавіліся. Былі пабудаваны касцёл, царква. Яўрэйская абшчына ўзвяла сінагогу.

Празарокі хутка развіваліся ў 30-ыя гады. Вуліцы былі брукаваныя. Працавалі льнозавод, маслазавод, паравы млын, пошта, аптэка, бальніца, адкрываліся шматлікія магазінчыкі, сталовыя, майстэрні. Шматлюдныя кірмашы некалькі разоў на год ператвараліся ў сапраўдныя ярмаркі.

У пачатку ліпеня 1941г. Празарокі захапілі фашысты, і ў гісторыі мястэчка наступіў самы жудасны момант. Быў у гэтай гісторыі адзін, самы чорны дзень які падзяліў яго жыхароў на жывых і мёртвых.

...Снежань 1941г. для празароцкіх шкаляроў пачаўся дзіўнымі канікуламі. Настаўнікі наказалі рыхтаваць урокі самастойна, а калі пачнуцца заняткі, скажуць дадаткова. Помню, 5 снежня дзень выдаўся сонечны, з лёгкім марозам, і мне, дзесяцігадоваму хлопцу, не хацелася сядзець дома.

Ва ўправе ў гэты дзень было ажыўлена. Людзі збіраліся кучкамі, шапталіся памiж сабой. Гучна гаварылі толькі паліцаі. Сярод іх выдзяляліся людзі без паліцэйскіх павязак на рукаве, але з карабінамі. Размова іх адрознівалася ад мясцовай – незнаёмцы густа сыпалі мацяршчынай. Да школы нікога не падпускалі, па двары шасталі немцы і ўзброеныя людзі ў грамадзянскім. Мы вырашылі ўсё ж падысці туды і паглядзець. Але толькі звярнулі з галоўнай вуліцы, як дарогу перагарадзіў вярзіла з карабінам і грозна загадаў паварочваць назад.

Вуліца была пустэльнай. Мяне пазвала жонка суседа Паўла Гаўрыльчыка, памахала рукой і хутка падышла да плота: "Ты толькі паглядзі, хлопец, што робіцца – яна спуджана азіралася па баках. – Правей хутара, на гары, бліжэй да жалезнай дарогі, разгульвае паліцай. А злева, далей пад Барткова, – другі... Я хадзіла ў сінагогу глянуць, што робіцца з другога боку. Там, злева ад старых могілак таксама паліцай, а бліжэй да балота яшчэ адзін. Божа міласцівы, што гэта будзе? Два нашыя паліцаі заходзілі ў яўрэйскія дамы і наказвалі ўсім неадкладна з'явіцца ў школу без рэчаў. Адзін мяне заўважыў і загадаў ісці дамоў і зачыніцца".

Пакуль мы гаварылі, на вуліцы з'явілася вялікая група яўрэяў. Ішлі яны моўчкі, пасярод вуліцы, апусціўшы галовы , нікога не прыкмячаючы. Стала жахліва, і я накіраваўся дамоў, каб расказаць, што бачыў. Маці і бацька не сказалі ні слова. Яны паглядзелі ў акно. Прайшло каля гадзіны, і на вуліцы з'явіўся высокі немец з аўтаматам. За ім крокаў за дзесяць калонай, моўчкі рухаліся жанчыны, дзеці і адзін стары. Праз некаторы час я ўспомніў, што не падаіў карову, і пайшоў у хлеў. Вуліца зноў апусцела. Даў карове вады і хацеў ужо вяртацца ў дом, але пачуў скрып снегу пад мноствам ног. Праз шчыліну ў сцяне добра праглядалася вераніца яўрэйскіх жанчын і дзяцей. Іх канваіравалі немцы – адзін уперадзе, два па баках, два ззаду. Чацвёра былі з аўтаматамі, адзін з кулямётам. Калі жалобнае шэсце стала паварочваць на вуліцу, якая вяла да царквы, з боку Марусінскага лесу ўдарыў вінтовачны залп. А яшчэ праз некалькі секунд данёсся поўны роспачы крык. У калоне захваляваліся, загаласілі.

Дома бацька і маці былі ў роспачы, калі мяне не было. А я толькі і сказаў: «Немцы забіваюць людзей». Бацька многа пабачыў на сваім вяку. Амаль 3-ы гады быў салдатам ў першую сусветную, пражыў грамадзянскую вайну. Зараз жа ён не знаходзіў сабе месца ў хаце і паўтараў: «Нелюдзі, нелюдзі... Забіваюць усіх! Забіваюць нават дзяцей! У тую вайну такога не было... »

Я глядзеў праз акно на людзей, якія ішлі на смерць. Амаль усіх іх я ведаў. Маладая жанчына несла на правай руцэ дзіця, а левай вяла другога, які ўжо можа хадзіць сам. А з боку Марусінскага лесу амаль праз роўныя прамежкі часу ўсё грымелі і грымелі залпы.

Ноччу ў Празароках ніхто не спаў – мястэчка быццам растварылася ў магільнай цішыні – ні агеньчыка, ні гуку. Нават сабакі не брахалі, быццам адчувалі нешта страшнае.

... Мясцовыя паліцаі трымалі ў сакрэце ўсё, што датычылася расстрэлу. На пытанні аднавяскоўцаў толькі і адказвалі: «Быў ў ачапленні, нічога не бачыў».

Нешта з падрабязнасцей расстрэлу давялося даведацца ад мужчын-магільшчыкаў, хоць гітлераўцы забаранілі ім што-небудзь расказваць пад страхам смерці. Аказваецца, калоны спыніліся паміж могілкамі і лесам, дзе зараз праходзіць новая дарога Полацк-Глыбокае. Праз лясок два аўтаматчыкі вадзілі да ямы па чатыры чалавекі. Яны распраналіся, здымалі абутак, станавіліся на край ямы спіной да нямецкіх салдат.Паступала каманда – і раздаваўся залп. Паліцай ужо ставіў наступную чацвёрку. Спачатку расстралялі мужчын, а потым забівалі жанчын, дзяцей, старых. Калі расстралялі ўсіх яўрэяў, паліцаі пагрузілі на сані адзенне і абутак забітых. Як зусім сцямнела, мужчын-капачоў адпусцілі.

На наступны дзень мы даведаліся, што дзве сястры Якерсон былі ў гасцях і пакуль яшчэ жывыя. Пад вечар ад камендатуры іх павялі на расстрэл. Гэта былі вядомыя на ўсю акругу прыгажуні. Іх бацька ў маладосці ездзіў на заработкі ў ЗША. Вярнуўся з добрымі грашыма, пабудаваў дом, адкрыў свой магазін. Справы ў яго ішлі добра. Дачок ён любіў, адзяваў па апошняй модзе. Яны ішлі на расстрэл ў хромавых боціках, модных паліто з мехавымі каўнярамі і пуховых хустках. Ішлі, узяўшыся за рукі, спакойна. Іх канваіравалі фельдфебер, два салдаты і паліцай. Ззаду ішоў мужчына з ломам і лапатай. Ён пазней і расказваў падрабязнасці забойства Розы і Рыты.

«Немцы курылі, а паліцай прымушаў дзяўчат раздзявацца. Калі на іх засталася толькі бялізна, ён падвёў іх да месца, дзе яма была закапана не поўнасцю. Паставіў на самым краі тварам да ямы. Калі да іх падышлі два немцы з вінтоўкамі, яны павярнуліся да іх тварамі. Фельдфебель і паліцай крычалі, прымушалі павярнуцца да ямы, але дзяўчаты ўзяліся за рукі і засталіся нерухомымі. Яны глядзелі салдатам ў вочы. Дзве прыгожыя дзяўчыны, босыя, у адных кароткіх кашулях, з расплеценымі чорнымі валасамі і вялікімі самотнымі вачыма. Фельдфебель даў каманду, і салдаты прыцэліліся ў іх з карабінаў... Потым немцы пра штосьці спакойна размаўлялі, а паліцай збіраў адзенне і абутак забітых. Людзі казалі, што за гэта адзенне паліцай прынёс немцам самагонкі і сала».

З усіх празароцкіх яўрэяў удалося пазбегнуць расстрэлу толькі траім: Ходасу, Гофману і Юдку. Іх невядома па якой прычыне адправілі ў гета ў Глыбокае, дзе яны прабылі да лета 1943 года. Калі партызаны занялі Докшыцы, разграмілі нямецкі гарнізон, у гета ўспыхнула паўстанне, і многім вязням удалося вырвацца на свабоду. Ходас, Гофман і Юдка пайшлі ў партызаны і ваявалі да вясны 1944 года. У час блакады першыя двое загінулі, а Юдка застаўся жывы. Ён адзіны з усіх яўрэяў мястэчка перажыў вайну.

Дарога пятая
Быў месяц май...

Сярод лясоў і балот на беразе рэчкі Сэрвач раскінулася вёска Парэчча. Жылі там людзі мірна, аралі, сеялі, гадавалі дзяцей. Па вечарах у лузе над рэчкай звінелі дзявочыя песні. Старыя на прызбах збіраліся і абмяркоўвалі мясцовыя навіны.

Часам у вёску наведваліся немцы і паліцаі. Ноччу непрыкметнымі сцежкамі прыходзілі партызаны. Пра зверствы фашыстаў вяскоўцы чуць чулі, але бачыць, Бог мілаваў, не бачылі. Верылі, што ўсё благое адбываецца недзе далёка, што іхнія мясціны быда не кране.

А бяда хадзіла зусім побач... Аднойчы, у маі 1944 года, непадалёку ад вёскі на міне падарваўся паліцай, што ехаў на парпы коней. Фашысты абвінавацілі ва ўсім парачан. За гэту страту немцы выбралі васьмярых мужчын, роўна столькі, колькі было конскіх ног. Загадалі капаць яму. А потым, паставіўшы васьмярых на яе краі, – расстралялі.

Напужаныя вайной людзі выносілі з хат самае каштоўнае і закопвалі ў зямлі, каб ніхто не знайшоў.

Хутка ў вёску завіталі фашысты. Усіх людзей пагрузілі ў машыны і павезлі ў канцэнтрацыйны лагер у вёсцы Сітцы. А саму вёску поўнасцю спалілі. Так як печы не гарэлі, у іх закладвалі міны, якія потым узрывалі. Па шчаслівай выпадковасці адна з мін не ўзарвалася.

У лагеры зняволеных кармілі баландой з каніны і прымушалі працаваць. А жанчыны павінны былі яшчэ кожны дзень мыць адзенне і прыбіраць за немцамі.

Шмат хто не вынес гэтага голаду і холаду. Шмат хто не вярнуўся назад.

Але і тых нямногіх, хто выжыў, магло ўвогуле не застацца, бо фашысты хацелі расстраляць і астатніх. Іх вывелі на расстрэл, паставілі да ямы... З'явіўся нямецкі начальнік з перакладчыкам. Расстрэл адмянілі, а зняволеных вярнулі назад у баракі. Блізка было вызваленне. У чэрвені 1944 года Савецкая Армія пагнала захопнікаў на захад.

Вярнуўшыся ў вёску, пагарэльцы знайшлі там адзінокую печ. Тых клункаў, якія яны закопвалі напярэдадні, не ўдалося адшукаць, бо жыхары суседняй вёскі, думалі, што ўжо ніхто сюды не вернецца.

Прыйшлося пачынаць усё спачатку. Трынаццацігадовыя хлопчыкі будавалі хаты, бо з дарослых мужчын амаль нікога не было.

г. Глыбокае – у верасні 1941 ў гета ўтрымлівалася 8 тысяч чалавек.
Вясной 1942 года ў адзін дзень знішчана 3 тысячы чалавек ва ўрочышчы Барок за 1,5 км ад горада. Астатнія 5 тысяч знішчаны ў самім гета.

в. Празарокі – у 1941 годзе знішчана звыш 300 чалавек.

в. Пліса – у 1943 годзе было расстраляна 500 яўрэяў.

У лагеры смерці ў Беразвеччы з верасня 1941 года па ліпень 1944 года было загублена больш за 27 тысяч ваеннапалонных.

Населеныя пункты Глыбоцкага раёна, якія былі знішчаны гітлераўцамі і не адноўлены пасля Вялікай Айчыннай вайны:

Слабада – красавік 1944 года – 12 двароў;

Барыкаўшчына – чэрвень 1944 года – 12 двароў.

З мая 1943 па чэрвень 1944 года ў Глыбоцкім раёне было знішчана 17 населеных пунктаў, якія адноўлены пасля вайны.

У Глыбоцкім раёне за гады акупацыі былі знішчаны 10133 мірныя жыхары. У фашысцкую няволю з Глыбокага было вывезена 1037 чалавек, да красавіка 1946 года дадому вярнуліся толькі 460 глыбачан.

Заключэнне

Часта бачу ў сне, як да мяне без аглядкі бяжыць маленькая Марынка. І ў той жа момант пранізвае жах. Яна размахвае рукамі, нешта крычыць, але я нічога не магу зразумець. Яна на момант знікае ў лагчыне. Потым, не перастаючы крычаць, з'яўляецца зноў. І я думаю: «Што ж на гэты раз?»

Заўсёды, калі маленькая Марынка, бегла вось так, здаралася нейкая бяда. Я жыў за вёскай, у хаце на краі лесу. Вёску і хату раздзяляла ўзаранае поле. І маленькая Марынка, хоць ногі і патаналі ў яшчэ свежай зямлі, спрытна пераадольвала гэтую прастору за пяць хвілін.

Яна прыбягала, прагна глытала трапяткое паветра і не магла вымавіць ні слова. Толькі нешта паказвала рукамі...

Так было і ў снежні сорак трэцяга года, калі немцы вывелі на вуліцу ўсіх сям'ю старасты і расстралялі. Відаць, "добрыя языкі" данеслі, што сюды ўжо не адзін раз прыходзілі партызаны. Калі я прыбег, ўжо палала хата, патрэскваючы на лютым марозе. З відавочцаў лютага пакарання былі толькі малыя хлапчукі, што не пабаяліся праследавання. Крывавыя плямы крыві расплываліся па снезе, быццам невялікае азярцо. Клубы чорнага дыму засцілалі неба... І, нарэшце, нібы цяжка ўздыхнуўшы, абвалілася страха...

Тое было ў вайну. А што значыць мір, я пакуль яшчэ не ведаў. І толькі зноў і зноў бачыў, як, размахваючы рукамі і не ў сілах нічога сказаць, бяжыць да мяне маленькая Марынка. І думаў: «Што ж там зноў здарылася?»

Аднойчы з'явілася яна з запаканымі вачыма. Усхліпвала і не магла вымавіць ні слова. «Наш старэйшы, – праз сілу выдыхнула яна, – мой брат!» На гэты раз бегчы куды-небудзь не было сэнсу. Крыху адпачыўшы, сказала: «Вярнуўся з фронту, але калека.Калі міністэрыўраваў чыгунку...» «Дурненькая, –суцяшаў яе, – але ж жывы, жывы вярнуўся!»"

І зноў да мяне бяжыць маленькая Марынка. Яна нешта крычыць, насільваецца нешта паказаць рукамі. Усё паказвае ў бок лесу. «Зноў жудаснае нешта здарылася!» – маланкай праносіцца ў маёй галаве. І вось Марынка побач. «Ну, што? Што?» – ледзь не вырываецца маё сэрца. А малая накіроўвае позірк у бок лесу, бязгучна кратаючы вуснамі, нешта кажа. І раптам я ўсё разумею.

«Ліпа цвіце, – кажа Марынка, – ліпа цвіце!»

І твар яе свеціцца шчасцем...

Усё гэта я бачу ў сне... Тут я заўсёды прачынаюся і думаю: «Вось што значыць мір».

«ХАЛАКОСТ. ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ»

УСТУП

У 2007 г. праходзіў II Рэспубліканскі конкурс работ навучэнцаў, студэнтаў і выкладчыкаў ***"Халакост. Гісторыя і сучаснасць"***.

Усяго ў конкурсе бралі ўдзел 20 студэнтаў.

27.01.2009 г. у Дзень памяці ахвяраў Халакосту адбылося узнагароджанне студэнтаў БДТУ – пераможцаў II Рэспубліканскага конкурсу ***"Халакост. Гісторыя і сучаснасць"***, які праводзіўся Саюзам беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын, грамадскім аб'яднаннем "Рэспубліканскі Фонд "Халакост", Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Лаўрэатамі сталі 3 студэнты (Малашук Марыя, Ісаеў Дзмітрый, Шэмель Юля).

Спецыяльны прыз атрымалі 3 студэнты (Адамовіч Вольга, Махлай Ірына, Міхалёнак Анастасія).

Адзначаны дыпломамі і падзякай кіраўнікі студэнцкіх прац Кузьміч В.А., загадчык кафедры беларускай мовы, і Жукоўская Т.У., выкладчык кафедры беларускай мовы.

Вольга АДАМОВІЧ

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Кузьміч В. А., загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік адукацыі Беларускай ССР, выдатнік адукацыі

Я хачу, каб у душах жывых яны з мёртвых паўсталі...

Уступ

Памяць чалавека — неацэнны скарб, які трэба шанаваць як найважнейшую рэліквію. Немагчыма выхаваць грамадзяніна з унутранай патрыятычнай, гуманістычнай пазіцыяй, калі падмурак яго жыццядзейнасці не грунтуецца на памяці пра свой род, сваю Радзіму, у тым ліку і малую, калі спіць яго душа. Ведаць і помніць, шанаваць і берагчы тое, што засталося ад родных і блізкіх табе людзей для таго, каб асэнсаваць гераічыны і мужны, трагічны і балючы лёс сваіх суайчыннікаў.

Асабліва абвастраецца памяць нашага народа пры ўспамінах аб Вялікай Айчыннай вайне, тым перыядзе, які яшчэ балюча адгукаецца ў кожнай сям'і, у кожным населеным пункце Беларусі.

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 лютага 2008 года № 110 «Аб падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе Савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» неабходна актывізаваць дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі.

Асэнсоўваючы падзеі Вялікай Айчыннай вайны з пункту гледжання сучаснай моладзі, варта не толькі разумець гераізм нашага народа (гэта, бясспрэчна, асноўнае), але і тыя трагічныя і балючыя яе старонкі, якія папярэджваюць, нельга крычаць аб тым, што вайна як з'ява ніколі не павінна быць меркай вырашэння канфліктаў, ніколі не павінна забіваць і знішчаць іншыя народы і краіны.

Дадзеная праца прысвячаецца аднаму з трагічных бакоў Вялікай Айчыннай вайны. Яна пабудавана на аснове рэальнага матэрыялу, сабранага аўтарам працы ад сведкаў тых жудасных падзей, якія адбываліся на прыгожай зямлі Докшыччыны. У аснову працы пакладзены ўспаміны відавочцаў тых страшных дзён, гістарычныя факты, матэрыялы музея Докшыцкай школы № 1.

Докшыцы і Параф'янава ў сучаснасці

Докшыцы — невялікі гарадок у Віцебскай вобласці. Гэта адзін з раённых цэнтраў Віцебшчыны. За 9 км ад Докшыц знаходзіцца вёска, у якой я нарадзілася, — Параф'янава. Праўда, ва ўсіх старых дакументах яна называецца мястэчкам. Чаму? Магчыма, для нейкага адрознення. Справа ў тым, што ў нас ёсць два Параф'янавы: маё, чыгуначная станцыя, і так званае «старое», дзе знаходзіцца каталіцкі касцёл. Заўсёды наша станцыя была большай па памерах і больш заможнай вёскай. Яшчэ перад вайной тут было багатае яўрэйскае мястэчка. У Докшыцах таксама жыло шмат яўрэяў. На той час ніхто не ведаў, які лёс іх напаткае…

Мал. 1 Сучаная карта Докшыцкага раёна

Ахвяры Докшыц

Чым народ не такі, як усе?
Што не так у іх абрадах і мове?
І чаму ў той страшнай вайне
Ўзненавідзеў іх жудасны вораг?

Паводле перапісу 1939 г., насельніцтва Докшыц складала каля 3,6 тыс. чалавек, у асноўным гэта былі яўрэі. Большасць з іх, калі пачалася вайна, не змагла або не пажадала эвакуіравацца, не верачы чуткам пра выключную жорсткасць нацыстаў у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва. Аднак ужо ў першыя месяцы акупацыі ў Докшыцах было створана гета, у якім за час яго існавання былі знішчаны 2653 яўрэі. У гета можна было браць абмежаваную колькасць рэчаў, таму некаторыя яўрэі раздавалі сваю менш каштоўную маёмасць мясцовым жыхарам.

Апошнім днём для яўрэйскай абшчыны горада стала 29 мая 1942 г., калі гета было «канчаткова ліквідавана». Гэтым страшным падзеям прысвечана кніга «Памяць: Докшыцы — Параф'янава», выдадзеная ў 1990 г. на англійскай мове ў Ізраілі. У кнізе занатаваны ўспаміны тых докшыцкіх і параф'янаўскіх яўрэяў, якім удалося застацца ў жывых, апавяданні пра тыя жудасныя дні, слёзы і боль па родных і знаёмых.

Барыс Казінец — адзін з нямногіх вязняў Докшыцкага гета, якім выпала ацалець у час яго «ліквідацыі». Яму пашчасціла трапіць да партызан. Ён ваяваў, са зброяй у руках помсціў за пакуты і смерць родных і сяброў. У кнізе «Памяць: Докшыцы — Параф'янава» ёсць і яго ўспаміны.

«Нарадзіўся я ў 1919 г. ў Докшыцах. У 1934 г. паступіў у польскую школу. Потым працаваў у швейнай майстэрні. У 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Полк наш размяшчаўся ў мястэчку Зэльва, што пад Ваўкавыскам.

На світанку 22 чэрвеня 1941 г. нямецкія войскі парушылі мяжу і ступілі на зямлю Савецкага Саюза. Наш полк з баямі адступаў у напрамку Баранавіч. Дзесьці пад Мінскам мы трапілі ў акружэнне. З яго я выходзіў разам з маім сябрам Молі Уэндам і яшчэ двума салдатамі Чырвонай Арміі. Ішлі лясамі, начавалі ў стагах сена, елі толькі тое, што давалі сяляне. Я ўжо тады з размоў з некаторымі людзьмі ведаў, што немцы вельмі дрэнна адносяцца да яўрэяў.

Мне пашанцавала, і 29 ці 30 чэрвеня 1941 г. я змог вярнуцца ў родны горад. Аб'явы, якія ўжо на гэты час былі развешаны на многіх пабудовах горада, загадвалі ўсім былым салдатам з'явіцца да нямецкіх улад. Я быў апрануты ў сялянскую вопратку і таму мог хаваць тое, што быў салдатам у нядаўнім мінулым.

Першымі двума ахвярамі фашыстаў сярод яўрэяў былі Мазін, звар'яцелы чалавек, і Маркман, які быў застрэлены ва ўласнай хаце. У ліпені загад насіць жоўтую стужку датычыўся ўжо ўсіх яўрэяў.

У гэтыя дні я вярнуўся ў абшчыну і запісаўся на працу. Працуючых збіралі кожную раніцу невялікімі групамі і пасылалі на работу або ў часовыя лагеры. Дысцыпліна там была вельмі строгая. Калі Зальман Раскін на некалькі хвілін спазніўся на работу, яму загадалі паўзці, а нямецкі саддат біў яго 25 разоў. Мы

бачылі, як моцны і здаровы Зальман уздрыгваў пры кожным удары. У душы мы паклялiся помсціць і не ўяўлялі, што ў хуткім часе ў горадзе не застанецца ў жывых ніводнага яўрэя.

Немцы пачалі адбіраць майстроў для стварэння груп рабочых. Мяне паслалі ў швейную майстэрню, дзе мы працавалі для іх арміі. Ад гэтай работы залежаў мой лёс на працягу ўсяго часу акупацыі. У Докшыцах была прызначана мясцовая адміністрацыя. Галоўным саветнікам немцы назначылі так званага Паўла Кавальскага, начальнікам паліцыі. Комульку, які служыў старшым сяржантам у Польскай Арміі. Ён быў родам з Познані, але гаварыў па-нямецку. У яго падпарадкаванні было 25 паліцэйскіх: браты Войнічы, браты Літвіны, Юхневіч і іншыя. Сваёй жорсткасцю ў адносінах да яўрэяў яны пераўзышлі нават эсэсаўцаў. Комулька быў савецкім вязнем, немцы вызвалілі яго, і тады ён аддана ім служыў. Ужо пасля вайны, у 1951 г., ён быў схоплены і павешаны паводле прыгавору суда ў Познані.

Бургамістрам быў прызначаны Яўген Рыгоравіч Спічонак, які хаваў яўрэйскую сям'ю Крамераў (зараз яны жывуць у ЗША). Гэтага добрага чалавека выпадкова застрэлілі партызаны, калі ён ехаў разам з камендантам Докшыц.

Як толькі ў горадзе з'явілася гестапа, у першую чаргу яно «паклапацілася» аб яўрэях, якія былі актывістамі савецкай улады. Гэта Гронам Клофт, Абрам Левітан, Зальман Цыклін і іншыя. Пасля чатырох дзён катаванняў яны былі вывезены з горада і расстраляны. Дзе іх магілы — невядома і сёння.

У жніўні 1941 г. фашысты падрыхтавалі наступную групу ахвяр. З таго часу мы сталі атрымліваць усё больш частыя звесткі аб масавых забойствах яўрэяў у суседніх мястэчках, такіх як Беразіно, Бягомль. Чаканне жудаснага знішчэння яўрэйскага насельніцтва марудна, але настойліва ўваходзіла ў нашу свядомасць.

У верасні 1941 г. быў выдадзены загад аб стварэнні гета ў Докшыцах. Зона гета пачыналася ад саду сінагогі і ўключала ў сябе некалькі суседніх алей і частку галоўнай вуліцы імя Касцюшкі. Усе спецыялісты, якія працавалі на немцаў, атрымалі дазвол (шайнэн) займацца сваёй работай і мелі права выходзіць з гета. Мой бацька і я шылі адзенне для ўлады. Голад паціху падкрадваўся да трох тысяч душ, якія жылі ў гета. 300 г хлеба на чалавека — усё харчаванне, і тое выдавалася нерэгулярна. Каб не спецыялісты, якія маглі выходзіць з гета кожны дзень і купляць або абменьваць каштоўнасці на ежу, гета вымерла б з голаду яшчэ раней за расстрэл.

Першы пагром адбыўся ў красавіку 1942 г. Мясцовая паліцыя — адна, без дапамогі з боку немцаў — уварвалася ў гета і пачала помсціць яўрэям за гады, што былі пад савецкай уладай. На другую раніцу паліцэйскія загадалі групе моладзі выкапаць яму побач з яўрэйскімі могілкамі. Арыштаваных яўрэяў прывялі туды і расстралялі. Мы ў гета чулі водгукі шматлікіх аўтаматных чэргаў і адзіночных стрэлаў, якімі дабівалі параненых. Разам з маім дзядзькам Зальманам Фрэйманам былі забіты і многія нашы суседзі: Кацовіч, Фрыдман, Сосман, Блоч і іншыя.

Пасля гэтага пагрому многія яўрэі сталі будаваць сховішчы, каб хавацца на час наведвання немцаў.

Я працягваў працаваць, але на адпачынак я і мае родныя хаваліся ў бункеры. Пад кухняй, на глыбіні 2,7 м, была выкапана яма. Мы ўмацавалі яе тоўстымі палкамі, пад якія насыпалі шмат пяску. Уваходам у бункер быў дымаход. Выйсці з бункера можна было ў сад, праз гэты ход паступала паветра. Такім чынам многія яўрэі рыхтаваліся да другога пагрому.



Мал. 2 Мост праз р.Бярэзіну

Другая «акцыя» адбылася ў пачатку мая 1942 г. На світанку гета было акружана паліцыяй. Яўрэі ў большасці сваёй пахаваліся ў бункеры. Але гэта мала дапамагло. Многія сховішчы немцы пазнаходзілі і ўсіх, хто там быў, расстралялі. Нашай сям'і пашанцавала больш. У сховішчы мы адсядзелі ўсю «акцыю». На наступны дзень выйшлі на вуліцы гета. Нашы вочы ўбачылі жудасную карціну. Забітыя ляжалі кучамі на вуліцах і дарогах, усё вакол было заліта крывёю, у дамах на пасцелях ляжалі забітыя людзі. На мосце Песач Каплан сабіраў мазгі свайго маленькага дзіцяці, падарванага фашыстамі. Цельца маленькага больш не было, і хаваць, і плакаць бацьку не было над чым. Усе яўрэі, якіх злавілі ў бункерах або сваіх дамах, былі сабраны ў месца ля клуба. Там немцы праверылі, хто з прысутных мае дазвол на работу. Іх пакінулі, а ўсіх астатніх падвялі да агульнай магілы і расстралялі. У гэтым пагроме загінула 350 яўрэяў.

Ліквідацыя гета прыйшлася на канец мая 1942 г. Гэта здарылася ў суботу. У 4 гадзіны раніцы нас разбудзілі суседзі і паведамілі, што гета акружана, уцякаць не было куды. Як і раней, яўрэі вырашылі, што могуць уратавацца, калі схаваюцца ў бункерах. У наш бункер схаваліся і суседзі, усяго 20 чалавек. Мы сядзелі ў яме, і нашы валасы краталіся на галовах ад жудасных крыкаў яўрэяў, якіх выганялі немцы са сваіх дамоў.

У 8 гадзін раніцы фашысты напалі і на наш след, пачалі пошукі бункера з боку печы. Праз некаторы час, які для нас здаваўся самым доўгім у жыцці, пачуліся крыкі: «Жыды, выходзьце!» Ніхто не адказваў на гэтыя крыкі, і тады пачулася пагроза, што яны кінуць гранаты, калі мы не выйдзем. Заставацца ў сховішчы не было сэнсу. Я выйшаў першы. І адразу атрымаў удар палкай па шыі. Кінуўся бегчы, але быў збіты нагамі. Мяне акружылі гестапаўцы, білі, але я змог выскачыць у калідор і скочыць з балкона. Нечакана апынуўся каля групы людзей, і нас зноў акружылі гестапаўцы, потым сагналі ў адно месца, дзе ўжо знаходзілася некалькі дзесяткаў яўрэяў, і іх прыводзілі ўсё больш і больш. Некаторыя з маіх суайчыннікаў плакалі, іншыя ляжалі на зямлі, не маючы сіл падняцца. Да мяне падсеў Гдалія Левін і зашаптаў на вуха: «Уважліва паглядзі на гэтыя дрэвы і хаты, ты не ўбачыш іх больш. Усё гэта застанецца, але нас не будзе, нічога не зменіцца ў гэтым свеце, толькі не будзе нас». Я памятаю гэтыя словы да сённяшняга дня, яны адлюстраваліся ў маёй свядомасці назаўсёды. Калі нас назбіралася дзесьці чалавек 350, усіх пастроілі ў вялікую калону і пагналі

да ямы, дзе раней расстрэльвалі яўрэяў. Наша апошняя надзея на выратаванне знікала з кожным крокам на шляху да гэтай жудаснай ямы. Калі падышлі да месца расстрэлу, некаторыя з яўрэяў спрабавалі ўцякаць. Але нікому з іх не пашанцавала. Усе былі забіты. У гэты час да мяне падышоў зондэрфюрэр Гартман і адвёў убок. Ён адвёў таксама майго бацьку, маю мачыху Гіту і яе дачку Хаю. Да мяне прыбегла наша суседка Сара Маркман. Яна сказала зондэрфюрэру, што яна мая цётка. Усіх нас ён павёў у горад. Як потым мы зразумелі, сваім уратаваннем павінны былі дзякаваць таму, што добра валодалі спецыяльнасцямі шаўца і краўца. А ў гэты час ля ямы пачаўся расстрэл. Яўрэям спачатку загадвалі распранацца, каб яны не запэцкалі крывёю вопратку і не змаглі схаваць каштоўнасцей, а потым забівалі.

Калі мы вярнуліся ў гета, то ўбачылі, што ўсё разбіта, разрабавана, а з розных сховішчаў, бункераў усё яшчэ працягвалі выводзіць яўрэяў. Некаторыя няшчасных забівалі сябе і дзяцей загадзя. Адна жанчына дала дзецям атруту і прыняла сама. Я ўбачыў прыгавораных да смерці прыгожых сясцёр Шлейфер. Яны былі апрануты толькі ў вельмі кароткія начныя кашулі. Дзяўчаты ўвесь час іх абцягвалі, саромеліся. Так амаль голых іх і павялі на смерць.

Знішчэнне Докшыцкага гета працягвалася 17 дзён, паколькі многія хаваліся, а іх упарта адшуквалі. Усе спецыялісты, якіх немцы пакінулі ў жывых па адным ад кожнай прафесіі, 9 дзён знаходзіліся ў адным доме, не пакідаючы яго. За гэты час нас ні разу не кармілі, вады таксама не давалі. Як мы пасля гэтага выглядалі, няцяжка ўявіць, але мы былі шчаслівыя, што засталіся жывыя.

У апошні дзень "ліквідацыі" была схоплена апошняя група яўрэяў, каля 2 чалавек. Іх таксама расстралялі. Пасля мы даведаліся, што яны пратрымаліся так доўга, бо ўцяклі з гета і хаваліся ў руінах яўрэйскіх дамоў на ўскраіне Докшыц па шляху на Глыбокае. Іх знайшоў хлопчык-пастух і здаў у рукі паліцыі.

У чэрвені 1942 г. ў Докшыцах не засталося ніводнага яўрэя.

Докшыцы былі вызвалены ў чэрвені 1944 г. Рэшткі яўрэйскага насельніцтва горада, тыя, хто ваяваў у партызанах, паступова вярталіся. Сярод іх былі Іосіф Шапіра, я — Барыс Казінец, Я. і Б. Рэгіманы, Б.Фрыдман, сям'я Розавых і іншыя.

Пасля вызвалення ў горад пачалі прыходзіць лісты ад яўрэяў, якія ўцяклі ад нацыстаў. Ад яўрэяў — салдат Савецкай Арміі. Ад родных з ЗША, Ізраіля і іншых краін. Толькі адно пытанне было ў тых лістах — ці застаўся ў жывых хто-небудзь з родных? Яны прасілі знаёмых, суседзяў, добрых людзей напісаць, што здарылася з іх сем'ямі. Адказ быў адзін: "Нікога не засталося. Усе забітыя". Сам горад быў практычна поўнасцю разбураны. Было знішчана каля 90% пабудоў. Горад сам стаў могілкамі. Немагчыма было дыхаць у ім, немагчыма было жыць у ім аніводнага дня».

Гэта жудасныя ўспаміны, якія чалавек пранёс праз усё жыццё. Імкнуся зразумець яго боль, але гэта, напэўна, немагчыма… Можна толькі клапаціцца пра тое, каб жыла памяць народа пра гэтых людзей, якія сталі такімі ненавіснымі для Гітлера. Бо проста былі яўрэямі. Бо проста жылі…

Але з успамінаў Міхаіла Дзмітрыевіча Явіда вынікае, што не толькі немцы здзекаваліся з яўрэйскага насельніцтва. Ён падкрэслівае, што асабліва прыніжэнне і пагромы маёмасці чыніліся над яўрэямі мясцовымі паліцаямі —

ураджэнцамі Докшыц і навакольных вёсак, якія ведалі, хто бедны, а хто багаты, хто быў пасля 1939 года ў камсамоле, хто ўступіў у партыю, хто іх родзічы і г.д.

Яўрэяў рабавалі таксама паліцаі. Немцы туды не заходзілі, паліцаі ж забягалі на тэрыторыю, хапалі ў каго вопратку, у каго гадзіннік, у каго швейную машынку.

Мясцовыя жыхары дапамагалі яўрэям, давалі прадукты, хоць за гэта можна было «атрымаць гуммы» ў камендатуры.

У час расстрэлу гета сям'я Явідаў схавала яўрэйскага хлопчыка — Хаіма Кацмана, які жыве і зараз у Ізраілі і падтрымлівае з гэтай сям'ёй самыя добрыя адносіны.

Такім чынам, знаходзіліся людзі, што не баяліся ўзяць на сябе цяжкі, а ў тых абставінах вельмі страшны абавязак — дапамагаць. Дапамагаць, нягледзячы на небяспеку для свайго ўласнага жыцця.

Параф'янаўская трагедыя

Бязмежныя крылы жыцця,
Як запалка, што ўспыхнула ярка.
Для кагосьці яна цеплыня,
Іншы ж зробіць пажарам запалку.

Параф'янава, як я ўжо казала, было мястэчка заможнае. Тут пражывала вялікая колькасць яўрэяў. Крамы, што былі на станцыі, таксама з'яўляліся пераважна яўрэйскімі.

Януковіч (Дамінеўская) Галіна Канстанцінаўна ўспамінае: «Я хадзіла ў школу разам з яўрэямі. На ўрокі рэлігіі прыязджаў і ксёндз, і бацюшка, і равін.

На станцыі была адна крама, дзе прадавалі тэхніку (будынак бібліятэкі). Калі ты прыходзіў, а там не было чагосьці, то на наступны ж дзень гаспадар ехаў у Вільню і прывозіў тое, што трэба.

Адным з самых вядомых яўрэяў у мястэчку быў Кастроль. Ён жыў у Параф'янаве і пасля вайны. Так атрымалася, што ляснічы паведаміў яму і яго брату, што яўрэяў збіраюцца сагнаць у гета. Таму тыя паспелі ўцячы. Яны сталі членамі партызанскага атрада.

У нас былі дзве каровы. Адну мой бацька прадаў яўрэю, упраўляючаму спіртзавода. Калі іх пачалі зганяць у гета, прыйшоў гэты яўрэй да нас з просьбай: «Ой, Дамінеўскі, забяры ты сваю карову назад, можа, хоць малака калі дасі. Ты пастаў хоць якую галаву замест яе». Бацька купіў іншую карову, завёў

Мал. 3 Памятны знак у Параф'янаве

ноччу, замяніў. Ён быў у вельмі добрых адносінах з яўрэямі, заўсёды іх абараняў. Як прыйшлі бальшавікі, у нас усё было павязана ў вузлы, чакалі з дня на дзень, што вывезуць нас як кулакоў. І толькі дзякуючы яўрэям нашу сям'ю не вывезлі. Яны вельмі паважалі майго бацьку. Страшны быў час. Кожны вечар ідзе са станцыі машына, палутарка. Чакаем, што едуць за намі. Прыязджаюць яўрэі заспакойваюць: "Не бойся, Дамінеўскі. Ніводзін волас з тваёй галавы не ўпадзе" .Такая моцная ўлада была ў іх».

Увогуле, адзін з вышэйшых пастоў у мястэчку займаў таксама яўрэй, Арон Левітан. Яго ж немцы і забілі першым, калі прыйшлі ў мястэчка.

Аповед пра знішчэнне параф'янаўскага гета пачну з успамінаў, што знайшла ў кнізе ізраільскага псіхолага Бар-Она «Спадчына маўчання». Гэта кніга змяшчае ўспаміны дзяцей тых людзей, што непасрэдна ўдзельнічалі ў страшнай справе Халакосту ў якасці выканаўцаў. Вось вытрымка з гэтай кнігі, што змяшчае размову з сынам немца, які быў пасланы ў Параф'янава падчас вайны.

«Рудольф адказаў на маю просьбу ў мясцовай газеце: "Дзеці, чые бацькі вінаватыя або прымалі ўдзел у ганеннях або ажыццяўленні праекта знішчэння ізраільскага народа, калі ласка..." Ён патэлефанаваў і сказаў, што будзе размаўляць толькі з ізраільскім карэспандэнтам. Мы назначылі час для інтэрв'ю і я згадзіўся сустрэцца з ім на аўтобусным прыпынку.

Як карэспандэнт я шукаў і меў поўную інфармацыю пра бацькоў і іх ролі падчас вайны, але для мяне адказчыкі былі таямніцай да той пары, пакуль яны не пачынялі расказваць свае гісторыі. Звычайна я прыходзіў на некалькі хвілін раней на месца сустрэчы, каб убачыць, як ідзе чалавек — як ён падыходзіць да прыпынку, як выглядае, здаецца ён спакойным ці не, ці змяняецца яго выраз твару, калі ён пазнае мяне. Аднак Рудольф ужо чакаў, паглядаючы на гадзіннік, хоць я і не спазняўся. Ён высокі і выглядаў як менеджэр мясцовай фірмы. Моцны поціск рукі. Я мог адчуваць яго хваляванне. Ён пачаў расказваць адразу, але я накіраваў яго размову у маленькую бяседу, таму што я хацеў дабрацца да свайго офіса, дзе быў уключаны дыктафон. Калі мы нарэшце дабраліся да майго пакоя і я запрасіў яго прысесці, ён выцягнуў жоўтыя лісты паперы са свайго партфеля.

Рудольф: Я нарадзіўся 4 красавіка 1930 года ў Вапертале, сын беспрацоўнага тэкстыльнага рабочага. Мой бацька ў той час не працаваў. Да таго як ён страціў працу, ён быў майстрам на тэкстыльнай фабрыцы. Аднак тады была вялікая колькасць беспрацоўных у гэтай мясцовасці і яго таксама звольнілі.

Бар-Он: Вы адзіны сын?

Рудольф: Я быў адзіным сынам да 1940 года, калі нарадзіўся мой брат. Ён і зараз жывы. Ён нарадзіўся 14 студзеня 1941 года ў Вапертале. Я правёў гэтыя раннія гады больш-менш прыемна да таго часу, пакуль мой бацька не знайшоў працу зноў. Я не памятаю, калі гэта было дакладна. Мы жылі ў зусім прымітыўным маленькім доме. Хоць ён быў без працы, аднак сам пабудаваў маленькі дом у садзе. Ён быў вельмі прадпрымальны і да самай смерці быў веруючым хрысціянінам. Дома мы маліліся, у нас былі гадзіны Бібліі, і мы спявалі разам. Былі таксама і іншыя, хто прыходзіў да нас пачытаць слова Божае разам.

Пасля бацька знайшоў новае месца працы. Ён быў назначаны рабочым на чыгунцы, яго пасылалі ў Расію і Польшчу. Калі больш дакладна, то ён быў пасланы ў Параф'янава. Гэта паміж Вільняй і Смаленскам. Ён працаваў, як гэта называлі падчас вайны, у якасці памочніка камандзіра рабочай групы. Быў вызначаны раён чыгункі, за які ён быў адказным. Гэта было паміж Параф'янава і Смаленскам, штосьці каля 300-500 км. Я не магу даць вам канкрэтную лічбу. Яго работа заключалася ў падтрыманні гэтага ўчастка чыгункі, які часта атакавалі партызаны. Яны ўзрывалі дарогі, такім чынам цягнікі сыходзілі з рэльсаў. Але самае важнае, што так паўплывала на мяне, было тое, пра што ён мне расказаў пасля свайго вяртання. У Параф'янаве было яўрэйскае гета. Шмат яўрэяў было сабрана разам і сканцэнтравана ў гэтым раёне, дзе ім дазвалялася жыць. Гэтыя яўрэі таксама працавалі на нямецкай чыгунцы. Большасць была занятая тым, што дапамагалі рамантаваць дарогі. Напрыклад — я ўжо не магу забыць іх імёны — гэта быў Арон Кац, Марыя і кухарка, якая рыхтавала ежу людзям, з якімі працаваў мой бацька. Гэтая кухарка была яўрэйкай. Я не ведаю яе імя. Але яе называлі Дола. Мой бацька мог наведваць гета і там размаўляць з яўрэямі.

Так як ён быў перакананым і веруючым хрысціянінам, ён гаварыў з імі аб Святым Пісанні, аб Біблii. І яны ведалі, што яны вераць у аднаго і таго ж Бога. У любым выпадку яны разумелі, што яны роўныя. І мы, германцы, мы таксама адносімся да роду ізраільскага.

Настаў дзень, калі гета было акружана войскамі СС. Яны спыталі майго бацьку: "Колькі табе трэба?" і ён адказаў: "Мне патрэбны ўсе". "Не, мне патрэбна шмат галоў, яны будуць расстраляныя," — сказаў афіцэр. І зараз ёсць такія добрыя хрысціяне з добрым дзіцячым сэрцам. Ён стаяў і не мог нічога зрабіць. Што ён павінен быў сказаць? "Забі і мяне таксама?" У яго былі дзеці і жонка. Што ж ён павінен быў зрабіць? У яго не было такой вялікай смеласці. Ён не мог супраціўляцца. Ён быў не ў стане ўратаваць яўрэяў — пасля таго, як паміж імі наладзіліся такія ўзаемаадносіны, яны сталі яго братамі, ён жыў разам з імі. Спачатку была забіта жанчына. Днём раней яна нарадзіла дзіця. Яна была кінутая ў магілу. Яны забілі таксама і дзіця. Мой бацька не ведаў гэтага. Затым ён пабег і моцна плакаў. Малады салдат СС пабег за ім і сказаў: "Я не магу больш працягваць гэта! Я забіў і так шмат людзей. Я ўжо не магу больш".

Пасля гэтага яго крытыкавалі. Я мог бы прачытаць вам пісьмо, якое напісаў мой бацька, каб праясніць падзеі. Гэта пісьмо, якое ён напісаў адразу пасля вайны. Ён быў вельмі хворым і быў звольнены са службы за свае перажыванні. Ён пісаў пісьмо пасля вайны, бо вельмі баяўся, што могуць забараніць пісаць гэта падчас вайны, падчас перыяду нацыянальнага сацыялізму. Дазвольце мне паказаць вам. Гэта вельмі старое пісьмо, і гэта пацвярджэнне таго, што мой бацька быў на ўсходзе.

(Яго рукі дрыжалі. Рудольф даў мне два дакументы, якія ён прынёс з сабой. Я мог бачыць, што яны вельмі старыя і захоўваліся акуратна ў нейлонавай сумачцы. Я таксама бачыў, што яны напісаны пажылой рукой і на адным з іх былі словы НАША ВІНА. Я даў Рудольфу шклянку вады і прапанаваў яму самому прачытаць гэтыя дакументы мне. Пісьмо было ад 16 мая 1945 года):

Мал. 4 Тут было гета

НАША ВІНА

Нарэшце пасля нека… тыдняў сур'ёзнай хваробы, … амаль адабрала ў мяне ўсе пачу… я знайшоў сілы, каб напісаць … тыя рэчы, што зрабілі мяне … рым і поўнасцю разбурылі … нервы. Я паспрабую расказ… пра падзеі па парадку і расту… чыць, чаму выбраў такую … свайму пісьму.

Да 1941 года на працягу многіх гадоў я актыўна працаваў дырэктар… нядзельнай школы для дзяцей. Наш прыход служыў для знешняй і ўнутр… місіянерскай дзейнасці ў Кітаі. Мая галоўная задача заключалася ў тым, … запрашаць да службы дзяцей. У мяне было шмат сяброў (дзякуючы маёй … ты з дзецьмі). Партыя верыла, што яна знайшла вернага чалавека для с… нацыянальна-сацыялістычнай праграмы дзеянняў. У гэты час я працаваў для … цыянальнай чыгункі. Абапіраючыся на маю работу, я стаў членам Нацыяна… най сацыялістычнай Германскай Рабочай Партыі 1 чэрвеня 1941 года.

Мне таксама паабяцалі, што я захаваю сваю веру, але пасля таго як я ста… членам партыі, мне забаранілі ўтрымліваць нядзельную школу. Гэта быў пер… ўдар. Я вымушаны быў маўчаць і адкласці маю любімую работу ўбок.

Я быў перакінуты ў мястэчка Параф'янава ў Польшчу, каб працаваць … упраўляючым. Гэта было 9 лютага 1942 г. Сярод іншых там было 247 яўрэ… мужчын, жанчын і дзяцей. Яўрэі павінны былі выконваць розную работу, ува… гуле яны жылі ў закрытым гета. Мы, немцы (4 чалавекі), былі замацаваны … поварам-яўрэйкай па імені Дола, прыгожай маладой дзяўчынай з рыжы… валасамі. Мае салдаты не адносіліся да яе з дастатковай павагай, бо яна была … іх перш за ўсё яўрэйкай. Але хутка яна заўважыла, што ёсць нехта, хто адносіцц… да яе з любоўю, і мы сталі сябрамі, хоць ніхто гэтага не заўважаў.

Аднойчы я захварэў на грып. Дола паклікала да мяне яўрэйскага фармацэўта … Бэлзіна, які здабыў для мяне цудоўнае лякарства. Мае падпарадкаваныя салда… ты пачалі насміхацца з мяне, з сяброўства з яўрэйкай, пачалі крытыкаваць і вы… казваць незадаволенасць. Калі я паправіўся, я першы раз наведаў гета. Наве… ванне гета было забаронена, і за гэта маглі пакараць. Дзякуючы маёй хвароб… мне было дазволена хадзіць у аптэку, якая была размешчана ў гета.

Такім чынам я наведаў аптэкара і быў удзячны сустрэчы з такімі цудоўны… людзьмі: яўрэйскімі жанчынамі Марыяй (дачкой Белзіна), Рытай (настаўніцай … і Лілі (настаўніцай фартэпіяна), таксама з сям'ёй Аэрона. Гэтыя людзі расказал… мне аб сваіх праблемах і трывогах. Перад маімі вачыма паўставалі расказы то… пра адно, то пра другое гора. Гэтым яўрэям, як маладым, так і старым, выдавал… норму ў 300 г хлеба ў тыдзень, гэта, і нічога больш з месяца ў месяц. Жабрацтва … гэтых бедных людзей стала відавочным для мяне. Цяпер я стараўся як мог дапа-

магчы ім. Я быў вельмі шчаслівы, калі да нас далучыўся новы падначалены салдат, які падзяляў мае погляды. Ён рашуча кінуўся дапамагаць гэтым бедным людзям. Мы былі вымушаны рабіць гэта вельмі асцярожна, бо маглі наведваць яўрэяў толькі позна вечарам, хоць яны былі кожны раз вельмі рады, калі мы прыходзілі. Я заўважыў, што іх трывогі растуць з кожны днём, таму што яны дзесьці чулі гаворкі пра тое, што яўрэі будуць забіты. Кожны раз яны пыталіся: "Што будзе з намі?" Я імкнуўся растлумачыць ім, што Усявышні не пакіне іх. Дома, у сваім пакоі, я горача прасіў Бога аб дапамозе. Так, у маёй скрусе я гаварыў: "Госпадзе, я буду служыць табе верна, толькі зрабі так, каб гэтыя людзі жылі." У выніку гэтага страшэннага смутку і жабрацтва нашы адносіны сталі вельмі цеснымі. Гэта зайшло так далёка, што мы разам апускаліся на калені прасіць у нашага Айца сілы ва ўсіх справах. Аднойчы вечарам, калі я наведаў іх зноў, мы сядзелі разам і я заспяваў песню "Добрай раніцы, дабранач" пад гітару. Калі мы дайшлі да слоў "Заўтра, калі Бог пажадае, цябе разбудзіць ізноў..." Рыта заплакала і сказала: "Я адчуваю штосьці дзіўнае". Апошнія словы, якія яна сказала, патанулі ў слязах. Гэта была апошняя ноч яе маладога жыцця.

Раніцай наступнага дня мы раптам пачулі, што гета было захоплена СС. Яўрэяў сабралі разам і выгналі на вуліцу. Тут яны павінны былі зняць абутак, паліто і курткі. Яны пачалі плакаць. Чатырнаццацігадовы хлопец паспрабаваў збегчы, аднак яго забілі. У адказ адзін яўрэй вельмі абурыўся і пачаў лаяць СС, аднак яго жорстка збілі і вымушаны былі несці на насілках. Людзей з вёскі прымусілі выкапаць вялікую яму і кожны, — дзеці і жанчыны, маладыя і старыя, павінны былі легчы тварам у зямлю. Сярод гэтых няшчасных людзей была жанчына, якая нарадзіла дзень назад. Яна была першай, хто пайшоў да магілы. Я бачыў, як яна кавыляла, гайдаючыся, і несла на руках амаль голае дзіця. Яна плакала і маліла пакінуць яго жывым. Яе груба штурхнулі ў яму і затым забілі.

Я як мага хутчэй пайшоў у свой пакой, зноў і зноў чуў выстралы, зваліўся на ложак. Зараз я страціў усё. Я ішоў за Бога 28 гадоў, і зараз адбылося гэта жудаснае здарэнне. Я верыў амаль да апошняй гадзіны, што Бог захавае гэтых людзей у выніку маёй малітвы, але потым пракляў Бога і ўсіх людзей.

Я жадаў поўнага забыцця. Пакінуты Богам і ўсімі людзьмі, я выконваў свае абавязкі ў поўнай апатыі і не ведаў, што будзе са мной далей.

Мае падначаленыя, за выключэннем С., называлі мяне баязліўцам і любіцелем яўрэяў. Яўрэі былі расстраляныя паўсюдна: у Глыбокім, Докшыцах, Будславе і Круляўшчызне. Калі я прыехаў у Докшыцы праз 10-12 дзён, то сустрэў там капітана. Першае, што ён спытаў было: "Дзе Марыя?" (Марыя была дачкой фармацэўта з Параф'янава). Я сказаў, што Марыя загінула. Капітан пачаў плакаць. Ён схапіў маю руку і сказаў: "Гэта страшная ганьба". Я не бачыў яго пасля гэтага, але ведаў, што яго сэрца сцякае крывёй. 1800 яўрэяў было расстраляна ў гэтым горадзе. Было шмат слёз. Я пабег паглядзець, што здарылася і ўбачыў яўрэяў, якія выходзілі з падземнай схованкі, каля 80 ці 100 людзей. Яны прасілі вады, іх твары былі белыя, як мел. Не ў стане сказаць што-небудзь, яны кідаліся на калені і прасілі пакінуць іх жывымі. Іх не слухалі і заганялі, як статак,

у хлеў. Я бачыў, як дзяўчынку гадоў дзесяці, якая хавалася ў сене пад навесам, была амаць поўнасцю знясілена, цягнулі ззаду за мной. Гэта бедная дзяўчынка была больш падобна да кучы касцей, чым да чалавека, і гэты вузел жабрацкага мучэння таксама кінулі ў хлеў. Я ніколі не забуду гэты страшны погляд і не змог дапамагчы сам сабе. Гэта было настолькі жудасна, што зрабіла мяне хворым на ўсё астатняе жыццё. Я не магу зразумець, як людзі могуць быць такімі звярамі. Гэтыя карціны часта бачу ноччу і днём.

Праз некалькі тыдняў мяне паслалі ў палявы шпіталь у Вілейцы па прычыне гіпертаніі. Але там я поўнасцю ўпаў духам, з той пары мне не даводзілася нікому казаць пра мае мучэнні. І гэтыя мучэнні станавіліся ўсё больш і больш цяжкімі, калі я ўявіў сабе, што я член банды забойцаў і злачынцаў, банды, якая пазбавіла б мяне жыцця, калі б я стаў пярэчыць. Такім чынам я адчуваў сябе горш і горш і мяне паслалі ў Вільню. Там у мяне знайшлі ўнутранае расстройства. Яны не ведалі прычыны і задавалі мне розныя пытанні, але я так і не сказаў ім нічога, бо не мог давяраць нікому, нават урачам. Пасля гэтага мяне паслалі дадому ў Германію ў суправаджэнні салдата. Калі я вярнуўся дадому, мой стан пагоршыўся, бо я не мог працаваць адзін, бо я мучаўся ад вельмі вялікай вагі тых падзей, якія перажыў. Праз некаторы час мясцовы камітэт партыі папракнуў мяне за ненацыянальна-сацыялістычны пункт гледжання на рэчы. Мой светапогляд быў рэлігійнай арыентацыі. Калі я хацеў пагаварыць аб маіх перажываннях, я вымушаны быў быць вельмі асцярожны, і гэта рабіла мяне вельмі хворым. Доктар Д. рашыў, што мяне лепш змясціць у інстытут. Я баяўся, што яны збіраюцца пазбавіцца ад мяне там... Карацей, я вымушаны быў легчы ў гарадскую бальніцу (клініку) для абследавання. Тут я прызнаўся ва ўсіх маіх муках доктару Л. і растлумачыў усё яму. Доктар Л. не належаў да партыі. Ён палкам зразумеў мяне і пераіў пастарацца забыцца на рэчы — тое, што было і ёсць немагчыма.

14 красавіка 1945 года да мяне раптам падышоў чалавек на вуліцы. Ён сказаў: "Я ведаю, хто Вы. Вы падрываеце работу партыі. Вы брудны сабатажнік, і гэта будзе каштаваць Вам жыцця.". Я зрабіў некалькі крокаў і ўпаў на месцы. Сведкі гаварылі, што я нешта гаварыў аб забойцах, карычневых бандытах і расстрэлах яўрэяў. Людзі думалі, што я звар'яцеў. Я заставаўся у такім стане некалькі дзён. Я быў хворы і не мог працаваць з 17 верасня 1944 года. Але зараз я поўнасцю быў знішчаны. Доктар Л. і доктар Ж. былі каля майго ложка. Калі я крыху апрытомнеў, я спытаў самога сябе:"Што я зрабіў?"

Я давяраў некаторым сем'ям і расказваў ім аб зверствах у Расіі. Ці маўчалі яны, я не ведаю. Я таксама не выдаў чалавека, які жыў далёка ад сваёй часці на працягу паўтара года, аб кім у мяне часта распытвалі. Я хаваў яго як мог. Я не мог дазволіць яму трапіць у рукі тых, хто хацеў пабудаваць так званы "рабочы рай" на крыві і касцях загінуўшых.

3 ці 4 мая, калі доктар наведаў мяне, я расказаў яму аб усім, асабліва аб Расіі. Я магу сказаць, што ён вельмі плакаў і яму было сорамна (дакумент неразборлівы).

Я не давяраў Богу ў Параф'янаве, але сёння я прасіў у яго прабачэння. Ён не быў на баку тых, хто чыніў такія несправядлівасці, і ён адкупіў тыя крывавыя справы".

Рудольф: Гэта канец пісьма. Гэта было перажытае. І дазвольце мне сказаць вам, што гэты чалавек мучыўся да самага канца, да той пары, пакуль не памёр 8 гадоў таму назад.

Бар: Ці былі ў вас сябры-яўрэі ў школе? Ці вучыліся ўвогуле яўрэі ў вашай школе?

Рудольф: Не, нікога. Пачакайце... Была адна. Яна была напалову яўрэйкай. Я пайшоў у школу ў 1936 годзе. Мы не ведалі спачатку, хто быў напалову яўрэем. Я нядоўга правучыўся ў гэтай школе. Яна ж расказвала пасля вайны, што іншыя дзеці распраналі яе дагала на вуліцы, бо пачулі, што яна напалову яўрэйка. Нават падлеткам і дзецям быў навязаны такі пункт гледжання, што яны могуць здымаць адзенне з аднакласніка і крычаць: "Яўрэй, яўрэй!" Яна і зараз жыве тут, выйшла замуж за англічаніна. Яна казала, што не хацела б выйсці замуж за немца.

Пасля запісу мы гулялі разам, і Рудольф сказаў, што яго дзеці не хацелі, каб ён куды ішоў, яны хацелі пакінуць мінулае ў мінулым. Я раптам уявіў сабе, як доўга ён зберагаў пісьмо свойго бацькі».

Гэты аповед прымушае яшчэ раз задумацца над тым, хто або што на самой справе вінавата ў трагедыі яўрэйскага народа.

Шмат людзей было забіта ў Параф'янаве. Вайцяховіч Яніна Іванаўна, якая ў той час была маленькай дзяўчынкай, расказвае, што яе бацька хадзіў адзін дзень на станцыю (самі яны жылі ў суседніх Шантарах, зараз гэта частка Параф'янава). Прыйшоўшы, ён сказаў, што, напэўна, будуць біць яўрэяў, бо ўжо выкапалі яму.

Яніна Іванаўна: «Хутка і сапраўды пачуліся стрэлы. Яўрэяў гналі ў калоне па чатыры чалавекі. Ім сказалі, што павязуць на цягніку ў Амерыку: схлусілі, каб тыя не разбягаліся і ўзялі з сабою свае грошы (у іх былі залатыя капейкі). Ішлі яны, такія шчаслівыя, але потым убачылі, што вядуць іх не на вакзал, а да выкапанай ямы. І вось гляджу я: дзяўчынка гадоў дванаццаці – чатырнаццаці ў такой яркай ружовай сукеначцы аддзялілася ад гэтай калоны і пабегла... Шмат так прабегла, амаль да нашых дамоў... А потым яе дагнала куля... Я памятаю, як яна падала... Пасля праз некаторы час да яе падышлі двое, узялі за рукі і пацягнулі. Гэтая сцэна — самы страшны ўспамін на ўсё маё жыццё...

Мал. 5. Група яўрэяў у Параф'янаве (1 ліпеня 1939). Знізу злева ў белых штанах Шлома Гейдэнсон

Пасля таго, як была праведзена аперацыя, яма так доўга

краталася… Там, відаць, было шмат не забітых, а толькі параненых. Прайшло некалькі тыдняў, і яма пачала моцна смярдзець, бо выкапана была неглыбока. І хлоркай яе сыпалі, і іншыя меры прымалі, але нічога не атрымлівалася… Нельга было схаваць сляды жорсткасці і насілля…

Вось такая сумная гісторыя».

Аднак, як аказалася, некаторым яўрэям удалося ўцячы. Мне вядомы два такія выпадкі: выратаванне Кастроляў і Гейдэнсонаў.

Пра Кастроляў я ўжо крыху ўпамінала. Хочацца яшчэ дадаць, што пасля, калі яны ўжо партызанілі, аднойчы ўвязаліся за імі немцы з сабакамі. Пачалі гнаць. Першая хата, на якую натрапілі браты, была хата Балашоў. Марыя Іосіфаўна Балаш расказвае, што яны пастукаліся ў хату і папрасілі ў яе маці схованкі. Часу думаць не было, таму тая схавала іх пад падлогай на кухні. Толькі дзякуючы гэтаму Кастролі выжылі.

Гісторыя выратавання братоў Гейдэнсонаў здаецца проста неверагодная. Іх хавалі ў сябе дзве сям'і: Півінскія і Станкевічы. У 1942 годзе ў маі праводзілася акцыя знішчэння гета. Нейкім чынам братам Шлому і Залману Гейдэнсонам пашчасціла ўцячы. Яны спачатку схаваліся ў папяроўку (спецыяльныя дошкі), пасля, ноччу, падаліся ў лес. Аднойчы браты пастукалі ў дом сям'і Півінскіх, якія жылі непадалёк ад станцыі, у вёсцы Целяшы. Гэта была рэлігійная польская сям'я, якая вырашыла прытуліць двух яўрэяў, кіруючыся гуманнымі меркаваннямі і рэлігійнымі матывамі. Півінскія ведалі сям'ю Гейдэнсонаў па даваенным часе, аднак яны не былі сябрамі. Для ратавання братоў Гейдэнсонаў члены сям'і Півінскіх зрабілі схованку на канюшні. Там Шлома і Залман хаваліся днём, ноччу яны пераходзілі ў хату. Юзэфа Півінская і яе чатыры дачкі: Міхаліна, Людвіга, Алена і Ядвіга, кожны дзень варылі і прыносілі братам ежу, даглядалі іх, з увагай і клопатам адносіліся да іх просьбаў. Шлома і Залман хаваліся ў доме Півінскіх каля года, да вясны 1943 г., але потым ім прыйшлося пакінуць схованку. Заставацца ў вёсцы было небяспечна, таму што ў Параф'янаве размясціўся нямецкі гарнізон. Аб тым, як склаўся далейшы лёс Гейдэнсонаў, сям'я Півінскіх змагла даведацца толькі пасля вайны.

Мал. 6. Медаль аб прысваенні звання Праведнікаў Народаў Свету

Для Шломы і Залмана зноў наступіў перыяд скітанняў. У чэрвені 1943 года іх прытуліла сям'я Станкевічаў, якія жылі на хутары Янавічы, за 3 км ад Параф'янава. Старэйшая дачка Станкевічаў Браніслава кажа, што ўспамінаць тое, што адбылося, без слёз ёй цяжка і цяпер. «Гэтыя хлопцы прыйшлі ноччу, пастукалі ў акно, прасілі ў мамы адчыніць дзверы. Але мама ім адказала, што Гейдэнсонаў даўно забілі: не паверыла, што гэта яны. Калі пад раніцу вярнуўся наш тата (ноччу ён пасвіў коней), ён загадаў маме схаваць габрэйскіх хлопцаў. А ў нас ў сям'і было пяцёра дзяцей. Шостым мама хадзіла цяжарная. Яна роспачна плакала, казала, што ўсіх нас

заб'юць. І нас, і Гейдэнсонаў. Але бацька стаяў на сваім. Адказаў, што калі ёсць Бог, дык выратуемся і мы, і яны. Браты хаваліся ў нас на гарышчы хлява. Там зрабілі два шчыты, а паміж імі паклалі сена. Зрабілі адтуліну, каб ноччу можна было перадаваць ім ежу. Зімой грэліся ў зямлянцы, дзе захоўвалася бульба. Бацька цепліў лазню, як быццам сушыць лён.

Мал. 7. Сям'я Гейдэнсонаў, ЗША

Нам, дзецям, бацькі не казалі, дзе знаходзяцца "пастаяльцы". Аднойчы мы заўважылі, што мама некуды носіць ежу, і запыталі, куды гэта яна. Яна адказала, што ежа — для сабакі. А мы ж тады самі паўталодныя хадзілі. Пасля мама прызналася, каму носіць ежу, і нават даверыла гэту справу нам. Страшна было. Прыйдуць немцы, я сяджу на печы, здаецца, зараз нас усіх пастраляюць. Меншыя дзеці не ведалі, што яны хаваюцца. Баяліся, што скажуць некаму.

Былі яны ў нас 1 год і 4 месяцы».

Частыя паходы дзяцей на канюшню не выклікалі падазрэння ў суседзяў. У пачатку 1944 года фашысты загадалі сям'і Станкевічаў пакінуць дом. Станкевічы звязаліся з партызанамі і пераправілі ў атрад братоў Гейдэнсонаў. Аднак праз дзень Шлома вярнуўся ў дом і расказаў Івану і Марыі, што яго брат Залман загінуў. Магчыма, партызаны падазравалі яго ў шпіянажы. Тады старэйшая дачка Браніслава накіравалася ў лес на пошукі другога партызанскага атрада. 11-гадовая дзяўчынка прайшла праз мноства нямецкіх пастоў, перш чым наткнулася на атрад, дзе сярод партызан былі і яўрэі (у тым ліку і Кастроль). Браніслава высветліла, што група згодна прыняць у свае рады яўрэйскага хлопца. Дзяўчынка дамовілася аб месцы і часе сустрэчы, і хутка Шлома Гейдэнсон стаў членам партызанскага атрада.

Пасля вайны ён выехаў у ЗША, а яго сын стаў амерыканскім кангрэсменам. Пачалі перапісвацца. Некалькі гадоў назад сын выратаванага Шломы, Сэм Гейдэнсон, па просьбе бацькі прыязджаў у Беларусь. Ён наведаў родныя мясціны бацькоў і абедзве сям'і, якія выратавалі яго бацьку. Сёння Браніслава з сястрой і іншыя родныя Станкевічаў і Півінскіх чакаюць Сэма ў госці.

Сэм Гейдэнсон, член Амерыканскага кангрэса, звярнуўся з хадатайствам у інстытут «Яд Вашэм» аб прысваенні звання Праведнікаў Народаў Свету гэтым высакародным людзям. Іх маці не дажыла да гэтай падзеі. Месяц назад ва ўзросце 93-х гадоў яна памерла, і званне праведніка народаў свету ёй прысвоена пасмяротна. У Ізраілі ёсць пасаджаныя дрэвы ў гонар кожнага з тых, хто дапамагаў выратавацца Гейдэнсонам, зорка, названая іх іменем.

Пасол ЗША ў Беларусі Майкл Козак у гутарцы з карэспандэнтам "Белорусская деловая газета" сказаў, што кангрэсмен Сэм Гейдэнсон прасіў перадаць сваю ўдзячнасць за выратаванне яго і за яго асабістае жыццё, якога проста не было б, калі б не ўчынак мужных беларускіх жанчын.

... Зараз на месцы трагічнай гібелі яўрэяў у Параф'янаве стаіць памятны знак. На яго адкрыццё прыехалі прадстаўнікі Мінскай яўрэйскай абшчыны, члены рэспубліканскаа камітэта па ўвекавечанні памяці ахвяр Халакосту. Сам знак уяўляе сабой рассечаны камень з пазалочаным надпісам, увасабляе абарванае жыццё, каштоўней за якое няма нічога на свеце.

Ад аўтара

Мая родная зямля! Няўжо на ёй, такой прыгожай і блакітнавокай ад азёр і рэк, такой спакойнай і памяркоўнай, тварыліся такія жорсткія злачынствы, якія розумам не ўсвядоміць. Здаецца, чуецца крык бязвінных ахвяр, маленькіх дзетак, іх мацярок... Зямля варушылася... Па дзесяцігадовай дзяўчынцы стралялі... Білі, забівалі, катавалі, палілі... Божа, якія страшныя словы! Якія жудасныя падзеі стаяць за гэтымі словамі.

Няма даравання, няма літасці забойцам людзей.

Таццяна БАХАНКО

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Кузьміч В. А., загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік адукацыі Беларускай ССР, выдатнік адукацыі

НЕЗАБЫЎНАЕ

Ліпеньскаяя раніца 1941 года. Над зямлёю цішыня. Спяць людзі, не чуваць спеву птушак. І раптам ранішнюю цішыню разрывае грохат гармат. Фашысцкія полчышчы абрушыліся на нашу Радзіму, змятаючы ўсё на сваім шляху.

Вялікая Айчынная вайна была адной з самых страшных і бязлітасных войн, якія калі-небудзь праносіліся над Беларуссю. Кожны трэці беларус загінуў, сотні вёсак было спалена разам з жыхарамі, сотні гарадоў пераўтворана ў руіны.

Я чытала шмат кніжак пра вайну. У школе нам таксама шмат расказвалі. Хочацца праўды. Значна важней нам, хто не бачылі жахаў вайны, знаць пра тое, як жылі людзі ў час блакады, які быў іх лёс.

Мой тата калісьці мне расказваў, што яго бабуля ў час вайны бачыла, як вялі яўрэяў на расстрэл. Яўрэяў было каля пяцісот чалавек, а паліцаяў было толькі пяць. Людзі, якія бачылі гэта, казалі яўрэям: «Уцякайце. Ніхто не заўважыць. Паліцаяў толькі пяць». На што яны адказалі: «У нас лёс такі. Нас павінны расстраляць».

Гэта гісторыя мяне вельмі ўразіла. Я не магу зразумець, чаму яны не хацелі захаваць сабе жыццё, чаму яны так адносіліся да свайго лёсу.

Гэта адбылося на Гродзеншчыне ў г. п. Мір. Сама я з Нясвіжскага раёна, г. п. Гарадзея. У мяне з'явілася жаданне даведацца, які лёс быў у яўрэяў на Нясвіжчыне, чаму яны так скараліся абставінам.

Даследуючы архіўныя матэрыялы, артыкулы газет, апытваючы людзей, я даведалася аб вельмі горкіх і балючых фактах знішчэння яўрэяў падчас вайны. Пра гэта павінны ведаць усе, каб ніколі фашызм і яго праявы не мелі месца на нашай зямлі.

ЧЫТАЙЦЕ,
УСЛУХОЎВАЙЦЕСЯ,
ДУМАЙЦЕ,
АНАЛІЗУЙЦЕ,
НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ,
НЕ ДАПУСКАЙЦЕ,
ПАЎТАРЭННЯ
СТРАШНАГА ЛЁСУ
ЯЎРЭЙСКАГА НАРОДА
ПА ВІНЕ НЕЛЮДЗЯЎ,
ВЫРАДКАЎ РОДУ ЧАЛАВЕЧАГА.

Генацыд яўрэйскага насельніцтва на Нясвіжчыне

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, якая была накіравана да насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася як збаўленне ад «яўрэйскага бальшавізму».

Паводле ўказання Гітлера фашысцкія верхаводы летам 1941 г. пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэта «канчатковае рашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў выкананне гэтай праграмы, фашыстамі было забіта 6 млн. яўрэяў, што складала 1/3 частку яўрэяў усяго свету (Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401 – 402).

Палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю праводзілі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Нясвіжчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя, паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і «вырашэнне яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму. Яны вызначаліся асобай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялялі яўрэяў ад мясцовых жыхароў, заганялі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся ўсюды: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Гродне, Жлобіне, Лідзе, Мінску і іншых гарадах і мястэчках. У асноўным гета ствараліся закрытага тыпу. Іх тэрыторыі абносіліся калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй.

Яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства, кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадзянскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, наведваць школы.

Для яўрэяў было ўведзена абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў, якімі былі шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі.

Амаль да ліквідацыі гета яўрэі павінны былі прымусова выконваць работу на акупантаў, пры якой многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы.

У Занальным Дзяржаўным архіве г. Баранавічы захаваўся акт Нясвіжскага гарсавета, падрыхтаваны для прадстаўлення ў суд над фашысцкімі злачынцамі ў Нюрнберг. У ім дадзены агульныя звесткі аб колькасці расстраляных жыхароў Нясвіжа ў час акупацыі горада нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 5410 чалавек 3700 — асобы яўрэйскай нацыянальнасці.

1 верасня 1941 г. яўрэям Нясвіжа загадалі пакінуць свае жылыя кварталы, якія знаходзіліся ўздоўж цэнтральных вуліц, і пераехаць у перавулкі. 18 кастрычніка на базарнай плошчы сабралі ўсіх мужчын яўрэйскай нацыянальнасці. З іх выбралі 200 заложнікаў і запатрабавалі ў якасці выкупу тавары і вырабы са скуры. Жыхары горада прынеслі ўсё, што патрабавалася. На наступны дзень немцы зноў запатрабавалі выкуп, але на гэты раз 0,5 млн. руб. 2,5 кг золата. З дапамогай жыхароў горада грошы і золата былі сабраны.

Восенню 1941 г. ў парку каля замка Радзівілаў фашысты расстралялі 1500 яўрэяў — мірных жыхароў Нясвіжа і яго наваколля.

Шулім Халяўскі, былы жыхар Нясвіжа, якому цудам удалося выжыць падчас карных акцый фашыстаў, адзін з арганізатараў і актыўны дзеяч яўрэйскага супраціўлення і партызанскай барацьбы ў лясах Беларусі ў кнізе «Салдаты з гета» падрабязна апісвае падзеі гэтага часу: «30 кастрычніка 1941 года ў 8 гадзін раніцы ўсім яўрэям Нясвіжа было загадана сабрацца на плошчы "для праверкі дакументаў"». Праз гадзіну, калі на плошчы сабралі ўсё яўрэйскае насельніцтва, нямецкі камендант пачаў называць прозвішчы людзей адпаведна іх заняткаў. Сярод рамеснікаў ён адбіраў высокакваліфікаваных спецыялістаў. Усяго было выбрана 585 чалавек, іх перавезлі на двор гімназіі. Астатніх раздзялілі на дзве калоны. Адна была накіравана да палацавага комплексу Радзівілаў, другая ў бок Гарадзеі. У хуткім часе ў гімназію прыйшоў нямецкі салдат, выбраў некалькі чалавек для работы ў нарадзе. Сярод іх была і Зелда Дэймсек. Пазней яна ўспамінала: «Нам загадалі сесці ў грузавік, які стаяў каля гімназіі. Калі мы пераехалі на другі бок базарнай плошчы, то зразумелі, што нас вязуць да замка Радзівілаў. Уздоўж дарогі, па абодвух баках, мы бачылі нашых сяброў, крочыўшых пад наглядам нямецкіх салдат. Не даязджаючы да касцёла, машына спынілася, бо праехаць было немагчыма. Яўрэяў піхалі на сярэдзіну дарогі, маўклівых і пакорных. Мы пачулі пакутлівы крык дзіцяці, які яўна крычаў ад голаду. Аднаму з салдат гэты крык надакучыў і ён пачаў сварыцца. Я невялікага росту і мала бачыла, што адбывалася, але я чула, як людзі каля мяне казалі: "Немец схапіў дзіця, а потым задушыў яго". Крык нечакана заціх». Надзеі выжыць не засталося.

У Нацыянальным інстытуце памяці Катастрофы і Гераізму «Яд Вашэм» у Іерусаліме захоўваюцца сведчанні відавочцы гэтай трагедыі Томаша Іосіфавіча Скрыцкага: «Прыйшоўшы ў парк, я ўбачыў на паляне жудасную карціну. На гэтай паляне быў выкапаны роў памерам 30-50 м даўжынёй і 3 м шырынёй, які быў даверху запоўнены трупамі расстраляных, сярод якіх было шмат дзяцей. Сярод забітых былі яшчэ і жывыя, і я доўга чуў стогны і крыкі, якія раздаваліся з гэтага рова. Так, я дагэтуль памятую крык адной дзяўчынкі: "Тата, навошта ты на мяне ціснеш?!" Тут знаходзіліся нямецкія салдаты і паліцэйскія, якія дабівалі людзей, што падавали прыкметы жыцця. Нас расставілі вакол гэтага рова і загадалі закопваць яго. Калі мы засыпалі, то праз зямлю стала праступаць кроў. Яе было так многа, што ручай цёк у возера, і вада каля берага стала чырвонай».

Старажылы Нясвіжа ўспамінаюць, што ніякага супраціўлення з боку яўрэяў не было. Перад расстрэлам іх сабралі на плошчы, рабін у сваім выступленні заклікаў да пакорнасці, пераконваў спакойна прыняць смерць, таму што гэта выпрабаванне ад Бога.

Адначасова фашысты правялі яшчэ адну акцыю масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва. На паўднёва-ўсходняй ускраіне горада, на дарозе Нясвіж — Сноў — Баранавічы (у раёне аўтадрома) былі па-зверску забіты яшчэ 1200 чалавек.

Амаль адразу пасля гэтых злачынстваў яўрэяў, якія знаходзіліся на тэрыторыі гімназіі, абавязалі пераехаць у гета, якое знаходзілася ў цэнтры Нясвіжа, мяжа праходзіла па цяперашніх вуліцах 1 Мая, Пушкіна, Савецкай, К. Лібкнехта. З жыхароў горада былі створаны брыгады для збору маёмасці ў апусцелых яўрэйскіх дамах і перадачы яго на нямецкія склады.

У архіве Яўрэйскага інстытута ў Варшаве ёсць цікавыя звесткі, пакінутыя Ш. Халяўскім, пра паўстанне ў Нясвіжскім гета (дарэчы, гэта было першае паўстанне яўрэяў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны). Супастаўляючы гэтыя сведчанні, матэрыялы яго кнігі і заявы ад 12 кастрычніка 1998 г., дасланай у Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік «Нясвіж», вырысоўваецца дастаткова поўная карціна жыцця ў гета.

«Адразу пасля засялення ўсіх яўрэяў пачала хваляваць думка аб самаабароне. І моладзь, і людзі старэйшага ўзросту пагадзіліся з тым, што нельга дапусціць паўтору асенняй (1941 г.) акцыі, нельга дазволіць паслухмяна весці сябе на смерць. Быў створаны савет рабочых (арбайтэррад), у які ўваходзілі прадстаўнікі цэхаў. Сярод іх Склар (Гароднія), Натан Масар (А-Шомер-а-Цаір), Барэнштэйн (Поалей Цысн), Халяўскі, Фарфэль, Ляхавіцка (А-Шомер-а-Цаір), Пік (А-Халуц) і інш. (У дужках пазначаны партыі, да якіх належалі гэтыя людзі.) Савет рабочых быў сапраўдным легальным штабам антыфашысцкага падполля, якое дзейнічала ў гета. Яго галоўнай мэтай было садзейнічанне падполлю ў падрыхтоўцы яўрэйскага насельніцтва да супраціўлення нямецка-фашысцкім захопнікам, да паўстання. Пазней быў выбраны выканаўчы камітэт цэхаў. У яго ўваходзілі галоўным чынам члены падполля — Мэсэр, Барнштэйн, Голдберг, Фарфэль, Х. Ляховіцка, Ерахлшэль, Ш. Халяўскі і інш. Гэта была

значная альтэрнатыва юдэнрату (савету яўрэяў), які меў сувязь з новымі ў
і не ставіў задачай падрыхтоўку яўрэйскага насельніцтва да адпору фашы
Старшынёй юдэнрата быў варшаўскі адвакат Магаліф. Здольны арган
ён супрацоўнічаў з моладдзю, але не меў поўнага даверу з яе боку. За не
тыдняў да канца гета, у ліпені 1942 г. юдэнрат быў перавыбраны. Стар
пакінулі ранейшага. Аднак і новавыбраны савет яўрэяў не знайшоў падтр
сярод насельніцтва гета.

17 ліпеня 1942 г. былі знішчаны яўрэі ў г.п. Гарадзея (14 км ад Нясвіжа).

18 ліпеня юдэнрат склікаў усіх яўрэяў у сінагогу. Старшыня паведаміў а
трагедыі Гарадзейскага гета. Усе плакалі, маліліся. Магаліф пераконваў пры
ных нічога не распачынаць.

19 ліпеня немцы зайшлі ў гета па бялізну, якую аддавалі яўрэям мыць. М
чыны з горада прыходзілі па рэчы, гаворачы, што ўсё роўна пасля знішча
немцы забярушь сабе.

20 ліпеня прыехалі літоўскія паліцэйскія. Пасля абеду таго ж дня ўлад
паведамілі юдэнрату, што з гэтага часу гета будзе ахоўваць літоўская паліц
У сувязі з гэтым зноў склікалі сход у бажніцы, на якім гучаў заклік да самаа
роны. Спецыяльна былі скліканы ўсе яўрэі, якія калі-небудзь служылі ў ар
Вызначылі пункты абароны: у месцах, дзе лепш разбурыць агароджу гета. К
мёт устанавілі на даху сінагогі. Усе павінны былі мець напагатове сваю збро
Вызначылі штаб, які падпальваннем стога сена павінен быў даць сігнал пачаць
барацьбы. Але вечарам літоўскія паліцэйскія не прыйшлі, паўстанне сарвалася.

На світанку 21 ліпеня ў гета з'явіліся немцы. Яўрэяў пачалі групаваць каля
бажніцы. Некаторыя ўвайшлі ў сінагогу. Старшыня юдэнрата Магаліф сказаў
"Яўрэі, ведаю, што не давяралі мне, думалі, што я вам здраджу. У апошнюю
хвіліну я з вамі і першы са сваёй сям'ёй іду на смерць". Немцы сказалі, што аб
бярушь малых у рабочы лагер. У гэты час з боку фашыстаў пачуўся выстрал
Яўрэі, якія сталі ў калоне, разбеглiся, пачалі хапаць зброю. Тыя, што мелі бензін
падпалілі гета. Дукер пачаў страляць з кулямёта ... Сам бачыў, як урач Кесаль
у пылаючым гета, сярод крыкаў яўрэяў, што нападалі з люгасцю на немцаў, ся-

род плачу згубленых дзяцей рабіў параненым перавязкі; як Якаб і Клячко забілі гарадскога паліцэйскага Чыжыка ... »

Пад вечар Шуліму Халяўскаму ўдалося выбрацца за межы гета, уся тэрыторыя якога была ўсеяна трупамі. Немцам не было над кім праводзіць акцыі расправы ...

Як сведчаць факты, атрыманыя з Занальнага Дзяржаўнага архіва ў г.Баранавічы, трупы

расстраляных закопвалі на месцы, а частку звозілі ў Альбянскі лес (5 км ад Нясвіжа). З рассказаў старажылаў горада стала вядома, што некалькі соцень яўрэяў, якія загінулі ў гета, пахавалі ў пачатку вуліцы Сноўскай (у раёне складоў вайсковай часці).

У сведчаннях Ш. Халяўскага ёсць звесткі, што ўратавацца ўдалося толькі 25 яўрэям. Большасць з іх не дажылі да дня вызвалення. Падчас паўстання было забіта і паранена 40 немцаў і іх памочнікаў.

У 1965 г. астанкі расстраляных са Старога парка былі перапахаваны на гарадскіх могілках. Тут устанавілі стэлу і надмагілле, а на месцы загубы — мемарыяльны знак. Дарэчы, дату, выбітую на помніку, неабходна выправіць на восень 1941 года.

У 1993 г. ў раёне аўтадрома ўстаноўлены помнік 1200 расстраляным.

З успамінаў Хмяльніцкага Паўла Іванавіча:

«Гэта трагедыя адбылася ў пачатку вайны ў мястэчку Гарадзея Нясвіжскага раёна.

Немцы прыйшлі на нашу вуліцу 17 верасня і пачалі выганяць яўрэяў з хат. Мужчын, жанчын, дзяцей і нават грудных дзетак, якіх трымалі на руках. Іх пастроілі ў калону. І немцы з аўтаматамі і з сабакамі пагналі іх на могілкі. Да яўрэяў нікога не падпускалі.

Мне было тады чатырнаццаць гадоў. І я разам са сваімі сябрамі з другога боку прабраўся на могілкі. Мы ціха пазалазілі на дрэвы і назіралі, як немцы пазверску распраўляюцца з гэтымі людзьмі.

Іх прыгналі на могілкі і прымусілі капаць вялікую яму. Калі яма была гатова, немцы расставілі яўрэяў вакол ямы, і пачалі па іх страляць. Пачуліся крыкі, стогны.

Яўрэі пападалі ўсе ў гэтую яму, а немцы прысыпалі іх і паехалі.

А мы пазлазілі з дрэў і пайшлі паглядзець на тую яму. Калі падышлі, то было такое адчуванне, што зямля жывая і што ёй вельмі балюча.

Цяжка зразумець, чаму так адносіліся да гэтых людзей і чым яны адрозніваліся ад іншых. Цяжка ўспамінаць пра ўсё гэта. Шмат часу ўжо прайшло. Але мы не павінны забывацца пра гэта, таму што перамога нам дасталася нялёгка. Многія людзі аддалі за яе жыццё. Мы не павінны забывацца пра гэта, каб зноў не паўтарылася вялікая трагедыя».

Заключэнне

Угледзьцеся ў фотаздымкі, у тыя камяні і каменьчыкі. Бацькі і дзеткі, якія пакорліва прынялі смерць. Але ж ці была магчымасць выратавацца, калі паўсюль праводзілася агідная нечалавечая палітыка знішчэння аднаго з найталенавіцейшых народаў на зямлі.

Добра, што на маёй Нясвіжчыне людзі захавалі памяць пра сваіх аднавяскоўцаў, сяброў. Царква і касцёл у асобах сваіх прыхажан памінаюць

бязвінныя ахвяры. Помнім і мы, маладое пакаленне. Помнім, каб не паўтарылася жудасная трагедыя.

Помнім, бо бяспамяцтва раўназначна смерці. Нашы равеснікі пазбаўляліся жыцця; маленькіх дзетак зажыва кідалі ў ямы; старых жорстка забівалі ... За што? Па якім законе? Хто яны, гэтыя людзі? А ці людзі? Нелюдзі. Так называюць у Беларусі людзей, якія страцілі чалавечы воблік. Ім няма даравання ніколі ні ад Бога, ні ад людзей. Пачвары. Так называюць выradкаў роду чалавечага.

Мемарыяльны знак
на месцы загубы фашысцкімі захопнікамі
яўрэйскага насельніцтва
Адкрыты 18 ліпеня 2004 г. ў г. п. Гарадзея.
У час вайны было забіта 1174 яўрэі г. п. Гарадзея.





Зміцер ІСАЕЎ

Студэнт факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Пераможца II Рэспубліканскага конкурсу «Халакост. Гісторыя і сучаснасць. Урокі талерантнасці» (II месца).

Кіраўнік: Кузьміч В. А., загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік адукацыі Беларускай ССР, выдатнік адукацыі

Катастрофа яўрэяў на Беларусі

Халакост і Барысаўшчына

Прырода стварыла людзей роўнымі ў адносінах да фізічных і разумовых здольнасцей.

Томас Гобс

Знішчэнне яўрэяў на акупіраванай тэрыторыі было адной з галоўных мэт Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. У іх фізічным знішчэнні нацызм разумеў як сродак для разбурэння савецкай дзяржавы і падрыхтоўкі яго да нямецкага асадніцтва. Нацысцкае кіраўніцтва ўяўляла яўрэяў як ворагаў нямецкага народа, а бальшавізм — як утоеную форму яўрэйскай дыктатуры. Галоўным вынікам Другой сусветнай вайны Гітлер абвясціў знішчэнне яўрэйскай расы ў Еўропе, а затым і ва ўсім свеце.

Заключэнне 23 жніўня 1939 г. Дагавора аб ненападзе паміж дзвюма краінамі (пакт Молатава-Рыбентропа) прывяло да замоўчвання палітыкі Германіі ў дачыненні да яўрэяў. Чырвоная Армія мела на ўзбраенні дактрыну наступальнай, а не абарончай вайны, мяркуючы тэатр ваенных дзеянняў на чужой тэрыторыі. Таму спецыяльныя мерапрыемствы па эвакуацыі насельніцтва адсутнічалі. З пачаткам вайны Беларусь апынулася на галоўным маскоўскім кірунку прасоўвання войскаў «Цэнтр», месцам жорсткіх баёў. Імклівасць нямецкага наступу перашкодзіла ўцёкам большасці яўрэяў, якія не вылучалі сябе з ліку савецкіх грамадзян. У нядаўна далучаных абласцях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, Прыбалтыкі і Бесарабіі савецкія памежнікі перашкаджалі насельніцтву пераскаць «старую мяжу». Вельмі важную ролю іграў фактар часу, які дапамагаў усвядоміць пагражаючую небяспеку. Мінск быў акупіраваны 28 чэрвеня 1941 г., а яго кіраўніцтва таемна пакінула горад яшчэ ўвечар 24 чэрвеня 1941 г. без аб'явы эвакуацыі. У выніку там загінула амаль 100 тыс. яўрэяў. У Віцебску загінула каля 20 тыс. яўрэяў з 37 тыс. (акупіраваны 11 ліпеня 1941 г.), у Магілёве — 10 тыс. з 20 тыс. (27 ліпеня 1941 г.), у Гомелі — 4 тыс. з 40 тыс. (19 жніўня 1941 г.).

Менавіта ў Беларусі быў упершыню на практыцы апрабаваны нацысцкі механізм пагалоўнага знішчэння яўрэяў. Разам з тым шматлікія гета сталі галоўнымі месцамі супраціўлення. Падпольныя арганізацыі існавалі ў гета Мінска, Баранавічаў, Бабруйска, Брэста, Гродна, Слоніма, Вілейкі і іншых гарадоў. Вязні

мелі сувязь з партызанамі, збіралі медыкаменты, зброю, боепрыпасы, аператыўныя звесткі, выводзілі ў лес баяздольную моладзь. У шэрагу гета напярэдадні масавых расстрэлаў успыхвалі паўстанні: у Нясвіжы (22 ліпеня 1942 г.), Міры (9 жніўня 1942 г.), Лахве (3 верасня 1942 г.), Камянцы (9 верасня 1942 г.), Тучынку (23 верасня 1942 г.), Клецку (21 ліпеня 1943 г.). Узброенае супраціўленне аказалі вязні гета ў Глыбокім, Кобрыне, Навагрудку, Ляхавічах і ў іншых месцах.

Вялікую ролю ў выратаванні яўрэяў сыграў партызанскі рух. Аднак да вясны 1942 г. становішча саміх партызан было адчайным. Разрозненыя і нешматлікія атрады хаваліся ў цяжкадаступнай мясцовасці, не карысталіся падтрымкай насельніцтва, не мелі неабходнай сілы, сродкаў сувязі і агнявой моцы. Сустрэчы з партызанамі не заўсёды азначала выратаванне для яўрэяў. У іх часта бачылі цяжар. Старыя, жанчыны, дзеці, хворыя і знясіленыя людзі не былі прыстасаваны да жыцця ў лесе і скоўвалі дзеянні партызан. Яўрэяў, з прычыны неверагоднасці іх выратавання, часам прымалі за нямецкіх шпіёнаў, падасланых атруціць студні і ліквідаваць кіраўнікоў партызан. Нягледзячы на тое, што шматлікія партызаны былі салідарныя з яўрэямі, бачылі ў іх таварышаў па зброі, усё ж антысемітызм дзе-нідзе ў іх асяродку захоўваўся. У гады вайны кіраўніцтва з Масквы рабіла стаўку на рускі патрыятызм, што ўзмацняла нацыяналістычныя элементы ў савецкай ідэалогіі. Па-свойму гэта знайшло выражэнне ў дзейнасці партызан на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

Яўрэі, якія здолелі ўцячы з гета, папоўнілі цэлы шэраг атрадаў беларускіх партызан. Яны ўдзельнічалі ў баявых аперацыях, «рэйкавай вайне», засадах, выконвалі агентурныя заданні, збіралі інфармацыю, займаліся прапагандысцкай дзейнасцю, былі лекарамі, збройнікамі, радыстамі, нарыхтоўвалі прадукты, працавалі ў партызанскіх пральнях, шавецкіх і кравецкіх майстэрнях, даглядалі параненых. Адной з форм гэтай барацьбы сталі яўрэйскія сямейныя лагеры і атрады, якія не мелі аналагаў у іншых краінах Еўропы. Ідэя іх стварэння належала Анатолію Бельскаму з Навагрудка, які арганізаваў уцёкі вязняў з цэлага шэрагу гета Заходняй Беларусі ў Налібоцкую пушчу. Яшчэ адзін буйны яўрэйскі лагер быў створаны ў 30 км ад Мінска. Ім камандаваў Шалом Зорын. Галоўнай іх задачай было не толькі супраціўленне нацыстам, але і выратаванне яўрэяў. Шмат сямейных лагераў панеслі вялікія страты і былі нарэшце знішчаны. Іншая іх частка здолела пратрымацца і выжыць.

На складзе ўдзельнікаў супраціўлення адбіваўся шматнацыянальны характар насельніцтва рэспублікі. У яе заходніх раёнах паўсталі польскія, беларускія і змешаныя беларуска-польскія атрады. У кожным з іх прысутнічалі яўрэі. Частка польскіх антыфашысцкіх груп падтрымлівала беларускіх партызан. У той жа час Армія Краёва (Armia Krajowa) і групоўка «Народныя ўзброеныя сілы» (Narodowe Sily Zbrojne) дзейнічалі самастойна. Яны ставіліся да яўрэяў як да прасавецкага элемента. Вясной і летам 1943 г. ад іх пацярпелі яўрэі ў пушчах Ліпічаны, Налібокі, лясах Рудзенска, Нарачы і Бранска.

Неад'емнай часткай гісторыі Катастрофы з'яўляецца лёс яўрэйскіх дзяцей. Адсутнасць жыццёвага досведу і фізічных сіл рабілі іх найбольш безабароннымі. Дзеці ў поўнай меры адчулі антысемітызм. Яны не маглі растлумачыць яго пры-

роду, але адчувалі, што ім жудасная доля наканавана. Смерць пагражала «мяшанцам» — дзецям ад змешаных шлюбаў яўрэяў і неяўрэяў, выдачы якіх патрабавалі нацысты. У той жа час дзеці валодалі несумнеўнымі перавагамі перад дарослымі, хутчэй рэагавалі на перамену сітуацыі. Імкненне да выжывання было часта значна вышэйшым, чым у дарослых, а навыкі паводзін, якія яны засвойвалі, — больш дзейснымі. Не выпадкова партызаны часта выкарыстоўвалі дзяцей у якасці правадыроў, выведнікаў, сувязных, якія пранікалі ў гета і выводзілі ў лес сталых людзей.

Ваенныя дзеянні ў Беларусі пазбавілі прытулку каля трох мільёнаў чалавек. Яўрэі зведвалі асаблівыя цяжкасці, у большасці выпадкаў гэта былі адзіночкі, якія страцілі сваіх блізкіх, удовы, дзеці і старыя. Сваякі іх былі расстраляны ў гета або не вярнуліся з фронту. Яны не мелі маёмасці, нават элементарных рэчаў для вядзення хатняй гаспадаркі. Хаты і кватэры, якія належалі раней яўрэям, былі разбураны, згарэлі або былі разрабаваны, іншыя — самавольна занятыя неяўрэямі або дзяржаўнымі арганізацыямі. Даказаць сваё права на домаўладанне перашкаджала адсутнасць неабходных дакументаў, згубленых у гады вайны. Аднаўленне справядлівасці правоў ўласнасці яўрэяў стала важнай умовай іх адаптацыі да мірнага жыцця.

У пасляваенныя гады яўрэі сутыкнуліся з праблемай замоўчвання Халакосту і адмаўленнем іх укладу ў перамогу над Германіяй на фронце і ў тыле. Чыніліся неабгрунтаваныя перашкоды па ўвекавечванні памяці родных і блізкіх. Пахаванні, звязаныя з генацыдам, у шматлікіх месцах не былі адзначаны. Стандартныя помнікі на брацкіх магілах, усталяваныя мясцовай адміністрацыяй, не змяшчалі слова «яўрэй», якое было заменена на абстрактныя «мірныя жыхары» або «савецкія грамадзяне». Калі ж сваякі загінуўшых яўрэяў праяўлялі ўласную ініцыятыву ўвекавечыць гэтую памяць, мясцовыя ўлады адмаўляліся ўсталяваць над імі дзяржаўную апеку і прадпрымалі энергічныя спробы для таго, каб прымусіць іх адмовіцца ад слоў «яўрэй» і «гета», надпісаў на ідыш, не гаворачы ўжо аб іўрыце. Падобная палітыка па захаванні памяці ахвяр генацыду праводзілася ў Расіі і Украіне.

Да канца 1980-х гг. у СССР пазбягалі тэмы Катастрофы. Традыцыі савецкага інтэрнацыялізму выключалі павышаную ўвагу да адной з нацыянальных катастроф. Лічылася, што Расія страціла столькі рускіх, Беларусь — беларусаў, Украіна — украінцаў, Грузія — грузін, Арменія — армян і г. д., што гаварыць асобна аб генацыдзе яўрэяў не прыстала. Гібель савецкіх яўрэяў разглядалася выключна ў святле супрацьстаяння Савецкага Саюза і Германіі, а тэрмін «генацыд» першыя 15 гадоў пасля заканчэння Другой Сусветнай вайны наогул не ўжывалі. Меркавалася, што «віна» яўрэяў, загінуўшых у акупацыі, складалася не столькі ў прыналежнсці да яўрэйства як такога, колькі ў іх «савецкасці».

У Беларусі, якая найбольш пацярпела ў гады вайны сярод іншых рэспублік СССР, палітыка генацыду мірных жыхароў была распрацавана дастаткова падрабязна, але пры гэтым не было прынята гаварыць аб ахвярах сярод яўрэяў. Беларуская гісторыяграфія працягвае захоўваць метадалагічную памылку,

настойваючы, што трагедыя яўрэяў з'яўлялася часткай трагедыі беларускага народа, тады як нацысты ніколі не забівалі беларусаў па этнічнай прыкмеце.

Тэма Халакосту даўно звярнула на сябе ўвагу даследнікаў. Першыя працы ў выглядзе мемуарнай літаратуры з'явіліся на ідыш, іўрыце, рускай і ангельскай мовах ужо ў другой палове 1940-х і 1950-х гг. і адбілі досвед былых вязняў, якія прайшлі шлях ад зняволення ў гета да свайго выратавання і ўдзеле ў руху супраціўлення. Шмат у чым яны былі наіўнымі, павярхоўнымі і тэндэнцыйнымі, аднак змяшчалі вялізны фактычны матэрыял, давалі адчуванне эпохі, прымушалі суперажываць. У 1960–1990-я гг. з'явіліся манаграфіі і сур'ёзныя навуковыя даследаванні аб Катастрофе, выдадзеныя галоўнай чынам у Ізраілі і краінах Захаду. Умоўна іх можна падзяліць па некалькіх кірунках: пярэдадзень Халакосту, публікацыя дакументаў і матэрыялаў аб нацысцкай палітыцы ў дачыненні да яўрэяў, гісторыя гета, яўрэйскае супраціўленне, акцыі генацыду.

У былым Савецкім Саюзе літаратура па гісторыі Халакосту з'явілася толькі пасля 1991 г. Заходняя гісторыяграфія з-за адсутнасці архіўнага матэрыялу была змушана абыходзіць яе ўсе пасляваенныя гады. У выніку ўтварылася інфармацыйная ніша, якая ў 1990-я гг. стала хутка запаўняцца. Найболей каштоўныя даследаванні былі выкананы навукоўцамі Ізраіля і іх калегамі з краін Заходняй Еўропы і ЗША.

Артыкулы, агляды, успаміны, зборнікі дакументаў і манаграфіі аб Халакосце, якія выйшлі ў 1996–1998 гг., значна адрозніваюцца па сваім прафесійным узроўні, глыбіні аналізу, асэнсаванні і пэўнасці. Найбольшы кантраст уяўляюць сабой працы, напісаныя ў Беларусі. Яны, нараўне з сур'ёзнымі даследаваннямі, як правіла, вельмі эмацыйныя. Вялікая частка звестак грунтуецца на запісах вусных сведчанняў, не пацверджана дакументамі і яе цяжка праверыць. Цалкам новай для рускамоўнай гісторыяграфіі стала тэма ўзаемаадносін яўрэяў і неяўрэяў на акупіраванай тэрыторыі. У другой палове 1990-х гг. дзякуючы доступу да архіваў гісторыяграфія Халакосту ў Беларусі значна ўзбагацілася. У серыі гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць», якая выдаецца з 1987 г., пачалі з'яўляцца дакументы па гісторыі Халакосту, спісы ахвяр гета, апісанне ўдзелу яўрэяў у партызанскай барацьбе, пералічваюцца помнікі на месцах масавых пахаванняў і г.д.

У 2000 г. у Тэль-Авіве на рускай мове на 432 старонках убачыла свет кніга «Катастрофа евреев в Белоруссии 1941–1944». Аўтар гэтай кнігі, ўраджэнец Беларусі прафесар Леанід Смілавіцкі, сабраў на самой справе унікальны матэрыял. У кнізе шмат шакіруючага і раней нідзе не апублікаванай інфармацыі аб Халакосце на тэрыторыі Беларусі. Манаграфія «Катастрофа евреев в Белоруссии 1941–1944» уключае асноўны тэкст, калекцыю дакументаў, бібліяграфію, слоўнік тэрмінаў, персаналіі, геаграфічны і імянны індэксы. Матэрыялам паслужылі дакументы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дзяржархіваў Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай абласцей, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Расійскага Цэнтра захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі, Расійскага дзяржаўнага архіва

эканомікі, Central Archive for the History of the Jewish People, Yad Vashem Memorial Institute Archive, Archive of the Oral History Department of the Contemporary Jewry Institute, Hebrew University of Jerusalem, collection.

Халакост на маёй малой Радзіме. Халакост і Барысаўшчына

Жыццё само па сабе ні блага, ні ліха:
яно змяшчае і блага, і ліха, гледзячы на тое,
у што вы самі ператварылі яго.

Мішэль Мантэнь

Гісторыя Барысава — гэта дзевяць стагоддзяў, насычаных войнамі і кровапраліццямі. Але не было ў ёй больш жахлівых дзён, чым панядзелак і аўторак 20–21 кастрычніка 1941 г. У гэтыя дні былі забіты барысаўскія яўрэі, якія па розных прычынах апынуліся пад уладай гітлераўскіх акупантаў і іх мясцовых памагатых.

Тады, пры ліквідацыі гета, паводле справаздачы катаў, было расстраляна 7245 чалавек рознага полу і ўзросту. Аднак асобныя крывавыя акцыі меншага маштабу праводзіліся і раней. Усяго ў перыяд акупацыі генацыд паглынуў больш за дзевяць тысяч яўрэяў-барысаўчан.

Спіс, які можна лёгка знайсці па ссылцы http://borisovcity.narod.ru/history/hist09.htm, не мае шырокай дакументальнай асновы. У Занальным дзяржаўным архіве ў Барысаве захоўваюцца толькі складзеныя мясцовымі органамі ўлады пасля выгнання акупантаў у 1944 г. «Поименные списки расстрелянных, повешенных, замученных гр-н СССР», але яны выкананы нядбайна і нядобрасумленна. У іх пералічана толькі нешматлікім больш за 250 яўрэяў. Значны лік запісаў там выглядае так:

Гиршин, муж., евр.
Бененсон (з 5 чал.), муж., евр., каваль.
Гранде, сям'я з 3 чал., евр., хата-хоз.
Ривкин (з 4 чал), муж., евр., бухгалтар.

Акт ад 15 верасня 1944 г., падпісаны трыма адказнымі дзяржаўнымі службоўцамі раённай улады (Шадрын, Даўгалаў, Сушкевіч) абвяшчае: «У жніўні месяцы 1941 г. ў вёсцы Плітчанка Бродаўскага сельсавета нямецкімі катамі было расстраляна дзевятнаццаць чалавек яўрэйскай нацыянальнасці невядомых прозвішчаў, бо яны былі бежанцамі і невядомых спецыяльнасцяў». На самой жа справе тады былі расстраляныя больш за 30 яўрэяў, але не бежанцаў, а жыхароў самой Плітчанкі і змешчанай побач вёскі Дразы. Мабыць, высвятленне прозвішчаў не ўваходзіла ў намер укладальнікаў акта, якія нават месца расстрэлу і пахаванні не злічылі патрэбным паказаць.

Праглядаліся дакументы і часоў акупацыі, у тым ліку і нямецкія, але там атрымалася выявіць толькі каля 40 яўрэйскіх прозвішчаў і імёнаў. Такім чынам, гэты мартыралог складаўся шляхам апытання сваякоў, суседзяў, знаёмых. Праца працягвалася з 1992 па 1998 г., прычым не толькі ў Барысаве, але і ў іншых гарадах

і краінах, з выкарыстаннем аб'яў у сродках масавай інфармацыі. Упушчаны час — пасля вайны прайшло больш за 60 гадоў, і памяць пацьмянела. Вось характэрны, але засмучальны адказ маладых людзей, выхаваных савецкай школай: «У нас загінула вельмі шмат сваякоў, але іх імёны ведалі бацькі, а яны памерлі». У Савецкім Саюзе вывучалі і памяталі радаводы дрэва правадыроў, а цікавасць да ўласных каранёў не заахвочвалася і часам нават была небяспечнай. Тым не менш, час упушчаны магчымасцяў заклікае да пакаяння.

У 1995 г. цалкам выпадкова стаў вядомы яшчэ адзін трагічны факт, які адносіцца да генацыду. Пры праглядзе крымінальнай справы № 17877 па абвінавачванні Курылкіна Ф.Ф., якая захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі, быў выяўлены дакумент, з якога следавала, што ў Барысаве расстраляна каля 400 яўрэяў-спецыялістаў з Заходняй Беларусі. На працягу паўгода яны працавалі ў шавецкай, швейнай і іншых майстэрнях, створаных акупантамі ў працоўным лагеры пры торфзаводзе «Белае Балота» (зараз пасёлак Чырвоны Кастрычнік Вялікастахаўскага сельсавета Барысаўскага раёна). Праверка, выкананая кіраўніцтвам асветніцкага грамадства «Святло меноры», пацвердзіла гэты факт. Сапраўды, яўрэі разам з сем'ямі былі дастаўлены ў той лагер для працы ў розных майстэрнях, але праз некалькі месяцаў навідавоку ў мясцовага насельніцтва (найболей падрабязна расказаў аб гэтым відавочца Уладзімір Аляхновіч) іх пагрузілі на грузавікі і павезлі ў бок бліжэйшай вёскі Бродня, каля якой яны былі расстраляныя. Гэта было прыблізна ўвесну 1943 г. Дату і дакладнае месца расстрэлу ўсталяваць не атрымалася. Застаюцца невядомымі і імёны загінуўшых.

Пачатак канца. Барысаўскае гета

Зло, як і дабро, мае сваіх герояў.

Франсуа Ларошфуко

Верагодна, усім прыходзілася назіраць за паводзінамі коткі, якая злавіла мыш. Перш, чым перамалоць сваімі сківіцамі ахвяру, прыручаная драпежніца доўга і весела пацяшаецца з яе, атрымоўваючы пры гэтым відавочнае задавальненне. Падобным чынам паводзілі сябе і гітлераўскія акупанты ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва, якое апынуўся пад іх уладай. Спачатку ка́ты прымушалі яўрэяў чапляць на сябе зневажальныя апазнавальныя знакі ў выглядзе ярка-жоўтых кружкоў або шасціканцовых зорак, а затым заганялі ў спецыяльна створаны лагер смяротнікаў, дзе тады жыццё ператваралася ў жахлівае існаванне. Асуджаныя падвяргаліся там нечуваным знявагам, фізічным здзекам, пакутам ад голаду і хвароб.

У канцы лета 1941 г. такі лагер (гета) быў створаны і на ўскраіне Барысава. Ён заняў некалькі кварталаў, абмежаваных вуліцамі Свабоды (зараз Лапаціна ад рынку ў бок вуліцы Яраша), Савецкай і Чырвонаармейскай. Славянскае насельніцтва адтуль выгналі, загадаўшы яму заняць яўрэйскія хаты на іншых вуліцах. Гета абнеслі калючым дротам, пакінуўшы адзіныя вароты на вуліцы Загараднай (зараз вуліца Рубэна Ібаруры), і арганізавалі ахову сіламі паліцэйскай службы з мясцовых жыхароў.

Вядома, што і да стварэння гэтага лагера смерці акупанты і мясцовыя добраахвотнікі забаўляліся забойствамі яўрэяў. На кірмашы беспадстаўна забілі старога Шымшу Альтшуля, адвялі ў турму і забілі маладых дзяўчат Ганю Глікман, Басю Таўгер, Рыву Райнес. Утапілі, як распавядаюць, школьнікаў-братоў Гілю і Фіму Бакаляр. Лютавалі і ў навакольных паселішчах — Зембіне, Мсціжы, Прыямена, Плітчанцы, Чарнеўцы…

Ужо ў першыя два месяцы акупацыі ахвяры сярод яўрэйскага насельніцтва горада і вёсак Барысаўскага раёна вылічваліся сотнямі, але крывавы фінал яшчэ быў наперадзе.

На перасяленне ў гета, якое пачалося раніцай 27 жніўня 1941 г., адводзіўся адзін дзень (практычна гэты тэрмін з'яўляўся нерэальным), яўрэям забаранялася карыстацца якім-небудзь транспартам, рэчы можна было несці толькі ў руках. Кватэр не хапала. Крайняя цесната вельмі хутка спарадзіла наяўную антысанітарыю і разнастайныя хваробы.

Адказным за ўнутраны парадак у гета і выкананне акупацыйных загадаў быў прызначаны Хацкель Баранскі, чалавек гадоў пад 50, былы працоўны лесабіржы дрэваапрацоўчага камбіната ім. Камінтэрна. Ён і яго некалькіх памагатых мелі няпростыя абавязкі, бо загады нямецкага начальства ішлі адзін за адным: то здаць цёплую вопратку, то расстацца з каштоўнымі рэчамі, то выплаціць непасільную кантрыбуцыю (пасля бургамістр Барысава Станкевіч крывадушна пахваліць насельнікаў гета за прыкладнае выкананне ўсіх загадаў).

У суправаджэнні паліцаяў вязні гета выводзіліся на працу, часцей за ўсё для пераноскі цяжкасцяў, мыцця падлогі, уборкі вуліц і смуродных месцаў.

Насельніцтва гета дасягала 8–9 тысяч чалавек і забяспечвалася толькі хлебам па 100–150 грамаў на душу. Дастаць іншыя прадукты было вельмі складана, бо зносіны са славянскім насельніцтвам забараняліся пад страхам бязлітасных пакаранняў. Таму голад, хваробы і заўчасная смерць сталі ўсёабдымнай паўсядзённай з'явай.

Здараліся і ўцёкі, але атрымліваліся яны рэдка, таму што з яўрэйскай знешнасцю знайсці хованку ў непрадказальным месцы было надзвычай цяжка, а адшукаць патрыятычнае падполле, якое толькі зараджалася, або партызанскі атрад было не меней складаным (тысячы яўрэяў знайшлі выратаванне сярод партызан, але трэба адзначыць, што, як сведчаць дакументы, у некаторых партызанскіх атрадах да яўрэяў ставіліся з непрыхільнасцю, не давалі зброі і нават забівалі).

Фашысцкая акупацыя прынесла гора і ў сем'і ад змешаных шлюбаў. Праўда, знаходзіліся адважныя і знаходлівыя ўмельцы, якія маглі абсталяваць для сваіх «палоў» і сяброў надзейныя схованкі, але і яны не заўсёды ратавалі ад ліхога «ўсёвідзячага» вока. Лекар Рэвека Эдэль, якую спрабаваў выратаваць рускі муж, была выдадзена суседзямі, а іншагародні хірург Ганна Татарская, якая працавала ў бальніцы пад чужым іменем, была расстраляна па даносе пацыента.

Спрабаваў выратаваць сваю жонку і двух малалетніх сыноў інжынер Аляксей Разін, але дзіўным чынам: як распавядаюць, ён пайшоў прасіць літасці ў нямецкага кашталяна. Адказам была куля…

А старыя рэлігійныя яўрэі звярталіся не да нямецкіх і дамаслых катаў, а да Святога пісання, шмат маліліся і спрабавалі супакоіць сваіх супляменнікаў, прадвяшчаючы хуткую перамогу над сатаной. Адрозніваўся ў гэтым дачыненні барадаты стары, былы меламед (настаўнік хедэра) Лейб Чэрнін.

Але былі і такія, хто не бачыў перад сабою светлых перспектыў. Вядомы ў горадзе правізар і скрыпач Абрам Залманзон разам з жонкай і двума малалетнімі дзецьмі пакінулі гэты свет з дапамогай яду.

...У тую восеньскую ноч 26-гадовая Ліда і 22-гадовая Рыва непрыметна пралезлі праз калючы дрот і накіраваліся да сваіх былых, але добрапрыстойных суседзяў, каб папрасіць у іх трохі прадуктаў. А пад раніцу, па дарозе назад, іх спынілі ўсхваляваныя прахожыя і папярэдзілі, што нельга вяртацца ў гета, бо яго насельнікаў ужо пачалі вывозіць на расстрэл. Пачуўшы такое, маладзіцы кінулі свае торбы з бульбай і ў жаху панесліся туды, дзе засталіся старыя бацькі Нахім і Гінда Аксельроды. Там ужо тварылася няўяўнае.

— Туды нельга! — загарлапанілі паліцаі і заступілі шлях, бо знешнасць дзяўчын у перадсвітальным змярканні, трэба меркаваць, не выклікала падазрэнняў.

— Але мы ж яўрэйкі! — узмаліліся сёстры. — Пусціце нас да маці і таты!

Тады іх прапусцілі. І было нямала такіх прыкладаў, калі маладыя людзі нават не спрабавалі ратавацца, аддаючы перавагу падзяляць лёс са сваімі бацькамі, дзядулямі і бабулямі.

Каля двух месяцаў праіснавала барысаўскае гета, дастаўляючы асалоду яго стваральнікам. Але 20 кастрычніка 1941 г. юрлівая пашча людаедаў самкнулася.

Яшчэ за тыдзень да гэтай даты, г.зн. 12 кастрычніка, начальнік службы парадку і павета Давыд Эгаф (былы жыхар мястэчка Зембін, які працаваў там у сярэдняй школе выкладчыкам нямецкай мовы) атрымаў загад з Мінска ад начальніка аператыўнай каманды № 3-а Цэнтральнага тылавога раёна оберштурмфюрэра Шлегеля падрыхтавацца да масавай акцыі па ліквідацыі ўсіх барысаўскіх яўрэяў.

На паўночнай ускраіне горада, недалёка ад аэрадромнага поля, быў знойдзены яр, дзе сіламі ваеннапалонных былі выкапаны дзве вялізныя і глыбокія ямы. А для падмацавання гарадской паліцыі выклікалі паліцаяў з бліжэйшых воласцяў.

Увечар у нядзелю 19 кастрычніка ў сталовай, якая знаходзілася каля кірмашовай плошчы, гарадская ўправа ўстроіла пышны банкет, куды было запрошана каля ста чалавек — некалькі нямецкіх афіцэраў з жонкамі і сяброўкамі, чыны паліцыі і мясцовыя фашысцкія прыхвасні. На гэтым зборышчы выступілі прыбыўшыя з Мінска оберштурмфюрэр Крафэ і бургамістр Барысава Станіслаў Станкевіч. Яны і абвясцілі прысутным аб расстрэле яўрэяў, што мае быць праз некалькі гадзін, і пажадалі поспехаў у гэтай «найважнейшай» аперацыі.

Паводле нямецкіх аператыўных дакументаў, ліквідацыя вязняў барысаўскага гета пачалася ў панядзелак 20 кастрычніка (некаторыя крыніцы паказваюць іншыя, але няпэўныя даты). Досвіткам у той дзень горад быў разбуджаны бязладнай стралянінай. Гета было акружана шматлікай узброенай

камандай. Падвыпіўшыя паліцаі ўрываліся ў хаты і ўсіх выганялі, зганяючы ў адведнае месца для далейшага следавання да прыгатаваных ям. Дастаўка туды ажыццяўлялася на грузавіках і пешымі калонамі. Пры гэтым асуджаныя падвяргаліся бесчалавечнаму збіенню ў спалучэнні з вулічнай мацяршчынай. Некаторых кідалі ў кузаў ужо мёртвымі. Усё гэта адбывалася на вачах разбуджанага і гнанага на вуліцу славянскага насельніцтва. Людзі з жахам або абыякавасцю (так пісаў у сваім рапарце нямецкі вахмайстар Зенекен) глядзелі ўслед сваім суседзям, знаёмым, сябрам, якіх грубіянская сіла адводзіла ў іншы свет.

Тут жа знаходзіліся і марадзёры з ліку спрытных баб і мужыкоў, якія кідаліся ў спусцелае жыллё, каб паспець захапіць пакінуты там хоць і бедны, але чужы скарб.

Перад карай яўрэяў сканцэнтравалі над ярам прыкладна за 50 метраў ад магіл. Аглушальныя крыкі, плач, стогн, лаянка там не змаўкалі. Забівалі групамі. Па 15–20 смяротнікаў, якіх падганялі прыкладамі і нагайкамі, валаклі ўніз, распраналі дагала і прымушалі легчы ў яму тварам уніз (так узнікала некалькі ярусаў акуратна складзеных трупаў, і гэтую канібальскую сістэму забойства, прыдуманую нібы бургамістрам Станкевічам з мэтай эканоміі «працоўных», назвалі «метадам сардзін»). Дзяцей скідалі туды, схапіўшы за рукі або ногі. А потым стралялі. Аднак не ўсе стрэлы аказваліся смяротнымі, таму што стралкі былі напоены гарэлкай, якую адмыслова падвозіў заўгас паліцыі Іосіф Майтак.

Нямала параненых было закапана жывымі. Уначы адна цалкам аголеная жанчына здолела выбрацца з ямы і нават падняцца на вяршыню рова, але там яна памерла ці то ад ран, ці то ад начнога холаду. Яе труп доўга не прыбіралі.

Некалькі дзён зямля, якая пакрыла пакутнікаў тонкім пластом, дыхала крывёю, і хутка стала відавочна, што перапоўненыя магілы стварылі сур'ёзную пагрозу санітарнаму парадку. Крывавая жыжа магла апынуцца ў працякаючай непадалёк Бярэзіне. Тады на магілы насыпалі вапну і яшчэ пласт пяску.

А праз два гады, калі ход вайны змяніўся, акупанты зноў вярнуліся да гэтага жудаснага месца, каб выканаць прысланнае з Берліна заданне пад кодавым нумарам 1005. Баючыся расплаты і па шкалярскай наіўнасці спадзеючыся замесці сляды жахлівых злачынстваў, яны прымусілі каманду ваеннапалонных вынуць з магіл гніласныя целы. Па начах сталі пылаць вялізныя вогнішчы. Цікаўных сустракалі стрэламі, але таямніцу выдаваў трупны смурод.

Тым не менш, выканаўцы гэтай жудаснай крэмацыі пасля яе завяршэння былі ліквідаваны.

Паводле справаздачы забойц, 20–21 кастрычніка 1941 г. было расстраляна 7245 яўрэяў. Аднак падлічана, што з улікам папярэдніх разрозненых акцый яўрэйскае насельніцтва Барысава і наваколля страціла больш за 9 тысяч чалавек, г.зн. амаль усіх, хто не змог або не паспеў своечасова збегчы на ўсход.

Выратаваліся нешматлікія. Нават тыя, хто паспеў схавацца ў лесе, не маглі там доўга пратрымацца, паколькі пакутавалі ад холаду і голаду. У канцы снежня 1941 г. каля мястэчка Бягомль, што прыкладна за 80 кіламетраў ад Барысава, немцамі была затрымана група яўрэяў з 13 чалавек. Гэта былі жыхары вёскі

Мсціж (шэсць жанчын і сямёра дзяцей), дзе яўрэі былі расстраляны яшчэ ў жніўні. Засталося загадкай, як і дзе яны здолелі пражыць яшчэ чатыры месяцы. І ужо зусім дзіўна, чаму іх пасля затрымання не забілі на месцы, а адправілі «для рашэння лёсу» аж у Барысаў, што пацвярджаецца захаванымі ў архіве нямецкім суправаджальным дакументам ад 28.12.1941 г. Вось імёны гэтых 13-ці: Кліонская Броха з дзецьмі Воляй, Элай, Дорай, Дзінай і Хаяй; Палякова Бася з дзецьмі Сёмай і Гітай; Бененсан Фрума, Бененсан Песя, Бененсан Еха, а таксама названая жыхаркай Бягомля Гурэвіч Лея.

Некаторыя яўрэі спрабавалі схаваць сваё паходжанне, спасылаючыся на свае славянскія прозвішчы. Часам гэта аддаляла гібель. Да 1943 г. дажылі яўрэйкі Певень (або Піотух), Разіна, Яраш, але ўсё-такі былі апазнаны і расстраляны.

У 1947 г. каля журботнага яра быў усталяваны сціплы помнік. Яго ўсталявала не дзяржава, якая дзяліла ўласных грамадзян на катэгорыі, а сваякі тых, каго вынішчыў крывавы генацыд. Згадак аб яўрэях на помніку не было. Надпіс у выглядзе казёнага клішэ прадыктавалі партыйныя функцыянеры, спасылаючыся на тое, што нацысты забівалі не толькі яўрэяў (толькі ў 1995 г. на помніку з'явіўся малюнак меноры, але зусім не па загадзе ўлады).

Сапраўды, у гады фашысцкай акупацыі злавесны прывід смерці лётаў над усімі, але становішча яўрэяў (як і цыган) было ўсё ж асобым. Яны падлягалі пагалоўнаму знішчэнню. Пол, узрост і веравызнанне не мелі ніякага значэння. Таму нават Ісус Хрыстос са сваімі апосталамі, калі б яны апынуліся пад уладай нацысцкіх мяснікоў, не маглі разлічваць на ласку.

10 лістапада 1991 г. ля помніка ахвярам генацыду адбыўся шматлюдны мітынг, арганізаваны мясцовым асветніцкім таварыствам яўрэйскай гісторыі і культуры «Святло меноры» з нагоды 50-годдзя з дня расстрэлу вязняў барысаўскага гета. Упершыню падобнае мерапрыемства было адобрана і падтрымана гарадскімі ўладамі. Вецер перамен дазволіў, нарэшце, уголас заявіць, што мітынг прысвечаны памяці не безаблічных грамадзян, а тых, хто быў забіты выключна з-за сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Іграла жалобная музыка. Прыспушчаны сцяг Беларусі суседнічаў з зоркай Давіда. З хвалюючымі прамовамі выступалі прадстаўнікі розных пластоў насельніцтва, у тым ліку і мэр горада Станіславаў Шыдлоўскі.

З асобай выразнасцю была прачытана памінальная малітва. Гэта зрабіў амерыканскі равін, бо айчыннага не знайшлося нават у сталіцы рэспублікі.

Праз два гады, 24 кастрычніка 1993 г., у рэчышчы шырокіх дзяржаўных мерапрыемстваў, прысвечаных памяці ахвяр генацыду (спатрэбілася паўстагоддзя, каб Беларуская дзяржава ўспомніла аб народзе, які ў гады вайны страціў кожнага другога), на тым жа месцы зноў адбыўся мітынг. Равіна не было, і таму малітва чыталася не так прафесійна. Ды і народа было няшмат. І не толькі таму, што ліў дождж.

Яшчэ менш людзей дайшло да яра ў дзень святкавання 50-годдзя Вялікай Перамогі. Гэта былі яўрэі-франтавікі, якія ўсклалі да помніка гваздзікі. Зноў прагучаў «Кадыш» — памінанне аб забітых.

Са зменай пакаленняў цьмянее памяць. Сцежкі да магіл продкаў з часам зарастаюць. Зараз нават у святы для яўрэяў дзень памяці 9-га Ава ля абеліска над ярам малалюдна. Аднак забыццё генацыду небяспечна, аб ім трэба памятаць заўсёды! Генацыд усядны. Калісьці ён забіваў армян, потым яўрэяў і цыган. І ўсе бачаць, што высвятленне дзікага пытання, чыя кроў чырванейшая, працягваецца, балюча зневажаючы і іншыя народы.

Брацкая магіла. Трагедыя ў Зембіне

Кажуць, што Бог церпялівы.
Але цярпець яўнае ліха ці не значыць
выяўляць бяссілле ці нават саўдзел у гэтым ліху?
Поль Анры Гольбах

Зембін… Гэтае старажытнае паселішча, якое знаходзіцца за 28 кіламетраў на поўночны захад ад Барысава, са спрадвечных часоў з'яўлялася шматнацыянальным. Царква, касцёл і сінагога суседнічалі побач і нікому не перашкаджалі. Бальшавікі з іх ваяўнічым атэізмам зачынілі храмы, але на адносінах паміж простымі людзьмі гэта ніяк не адлюстравалася.

Аднак у ліпені 1941 г. Зембін апынуўся пад уладай гітлераўскіх захопнікаў, і амаль адразу пачаліся ганенні супраць яўрэйскага насельніцтва, якое складала каля паловы жыхароў мястэчка. Усім яўрэям было загадана насіць на грудзях і спіне жоўтыя апазнавальныя знакі, зносіны з астатнімі зембінцамі забараняліся.

З мэтай узмацнення жорсткасці ізаляцыі прылеглая да яўрэйскіх могілак Працоўна-Сялянская вуліца была пераўтворана ў гета, куды яўрэі былі гвалтоўна пераселены. Але праіснаваў гэты злавесны лагер усяго адзін месяц. У сярэдзіне жніўня па загадзе акупантаў 18 яўрэяў на ўскраіне Зембіна пачалі рыць вялізную яму, якая нібы спатрэбілася для звалкі пашкоджанай і непатрэбнай ваеннай тэхнікі, якая заставалася на палях.

Праца працягвалася некалькі дзён, яму вырылі, аднак зробленыя ў ёй земляныя прыступкі не маглі не выклікаць трывожнага падазрэння.

Усё праяснілася раніцай у панядзелак 18 жніўня 1941 г., калі паліцаі Гнот і Голуб абышлі гета і абвясцілі распараджэнне нямецкага камандавання ўсім без выключэння яўрэям сабрацца каля рынка для праверкі дакументаў. І калі ўсе там сабраліся, стала відавочным, што назад ходу не будзе. Узброеныя карнікі адціснулі акружаны натоўп бліжэй да ямы і паставілі на калені. Потым, праўда, дазволілі сесці на зямлю, але толькі для таго, каб «адпачыць» у чаканні сваёй смяротнай чаргі.

Першымі адвялі ў лясок, дзе знаходзілася яма, каля 20 найбольш моцных на выгляд мужчын, і неўзабаве адтуль данесліся прыглушаныя стрэлы, што прывяло смяротнікаў у жахлівы стан. Але слёзы і немы крык выклікалі ў фашыстаў толькі азвярэнне, якое праявілася ў дзікім рукапрыкладстве.

Затым па чарзе, у групах па 15–20 чалавек, сталі гнаць да ямы і астатніх (пашкадавалі толькі двух малалетніх дзяцей Хасі Хадасевіч, народжаных ад змешанага шлюбу).

Да трох гадзін дня ўсё было скончана, і яму, дзе ляжалі ў крыві 927 [illegible] засыпалі.

Гэта жудасная акцыя, якая не паддаецца асэнсаванню, была прывед[illegible] жыццё акупантамі пад кіраўніцтвам начальніка барысаўскай службы бяс[illegible] (СД) гауптштурмфюрэра Шанемана пры ўдзеле гестапаўцаў Берга і Ва[illegible] каменданта Барысава Шэрэра, каменданта Зембіна Ілека, а таксама перакла[illegible] Люцкэ, якім дапамагалі фашысцкія прыхвасні з ліку мясцовых жых[illegible] зембінскі бургамістр Давыд Эгоф, начальнік зембінскага паліцэйскага ўчас[illegible] Васіль Харытановіч, яго намеснік Феафіл Карчмоў (пасля забіты партызанам[illegible] паліцаі Аляксей Рабецкі, Кастусь Голуб, Рыгор Гнот, Кастусь і Павел Аніскев[illegible] Якаў Капыток і інш.

Пасля вайны сваякі загінуўшых на свае сродкі акаймавалі магілу бет[illegible] най агароджай і ўсталявалі памятную дошку . Пахаванне было занесена ў Зб[illegible] помнікаў гісторыі і культуры і, такім чынам, атрымала статус ахоўнага дзяржа[illegible] вай аб'екта.

Тым не менш, гэта месца неаднаразова падвяргалася апаганенню з бо[illegible] «золаташукальнікаў» і іншых вандалаў. У 1992 г. была дашчэнту разбіта мармуро[illegible] вая мемарыяльная дошка, што прымусіла яўрэйскую грамадскасць з рэгіянальнага таварыства «Святло меноры» адшукаць сродкі для новага памятнага знака (но[illegible] вая дошка, на гэты раз металічная, была ўсталявана ў сакавіку 1993 г.).

У сельскай мясцовасці Барысаўскага раёна магіла зембінскіх яўрэяў з'яўляецца самым масавым пахаваннем часоў вайны. Аднак толькі ў 1993 г. мясцовыя ўлады вырашылі ўсталяваць там да 50-годдзя вызвалення Беларус[illegible] ад фашысцкіх акупантаў помнік. Зрэшты, гэта гучна разрэкламаванае рашэн[illegible] не Барысаўскага райвыканкама, як і трэба было чакаць, з-за адсутнасці сродкаў апынулася ўсяго толькі нікчэмнай паперкай.

Хто ляжыць у гэтай магіле персанальна? Цікавасць да гэтага пытання ўладамі перарывалася і магла пацягнуць за сабою непрыемнасці (напрыклад, абвінавачванне ў нацыяналізме). Таму праз паўстагоддзя ў памяці засталіся толькі нешматлікія імёны. Не дапамаглі і архівы. У афіцыйным спісе загінуўшых зембінцаў, складзеным сельскім Саветам у жніўні 1944 г., г. зн. амаль адразу пасля выгнання акупантаў, пайменна названы толькі пяць яўрэяў (Бененсан Гіля, Бененсан Ліба, Кац Меёр, Кац Хая, Харык Фаня). Сумны факт...

Праведнікі з Барысава. Аб тых, хто ратаваў асуджаных

Дабро, якое мы робім іншым,
дабром жа служыць нам самім.
Жан дэ Лафантэн

Грамадства не бывае аднастайным. Людзі адрозніваюцца адзін ад аднаго і па характары, і па светапоглядзе, і па дачыненні да сябе падобным. Не ва ўсіх умовах гэтыя адрозненні выяўляюцца кантрастна. Але фашысцкая акупацыя хутка высвеціла, хто ёсць хто. Адразу выявіліся падонкі, якіх ахапіла зараднасць і са-

лодкае прадчуванне магчымасці ўзбагаціцца за кошт чужога дабра. Чалавек, які падаваўся прыкладам бездакорнай добрапрыстойнасці, мог адчыніць суседскія веснічкі і з лабавой прамалінейнасцю сказаць: «Лейба, аддай мне тваю карову, бо цябе ўсё роўна заб'юць». (Дарэчы, у архіве захаваўся ўласнаручны загад барысаўскага бургамістра Станкевіча: «Усё быдла ў жыдоў адабраць!»).

Знаходзіліся і добраахвотнікі, якія імкнуліся не толькі знайсці схаванага яўрэя, але і прыкончыць яго сваімі рукамі.

Зразумела, маса грамадзян спачувала яўрэям, хоць і не магла аказаць ім практычнай дапамогі. Бо нават нязначныя зносіны з гэтай «найніжэйшай расай» утойвалі ў сабе надзвычай небяспечную рызыку, а на гераізм, як вядома, здольны не кожны.

Але людзі, якія праяўлялі адвагу ў спалучэнні са шчырай высакароднасцю, усё ж знаходзіліся паўсюдна. Іх было нікчэмна мала ў параўнанні з армадай забойцаў, але, як афарыстычна выказаўся пісьменнік Аб Мішэ, «чым цямнейшая ноч, тым ярчэйшыя зоркі».

Вядома, што шмат яўрэяў было выратавана духавенствам, і ў сувязі з гэтым нельга не назваць кіеўскага святара Аляксея Глаголева, львоўскага мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага, ксяндза з Каўнаса Бронюса Паўкштыса.

На Святой зямлі, у Іерусаліме, па рашэнні ізраільскага ўрада створаны буйны музей-мемарыял Катастрофы габрэйскага народа «Яд Вашэм», мэтай якога, у прыватнасці, з'яўляецца ўвекавечванне памяці тых, хто, рызыкуючы ўласным жыццём і не праследуючы меркантыльных інтарэсаў, выратаваў хаця б аднаго яўрэя. Гэтым адважным і высакародным людзям спецыяльны камітэт прысвойвае ганаровае званне «Праведнік народаў свету». Затым іх імёны можна ўбачыць на адпаведных таблічках у мемарыяльнай алеі ражковых дрэў, кожнае з якіх пасаджана ў гонар пэўнага выратавальніка, або на спецыяльных памятных стэлах.

Сярод найбольш вядомых Праведнікаў народаў свету — кароль Даніі Хрысціян X, які ў перыяд акупацыі сваёй краіны не пабаяўся заявіць, што ні ў кога няма права ставіцца да яўрэяў інакш, чым да астатніх грамадзян. І дацкі народ зразумеў свайго правадыра, не дапусціў дэпартацыі суайчыннікаў-яўрэяў у лагеры смерці. За некалькі начэй яны былі таемна вывезены на лодках у нейтральную Швецыю, а пакінутая імі маёмасць была захавана ў недатыкальнасці.

А ў Венгрыі тысячы яўрэяў былі абавязаны жыццём шведскаму дыпламату Раўлю Валленбергу, які забяспечыў іх пашпартамі сваёй краіны. Вялізны ўклад у справу выратавання яўрэяў унеслі партугальскі консул у Бардо Арыстыд дэ Суза Мендэс і японскі консул у Каўнасе Сенпа Сугіхара. Шырокую вядомасць атрымаў і нямецкі прадпрымальнік Оскар Шындлер.

Найбольшую колькасць Праведнікаў народаў свету дала Галандыя — больш за тры тысячы. Прыкладна столькі мае і Польшча. Параўнальна шмат іх сярод французаў, літоўцаў і іншых еўрапейскіх народаў, якія спазналі жах фашысцкага рэжыму. Сустракаюцца на Алеі праведнікаў імёны грамадзян Расіі і Украіны, але рэдка. Да нядаўняга часу ў нязначнай меры была прадстаўлена і Беларусь.

І не таму, што не было годных. Прычына тут у тым, што ў Савецкім Саюзе выратаванне яўрэя подзвігам не лічылася. Там узнагароджвалі і за мужнасць у баі, і за адвагу на пажары, і за дапамогу тапельцу, і за шматлікія іншыя высакародныя ўчынкі. Аднак ніхто не чуў аб узнагародах за выратаванне ад генацыду. Такіх выратавальнікаў улада не прымячала. А замоўчванне бескарыслівай гераічнасці гэтых людзей прывяло да таго, што шмат імёнаў згублена назаўсёды, і гэты факт выклікае глыбокі роздум.

Тут прыводзіцца няпоўны спіс тых, хто ратаваў яўрэяў-барысаўчан. Гэта ўсяго толькі рэестр імёнаў, але подзвіг кожнага з ніжэйпералічаных асоб годны асобнай кнігі.

АЎСІЕВІЧ Еўдакія. Некалькі дзён хавала і карміла ўцекача з гета Ізю Лейкінда і дапамагла яму выратавацца.

АНТАНОВІЧ Ганна, СВІРЫДОВІЧ Марыя і Павел. Дапамаглі выратавацца Гіцы Шэхтман і двум яе малалетнім сынам Дзіму і Аліку.

БУЛАЙ Зося і Павел. Прытулілі ў сваёй вясковай хаце і выратавалі ад немінучай згубы Ганну Скумс і яе малалетняга сына Валянціна. Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

БЫКОЎСКАЯ Антаніна. Дапамагла выратавацца сёстрам-малалеткам Мані і Лене Нейман.

ВАГНЕР Ганна. Выратавала Любоў Клябанаву, цалкам незнаёмую жанчыну, якую на працягу трох гадоў хавала ў сваёй хаце і дзялілася кавалкам хлеба.

ВЕРЖБАЛОВІЧ Васіль. Прытуліў у сваёй хаце і выратаваў яўрэйку Веру Самцэвіч.

ВІТОРСКІ Уладзімір. Дапамог выратавацца камсамольскай актывістцы Мані Шуб.

ВАЎКАВЕЦ Лідзія. Сялянка з вёскі Навасёлкі Глівінскага сельсавета Барысаўскага раёна. Хавала ў сваёй хаце Ганю Шустаровіч і здолела адвесці яе ў партызанскі атрад.

ГАЙДУК Ніна. Сялянка, якая выратавала Гінду Гантман і яе брата. Удастоена звання «Праведнік народаў свету».

ДУБРОЎСКІ Аляксандр. Настаўнік. Выратаваў сясцёр Марыю і Зіну Ральбіных. Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

ЕЎДАКІМЧЫК Аляксандр. Выратаваў сваю жонку Песю.

ЕЛАК Рыгор. Селянін, які выратаваў Барыса Гурэвіча.

ЗАХАРЭВІЧ Галя. Дзесяцігадовая дзяўчынка. Напярэдадні ліквідацыі барысаўскага гета пракралася туды і таемна вывела з яго свайго пляменніка па бацькаўскай лініі трохгадовага Юрася (ён знаходзіўся ў гета са сваім бабуляй і дзядулем Нехамай і Маісеём Рольбінымі, якія ў наступны дзень былі забіты).

КУДЗІНЫ Парфен і Еўдакія. Прытулілі ў сваёй сям'і і выратавалі падлетка Ізю Шмуліка.

ЛУКІНСКІЯ Яўген і Еўдакія. Выратавалі студэнтку Паліну Аўскер. Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

МАЗУРКЕВІЧ Фёдар. Жыхар вёскі Чарневічы Барысаўскага раёна. Выратаваў восем яўрэяў. Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

МАЖЭЙКА Ванда. Выратавала ваеннапалоннага Язэпа Рыўкінда.

МІХАЙЛАЎ Іван. Нягледзячы на дамаганні і пагрозы паліцыі, здолеў схаваць яўрэйскае паходжанне сваёй жонкі Рэвекі Якубовіч, чым дапамог ёй вызваліцца з турмы і выратавацца.

ПЕТУХОЎ Цімафей. Выратаваў сваю жонку Еву.

РАЙМАН Міхась. Па паходжанні немец. Сваю жонку Х'ену доўга хаваў у схованцы, а затым здолеў пераправіць яе ў партызанскі атрад.

РУСЕЦКІ Максім. Жыхар вёскі Скупліна. Выратаваў сваю жонку Злату.

СЕМЧАНКА Андрэй. Забяспечваў ежай Самуіла Нісневіча, які збег з гета і хаваўся ў схованцы.

СКАВАРОДКА Канстанцін. У гады акупацыі Барысава загадваў дзіцячым домам, дзе пад чужымі імёнамі хавалася і была выратавана група яўрэйскіх дзяцей (Люся Бейненсан, Аня Ліпкінд, Роза Давідсан, Лена Нейман і інш.). Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

СТРОК Іван. Праваслаўны святар. Узяў да сябе ў сям'ю і выратаваў трохгадовага хлопчыка Толіка Шахвалава.

ТУМАР Ніна. Дапамагла выратавацца настаўніцы Фаіне Бярковіч.

ФРАЛОВА Алена. Выратавала і ўдачарыла 6-месячную дзяўчынку Розу Рубінчык. Удастоена звання «Праведнік народаў свету».

ЧОРНЫЯ Віктар і яго сёстры Ганна і Валянціна. Сяляне з вёскі Страшнае (цяпер Высокі Бераг) Барысаўскага раёна. Выратавалі Марыю Эпштэйн і яе малалетнюю дачку Раю. Удастоены звання «Праведнік народаў свету».

ШАФРЫНОЎСКАЯ Вера і БУЛАЙ Алена. Дапамаглі выратавацца Фіры Годэс і яе двухгадоваму сыну Паўліку.

ШУЛЬЦ Алена. Выратавала жыццё ваеннапалоннаму Якаву Мейлехсу і дапамагла знайсці сховішча ваеннапалоннаму Уладзіміру Крывашэю.

Чые рукі ў крыві?
Аб тых, хто забіваў нявінных

Злодзею адна дарога, а хто шукае, таму многа.
Беларуская народная прыказка

Ёсць злачынства, якое не скупляецца, – гэта здрада радзіме.
Буаст

Праўда здольна занядужыць, але памерці яна ніколі не памрэ.
Мігель дэ Сервантэс Сааведра

Над уваходам у некропаль расстраляных у Барысаве яўрэяў вісіць сціплая мемарыяльная дошка з лаканічным пытаннем: «ЗА ШТО?!»

На гэта пытанне адказу няма. Тады зададзімся іншым пытаннем: ХТО ІХ ЗАБІВАЎ?

Адказ ёсць, бо забойцаў без імёнаў не бывае!

Фон Швайніц, Шэрэр, Ілек, Шанеман, Штайлер, Розберг, Розенфельд, Крафе — гэтых і іншых германскіх фашыстаў, якія гаспадарылі у Барысаве, яшчэ неяк можна зразумець (але не прабачыць!), бо ад чужакоў, якія прыйшлі з мячом, толькі вар'ят стане чакаць дабра і літасці. Але на захопленай зямлі забівалі не толькі акупанты. У якасці катаў да іх наймаліся мясцовыя добраахвотнікі, натоленыя смагай нішчыць камуністаў, жыдоў і наогул усіх, каго загадаюць (ішла за германскімі войскамі каманда «Масква», якая адмыслова займалася вербаваннем калабарацыяністаў і цяжкасцей не адчувала).

І не трэба думаць, што гэта, на жаль, шматлікая кампанія складалася толькі з непаўнавартасных асобаў. Сярод іх былі такія, хто валодаў універсітэцкім дыпломам і прэтэндаваў на рэспектабельнасць. Напрыклад, тады яшчэ малады чалавек Станіслаў Станкевіч, займаўшы ў 1941–43 гг. пасаду бургамістра Барысава і Барысаўскага раёна, раней скончыў Віленскі універсітэт і настаўнічаў у Навагрудку, а Бельгійскі універсітэт нават удастоіў яго навуковай ступені доктара. На сумленні гэтага «асветніка» мноства злачынстваў, асабліва накіраваных супраць яўрэяў. І не толькі ў Барысаве, але і ў Баранавічах, куды яго перавялі пазней. Магчыма, сам ён не страляў, не жадаючы пэцкацца, але распараджаўся і без стомы выслужваўся перад сваімі гаспадарамі. Нават вясной 1945-га ў аганізуючым Берліне, рэдагуючы там беларускую газеціну «Раніца», ён працягваў заклікаць з яе старонак да падтрымкі фюрэра і імкнуцца да перамогі (дарэчы, С. Станкевіч быў адным з 1023 дэлегатаў скліканага калабарацыяністамі другога Усебеларускага кангрэса, які адбыўся ў акупаваным Мінску амаль перад самым яго вызваленнем — у чэрвені 1944 г.).

А стараннасць настаўніка з Зембіна Давіда Эгофа ў сваім слугаванні фашыстам наогул не ведала межаў. Гэты чалавек уласнаручна забіваў. Першапачаткова ён рабіў гэта ў Зембіне, калі займаў там пасаду бургамістра, а з 29 жніўня 1941 г. працягваў гэтым займацца ў Барысаве, куды быў прызначаны начальнікам паліцыі (або службы парадку, як называлі яе акупанты). Эгоф набыў вялікі досвед у арганізацыі забойстваў і гэтым выхваляўся. Для ліквідацыі вязняў барысаўскага гета выкарыстоўвалася каля 200 чалавек (за выключэннем прыбыўшай з Мінска невялікай каманды, якая складалася з немцаў і літоўцаў, гэта былі мясцовыя паліцаі), і, падавалася б, катаў хапала. Але Эгоф на месцы кары асабіста варочаў нагайкай і забіваў, прыцэльна страляючы з маўзера.

Не адставаў ад Эгофа і яго намеснік Пётр Кавалеўскі, былы жандарм, а затым непрыкметны касір у шавецкай арцелі. Пакуты смяротнікаў дастаўлялі яму асалоду. Ён прымушаў іх капаць магілы для саміх сябе і імкнуўся знішчыць малейшую міласэрнасць, нават калі гэта міласэрнасць, як часам здаралася, зыходзіла ад немцаў. Вядомы «характэрны» эпізод: калі ў дзень чарговай расстрэльнай экзекуцыі на пінжаку Кавалеўскага заўважылі нейкае шэрае рэчыва, ён адмахнуўся, нядбайна растлумачыўшы, што гэта жыдоўка запырскала яго сваімі мазгамі.

«Беднаму» Кавалеўскаму было ўжо за 60, і ён, па яго ж прызнанні, так стамляўся падчас расстрэлаў, што прыходзілася чаргаваць «працу» з адпа-

чынкам. Сапраўды, чаму б і не адпачыць кіраўніцтву, калі было каму пераняць руку. Гэта з задавальненнем рабілі, напрыклад, начальнік гарадскога аддзялення паліцыі Міхась Грынкевіч або акалодачны наглядчык Станіслаў Кісляк, якія валодалі ў дачыненні да кровапраліцця прыкметнымі арганізатарскімі здольнасцямі.

Асаблівы запал да забойстваў выяўляў Канстанцін Піпін, ленінградзец, воляю выпадку трапіўшы ў Барысаў. Усюды, дзе толькі мог, пакідаў свае крывавыя сляды гэты прафесіянал у вобласці заплечнага майстэрства — у Барысаве, Мсціжы, Крупках...

Адрозніваўся сваёй стараннасцю паздзекавацца з людзей п'яніца і марадзёр Міхаіл Маразевіч. Відавочцы запомнілі яго ў ліку тых, хто суправаджаў калону яўрэяў, якую вялі ў апошні шлях. Палка бандыта не ведала стомы (дарэчы, гэты адпеты падонак з-за непрабуднага п'янства апынуўся нягодным нават для прафашысцкай паліцыі, і ў 1942 г. яго зволілі).

Нельга не ўспомніць і акалодачнага наглядчыка Васіля Будніка, які праявіў сябе «ўмельцам» у распрананні асуджаных. За хвіліну да расстрэлу ён з быстрынёй фокусніка сцягваў з іх вопратку, пакідаючы цалкам голымі, і пры гэтым паспяваў яшчэ і пастрэльваць у дзяцей, якіх шпурлялі ў яму як неадушаўлёныя прадметы.

Пакінула гадкую памяць і дынастыя паліцаяў Пятроўскіх — Фёдар Грыгор'евіч і яго сыны Іван і Мікалай. Яны палявалі на яўрэяў, адбіралі іх маёмасць і не давалі праходу чорнавалосым, падазраючы кожнага з іх у яўрэйскім паходжанні. Малады барысаўчанін Міша Стральчонак, пякучы брунет (ды яшчэ мог бегла гаварыць на ідыш), распавядаў, як неаднаразова і доўга яму прыходзілася даказваць, што ён не яўрэй. А западозраны ў яўрэйстве заўгас гарадской лякарні Андрэй Малярэвіч здолеў пазбегнуць расстрэлу толькі дзякуючы ўмяшанню турэмнага лекара Замбржыцкага (сам гэты медык быў пасля пакараны за сувязь з патрыятычным падполлем і партызанскім рухам).

Мноства заслуг перад сваімі гаспадарамі меў і выхадзец з Зембіна паліцай Павел Аніскевіч: беспадстаўна збіваў людзей бізуном, гвалтаваў жанчын, удзельнічаў у аблавах і арыштах, займаўся вымагальніцтвам, здзекаваўся з яўрэяў (за ўсё гэта ён быў удастоены мянушкі «групэнфюрэр»). Колькі чалавек забіў Аніскевіч, засталося невядомым. Але некаторыя вялі такі лік, нібы гэта былі паляўнічыя трафеі. Напрыклад, паліцай Іван Ганчарэнка з журботай расказваў сябрам-сабутэльнікам, што забіў пяць яўрэяў. Усяго пяць... Затое ў паліцая Пятра Логвіна былі, мабыць, лепшыя паказчыкі ў гэтым нечалавечым спаборніцтве. З дапамогай маленькай няцямлівай дзяўчынкі ён адшукаў схованку, дзе хаваліся тры яўрэйскія сям'і, і забіў усіх, у тым ліку і дзяўчынку.

Палявалі на яўрэяў не толькі штатныя паліцаі, якія атрымоўвалі за гэта зарплату (эквівалентам 30 срэбранікам для радавога былі 250 абясцэненых рублёў у месяц). Знаходзіліся і іншыя. Шустры дзядок па прозвішчы Кончык бегаў па вуліцах з драбавіком і крычаў: «Ад мяне, старога і вучонага сабакі, ні адзін жыд не выратуецца!»

Следчым у паліцыі працаваў барысаўчанін Віктар Гарніцкі, які рэдка быў цвярозы, і ў п'яным угары як толькі мог здзекаваўся са сваіх ахвяр, прыпісваючы ім усе магчымыя і немагчымыя злачынствы.

Варта ўспомніць і дэзерціра Чырвонай Арміі лейтэнанта Іосіфа Казакевіча, агента СД па мянушцы Барсук. У сваім родным Барысаве ён займаўся высочваннем падпольшчыкаў і партызан, а таксама яўрэяў, якія насілі нехарактэрныя для іх прозвішчы. У 1943 г. па яго даносах было расстраляна некалькіх яўрэек.

У СД быў завербаваны і Іосіф Шаблінскі з вёскі Лазіна (агент пад № 20), які, па аповядах, таксама стараўся ў антысеміцкай кампаніі, але ў 1943 г. схаваўся, затаіўшыся недзе ў Літве.

Пасля ліквідацыі гета каты сталі дзяліць яўрэйскую маёмасць. Займаліся гэтым Станіслаў Станкевіч і яго бліжэйшыя памагатыя. Шмат чаго прыйшлося аддаць немцам, але сябе, натуральна, яны не абдзялялі. Напрыклад, падручны Эгофа Пётр Кавалеўскі, акрамя раней прысвоенай хаты яўрэя Шэйнемана, прыхапіў яшчэ і такія каштоўнасці: жаночае футра, паліто, аўчыннае футра, патэфон, этажэрку, 55 рублёў залатой манетай царскай чаканкі і кіпу савецкіх грошай. Радавым катам даставаліся больш сціплыя рэчы. Вядома, што паліцаям Міхаілу Тарасевічу, Рыгору Верхаводцу, Івану Капытку, якія выклікаліся для падмогі з Карсаковіч, прыйшлося задавальняцца толькі гадзіннікамі і нейкай іншай дробяззю. Частка нарабаваных рэчаў была аддадзена ў краму для продажу па талонах (гэтай справай, у прыватнасці, займалася нейкая Марыя Петруненка).

Як жа паступілі з забойцамі пасля выгнання акупантаў?

Не ўсё апынуліся на лаве падсудных. Адны збеглі на Захад разам з немцамі, іншыя змаглі згубіцца на прасторах сваёй неабсяжнай краіны, трэція прадбачліва прымазаліся да партызанаў або апынуліся ў дзеючым Савецкім войску, бо ў палявых ваенкаматаў не было часу разбірацца ў біяграфіях закліканых.

З ордэнамі вярнуўся пасля вайны ў Барысаў Аляксандр Варфаламеёвіч Мірончыкаў (ён жа Мірончык), які апынуўся ў арэоле славы падпольшчыка, партызана, франтавіка. У кнізе «Памяць. Барысаўшчына. Барысаў і Барысаўскі раён» на С. 307 змешчаны яго ўспаміны, дзе ён распавядае, як, уладкаваўшыся ў паліцыю загадчыкам складам, вёў актыўную падпольную работу супраць акупантаў, а затым збег да партызанаў і ваяваў з ворагам у атрадзе «Камунар» (цікава, што ў той жа кнізе на С. 398 Мірончыкаў значыцца зніклым без вестак). Аднак нешта з памяццю стала ў бывалага партызана. Таму што, паводле §3 загада № 1 па кіраванні паліцыяй г. Барысава, Нова-Барысава і Барысаўскага павета ад 29.08.1941 г., Мірончык Аляксандр Варфаламеёвіч быў прызначаны зусім не загадчыкам склада, а начальнікам Нова-Барысаўскага аддзялення паліцыі. І гэты начальнік, аб патрыятызме якога пісалі ў кнігах і газетах, таксама прыклаў сваю руку да праследавання і знішчэння яўрэяў, што пацвярджаецца некалькімі архіўнымі дакументамі (праўда, начальнікам ён прабыў нядоўга, неўзабаве яго змяніў Цімафей Бахановіч).

Не з пустымі безузнагароднымі грудзямі скончыў вайну партызан Сцяпан Аляксеевіч Буры, але, у адрозненне ад Мірончыкава, яго паліцэйскае мінулае было своечасова раскрыта, і ён атрымаў па заслугах.

Добра ваяваў супраць германскіх агрэсараў і Канстанцін Мазалеўскі, аб чым сведчылі тры яго баявыя ордэны. Аднак засталося невядомым, якія ўзнагароды атрымаў за свае дзеянні той жа Мазалеўскі ў сваю бытнасць бургамістрам Карсаковіцкай воласці. Цяжка ўявіць, што акупанты не ацанілі чалавека, які актыўна змагаўся супраць савецкіх актывістаў, партызан і яўрэяў.

Некаторыя з барысаўскіх паліцаяў, якія прымалі ўдзел у забойствах і іншых злачынствах супраць мірнага насельніцтва, па прысудзе суда былі расстраляны. Але быў перыяд (з 26 мая 1947 г. па 12 студзеня 1950 г.), калі смяротная кара ў Савецкім Саюзе была скасавана. Таму, у прыватнасці, далёка не ўсе забойцы падзялілі лёс сваіх ахвяр.

Напрыклад, начальнік апорнага паліцэйскага пункта, адзін з найбольш актыўных забойцаў Канстанцін Піпін, быў асуджаны на максімальны ў той перыяд тэрмін пакарання — 25 гадоў пазбаўлення волі. Але ў выпраўленчым лагеры за прыкладныя паводзіны ён удастоіўся павагі начальства, быў узнагароджаны ганаровай граматай і прадстаўлены да датэрміновага вызвалення. Суд вызваліў яго амаль на 10 гадоў раней тэрміну.

Пазбег смяротнай кары і заўзяты жывадзёр Давід Эгоф, які пасля 25-гадовай адсідкі прыязджаў у Барысаў, дзе, як распавядалі, сустракаўся са сваёй дачкой Ірай...

Вярнуўся дахаты пасля адбыцця пакарання таксама Пётр Логвін, які ўладкаваўся ў краме секарам мяса — бліжэй да сякеры і крыві.

А 68-гадовы Фёдар Пятроўскі, які працаваў памагатым начальніка аддзялення паліцыі Нова-Барысава, наогул быў вызвалены ад адказнасці ў сувязі з узростам.

У 1996 г. таварыства «Святло меноры» апублікавала, выпусціўшы адмысловы буклет з назвай «Зачараваныя крывёй», спіс здраднікаў і забойцаў (па стане на жнівень-лістапад 1941 г.), які на працягу 50 гадоў быў засакрэчаны. Рана або позна таемнае становіцца відавочным, таму што гісторыя не церпіць замоўчванняў.

Няма сэнсу гаварыць аб кожным з гэтага вялізнага архіўнага пераліку. Можна, мабыць, выказаць здагадку, што некаторыя з іх ішлі ў памочнікі да немцаў не столькі з сімпатыі да акупантаў, колькі з нянавісці да савецкай улады, але нішто не можа служыць апраўданнем нявінна пралітай крыві. Усе яны па сутнасці аднаго кшталту і адным светам мазаны, бо ішлі да азвярэлых расістаў добраахвотна. Яўрэі звычайна гавораць аб такіх: «Няхай будуць праклятыя і забытыя іх імёны!»

Аднак не ўсё паддаецца забыццю. Памяць аб катах агідная, але нікуды ад яе не дзенешся (паспрабуйце забыць Гітлера або Амана). Затуляючыся смугой анёльскай нявіннасці, многія з іх дажылі да глыбокай старасці. Засталіся дзеці, унукі, праўнукі. Якія гены дасталіся ім ад праслаўутых продкаў? Пытанне, магчыма, цікавае, але бяздзейнае...

Пакрыўджаныя часам і грамадствам. Аб сінагогах Барысава

З няпраўдамі бацькоў нельга мірыцца сыну
Жан Расін

У даперабудоўчы час гісторыяй сінагог у Беларусі ніхто не займаўся, бо занятак гэты не заахвочваўся і перспектыў не меў. У 1930 г. было разгромлена папулярнае краязнаўчае выданне «Наш край», а замяніўшы яго часопіс «Савецкая краіна» ўжо ў першым нумары абрушыўся на краязнаўцаў, якія «капаючыся ў пыле і брудзе цэркваў, касцёлаў і сінагог, упускае пытанні сацыялістычнага будаўніцтва».

Тым не менш, аб цэрквах і касцёлах у публічных і фундаментальных бібліятэках можна знайсці нямала цікавых матэрыялаў. А вось згадванні аб сінагогах у даступных матэрыялах фрагментарныя і сустракаюцца рэдка. Бедныя і архіўныя звесткі. Таму і аповед аб сінагогах Барысава далёкі ад паўнаты.

Сёння савецкія сучаснікі маюць аб сінагозе вельмі смутнае ўражанне. І мала хто ведае, што, насуперак ходкаму меркаванню, сінагога (у перакладзе з грэчаскага — месца збораў) не з'яўляецца храмам у агульнапрынятым сэнсе гэтага слова, таму што, паводле канонаў іудаізму, грамадская малітва можа адбывацца ў любым месцы. Для гэтага неабходны толькі кворум з дзесяці яўрэяў-мужчын. Што ж да ўласна сінагогі, то там могуць адбывацца не толькі набажэнствы, але і іншыя мерапрыемствы яўрэйскай рэлігійнай суполкі. Такім чынам, сінагогу трэба разглядаць як памяшканне або будынак, найбольш прыстасаваны для малітваў, але не толькі для іх.

Некаторыя сінагогі прынята называць малітоўнымі школамі (бейт мідраш), дзе, апроч малітваў, займаюцца вывучэннем Старога Запавету і Талмуду. Бейт мідраш лічыцца больш святым месцам, чым сінагога.

Распазнаць будынак сінагогі па фасадзе, у адрозненне ад царквы або касцёла, не заўсёды проста. Досыць сказаць, што сінагогу па вул. Лапаціна 41, якая захавала, на здзіўленне, свой галоўны фасад у першапачатковым выглядзе, гарвыканкам прызнаў толькі пасля экспертнага заключэння запрошанага з Мінска спецыяліста (гэта была кандыдат архітэктуры Тамара Габрусь).

У 1917 г., да кастрычніцкага пераварота, у Барысаве, дзе тады пражывала каля 10 тысяч яўрэяў, мелася 13 сінагог, уключаючы малітоўныя школы. Пры савецкай уладзе сінагогі, як і храмы наогул, не ўзводзіліся. А царская ўлада гэтаму ў мяжы аселасці, як правіла, не перашкаджала. Трэба было толькі прытрымлівацца выразна вызначаных нарматыўных установак: на 30 яўрэйскіх хат дазвалялася будаваць адну малітоўную школу, а на 80 хат яшчэ і сінагогу. Пры гэтым сінагога ад праваслаўнага храма магла знаходзіцца не бліжэй чым за 100 сажняў, а калі сінагога і храм знаходзіліся на розных вуліцах, то не бліжэй за 50 (1 сажань — 2,13 м). Будаваліся сінагогі, зразумела, не на казённыя грошы.

Першыя звесткі аб барысаўскай сінагозе адносяцца да 1732 г. Гэта была малітоўная школа, якая знаходзілася на Замкавай вуліцы, недалёка ад сёння

існуючага гарадскога рынку. На плане 1810 г. сінагога пазначана на тэрыторыі, якая зараз адносіцца да жома № 20 па вул. Лапаціна.

У 1852 г. у Барысаве на 3400 вернікаў мелася ўжо пяць сінагог, у т.л. адна хасідская пад назвай «Любавіцкая» (1300 вернікаў). Першая мураваная сінагога была пабудаваная ў 1866 г., а да 1917 г. іх ужо было пяць.

Вось звесткі аб дыслакацыі некаторых сінагог (адрасы сучасныя): вул. 3-га Інтэрнацыяналу — паміж дамамі 48 і 50; вул. 3-га Інтэрнацыяналу, 49 (будынак захаваўся); вул. Нармандыі-Нёман — паміж вуліцамі Камсамольскай і Мінскай па няцотным баку; вул. Нармандыі-Нёман — паміж вул. Дзяржынскага і Камсамольскай па цотным баку (у савецкі час гэту сінагогу перабудавалі ў клуб Прамкааперацыі); вул. Лапаціна, 20 (у савецкі перыяд у будынку гэтай сінагогі доўгі час знаходзілася друкарня ім. 1-га Мая); вул. Лапаціна, 41 (будынак захаваўся); вул. Камсамольская, 78 (будынак захаваўся); вул. Дзяржынскага, 8; вул. Працы, 10; вул. Пралетарская, 23; праспект Рэвалюцыі, 73. Сінагогі меліся і ў некаторых сельскіх паселішчах каля Барысава: Зембіне, Дзедзілавічах, Плічанцы, Лошніцы, Чарнеўцы.

Большасць згаданых сінагог уяўлялі сабой сціплыя драўляныя будынкі, якія мала чым адрозніваліся ад звычайных жылых хат. Але былі і выключэнні. Адной з лепшых у губерні і самой буйной у Барысаве з'яўлялася Вялікая сінагога (вул. 3-га Інтэрнацыянала, 49), пабудаваная ў 1913 г. Яе памеры для павятовага мястэчка былі сапраўды вялікімі (плошча першага паверха — 483 кв.м.), ды і па архітэктурным абліччы яна была прывабнай, асабліва галоўны фасад з яго масіўнымі прафіляванымі пілястрамі, разнастайнымі абломамі, высокімі арачнымі вокнамі і вітражнай зоркай Давіда. Уся гэта прыгажосць знікла пасля бяздумнай рэканструкцыі ў 1962 г.

Але, як ужо было сказана, адзін невялікі каменны будынак былой сінагогі, якая была пабудавана ў 1911 г. і насіла назву «Хеўрэ тылім», захаваўся амаль у першародным выглядзе. Яго можна ўбачыць на вул. Лапаціна, 41. У 1994 г. асветніцкае таварыства «Святло меноры» па афіцыйным дазволе гарвыканкама (рашэнне ад 23.11.1993, пратакол № 11) усталявала там адпаведны ахоўны знак.

Архітэктурная разнастайнасць сінагог значная. Сустракаюцца готыка, барока, рэнесанс, але часцей — эклектыка, г.зн. сумесь розных стыляў. Унутранае ўбранне сінагогі бывае багатым, але звычайна няхітрым: лавы з пюпітрамі або крэслы, свяцільнікі-сямісвечнікі і люстры, на сценах — скрыжалі з біблейскімі запаведзямі. Кожная артадаксальная сінагога мае малітоўную залу для мужчын і, як правіла, асобнае памяшканне для жанчын (звычайна гэта галерэя). Але ў бедных сінагогах, дзе такога памяшкання няма, мужчыны і жанчыны раздзяляюцца прымітыўнай перагародкай (у сінагогах ліберальнага толку, г. зн. кансерватыўных і рэфармісцкіх, размежавання полу не прытрымліваюцца).

У малітоўнай зале каля сцяны, найбліжэйшай да Храма — разбуранай у даўнія часы іудзейскай святыні ў Іерусаліме, знаходзіцца найважнейшая частка інтэр'еру — каўчэг запавету (арон-кайдзеш), дзе ў раскошных чахлах захоўваюцца пергаментныя скруткі са Святым пісаннем, г. зн. Торай, або

Пяцікніжжам; такі скрутак завецца Сефер-Тора. А перад каўчэгам узвышаецца кафедра (біма), з якой Тору ўрачыста чытаюць. Запрашэнне да чытання Торы з'яўляецца выражэннем высокай пашаны.

Мужчыны моляцца ў рытуальным уборы — белых з чорнымі, сінімі або блакітнымі палосамі накідках з асобным чынам сплеценымі пэндзлямі і абавязкова ў галаўных уборах (ярмолках, кепках і інш.). Жанчынам таксама нельга знаходзіцца ў сінагозе з непакрытай галавой.

У адрозненне ад хрысціянаў, іудзеі, паводле канонаў рэлігіі, абавязаны чытаць малітву самі, а не абмяжоўвацца ўспрыманнем чужога голасу, чым, у прыватнасці, і тлумачыцца традыцыйная пісьменнасць яўрэяў.

Духоўным раздзелам яўрэйскай рэлігійнай суполкі з'яўляецца равін, які атрымаў адукацыю ў спецыяльнай рэлігійнай школе — іешыве. Сярод вернікаў ён галоўны кансультант па ўсіх пытаннях, якія датычацца рэлігіі і жыццёвых калізій.

У чарзе духоўных равінаў Барысава быў прыкметным выпускнік Валожынскай іешывы Арон-Мошэ Кісялёў (1865–1949), які ўзначальваў барысаўскую суполку некалькі гадоў. Нараўне з духоўнымі равінамі ў царскай Расіі дзейнічалі і так званыя грамадскія, або казённыя равіны, якія выбіраліся суполкай на тры гады і падлягалі зацвярджэнню губернскімі ўладамі. Казённы равін прадстаўляў яўрэйскую суполку ў дзяржаўных установах, прымаў прысягу ў яўрэяў-салдат, вёў рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану.

Ваяўнічы атэізм бальшавікоў заявіў аб сабе ўжо ў першыя гады савецкай улады. 17 чэрвеня 1922 г. Барысаўскі павятовы выканкам, выконваючы ўказанне кіруючых органаў, выдаў па аддзеле народнай адукацыі пастанову №43, якая паставіла па-за законам яўрэйскую рэлігійную адукацыю. Зачыняліся ўсе хедэры і талмуд-тора, якія існавалі з 1895 г. У той пастанове непасрэдна сінагогі не згадваліся, але яна з'явілася адпаведным сігналам. Адразу пачалі з'яўляцца хадайніцтвы яўрэйскіх працоўных аб перадачы сінагог пад клубы, і гэтыя просьбы задавальняліся. Вялікая сінагога была пераўтворана ў працоўны клуб (пазней Дом піянераў). Знайшлі ўжыванне і іншыя канфіскаваныя і пераскраданыя малельні. У горадзе пакінулі дзеючай толькі адну маленькую і трухлявую сінагогу «Слабадскую», пабудаваную ў 1840 г. (вул. Дзяржынскага, 8). Апошнія набажэнствы адбываліся ў ёй нават у ліпені 1941 г., г. зн. пры фашысцкім акупацыйным рэжыме. Але пасля стварэння гета мясцовыя марадзёры гэту сінагогу разрабавалі (святыя скруткі былі выкарыстаны ў якасці дахавага матэрыялу для столяў) і разабралі на паліва.

Пасля вайны перажыўшыя яе яўрэі пачалі вяртацца ў Барысаў, аднак вернікаў сярод іх было мала. Тым не менш кворум (міньён) набіраўся з лішкам, але неаднаразовыя спробы зарэгістраваць рэлігійную суполку, каб надаць ёй легітымнасць, поспеху не мелі. Малітвы працягваліся ў прыватных хатах і неаднаразова перарываліся з'яўленнем міліцыі. У 1992 г. міньён распаўся. З той пары іудаізм у былым паўеўрапейскім горадзе практычна, калі не лічыць традыцый, звязаных з рэлігійнымі святамі (мацой на Песах, нягледзячы на перыя-

дычныя забароны і іншыя цяжкасці, барысаўскія яўрэі абзаводзіліся заўсёды), спыніў сваё існаванне, і ўмовы для яго адраджэння нерэальныя, хоць фармальна іудзейская рэлігійная суполка існуе. У 1998 г. яе старшынёй на альтэрнатыўнай аснове таемным галасаваннем абраны інжынер Г. Я. Зархін, звязаны з рэлігіяй толькі тым, што па матчынай лініі з'яўляецца ўнукам равіна.

У Барысаве дзейнічаюць пабудаваны яшчэ ў 1874 г. праваслаўны прыгажун-сабор, актыўны і адноўлены з руін на асабістыя грошы каталікоў старажытны касцёл, ёсць і адроджаныя храмы іншых канфесій. Сінагогі няма. А было трынаццаць. Адабралі, апаганілі, разрабавалі, знявечылі, а адраджаць ужо няма каму...

Глафіра КАРАЛЁВА

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Кузьміч В. А., заслужаны работнік адукацыі Беларускай ССР, загадчык кафедры беларускай мовы БДТУ, выдатнік адукацыі

ЧАСТКА БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

Сёння кожны дзень па тэлевізары можна пачуць словы аб гуманізме, чалавекалюбстве, павазе, роўнасці, дабрыні і міры. Тэма перамогі дабра над злом самая актуальная ў нашы дні. Кожная дзяржава імкнецца, каб дзеці ад нараджэння разумелі сутнасць нацыянальнай маралі. Устаючы раніцай і пражываючы новы дзень свайго жыцця, большасць з нас нават не задумваецца, што яшчэ зусім нядаўна дзясяткі тысяч людзей не маглі і марыць аб мірным небе над галавой, аб уласным цёплым кутку і аб смачным свежым кавалку хлеба.

Халакост... Што гэта? Выпадковасць або заканамернасць? Трагічная падзея для ўсяго чалавецтва або толькі для вызначанай групы людзей? На гэтыя пытанні доўгі час лідэры ўсіх краін адказвалі маўчаннем. І толькі цяпер шматлікія народы свету ўсвядомілі значэнне Халакосту, зразумелі, што гэта страшны ўрок, што такое можа паўтарыцца з любым іншым народам, калі мы не навучымся разумець адзін аднаго, паважаць права чалавека на жыццё незалежна ад яго колеру скуры, нацыянальнасці і адносін да рэлігіі.

Дагэтуль ніхто не можа назваць дакладныя лічбы забітых, знішчаных, закатаваных і скалечаных габрэйскіх жыхароў нашай зямлі. Фактычна кожны сёмы габрэй Еўропы быў знішчаны на тэрыторыі Беларусі.

Часта беларускі народ вінавацяць у празмернай пасіўнасці ў палітычных пытаннях, залішняй памяркоўнасці. На першы погляд, беларусы здаюцца пасіўнымі і палахлівымі. Але паспрабуем задумацца, а ці дрэнна гэта? Што выклікала перавагу ў нашым характары менавіта такіх якасцяў?

На вачах нашых прадзедаў і дзядоў адбываліся жудасныя падзеі знішчэння цэлага народа толькі за тое, што яны габрэі. Але няма сумнення, што ў выпадку перамогі гітлераўскай Германіі гэтая ж доля спасцігла б і славян, бо да заканчэння вайны па планах Гітлера на акупаванай тэрыторыі іх павінна было застацца не больш за 25% ад першапачатковай колькасці. Прыхільнікі расавай тэорыі сцвярджалі, што не толькі габрэі, але і славяне з'яўляюцца прадстаўнікамі «ніжэйшых рас», а значыць не маюць права на вольнае існаванне. Ці не лепш, каб права жыць пазбаўлялі нацыстаў і іх памагатых?

Трагедыя габрэйскага народа — гэта агульная трагедыя беларускага народа ў другой сусветнай вайне. Гэта і наша трагедыя.

Цяжка ўявіць, што колькасць памерлых у Халакосце складае больш за 6 мільёнаў чалавек. А насельніцтва нашай рэспублікі ўсяго 10 мільёнаў. Упершыню за ўсю гісторыю чалавецтва знішчэнне мірнага насельніцтва па расавай прыкмеце насіла такі глабальны характар. Генацыд габрэйскага народа стаў элементам дзяржаўнай палітыкі Германіі. На пачатку другой сусветнай вайны кожны трэці жыхар на Беларусі быў габрэй, а па перапісе 1999 года частка грамадзянскай габрэйскай нацыянальнасці складала ўсяго 0,3 %.

Умоўным пачаткам Халакосту прынята лічыць дату 1 красавіка 1933 года, калі па ўсёй Нямеччыне ўпершыню было абвешчана, што габрэйскія крамы павінны быць зачынены, а тавары з іх нікому з немцаў больш купляць не варта. Пазней габрэі, паводле прынятага рэйхстагам закону, пазбаўляюцца выбарчага права і магчымасці займаць якія-небудзь пасады ў дзяржаўным апараце. Былі забаронены шлюбы паміж габрэямі і немцамі. У Нямеччыне пачала дзейнічаць прымусовая сістэма эміграцыі габрэйскага насельніцтва. Па стаўленні да іх сталі ўжывацца такія меры, як збіванні, перасьледы, публічныя зневажэнні і здзекаванні, а таксама канфіскацыя маёмасці.

Але гэта толькі пачатак. Канчатковае рашэнне знішчыць габрэйскі народ было прынята ўвосень 1941 года, хаця сістэма канцэнтрацыйных лагераў да таго часу загубіла ўжо шматлікіх з іх. Эсэсаўцам было дазволена да смерці збіваць у лагерах габрэяў, якія працавалі з усіх сіл у надзеі, што стараннасць можа адвесці ад іх удары. Дарма. Самае жудаснае было, што габрэі ў лагерах нават не крычалі, калі іх жудасна катавалі. Толькі параненыя хрыпелі. Гэта рабілася для забеспячэння пачуцця страху ў іншых людзей, іх няўпэўненасці ў выжыванні.

У гэты час, паводле загаду Гітлера, усе габрэі Мінска павінны былі ў пяцідзённы тэрмін перасяліцца ў раён паўночна-заходняй часткі горада. Пазней тэрмін быў падоўжаны. Так пачало функцыянаваць мінскае гета.

20 студзеня 1942 года была праведзена Ванзеенская канферэнцыя, у выніку якой было прынята «канчатковае рашэнне габрэйскага пытання», паводле якога ў Еўропе павінны быць знішчанымі 11 мільёнаў габрэяў. Пачаўся чарговы этап знішчэння габрэйскага насельніцтва. На тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалася ліквідацыя малых гета, непрацаздольнага насельніцтва гета, а таксама працягвалася канцэнтрацыя габрэяў. Карныя акцыі праходзілі па ўсёй тэрыторыі гета. Ні ў чым непавінных габрэяў мог расстраляць любы, хто меў зброю. Іх адпраўлялі

ў лагеры смерці, дзе падвяргалі нечалавечым катаванням. Габрэйскім жанчынам прыходзілася аддаваць сваіх дзяцей незнаёмым людзям, каб выратаваць ад пераследу. Але нацысты арганізавалі камісію па вызначэнні нацыянальнасці па знешнім выглядзе, якая выяўляла габрэйскіх дзяцей і вяртала назад ці ўвогуле знішчала. Для іх не існавала падзелу на дзяцей і дарослых.

Частай прычынай смерці ў гета сярод габрэйскага насельніцтва былі інфекцыйныя захворванні і знясільванні з-за сістэматычнага недаядання і цяжкай нечалавечай працы. Медыкаменты адсутнічалі.

Нормы выдачы прадуктаў для габрэяў былі ніжэйшымі за 50% (гэта прыблізна 200 грамаў хлеба на дзень). Габрэі часта абменьвалі свае асабістыя рэчы, адзежу на муку і тлушч у мясцовага насельніцтва. Але атрымаць гэтыя самыя каштоўныя прадукты можна было толькі за межамі гета, выхад куды быў катэгарычна забаронены. Некаторыя дзеці таемна выбіраліся за драцяныя агароджы, прывязвалі невялікія мяшочкі з мукой да свайго цела і ўносілі іх на тэрыторыю гета ўвечар разам з працоўнымі калонамі. Муку прадавалі або абменьвалі ў пекараў на хлеб. Ні садавіны, ні мяса ў гета не елі. Большасць габрэйскіх сем'яў варылі суп з адходаў са сталовай.

Паўзы ў знішчэнні габрэяў адбываліся толькі з-за недахопу працоўнай сілы.

Акцыі знішчэння праходзілі па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Габрэяў расстрэльвалі, скідалі іх трупы ў яры, якія нават не засыпалі зямлёй. Целы жанчын і дзяцей цягалі сабакі і птушкі. Пазней было ўстаноўлена, што частка расстраляных скідалася ў ямы яшчэ жывымі, шматлікія целы мелі сляды гвалту.

Хоць габрэйская рэлігія забараняе самагубства, ад безвыходнасці габрэі здзяйснялі масавае самаспаленне. Яны аблівалі свае хаты газай, а затым падпальвалі. Некаторыя з іх у апошні момант выбягалі з падпаленых сцен, але ў большасці выпадкаў апёкі былі занадта сур'ёзныя і людзі ўсё роўна паміралі ў пакутах.

Сістэматычнае знішчэнне, а не спантанае злачынства можа быць праведзена толькі ўладамі пад прыкрыццём ваеннай неабходнасці. Акцыі арганізаванага знішчэння і забойствы, якія праводзілі нацысты, патрабавалі супрацоўніцтва і з ваеннай, і з грамадзянскай адміністрацыяй, а таксама падтрымкі самога германскага народа. Лідэры акупаваных краін, улады, пэўная частка мясцовага насельніцтва падтрымлівалі нацысцкія планы, што яшчэ больш заганяла габрэяў да апошняй мяжы.

Мая родная полацкая зямля і яе габрэйскія жыхары таксама пакутавалі ад нацыстаў. Увосень 1941 года ў наваколлі вёскі Гомель Полацкага раёна на беразе возера было расстраляна 45 мірных вяскоўцаў габрэяў. Сярод іх былі і жанчыны, і дзеці, і старыя. Спачатку фашысты забралі на прымусовыя будаўнічыя работы 17 мужчын, але неўзабаве і іх спасцігла доля забітых. Целы загінулых былі пахаваныя каля вёскі Свяціна. Цяпер на месцы трагедыі часоў другой сусветнай вайны знаходзіцца помнік ахвярам Халакосту. Яшчэ адзін помнік усталяваны ў наваколлях Полацка ў раёне вайсковага мястэчка Баравуха-3. Вось што рабілася з маёй радзімай у тыя страшныя часы:

«Захватив город Полоцк, немецко-фашистские захватчики ввели в нём и в районах Полоцкой области так называемый "новый порядок". Осуществляя свой чудовищный план истребления мирного советского населения, гитлеровские палачи в городе Полоцке и районах Полоцкой области беспощадно и систематически уничтожали мирных советских граждан. В городе Полоцке и районах Полоцкой области немецко-фашистские захватчики ввели режим кровавого террора и насилия; с особой силой фашистский террор свирепствовал в городе Полоцке.

Для массового истребления советского населения фашистами был создан особый аппарат и организовано в городе Полоцке два лагеря (один из них для военнопленных Красной Армии и один для мирных советских граждан).

На основании материалов расследования, произведённого Чрезвычайной комиссией, а также многочисленных свидетельских показаний советских граждан — очевидцев фактов злодеяний и зверств — установлено, что немецко-фашистские захватчики истребили в одном только городе Полоцке около 150 тыс. человек советских граждан: мужчин, женщин, детей и стариков, как жителей города Полоцка, так и советских граждан, привозимых из других населённых пунктов БССР, а также и военнопленных бойцов, и офицеров Красной Армии, и партизан.

Лагерь, созданный гитлеровцами для советских военнопленных, был расположен в 1 км от города Полоцка... Лагерь для мирных советских граждан находился около кирпичного завода. Оба лагеря были обнесены в несколько рядов забором из колючей проволоки.

Режим в лагерях был подчинён задаче массового истребления заключённых. Заключённые влачили голодное существование. Их пища состояла из выдаваемой один раз в сутки мучной баланды по 2 стакана на человека, сваренной без соли, и 100 г хлеба, приготовленного из смеси древесных опилок со жмыхом.

Заключённых в лагерях морили голодом, заставляли выполнять непосильные работы. Тех, кто выбивался из сил и не мог выполнять работу, расстреливали на месте или зверски избивали палками. Гитлеровцы создали в лагерях условия к распространению заболеваний сыпным тифом и другими инфекционными болезнями.

Немецко-фашистские бандиты изобрели самые изощрённые формы пыток советских граждан. Причём всё это у них считалось делом чести каждого немца и поощрялось главным военным командованием и правительством.

Заключённые в лагерях и граждане города Полоцка, заподозренные в неуважении к "новому порядку", истреблялись без суда и следствия. Пытки, истязания и расстрелы, проводившиеся в лагерях и на улицах города, в окрестных населённых пунктах являлись предметом развлечений немецко-фашистских бандитов...

Немецко-фашистские бандиты проявляли исключительные зверства в отношении населения еврейской национальности. В декабре 1941 г. ... в городе Полоцке был организован специальный лагерь для истребления еврейского населения (гетто), который был расположен около кирпичного завода на окраине города Полоцка. Территория лагеря была обнесена колючей проволокой. Вы-

ход из гетто никому не разрешался. На работу из лагеря водили под конвоем. В этом лагере находилось более 8 тыс. человек мирного еврейского населения.

Еврейское население подвергалось полному ограблению со стороны немецких мародёров. Условия жизни в лагере были ужасающими. Люди спали в грязи, под открытым небом. С евреями немцы обращались хуже, чем со скотом. Немцы проводили массовые облавы на еврейское население, не щадили ни мужчин, ни женщин, ни детей, ни стариков. Детей убивали на руках у матерей.

За время существования гетто только в городе Полоцке немцы истребили в нём более 7 тыс. человек мирного еврейского населения. Детей, как правило, бросали живыми в ямы с расстрелянными и заживо закапывали...»

Чытаючы дакументы і матэрыялы аб Халакосце, разбіраючыся ў яго прычынах і наступствах, я часта задаю сабе пытанне: «Як людзі маглі рабіць такое? А ці людзі гэта?».

Сёння, у мірны час, нярэдка мы не ўяўляем усёй каштоўнасці жыцця, шчаслівага жыцця, без болю і пакут.

Я хачу, каб людзям любой нацыянальнасці было цёпла і ўтульна на роднай зямлі. А тым нелюдзям, выродкам роду людскога, ад імя ўсяго беларускага народа я нясу праклён. У беларусаў кажуць: «Каб ты здох», — і гэта датычыцца найперш тых, хто забіваў ні ў чым не павінных, таленавітых габрэйскіх людзей, іх прыгожых жанчын, мужчын, дзетак. Мне хочацца плакаць і крычаць. Тое, што адбылося ў Еўропе, — ганьба ўсім дзяржавам за іх абыякавасць да таго перыяду, калі нацызм зараджаўся.

А цяпер... Як бы годна выглядала наша дзяржава, калі б у ёй не знішчалі столькі габрэйскіх людзей, нашых людзей, нашай роднай Беларусі. Усе мы найперш людзі, і заўсёды трэба помніць аб гэтым.

Халакост — гэта частка беларускай гісторыі. І кожны з нас абавязаны захоўваць у сваім сэрцы часцінку людской трагедыі, каб сказаць сваім бацькам, дзецям, а пазней і ўнукам: «Я жыву ў шчаслівай краіне. Я люблю свой мірны неваяўнічы народ. Я люблю сваю Беларусь...»

Людміла СТАЎСКАЯ

Студэнтка факультэта выдавецкай справы і паліграфіі (ВСіП)

Кіраўнік: Кузьміч В. А., заслужаны работнік адукацыі Беларускай ССР, загадчык кафедры беларускай мовы БДТУ, выдатнік адукацыі

І ЗАСТАЛІСЯ ТОЛЬКІ ЎСПАМІНЫ

Вялікая Айчынная вайна пакінула пасля сябе моцны адбітак на лёсе жыхароў нашай краіны і далёка за яе межамі. Кожны з нас, распытаўшы ў сваіх

дзядуль і бабуль, можа напісаць пра страшэнныя падзеі, якія адбываліся ў той час, пра скалечаныя душы людзей, пра дзяцей, якія страцілі бацькоў і раней часу станавіліся дарослымі. І маіх родных «гэтая навала» не абышла. Вось некалькі гісторый з ужо мінулых часоў…

Помнік мужнасці і самаадданасці

Мяне заўсёды цікавіла: чаму ў пераломных момантах адны ідуць шляхам дабра, а іншыя выбіраюць шлях здрады? Што падштурхоўвае людзей на тыя ці іншыя дзеянні? Чаму ёсць тыя, якія ахвяруюць сваім жыццём, і тыя, якія ахвяруюць жыццём людзей, якія знаходзяцца побач з імі. У пэўнай ступені адказ на гэта пытанне можна адшукаць у наступнай гісторыі.

Быў пачатак 1942 года. Браты Мінчуковы Ціхон і Павел Цярэнцьевічы, выхадцы з вёскі Чыгірынка Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, ішлі перадаць важнае паведамленне партызанскаму атраду, які знаходзіўся каля вёскі. З імі побач быў іх сябра, аднак ён аказаўся паліцаем і здаў немцам сваіх сяброў. Братоў схапілі, пачалі распытваць, дзе ў вёсцы схаваны боепрыпасы, дзе знаходзяцца іншыя партызанскія атрады. Але браты, ведаючы, што калі яны прамовяць хоць слова, тады расстраляюць ўсіх жыхароў іх роднай вёскі. Нягледзячы на жорсткія катаванні, не выдалі сваякоў і былі расстраляны. Потым па наводцы таго ж паліцая быў расстраляны амаль увесь партызанскі атрад. Сам паліцай, быццам бы паранены ў руку, схаваўся недзе ў Сібіры, змяніў прозвішча, але яго ўсё роўна знайшлі і асудзілі як ворага народа. А мужным братам Мінчуковым і членам партызанскага атрада ў 2004 годзе паставілі помнік, які стаіць каля вёскі Чыгірынка. Гэта падзяка той самаадданасці, мужнасці, упартасці, якую праявілі яе жыхары. Гэта своеасаблівы знак, гэта вера ў тое, што добрыя ўчынкі ніколі не застануцца незаўважанымі. Калі чалавек здрадзіў, а на маю думку ў такіх выпадках чалавек здрадзіў у першую чаргу сабе, тады ён можа быць упэўнены, што раней ці пазней прыйдзе пакаранне.

Мы будзем падаць,
Зноў уздымацца.
Ісці ўперад,
За мару змагацца.

І недзе побач з намі
Будзе нехта крычаць:
«Перамога, браты,
Тут, каля нас!»!

Мая цудоўная прабабуля

Цяжкі лёс быў і ў маёй прабабулі, Мінчуковай Надзеі, якая пасля забойства мужа, Мінчукова Ціхона Цярэнцьевіча, засталася з двума малымі дзецьмі. Яе некалькі разоў выклікалі на допыт. Калі яна прыйшла на допыт у першы раз, яе пачалі распытваць, дзе знаходзіцца склад зброі. Яна ведала, але нічога не сказала. Тады яе паставілі да сцяны, і нямецкія салдаты пачалі страляць каля яе. Кулі пралятаілі побач, і Надзея ведала, што ў любую хвіліну адна шалёная куля можа папасці ў яе. Я не ведаю, што адчувае чалавек у такія хвіліны, але мне здаецца, што гэта быў самы жудасны момант у жыцці маёй прабабулі. Момант,

калі ты знаходзішся паміж жыццём і смерцю. Ведаючы сваю прабабулю, магу з упэўненасцю сказаць, што ў тыя хвіліны яна клапацілася не пра сябе, а пра сваіх дзяцей. Але прабабулі вельмі пашанцавала: сярод афіцэраў быў наш разведчык, які заступіўся за яе, яна была адпушчана. Потым жанчыну яшчэ некалькі разоў выклікалі, але больш не стралялі ў яе. Пасля таго мая прабабуля вымушана была хавацца разам з дзецьмі па балотах. Але яна змагла выжыць і выгадаваць сваю дачку Святлану і яе старэйшага браціка Уладзіка. Яна заўсёды была мужнай, але ў той жа час і пяшчотнай жанчынай, якая несла дабрыню. Яна падбадзёрвала салдат сваімі песнямі, у яе быў цудоўны голас, звонкі, чысты. І нягледзячы на тое, што яна была вельмі прыгожай жанчынай і да яе заляцаліся многія, яна больш не выходзіла замуж і засталася вернай майму прадзядулю, якога кахала ўсё сваё жыццё.

Праведнік народаў свету

На вайне заўсёды знойдзецца месца добрым учынкам, пяшчоце, узаемадапамозе. Аб гэтай дабрыні, якая захавалася, нягледзячы на ўсе тыя рэчы, што адбываліся вакол, мая апошняя гісторыя.

Сям'я Павукоў, якая складалася з бацькоў і іх чатырох дзяцей, пражывала ў вёсцы Чахец каля Кобрына. У вясковай школе вучыў дзяцей яўрэй Юдзевіч Маісей, сям'я якога сябравала з сям'ёй Павукоў, а менавіта сябравалі гаспадары сямействаў, Іван Павук і Маісей. Надышла вайна. І як усім вядома, усіх яўрэяў стараліся знішчыць. Аднойчы ноччу, калі яўрэяў пачалі вывозіць у яўрэйскае гета, Юдзевіч прыйшоў шукаць падтрымкі ў свайго сябра Івана.



Іван Павук схаваў сям'ю свайго сябра, хаця добра ведаў, што за гэта расстраляюць усю яго сям'ю. Яго дзеці, старэйшая дачка Лідзія і яе брат, мой дзядуля, Аляксандр, насілі Рэгіне, Маісею ежу, робячы выгляд, быццам бяруць ежу, каб бавіць свой час на рэчцы. Потым хаваць Юдзевічаў стала вельмі небяспечна. Тады гаспадар сямейства намаляваў карту — гэта быў шлях да партызанскага атрада. Але сам ён не мог пайсці, бо за ім сачылі немцы. Тады зноў Лідзія і Аляксандр дапамаглі сям'і свайго любімага вясковага настаўніка. Яны давялі іх да партызанскага атрада.

Пасля вайны сям'я Юдзевічаў пераехала ў Ізраіль. Доўгі час яна перапісвалася з сям'ёй Павукоў. Потым яе след знік. Але ў 80–х гадах майму дзядулю прыйшло пісьмо з Нью–Йорка ад дзяцей Юдзевічаў. Аказалася, што іх сям'я праз некаторы час пераехала з Ізраіля ў Нью–Йорк, бацькі змянілі прозвішча, сям'я Павукоў таксама пераехала, таму след на некаторы час знік. Але і да сённяшняга дня сям'я Юдзевічаў удзячна сям'і Павукоў. А ў 2001 годзе майго дзядулю выклікалі ў Мінск у пасольства Ізраіля, дзе ён атрымаў грамату «Праведнік народаў свету» і бронзавы медаль за актыўны удзел у абароне яўрэяў.

Зараз мой дзядуля выкладае асновы медыцыны ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Гэта вельмі разумны і цікавы чалавек.

Дар'я ШУШКЕВІЧ

Студэнтка факультэта тэхналогіі арганічных рэчываў (ТАР)

Кіраўнік: Жукоўская Т. У., выкладчык кафедры беларускай мовы БДТУ

ЖЫЦЦЁ І ЗМАГАННЕ ІЛЬЯНСКІХ ЯЎРЭЯЎ

Уводзіны

Мэта дадзенай працы – акрэсліць пэўную этнаканфесійную структуру яўрэйскага пасялення Ільля Вілейскага раёна, ахарактарызаваць працэсы ўзаемадзеяння і ўзаемапранікнення культур, вылучыць кола пытанняў і праблем, якія патрабуюць далейшага вывучэння і рашэння, сфарміраваць у моладзі гістарычнае мысленне і спагаду да ахвяр масавых забойстваў падчас ваенных падзей. Сярод праблем айчыннай гісторыі важнай і актуальнай застаецца праблема міжнацыянальных адносін на Беларусі, якая слаба даследавана да гэтага часу. Вядома, што склад насельніцтва ўплывае на этнічную і нават палітычную сітуацыю ў краіне. Палітыка дзяржавы так ці інакш адлюстроўвае наяўную этнічную сітуацыю, улічвае інтарэсы розных этнасацыяльных і этнаканфесійных груп насельніцтва, рэгулюе міжэтнічныя ўзаемаадносіны прававымі актамі і практычнай работай выканаўчай улады. Сапраўдная цывілізаваная палітыка, што забяспечвае роўнасць правоў і гармонію міжэтнічных узаемаадносін, магчыма толькі ў суверэннай дэмакратычнай дзяржаве, якой з'яўляецца Беларусь. У сувязі з гістарычнымі ўмовамі існавання беларускага народа, палітычнымі, сацыяльнымі працэсамі, што адбываліся на нашых землях, беларусы заўсёды былі вымушаны жыць побач з вялікай колькасцю іншых нацыянальнасцей. Пры гэтым адносіны нашага народа з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей складваліся па-рознаму, але часцей за ўсё яны насілі мірны характар: беларусы, рускія, палякі, яўрэі і г. д. побач жылі, гаспадарылі, прымалі ўдзел у розных унутраных і знешнепалітычных працэсах. Немалаважную ролю ў гэтых з'явах адыгралі такія рысы характару і асаблівасці менталітэту беларусаў як талерантнасць, верацярпімасць, гасціннасць. Як зазначаў вядомы беларускі гісторык Л. Лыч: «Культура кожнага чалавека і народа ўвогуле найлепш за ўсё вызначаецца тым, як яны ставяцца да сваёй гісторыі, духоўных традыцый папярэдніх пакаленняў. Паважаючы сваё, трэба шанаваць і створанае іншымі народамі, бо чым больш культурных каштоўнасцей знаходзіцца ў іх распараджэнні, тым багацейшы духоўны патэнцыял сусветнай цывілізацыі».

1. З гісторыі ўзнікнення назвы мястэчка Ільля

Вядома, што чалавек не выбірае радзіму. Яна даецца яму разам з матчыным малаком аднойчы і на ўсё жыццё. Дзе б потым ён ні быў, дзе б ні жыў, куды б ні закінуў яго лёс, а сэрца помніць той сціплы куточак вялікай Зямлі Людзей, які падарыў першыя чалавечыя радасці.

Вёска Ілья, у першаснове якой ляжыць яўрэйскае пасяленне, размешчана прыкладна за 30 км ад раённага цэнтра Вілейка. Пасяленне закладзена на заходнім беразе ракі Ілья, якая з'яўляецца прытокам Віліі, што нясе свае воды ў Нёман. Паходжанне мястэчка ахутана глыбокім пластам гісторыі. Ёсць розныя легенды пра яго паходжанне, паводле якіх заснаванне Ільі можна аднесці да XIV–XV стст. Больш грунтоўныя звесткі маюцца ў польскім гістарычным геаграфічным слоўніку (1882 г., ч. 3 , ст. 258 – 269) згодна з якім ўжо ў 1634 годзе ў мястэчку існавалі хрысціянская царква, яўрэйская сінагога. Там жа сцвярджаецца той факт, што мястэчка Ілья пачало свой рост ад асабняка Радзівілаў, гаспадаром якога быў чалавек па імені Ілья. Другая легенда адносна паходжання назвы Ілья таксама мае гістарычны фон. У канцы XIV стагоддзя літоўскім княствам кіраваў князь Вітаўт, які ўсё сваё жыццё мужна змагаўся супраць татар і перамог іх. Вялікі князь сваіх воінаў за рыцарскія подзвігі надзяляў асабнякамі; гэтым ён імкнуўся дасягнуць дзвюх мэт адначасова: пашырыць граніцы свайго валадарства і мець паўсюдна адданых яму людзей. Адным такім рыцарам, якому падараваў Вітаўт землі, да якіх належыць Ілья, быў Радзівіл. Гэты Радзівіл і стаў першым уладаром у дынастыі князёў Радзівілаў.

Старажытная легенда паведамляе: «Калі гэты Радзівіл апынуўся на падараваных землях, ён пачаў выбіраць месца для свайго асабняка. Вакол шумелі лясы, якія ўражвалі сваімі высачэзнымі соснамі. За цэлы дзень князь так і не здолеў выбраць годнае месца для пасялення. Вечарэла. Сонца садзілася за лес. Стомлены князь вырашыў прыпыніцца на ўскрайку лесу і імкліва пакрочыў туды, але раптам наткнуўся на раку, яна перапыніла яго шлях. Князь вырашыў крыху адпачыць, сабрацца з сіламі, каб прадоўжыць свой шлях. Тым часам ноч ахутала зямлю, сон змарыў воіна. Яму ці то ў яве, ці то ў сне з'явіўся прарок Эліджа, які ласкава шапнуў: "Не бойся , на світанні табе прыйдзе рашэнне, я буду з табой, ты будзеш уладарыць гэтай зямлёй, а твае нашчадкі стануць вядомымі людзьмі". Прачнуўся ў хваляванні князь, не ўбачыў прарока Эліджа (Ілію), але прысягнуў яму, што пабудуе на рацэ асабняк і назаве гэта месца Ілія , што і было зроблена».

Князь Вітаўт добра адносіўся да літоўскіх (беларускіх) яўрэяў, даў ім магчымасць будавацца, абжываць мясцовасць. З іх асяроддзя выйшлі першыя арандатары, гандляры, падаткавыя чыноўнікі. Мястэчка стала яўрэйскім асяродкам.

Хоць мястэчка было невялікім і небагатым, але яно стала цэнтрам Торы. Адсюль пайшлі вядомыя людзі. Сама атмасфера мястэчка спрыяла духоўнасці. Равіны Ільі імкнуліся аб'яднаць свае намаганні ў выхаванні духоўна багатых людзей. На жаль, аб усіх равінах няма дакладных звестак. Але гісторыі вядомы імёны равінаў, якія паходзяць з Ільі, Менашэ ад Ільяна, Бена Пората, равіна Лейбы Шапіры (Лейбэйл Кабнер), равіна Рэувена Хелвіа Левіна (запрошаны ў Дзвінск), равіна Самуэла Бена Зеліга, равіна Моша Шломы Хары, равіна Аврахама Элі Рэмеза.

Мястэчка Ілья было падобна на тысячы іншых месц, але між тым адрознівалася ад іншых, мела свае характэрныя прыкметы: своеасаблівыя традыцыі, абрады, адукацыйную сістэму. Многіх жыхароў называлі «шоў-

кавымі мяшочкамі», што адлюстроўвала іх характар лепш за ўсё: бедныя, але ганарлівыя. І хоць большасць яўрэйскага насельніцтва жыло небагата, як кажуць, «з падцягнутымі паясамі», але яны ніколі не звярталіся да іншых, больш багатых, з працянутай рукой, не прасілі дапамогі. Калі некаторыя ад недаядання худзелі, то, выходзячы на людзі, расціралі свае шчокі, каб здавацца больш румянымі і здаровымі. Эканамічная аснова была бедная, але сэрцы яўрэяў былі звернуты да духоўнасці. Кожнае новае пакаленне строга выхоўвалася ў рэлігійнасці. У Ільі вялікая ўвага звярталася на выхаванне мужчынскай часткі насельніцтва і моладзі ў духу рэлігійных каштоўнасцей.

2 Трагічныя водгукі Вялікай Айчыннай вайны: Халакост

Няшмат засталося сведкаў тых жудасных часоў, але мне пашчасціла сустрэцца з імі, засталіся дакументальныя архіўныя сведчанні. Успаміны старажылаў ускалыхнулі маё сэрца. Я шмат чаго даведалася пра культуру маіх землякоў-яўрэяў, перажыла пачуццё нянавісці да тых, хто сеяў смерць і гвалт над мірным насельніцтвам у гады вайны.

Складаны, трагічны шлях прайшлі ільянцы за час існавання мястэчка, але не зарубцаваліся раны на сэрцы, якія нанесла ім Вялікая Айчынная вайна. Перачытваючы архіўныя старонкі, слухаючы аповеды-ўспаміны, звязаныя з народным горам, з Халакостам, як бы пражываеш жыццё гэтых людзей, разам з імі пакутуеш, чакаючы развязкі трагічных падзей тых страшных гадоў вайны.

Вядома, што ў час Вялікай Айчыннай вайны яўрэйскае насельніцтва панесла вялікія страты – загінула каля 80% беларускіх яўрэяў. Не абмінула трагедыя і Ілью.

Архіўныя дакументы сведчаць: «Илья – село в Вилейском районе (с 1959 г.) Минской области, расположено на р. Илия, в 37 км от Вилейки и 75 км от Минска; известно с XV в., с 1793 г. в Российской империи, местечко Вилейского уезда Виленской губернии, в 1847 г. – 894 еврея, в 1897 г. – 829 (из 1.431 общего населения); в 1921-1939 гг. в составе Польши, с 1939 г. в БССР, в предвоенные годы проживало 586 евреев; оккупировано немецкими войсками с 3 июля 1941 г. по 3 июля 1944 г., которые убили в Илье и Ильянском районе 1495 чел.; есть братская могила советских воинов и партизан, могила жертв фашизма, однако упоминание о евреях отсутствует».

Тым не менш шматлікія архіўныя дакументы, расказы старажылаў канстатуюць трагедыю ільянскіх яўрэяў. Ніжэй прадстаўлены дакументальныя матэрыялы аб знішчэнні яўрэяў у Ільі:

«Илья (Ілля, Ilya, Ilja): о гибели общины существуют противоречивые сведения. Рассказы местных жителей отличаются от сведений, содержащихся в акте комиссии содействия ЧГК по Ильянскому району от 19 марта 1945 г. Не ясно идёт ли речь об одних и тех же погромах. Свидетели дали показания о событиях 16 и 17 марта 1942 г., тогда как комиссия ЧГК описывала акцию в мае 1942 г. Количество жертв в первом и втором случаях (более 700 чел.) совпадает.

Версия первая. Вечером 16 марта 1942 г. в местечко прибыл отряд карателей во главе с гестаповцем. На следующий день немцы и полиция собрали

евреев на площади, сбор закончился к 15.00 часам. Сильная охрана из жандармов не оставляла возможности бежать. Всех погнали к недостроенному овощехранилищу и заперли в большом сарае. Выводили по два-три человека, ставили около ямы и расстреливали. К вечеру сарай опустел, яму облили бензином и подожгли, когда пламя охватило поверхность, раздались крики, проклятия и стоны. Кричали те, кто прыгал в яму сам, не ожидая выстрелов. После расстрела немцы и полицейские обходили дома в гетто и обнаружили ещё 60 чел. Евреев отвели к яме, где ещё горел огонь, расстреляли, а трупы столкнули вниз. Так погибло более 700 евреев. Имущество убитых разграбили (Иван Танкович (1905 г.р.). Иосиф Жабко (1893 г. р.) уточнял, что вечером 16 марта немцы позвали старосту гетто Абрама Мотке и приказали привести 10 самых красивых еврейских девушек (по другим сведениям 8 – Л. С.). Среди них были Сара и Хая Гринблат, Рыся Копелевич, Бася Риер, Сара Сосман, Хая Бруйда. Их изнасиловали, а на утро расстреляли. Облив яму бензином, каратели бросили ручные гранаты. Евн Неухович Риер (1914 г. р.) вспоминал, что несмотря на то, что сцена расстрела была ужасной, каратели смотрели на неё с улыбкой. После расстрела в местечке схватили не 60, а 64 чел. Всего по мнению Риера, в Илье и близлежащих сёлах были убиты 799 жителей, из которых 51 были не евреями. Версия вторая. В мае 1942 г. из Вилейки в Илью прибыл карательный отряд из гестапо в 200 чел., которых сопровождали 30 белорусских полицейских. По ул. Советской вырыли яму размером 50 м х 30 м Людей заставили раздеваться и становиться на краю, расстреливали в упор из пулемета и автоматов. Когда яма заполнилась, её облили бензином и бросили 100 кг зажигательную бомбу. Трупы тлели три дня. Подобным образом поступили в Вязыне и Ольковицах. Всего было расстреляно и сожжено 745 чел., включая 150 детей в возрасте до десяти лет. В акции принимали участие: офицеры Корф, Макс, капитан Страсбург, обер-вахмейстер Фрицель, шеф жандармов м. Илья подофицер Бернард Вырвинг, начальник полиции Николай Скабей, полицейские Николай Давыдович, Николай Соколовский, Мечислав Кротович, Степан Селявка, Пётр Кононок, Михаил Кожура и Федор Голубович» (Оригинал источника хранится в ГАРФ, ф. 7021, оп. 89, д. 6, лл. 5-55; НАРБ, ф. 861, оп. 1, д.10, лл. 26, 30, 34; ф. 4, оп. 29, д. 112, лл. 457-458; копии в Архиве Яд Вашем, М-33/1139).

Маюцца і іншыя падобныя дакументы. Напрыклад, пратакол допыту сведкі Э. Э. Мелнгайліса ад 27 кастрычніка 1971г. у г. Мінску. Той паказваў: «У першай палове чэрвеня ноччу нас паднялі па трывозе, загадалі ўзяць з сабою зброю і 2-3 скрыні ручных гранат. Выехалі пасля поўначы на 3 грузавых аўтамашынах і на 2 легкавых. Першымі ішлі легкавыя аўтамашыны, затым грузавыя. Куды мы едзем, нам сказана не было.

У першай легкавой машыне ехаў Граве з двума намеснікамі. Машыну вёў пастаянны шафёр Граве па імені Тэадор. Усе ў карычневай форме, у іх на левым рукаве была нашыўка са свастыкай. Ні гэтых асоб, ні вадзіцеля я не ведаў, але мяркую, што машына была не з СД. Гэтыя асобы збіралі каштоўнасці, якія належалі яўрэйскаму насельніцтву. Гэта былі гаспадарнікі, мы іх называлі

«фазанамі». Астатнія былі ў нямецкай форме, на плячах у кіцеляў замест пагонаў былі два пераплеценыя шнуры. Потым я даведаўся, што гэтых людзей называлі «зондэрфюрэрамі». У першай і другой машынах знаходзіліся латышы, сярод якіх, магчыма, было некалькі перакладчыкаў. У кожную машыну памяшчалася прыкладна 25 чалавек. У трэцяй машыне былі немцы ў форме СД і жандармерыі, крымінальныя чыноўнікі, сярод якіх былі і латышы, большасць была ў форме СД.

Ехалі мы праз лес і кустоўе. На шляху следавання была вёска ці асобныя дамы. Пад'язджаючы да аднаго з дамоў, Граве застрэліў з пісталета, прыстасаванага для стральбы ў начны час, кошку.

У хуткім часе спыніліся. Я і яшчэ некалькі чалавек уставілі ў ручныя гранаты дэтанатары, пасля чаго паехалі далей. Перад світаннем прыехалі ў адну вёску, як я пазней даведаўся, гэта была вёска Ілья. Вёска вялікая, некалькі вуліц, ёсць плошча, недалёка ад вёскі лес. На плошчы мы спыніліся.

У вёсцы Граве ўжо чакалі 5-6 немцаў у форме ахоўнага колеру. Адзін з іх, у чыне капітана, далажыў Граве. Акрамя гэтых асоб было многа паліцэйскіх у чорнай форме, магчыма, чалавек 30 – 50.

Злева ад базарнай плошчы знаходзілася 20 – 30, а можа і больш жылых дамоў, абгароджаных калючым дротам, у якіх знаходзіліся асобы яўрэйскай нацыянальнасці. Латышам і паліцэйскім быў дадзены загад ачапіць месца знаходжання яўрэяў, прычым паліцэйскім аддаваў загад немец, які сустракаў Граве, а латышам – Граве на латышскай мове (Граве – начальнік СД у Вілейцы). Ён сказаў нам, што мы прыбылі не для аперацыі супраць партызан, а для знішчэння яўрэяў і спытаўся, хто з латышоў хоча прыняць удзел у растрэле яўрэяў. Такіх знайшлося 7 – 10 чалавек. У гета ўвайшлі ўсе немцы, перакладчыкі, латышскія следчыя, усе асобы, якія ехалі ў легкавых аўтамашынах і ўсе асобы, якія сустракалі Граве ў Ілі.

Я бачыў, як з бліжэйшых да нас дамоў пачалі выганяць асоб яўрэйскай нацыянальнасці, у асноўным гэта былі дзеці, старыя, жанчыны. Мужчын было вельмі мала. Я бачыў, як гэтых асоб пагналі за дамы, у поле, уніз, пад ухіл. Пасля таго, як выгналі ўсіх яўрэяў, асобы ў форме жандармераў, СД і ў чорнай форме шукалі каштоўнасці і людзей, што схаваліся. Асабіста я не бачыў, але потым мне расказвалі, што ў дамах знаходзілі яўрэяў, якія хацелі схавацца.

Прыкладна праз паўгадзіны пасля таго, як сагналі ўсіх яўрэяў, я пачуў стралянінy з аўтаматаў і пісталетаў. У большасці выпадкаў гэта былі асобныя стрэлы. Былі чуваць крыкі жанчын і дзяцей. Стралялі прыкладна на працягу 2–3 гадзін. У час расстрэлу да аўтамашыны, дзе я знаходзіўся, падыходзілі немцы ў форме СД і дадаткова бралі патроны. Расстрэл адбываўся за вялікім хлявом. Пасля заканчэння стральбы, прыкладна праз гадзіну, большасць вярнулася да аўтамашын. Латышскае ачапленне гета было знята, засталіся толькі паліцэйскія ў чорнай форме. Праз некаторы час вярнуліся Граве, яго намеснікі і немцы, якія прыехалі на другой аўтамашыне .

Калі вярнуліся нашы латышы, яны расказвалі мне, што ў асоб яўрэйскай нацыянальнасці было адабрана шмат розных каштоўнасцей, асабліва многа было залатых манет царскай чаканкі. Потым я бачыў, што гэтыя каштоўнасці, не памятаю, у скрынях ці ў сумках, былі пагружаны ў другую легкавую машыну. Пасля за-

канчэння гэтай акцыі, у другой палове дня, усе селі па машынах і паехалі ў Вілейку. Паліцэйскія ў чорнай форме і асобы, якія нас сустракалі ў Ільі, засталіся на месцы.

Пасля вяртання ў Вілейку ў памяшканні СД была наладжана гулянка. Мне здаецца, што на гулянку былі запрошаны таксама радавыя, што прымалі ўдзел у расстрэле ў Ільі. З уласных назіранняў, а таксама па расказах у час выпіўкі з латышамі, я зразумеў, што ўсяго у Ільі было расстраляна прыкладна 300 – 400 чалавек. Працягваючы службу ў СД Вілейкі, я ведаў, што пад кіраўніцтвам Граве былі выезды на акцыі ў іншыя населеныя пункты. Расстрэльвалі, у асноўным, яўрэяў».

З паказанняў ваеннапалоннага Франца Геса: «У Ільі расстраляны каля тысячы яўрэяў за градамі, абліты бензінам і спалены. У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічалі салдаты з паветранай часці, латышы і беларускія паліцэйскія, якія ўваходзілі ў падпарадкаванне нямецкай жандармерыі».

Розныя архіўныя дакументы даюць неаднастайныя звесткі па колькасці забітых і датах расстрэлу. Звярнуўшыся да мясцовых жыхароў, што ў нейкай меры былі сведкамі забойства ільянскіх яўрэяў, я ўдакладніла некаторыя факты. Трэба адзначыць, што пра яўрэяў ніхто, з кім я размаўляла, ні слова дрэннага не сказаў. Усе толькі шкадавалі іх і цяпер нават плачуць, успамінаючы тыя страшныя дні. Жанчыны кажуць: «Не хочацца ўспамінаць гэты страх. Мы стараемся пра гэта не успамінаць…».

З успамінаў жыхароў вёскі Ілья. Ад ільянскіх жанчын (Барысевіч Ніна Браніславаўна, 1928 г. н., Васільева Галіна Пятроўна, 1929 г. н., Вараўка Марыя Пятроўна, 1930 г. н.) даведалася, што сапраўды яўрэі былі сагнаны ў гета (каля цяперашняй сельскай бібліятэкі). На іх адзенне былі нашыты адметныя знакі ў выглядзе шасціканцовых зорак жоўтага колеру. Немцы здзекаваліся з іх, білі без усялякай прычыны. Кожны дзень ганялі на распрацоўку лесу.

Усе жанчыны прывялі такі факт. Калі немцы пачалі выганяць яўрэяў з хат, да іх звярнуўся равін. Ён сказаў прыкладна такія словы: «Яўрэі! Настаў наш смяротны час! Сёння мы павінны памерці. Не супраціўляйцеся, не хавайцеся! Гэта наша кара». І яго паслухалі, і пайшлі за ім...

Толькі зноў жа жанчыны называюць розныя месяцы: ці то сакавік («Бо добра помню, што снег яшчэ ляжаў, а на ім крывавыя плямы»), ці май («Калі праз некалькі дзён нас прыгналі закопваць целы, то зямля была мяккая, не мёрзлая».

Праўда, лічбы яны прытрымліваюцца «700 – 750 чалавек». Пры тым, кажуць, што гэта былі толькі яўрэі з Ільі. Больш ні адкуль іх сюды не прывозілі.

У жывых маглі застацца толькі тыя з іх, хто яшчэ да забойства ў 1942 годзе пайшоў у партызаны, ці тыя (але іх магло быць вельмі мала) хто ўцёк з-пад куль і застаўся жыць.

Жыхарка Ільі Марыя Крэнь (1931 г. н.) расказвала, што яе маці прапаноўвала сям'і каваля (яны былі яўрэямі), схаваць у сябе іхняга хлопчыка. Але бацькі сказалі: «Куды мы — туды і нашы дзеці». Так яны і загінулі ўсёй сям'ёй, як і астатнія яўрэйскія сем'і.

Гісторыя пра карову Лысуху, дзяўчынку Берту, бабулю Розу і Праведнікаў свету запісана са слоў настаўніцы гісторыі Ільянскай школы. А яна ў сваю чаргу

прывезла яе з Мінска, з канферэнцыі па Халакосту: было гэта ў час вайны. Мы жылі, як і цяпер, у вёсцы Альхоўка за два кіламетры ад Ількі. А ў Ількі да вайны было многа яўрэяў. Яны трымалі невялічкія крамы, майстэрні. Мы таксама да іх хадзілі купляць солі, цукру, запалак.

Калі прыйшлі немцы, то яўрэйскія сем'і ўцякалі, хто куды. Бо немцы вельмі іх не любілі, зганялі ў гета, расстрэльвалі.

Адной яўрэйскай сям'і Сямёна Хелвіна ўдалося ўцячы ў лес. Яшчэ да гэтага аддалі яны сваю карову, якую любілі і якая была іхняй карміцелькай, сваім суседзям- беларусам.

А дзе дзецца ў лесе? Ды і такіх сямей яўрэйскіх было многа. І старыя, і хворыя, і малыя – такі быў склад яўрэйскіх сем'яў, што сталі шукаць абарону ў партызан. А партызанскія атрады не маглі іх прыняць, але не маглі і пакінуць.

Тады камандзір атрада загадаў сваім партызанам на чале з Кісялёвым Мікалаем Якаўлевічам весці гэтыя сем'і (а іх было каля 250 чалавек) праз лінію фронту на савецкую неакупіраваную зону. А гэта трэба было прайсці 300 кіламетраў: і хворыя, і дзеці, і старыя павінны былі ісці толькі ноччу і толькі лясамі.

Бабуля Роза Сямёнаўна Хельвіна была таксама хворай. У яе моцна балела нага, пачыналася гангрэна. Яна стала прасіць сваю сям'ю пакінуць яе ў лесе. Хоць і вельмі цяжка было гэта зрабіць, але бабулю пакінулі, нічога не сказаўшы камандзіру.

Дзяцей неслі ў мяшках. Тыя плакалі, прыходзілася іх пужаць, прасіць, каб маўчалі. Але адна дзяўчынка, Берта Кравец, плакала больш за ўсіх. Тыя, хто ішоў разам з гэтай сям'ёй, спыніліся, сабраліся разам і вырашылі, што ад гэтага дзіцяці трэба пазбавіцца. Бо яна сваім плачам можа загубіць усіх. Як гэта не страшна сказаць, але... рашылі ўтапіць. Бацька з маці вялі яе ўжо да рэчкі, як пачуўся голас Кісялёва: «Што тут робіцца?». Яўрэі растлумачылі. Тады Кісялёў, рускі па нацыянальнасці, узяў дзяўчынку на рукі і сказаў: «Мы павінны дайсці ўсе». Больш дзяўчынка не плакала. Яе нёс Кісялёў.

Якой цяжкай была тая дарога, можна толькі сабе ўявіць! Самымі страшнымі аказаліся апошнія кіламетры – гэта пераход праз лінію фронта. Але, на дзіва, выйшлі ўсе на савецкую тэрыторыю, чыгуначную станцыю у Калінінскай вобласці. Кісялёў выдаў усім дакументы, сказаў, каб садзіліся на паязды і ехалі ў глыб Расіі.

Сям'я Хельвіных трапіла ў Сярэднюю Азію. Два гады пражылі яны там, пакуль даведаліся, што Беларусь вызвалена ад фашыстаў. Адразу напісалі пісьмо сваім суседзям у Беларусь. Паміж іншым запыталіся: «Як там наша карова?». Колькі ім было радасці, калі атрымалі пісьмо з Беларусі, а там пісалі, што ваша карова жывая. А галоўнае – жывой была і іхняя бабуля. Яе выратавалі партызаны, аднеслі ў сялянскую хату. Да надзейных людзей. Там яе вылечылі. Потым жанчыну ўзялі ў партызанскі атрад, дзе яна пякла хлеб партызанам да канца вайны.

З матэрыялаў школьнага краязнаўчага музея вядома, што за выратаванне бабулі Розы з сям'і Хельвіных, ў 1996 годзе былому партызану Сафонаву спецыяльнай камісіяй з Ізраіля прысвоена званне Праведнік свету. Былы партызанскі кіраўнік М. Кісялёў пасля вайны працаваў у Міністэрстве знешняга

гандлю. Толькі ў 2006 годзе родныя змаглі сабраць усе доказы яго подзвігу па выратаванні ў час вайны 250 яўрэйскіх сем'яў. Гэта званне прысвоена і яму. Дакументы Праведніка свету былі ўручаны дзецям М. Кісялёва ў красавіку 2006 года.

Вось такая быль пра карову Лысуху, бабулю Розу, дзяўчынку Берту і Праведнікаў свету.

У архіўных дакументах засталіся сведчанні Халакосту ў Ільі, якія ўражваюць сваёй жорсткасцю.

З успамінаў сведкі і ўдзельніка падзей Йона Рыара: «Я толькі паспеў перакінуцца з бацькам некалькімі словамі, як пачуў грохат каваных салдацкіх ботаў. Немец прывёў з сабой Zoshka Geitlitz (з-за цяжкасці перакладу ўказваецца ангельскі варыянт імя) і прыказаў нам сабраць целы забітых яўрэяў ў памяшканнях, па вуліцах, дварах, па дарозе ў лес і пахаваць іх. Я спрабаваў адгаварыцца, спасылаючыся на здароўе, але меня жорстка збілі. З ран маіх ішла кроў, але мы, з такім жа бедалагам, збіралі целы сваіх аднавяскоўцаў. Вось Міры Рубі, брат майго сябра Дэвіда.... У хаце Шломы Залмана да глыбіні душу ўразіла сцэна бесчалавечнай расправы: акрываўленае цела маладой маці, а на ёй дзіцё. Яно таксама мёртвае. У двары кузняца Якава ляжала яго жонка і двое дзяцей, якія сцякалі крывёй. Раптам чую стрэлы. Абярнуўшыся, з жахам убачыў майго бацьку і брата, якія былі ўжо мёртвымі. Гнеў і слёзы душылі мяне, але мы працягвалі збіраць целы забітых. Цела Тэйбл Акмана ўжо рвалі дзве свінні. Такім чынам, мы сабралі каля сотні цел».

Немцы змаглі пераканаць яўрэйскае насельніцтва ў тым, што яны застануцца жывымі, калі будуць выконваць усе патрабаванні немцаў. Хоць у Радашковічах, Маладзечне, Вілейцы і Даўгінаве яўрэі былі ўжо знішчаны, немцы яшчэ не зачапілі яўрэяў у Ільі. Яўрэі Ільі верылі гэтаму, спадзяваліся, што яны выжывуць і разам з тым страх ахутваў іх. Моладзь, у адрозненне ад дарослай радні, адчувала ілюзорнасць гэтай надзеі і сцвярджала, что выратаванне – ў лесе.

Тое, чаго баяліся яўрэі, сапраўды здзейснілася. Жудасны дзень настаў. На досвітку 17.03.1942 фашысты акружылі Ілью і пачалі выганяць яўрэяў з хат сілай. Праз кароткі час яўрэі Ільі: пажылыя, жанчыны і дзеці стаялі на базары, акружаныя немцамі, зброя якіх была нацэлена на іх.

3. Жыццяпіс ільянскіх яўрэяў ва ўспамінах старажылаў вёскі Ілья

Жыхарка вёскі Ілья Александровіч Раіса Макараўна (да замужжа – Мяховіч) дзеліцца сваімі ўспамінамі пра побыт яўрэяў, іх абрады, узаемаадносіны паміж сабой і іншымі жыхарамі. Жанчына распавядае: «На яўрэйскіх могілках у Ільі бедных яўрэяў хавалі асобна, на адведзенай палове могілак – з боку вёскі Дварэц, а багатых хавалі з другога боку – ад Ільі, гэта была іх палова могілак. На кожнай палавіне стаяла свая хатка, у ёй былі спецыяльныя насілкі, каб насіць памерлых і была спецыяльная кушэтка. Калі яўрэй паміраў, то яго клалі на падлогу дома ў хаце, мылі, апраналі. Шылі спецыяльны саван, і яго адзявалі на памерлага, абмотвалі ўсё цела, нават твару не было бачна. Пакрывалі чорнай накідкай і неслі на могілкі бягом, бягом па вуліцы і далей. Жанчыны на могілкі не хадзілі. Не

плакалі, толькі спявалі малітвы. Дол на могілках абстаўлялі дошкамі і на дно клалі дошкі. Туды апускалі нябожчыка, зверху закрывалі дошкамі і засыпалі зямлёй. Могілкі былі ў тыя гады агароджаныя плотам з высокіх дошак так, што і шчыліны не было ў плоце. У плоце гэтым былі дзверы і яны былі на замку. Але Шушкевіч Аляксандр Пятровіч з Ількі сцвярджае, што плота на Ільянскіх могілках не было.

Некаторыя мясцовыя людзі яўрэяў недалюблівалі, бо яны былі хітрыя. Але ж яўрэі заўсёды дапамагалі вяскоўцам, калі кароўка здохне, ці хто, крый бог, пагарэў. Збіралі грошы і прыносілі такім. Ды і так яны, бывала, заўсёды давалі тавары на павер. Толькі ж гэтыя нашы мясцовыя п'яніцы ці шалдоны, як іх звалі, абманвалі яўрэяў. Яны прасілі ў іх нешта, а потым не аддавалі пазычанае. Яўрэі нават лепшыя былі за нашых. Сярод нашых былі грубыя, жадныя, не пагадлівыя. А яўрэі не.

«Мы ім прадавалі хрэн, пясок жоўценькі чысціць самавары» – расказвае Раіса Макараўна. Я і сама насіла яго ў вядры прадаваць. Яйкі ім прадавалі, а некаторыя і малако, і другое што. У іх тавары былі добрыя. А ў хатах гразка было ў іх. У суботу не працавалі, а ні крыху. У пятніцу, бывала, свечкі запаляць, а ў суботу я хадзіла тушыць, яны нават свечкі самі ў суботу не тушылі. Называлі нас «агой» (гэта значыць, мужык). Мы, дзяўчаты, дружылі паміж сабой. Яўрэйкі былі прыгожыя, чыстыя. Але некаторыя былі і брудныя, неахайныя, мазаліся кірасінай, каб вошы не заводзіліся.

Каля нас, на нашай вуліцы, жыла Сорка, яна дачку аддавала замуж. Я хадзіла глядзець тады. Маладую адзявалі, пакрывалі фатой, садзілі пасярод хаты яе, а музыкант на скрыпцы граў. У сінагогу вянчацца хадзілі. Каля дзвярэй равін іх вянчае, там віно пілі і білі пасля гэтага аб зямлю бакалы. Гарэлку не пілі, рабілі для гасцей салодкі стол.

Яўрэі трымалі магазіны ў сваіх хатах. Чатары сінагогі былі ў Ільі, нават яшчэ і недабудаваныя былі, чатыры школы пры іх былі. Сінагогі высокія былі, як цяпер іх бачу. Адна сінагога была там, дзе цяпер Зіноў'ева жыве. Адзін раз хлопцы пажартавалі. У час малебну кінулі ў сінагогу жывую варону, яўрэі спалохаліся, патушылі свечкі. Сашка Вайцяхоўскі, казалі, гэта зрабіў з хлопцамі. У вайну ён у паліцаях быў, а потым у партызанах.

Была яшчэ такая яўрэйка Хана, яна ненармальная была, хадзіла па вёсцы, яўрэі яе кармілі, але ў хату да сябе не пускалі, бо яна брудная была, хадзіла ў галошах набасанож. Перад вайной яна памерла. А быў яшчэ нямы яўрэй, перад вайной ён паказваў, што будзе вайна. Яму і верылі, і не верылі. Немцы яго забілі ў вайну.

Немцы забівалі яўрэяў у Ільі тры ці, можа, і чатыры разы. А калі прыйшлі немцы, то спачатку яўрэяў грабілі нашы, свае. Хадзілі па хатах і забіралі ў іх дабро, мяхамі выносілі ўсё. Толькі сур'ёзныя гаспадары не хадзілі грабіць яўрэяў. Гэта рабілі толькі п'яніцы, гультаі, ніякія. Але ж прахам ім пайшло ўсё награбленае. А потым паліцаі і немцы здзекаваліся і грабілі яўрэяў, нібыта яўрэі маглі адкупіцца золатам, зернем. Я сама адзін раз бачыла, як яўрэі адкупляліся. Мы тады дзяжурылі па вёсцы і зайшлі ў адзін яўрэйскі двор. Дык яны туды зносілі

хто залатыя рэчы ці грошы, хто тканіны, хто авёс. Вагі тут жа стаялі. Гэта яўрэі так адкупліваліся. Але ж усё роўна іх потым пабілі. Жахліва вельмі было. Там яма была выкапана яўрэямі некалі пад лядоўню. У гэту яму лёд запасалі на лета, закрывалі яго апілкамі. І стаяў побач сарай. Там і білі яўрэяў. Мы самі баяліся, што і нас паб'юць усіх, як яўрэяў. Нехта тады прыдумаў, нават, такую прымаўку: «Жыдам адна субота, палякам – два тыдні, а беларусам – два вяселлі».

Я бачыла, як хаваўся Саламянскі Файва. Яго сям'ю (дзяцей і жонку) забілі немцы, а яго самога не чапалі, бо ён патрэбны быў немцам як майстар – млынар. Ён жа да вайны меў свой млын. Хадзіў на млын працаваць ужо і пры немцах. Не раз заходзіў да нас у хату, да бацькі. Ён прыносіў нам муку, няшмат, праўда, а мы яму за гэта давалі табакі курыць, яна ў нас была свая. У яго на спіне была нашыта зорка яўрэйская, як ва ўсіх яўрэяў тады, бо немцы загадалі так зрабіць.

Адзін раз ён ішоў па вуліцы, і каля пажарнай яго заўважылі немцы. Яны закрычалі «юда, юда» і пагналіся за ім. Ён уцякаў, ускочыў да нас у хату. Мой бацька накінуў на яго кажух, і ён пабег у агарод, і лёг там у баразну, схаваўся. Тады яго немцы не знайшлі.

А яшчэ мы хавалі аднаго хлопчыка-яўрэя. Ён і маці прыйшлі ў Ілью з Даўгінава, бо там білі яўрэяў, і яны думалі схавацца ў Ільі. Але і ў Ільі яўрэяў білі ўжо. Маці хлопчыка забілі немцы, а яго мы хавалі ў лазні на сваім агародзе. Цэлы тыдзень насілі яму туды ежу ў вядры, каб ніхто не здагадаўся. Бо тут жа вакол школы, блізка ад нашай хаты, былі ўжо нямецкія акопы, і немцы маглі ўсё бачыць. Я адзін раз прыйшла да яго з ядой, а яго там не было. Можа і ён недзе жывым застаўся.

Ведаю два выпадкі, калі нашы вясковыя людзі аддавалі яўрэяў немцам, і тыя іх забілі. Была тут такая, не хачу, нават, называць яе. Яна піла, гуляла. Знайшла яўрэйскую дзяўчынку, тая недзе хавалася ад немцаў, і прывяла яе немцу. Як тая дзяўчынка плакала, прасілася, рукі цалавала – жалка бачыць было гэта. А яна ўсё роўна завяла да немца. А той – пах – і забіў дзяўчынку. І яшчэ. Яўрэйская сям'я схавалася неяк паміж сценамі, паміж хат, і стаялі яны там. Іх заўважыў тут адзін такі і прывёў немцаў. Немцы выцягнулі яўрэяў і забілі.

Чаго толькі не было... Хіба ўсё раскажаш. Быў да вайны такі яўрэй Лейба ў Ільі. Ён не любіў нешта яўрэяў, а яны яго. Ён еў сала, усё еў. Не браў іх закона. Сам рэзаў цялё, не вадзіў да рэзніка, як гэта рабілі ўсе яўрэі. У вёсцы быў спецыяльна для гэтага рэзнік – яўрэй, які рэзаў жывёл. У яго і бойня была там, дзе цяпер Дубаневіч жыве. Курэй, праўда, гэты рэзнік рэзаў дома, а не біў на бойні. Дык вось, яўрэі яго ў 1940 годзе самі здалі ў НКУС савецкай уладзе. І яго вывезлі адсюль некуды ў Расію. Тады ж многіх вывозілі адсюль падазроных».

Успамінае Раіса Макараўна Александровіч

Сёння у Ільі няма ніводнага карэннага яўрэя. Састарэлі людзі, што бачылі іх, калі былі малыя. Не гучыць іх мова… . Але ж ў абліччы нашай вёскі маецца нешта такое, што нагадвае нам: Ілья – яўрэйскае мястэчка.

У знак памяці вынішчэння яўрэяў у вёсцы Ілья (па матывах верша Элізэра Дзінерштайна, ЗША) Роза Канстанцінаўна Шэрая, настаўніца Ільянскай СШ з краязнаўчым ухілам імя А. А. Грымаця, напісала верш:

Их вели по последней дороге,
Как скотину, вели на убой.
Их сжимались сердца от тревоги…
Резал душу охранников вой.
Их всё гнали, и гнали, и гнали
Стариков, матерей и детей…
И сердца их безмолвно рыдали…
Шли к погибели сотни людей.
Боже мой! Жгли живыми евреев,
Как дрова поджигали в печи,
Торопились враги поскорее
Тот кровавый костёр завести.
Лес стонал от безудержной боли,
Небо стыло над ямой живой…
Уготован им чёрною волей
Преждевременный вечный покой.
Уцелевших осталось немного,
На чужбину их ветер унёс.
В никуда Илья помнит дорогу
Жертв еврейских и море их слёз.
Время лечит, но как прежде тревога…
Нарушает ильянский покой
Холокоста немая дорога
Отражается Ильей-рекой.

У кнізе «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» прыведзена найбольш дакладная колькасць расстраляных і спаленых яўрэяў у Ільі – 2300 чалавек.

Як нашчадкі захоўваюць памяць пра тую трагедыю, пра тых загінуўшых бязвінных людзей, сваіх землякоў?

4. Ільянскія яўрэйскія могілкі

Ільянскія яўрэйскія могілкі размешчаны за вёскай, на яе паўночна-ўсходняй ускраіне, на лузе, на невысокім узвышшы. (Дадатак) Цяпер тут нябожчыкаў не хаваюць, бо ў вайну ільянская яўрэйская абшчына была поўнасцю знішчана фашысцкімі вырадкамі. Могілкі зараслі травою, кустамі і не агароджаны. Шмат надмагільных камянёў даўнейшай пары і не зусім даўнія, на якіх нават можна прачытаць надпісы на яўрэйскай мове. Многія гэтыя помнікі павалены і ўжо ўраслі ў зямлю. Частка гэтых камянёў адтуль была звезена мясцовым насельніцтвам для будаўнічых мэтаў. Рабілі яны гэта як варвары, і не баяліся ні Бога, ні Алаха – нікога. Толькі ў 2004 годзе калектыў Ільянскай сярэдняй школы зрабіў першыя намаганні па добраўпарадкаванні могілак. Ініцыятыва гэта была падтрымана старшынёй Ільянскага сельскага савета Кутас Г. В. Было запланавана ў 2005 годзе яўрэйскія могілкі абгарадзіць і прывесці ў належны парадак. Сельскім саветам для гэтага выдзелены сродкі. Вучні і настаўнікі школы сумесна з яўрэйскай моладдзю з Мінска, прадстаўнікамі міжнародных арганізацый прынялі ўдзел у добраўпарадкаванні могілак. У арганізацыі гэтых мерапрыемстваў дапамогу аказала Герасімава Іна Паўлаўна, дырэктар музея беларускіх яўрэяў у Мінску. Праведзены шэраг сумесных мерапрыемстваў школы і музея ў 2005, 2006, 2007 гадах.

Кожны раз, калі я бываю ў роднай вёсачцы Ілья, нізка схіляю галаву, праходзячы паўз людскія пахаванні. І хочацца гучна закрычаць: «Людзі! Будзьце людзьмі!»

Заключэнне

Боль і жах выклікае ў мяне нялітасцівы, жорсткі і трагічны лёс гэтых людзей. Ці не замнога гэта для адной нацыі? Праз архіўныя дакументы, расказы старажылаў-землякоў паўстае трагедыя яўрэяў, якія перанеслі нясцерпныя выпрабаванні вайны, нацыянальныя здзекі з боку суседніх народаў, знішчэнне. Усё ж шматпакутны люд выстаяў і перамог. Выстаяў, на маю думку, дзякуючы сваёй гістарычнай памяці, веры, еднасці, патрыятызму.

Знітаваныя адной зямлёй, неўміручасцю нацыянальнага духу, несмяротнасцю кожнага народа, якія маюць сваю Вялікую гісторыю і культуру, беларусы і яўрэі будуць заўсёды прыкладам цывілізаваных нацый.

Сёння Рэспубліка Беларусь характарызуецца як шматнацыянальная і шматэтнічная дзяржава, што замацавана Канстытуцыяй нашай краіны і рэалізуе свае намаганні праз унутраную палітыку, накіраваную на забеспячэнне найбольш спрыяльных умоў для існавання і развіцця нацыянальных супольнасцей на Беларусі. Наша дзяржава зацікаўлена ў пабудове дэмакратычнага прававога грамадства, у якім на практыцы задавальняюцца нацыянальна-культурныя патрэбы ўсіх без выключэння народаў краіны пры ўмове забеспячэння агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

Зыходзячы з даўнасці аседласці яўрэяў на беларускіх тэрыторыях залежыць ступень знітаванасці нацыянальнай меншасці з Беларуссю і яе тытульным этнасам, уключанасць у яе эканамічнае і культурнае жыццё, сацыяльна-палітычныя працэсы. Даўнасць аседласці спрыяе стварэнню перадумоў для фарміравання ў нацыянальнай меншасці пачуцця патрыятызму, успрымання ёю Беларусі як сваёй новай Радзімы, усведамленне сябе часткай яе народа. Гэты патрыятызм перадаецца з пакалення ў пакаленне, ён замацаваны агульным лёсам народаў Беларусі, няпростымі гістарычнымі выпрабаваннямі. Вельмі істотна тое, што і ва ўмовах шматстагодняй адарванасці ад сваёй зямлі ў беларускіх яўрэяў захавалася ўласцівая толькі ёй субкультура.

Існаванне побач з беларусамі яўрэяў аказвала значны ўплыў на эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае развіццё беларускіх зямель, узаемаадносіны з суседнімі краінамі, развіццё беларускай культуры, фарміраванне і ўзмацненне нацыянальнай самасвядомасці нашага народа.

Пытанні міжэтнічных зносін на Беларусі ў святле гістарычных фактаў разглядаліся многімі даследчыкамі, але праца ў гэтым накірунку яшчэ не даведзена да канца. Спадзяюся, што дадзеная праца будзе ўнёскам у такую важную справу.



לשמאל: דוד קופלוביץ, לובה סוסמן, אחותי מלכה, אורחת מוליצקי
דיהן — יצחק סוסמן, ישראל מיכאל סולטוביץ, חיה רבונסקי ואבריג
ראובן קופלוביץ וחיה זיסמן כולם נספו בשואה — הי"ד





דער נײַ פאַרענדיקטער בנין פון דער „תרבות" שול



המצבה לזכר גבורי ההתקוממות הפולנית
בנובמבר 1830

די [illegible] אין [illegible]

[illegible]

ראשוני קן בית״ר [illegible]



[illegible]

[illegible]

[illegible]

יונה ריאר, רעיתו בת שבע ובנם יהודה
עם תום מלחמת העולם, בצאתם מהיערות

[illegible]

[illegible]

ІЛЛЯ
ВІЛЕЙСКІ РАЁН
ЗНІЩЧАНА
КАЛЯ
800
ЧАЛАВЕК







НА ЭТОМ МЕСТЕ
В 1942 ГОДУ
ФАШИСТСКО-БАНДИТСКИМИ
ВЛАСТЯМИ
РАССТРЕЛЯНЫ
750 ЧЕЛОВЕК
СОВЕТСКИХ
ГРАЖДАН

28000р.
БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта

AVE

Адраджэнне
Вера
Еднасць

Літаратурна-мастацкі альманах

Выпуск 6

У дзвюх частках

Частка першая

848191
БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта

Вёрстка *В. У. Трусевіч*

Дызайн вокладкі *В. У. Аскерка*

Падпісана да друку 01.02.2011. Фармат 70×108 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура Arno Pro. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 21,3. Ул.-выд. арк. 18,0.
Тыраж 100 экз.

Аддрукавана ў Цэнтры выдавецка-паліграфічных
і інфармацыйных тэхналогій установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».
220006. Мінск, Свярдлова, 13а.
ЛИ № 02330/0549423 ад 08.04.2009.
ЛП № 02330/0150477 ад 16.01.2009.